Ю. У. Несцяровіч

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ МЕТАДАЛОГІІ ГІСТОРЫІ, ГІСТАРЫЯГРАФІІ, НАВУКАЗНАЎСТВА І ЭТНАЛОГІІ

БЕЛАРУСКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ
ДАКУМЕНТАЗНАЎСТВА І АРХІЎНАЙ СПРАВЫ

Ю. У. Несцяровіч

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ МЕТАДАЛОГІІ ГІСТОРЫІ, ГІСТАРЫЯГРАФІІ, НАВУКАЗНАЎСТВА І ЭТНАЛОГІІ

Мінск
2004

УДК 930.01
ББК 63.2
Н 56

Рэцэнзенты: Шыраканаў Дзмітрый Іванавіч — доктар філасофскіх навук, акадэмік НАН Беларусі,
Насевіч Вячаслаў Леанідавіч — кандыдат гістарычных навук,
Крыштаповіч Яўген Аляксандравіч — кандыдат філасофскіх навук

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам БелНДІДАС

**Несцяровіч Ю. У.** Тэарэтычныя праблемы метадалогіі гісторыі,
Н 56 гістарыяграфіі, навуказнаўства і этналогіі / Ю. У. Несцяровіч. — Мн.: БелНДІДАС, 2004. — 162 с.

ISBN 985-6099-99-4

У форме праблемнага агляду выкладаюцца погляды на праблемы гістарычных заканамернасцяў, аб'екта і прадмета гістарычнага пазнання і даследавання, суадносін гістарычных фактаў і канцэпцый, на навуказнаўчую трактоўку прадмета навуковай дысцыпліны, лагічную структуру гістарычнага даследавання, упарадкаванне гісторыказнаўчай і навуказнаўчай тэрміналогіі, на тыпалогію метадаў і ўзроўняў даследавання, удакладненне прадметных межаў гістарыяграфіі, метадалогіі гісторыі і навуказнаўства, на распрацоўку тэорыі этнасу і анталагічны статус этнасаў, на ўстанаўленне рэферэнтаў паняццяў, з дапамогай якіх апісваюцца з'явы грамадскай рэчаіснасці.

Прызначана для спецыялістаў, аспірантаў у галінах гістарыяграфіі, метадалогіі гісторыі, этналогіі, анталогіі і тэорыі пазнання, сацыяльнай філасофіі.

**УДК 930.01**
**ББК 63.2**

ISBN 985-6099-94-4

© Несцяровіч Ю. У., 2004
© БелНДІДАС, 2004

*Гісторыя як навука сёння перажывае адзін з перыядаў барацьбы вакол вызначэння зместу гэтай дысцыпліны і яе вынік пакуль цьмяны.*

Джон Тош[1]

# УВОДЗІНЫ

У кнізе разглядаюцца некаторыя праблемы і пытанні метадалогіі гісторыі — тэрміналогіі гісторыказнаўчага (метагістарычнага) апісання, наяўнасці сярод вынікаў канкрэтна-гістарычнага даследавання тэорый і законаў, суадносін гістарычных фактаў і канцэпцый, суадносін апісання і даследавання; тэорыі гістарыяграфіі — шматзначнасці тэрміна "гістарыяграфія", прадметных межаў гістарыяграфіі; навуказнаўства — экспплікацыі, устанаўлення адкарэліраванай навуказнаўчай тэрміналогіі, тыпалогіі ведаў, метадаў і ўзроўняў даследавання; этналогіі — пабудовы тэорыі этнасу, прадмета этналогіі, дысцыплінарнага статуса этнасацыялогіі. Частка даследавання прысвечана аналізу асноў і ўдакладненню прадметных межаў навуказнаўчых дысцыплін і яго тлумачэнню. Акрамя таго, у ёй закранаюцца праблемы і пытанні гістарыясофіі (суб'екта гісторыі, аб'ектыўнасці сусветна-гістарычнага працэсу), гнасеалогіі (адносін суб'екта гістарычнага пазнання і даследавання да рэчаіснасці і аб'екта даследавання), сацыяльнай філасофіі (удасканалення паняційнага апарату грамадазнаўчых дысцыплін), а таксама філасофіі этналогіі (анталагічнага статуса этнасаў).

Тэрмін "тэорыя" шматзначны, яго значэнне карэкціруецца ў залежнасці ад вынікаў развіцця гнасеалогіі, эпістэмалогіі ў розныя часы. Тэрміны "тэорыя" і "навуковая тэорыя" маюць розныя значэнні не толькі ў межах гнасеалогіі і розных навуказнаўчых дысцыплін, але і ў пэўных канцэпцыях розных філасофскіх кірункаў. Слова "тэорыя" змяняе значэнне і ў залежнасці ад таго, з якімі словамі яно злучаецца. Ужыванне слова "тэорыя" ў якасці тэрміна адрозніваецца ад ужывання яго ў якасці часткі выразаў, якія абазначаюць найменні пэўных сістэм ведаў пэўных галін даследаванняў і найменні пэўных раздзелаў навуковых дысцыплін (напрыклад, у выразах "тэорыя археаграфіі", "тэорыя крыніцазнаўства"). У першым выпадку яно ўказвае на паняцце філасофскіх і навуказнаўчых дысцыплін; у другім — на пэўную навуковую тэорыю, напрыклад тэорыю цвёрдага цела, тэорыю эмоцый; у трэцім выпадку — на распрацоўкі, у якіх

---

[1] Тош Джон. Стремление к истине. Как овладеть мастерством историка. М., 2000. С. 242.

перш за ўсё раскрываецца лагічная структура і вызначаюцца прадметныя межы адпаведных навуковых дысцыплін, а таксама розныя вынікі рэфлексіі адносна іх розных аспектаў.

Пад гістарыясофіяй разумеем філасофскую дысцыпліну, прадметныя рамкі якой акрэслены сэнсам, заканамернасцямі, формамі і кіруючымі сіламі гістарычнага працэсу, пра якія разважаецца пераважна на аснове метаду разумовасці. Паводле такога разумення гістарыясофіі адносім да яе, напрыклад, тэорыю фармацый К. Маркса, тэорыю этнагенезу Л. М. Гумілёва. Тэорыю эксплуатацыі Дж. Коэна, тэорыю сацыяльных агульнасцяў Дж. Рымера і іншыя вучэнні і канцэпцыі адносім да сацыяльнай філасофіі (у дадзеным выпадку слова "тэорыя" — частка выразу, якім абазначаюцца тэарэтычныя распрацоўкі, што магчыма класіфікаваць як тэорыі, толькі калі зыходзіць з шырокага паняцця тэорыі, распаўсюджанага ў межах філасофіі). Пад гісторыказнаўствам маем на ўвазе комплекс галін даследаванняў, датычных асаблівасцяў, лагічнай структуры, развіцця ведаў і метадаў розных тыпаў гістарычнага даследавання.

Пад гнасеалогіяй маецца на ўвазе філасофская дысцыпліна, у якой абгрунтоўваюцца розныя тыпы, спосабы, формы пазнання, высвятляюцца адносіны ведаў і іншых вынікаў пазнання да рэчаіснасці; пад эпістэмалогіяй — навуказнаўчая дысцыпліна, у якой даследуюцца розныя аспекты атрымання навуковых ведаў, г. зн. што мы прытрымліваемся погляду на адрозненне гнасеалогіі і эпістэмалогіі, які адпавядае поглядам А. Пуанкарэ і К. Попера на філасофію навукі, і тым самым адвяргаем погляд, які адстойвае сёння значная частка філосафаў, паводле якога гнасеалогія і эпістэмалогія — толькі розныя найменні тэорыі пазнання, якая дзеліцца на тэорыю пазнання класічнага і некласічнага тыпу[2].

Мы будзем адрозніваць мову гісторыказнаўчага даследавання, г. зн. мову апісання працэсаў гістарычнага пазнання, і мову, агульнапрынятую сёння для абазначэння аспектаў навукова-гістарычнай дзейнасці, мову навуковага ўжытку. У межах сферы ажыццяўлення навуковай дзейнасці ўсталявалася пэўная тэрміналогія, якая тычыцца яе аспектаў. Мы ўводзім некаторыя новыя тэрміны, у прыватнасці "гісторыка", у мэтах несупярэчлівага гісторыказнаўчага апісання гістарычнага пазнання, не прапануючы іх для выкарыстання ва ўжытку навукі (сферы грамадскай дзейнасці).

---

[2] Лекторский В. А. Эпистемология классическая и неклассическая. М., 2001. С. 5, 103.

Сістэму гістарычных дысцыплін мы падзяляем на гісторыку (г. зн. галіну даследаванняў, датычных гісторыі грамадства), якая складаецца з агульных раздзелаў (напрыклад, гісторыя Азіі, гісторыя сярэдніх вякоў), прыватных раздзелаў (гісторыя ВКЛ, гісторыя СССР), галін (гісторыя культуры Беларусі, палітычная гісторыя ВКЛ), спецыяльных дысцыплін (археалогія, археаграфія) і сумежных гістарычных дысцыплін (эканамічная гісторыя, гісторыя дзяржавы і права). Калі ўключаць сумежныя гістарычныя дысцыпліны ў склад гісторыкі, то яна становіцца не сукупнасцю раздзелаў, а комплексам навуковых дысцыплін. Такім чынам, найменне “гісторыка” ў рамках метадалогіі гістарычнага пазнання — не замена наймення “гістарычная навука”, гэта скарочанае найменне самай разгалінаванай дысцыпліны сярод гістарычных — гісторыі грамадства. “Сусветная гісторыя” — найменне аднаго з раздзелаў гісторыкі, але не другое яе найменне.

Выраз “гістарычная навука” непрымальны ў якасці абазначэння сістэмы навуковых дысцыплін, якія выдзяляюцца з галіны гістарычнага пазнання, паколькі ён выкарыстоўваецца і як найменне, і як тэрмін, які абазначае шматслойнае паняцце. Тэрмін “гістарычная навука”, як і большасць іншых гісторыказнаўчых (і навуказнаўчых) тэрмінаў, стварыўся ў рамках светапоглядаў, пры якіх выразна не адрозніваліся навуковы і філасофскі тыпы пазнання, моўныя і мысліцельныя працэсы, тэрміны і паняцці, аб’екты мыслення і аб’екты пазнання, імёны і веды, паняцце навукі і паняцце навуковай дысцыпліны і г. д.

Увогуле, толькі сістэма гістарычных дысцыплін абазначаецца назвай, у якую ўваходзіць слова “навука”, а не агульнапрынятыя найменні “фізічная навука”, “лагічная навука” і г. д. Для абазначэння сістэм навуковых дысцыплін ужываюцца іншыя аднаслоўныя найменні. У Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў — аналаг сістэмы навуковых дысцыплін — галіны навукі абазначаюць як “фізіка-матэматычныя навукі”, “гістарычныя навукі” і г. д., але ў гэтым выпадку слова “навука” ў множным ліку з’яўляецца сінонімам тэрміна “навуковыя дысцыпліны”.

Асноўная ідэя, якую аўтар лічыць неабходным давесці да чытача, — тое, што патрэбна ўдакладненне выкарыстоўваемай адпаведнымі спецыялістамі гісторыказнаўчай і шырэй — навуказнаўчай тэрміналогіі (пад навуказнаўчай тэрміналогіяй мы разумеем сукупнасць тэрмінаў метадалогіі навуковага пазнання і эпістэмалогіі). Сёння немагчыма ўявіць сабе навуковую дысцыпліну без монасемічнай або хаця б несупярэчлівай тэрміналогіі. Каб дасягнуць дакладных высноў

і ў метатэарэтычных даследаваннях, неабходна мецъ у іх карэляцыйна ўстаноўленую тэрміналогію. Некаторыя айчынныя метадолагі гістарычнага даследавання сцвярджаюць, што гісторыказнаўчая тэрміналогія — умоўная. Запярэчым ім, што яна безумоўна ўмоўная для гісторыкаў, сацыёлагаў і тых, хто праводзіць навуковыя даследаванні. Аднак для тых, хто праводзіць метадаследаванні, вывучае лагічную структуру гістарычнага даследавання і яго метадаў, яна не ўмоўная. Падобныя сцвярджэнні пра ўмоўнасць тэрміналогіі, на наш погляд, адзнака іх няздольнасці распрацоўваць строга сістэму гісторыказнаўчых ведаў. Калі яна ўмоўная, то наша разуменне працэсу гістарычнага даследавання невыразнае, прыблізнае.

Шматзначным застаецца сёння ў гістарычных працах выкарыстанне тэрмінаў "гістарыяграфія" і "метадалогія гісторыі", а прадметныя межы дысцыплін, якія імі абазначаюцца, дакладна не акрэслены. Улічваючы дыферэнцыяцыю і інтэграцыю навуковых дысцыплін, у тым ліку і гістарычных у сферы навукі, уяўляецца актуальнай навуказнаўчай праблемай удакладненне прадметных межаў і ўстанаўленне прадметных рамак розных гістарычных і навуказнаўчых дысцыплін.

# ГЛАВА 1
# НЕКАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ МЕТАДАЛОГІІ ГІСТОРЫІ

## 1. ГІСТАРЫЧНЫЯ ЗАКАНАМЕРНАСЦІ

Увага айчынных гісторыкаў і гісторыказнаўцаў да метадалагічных праблем гістарычных дысцыплін і гістарычнага пазнання павялічваецца з другой паловы 90-х гг. XX ст., пра што сведчаць розныя тэарэтычныя і філасофскія праблемы гістарыяграфіі і метадалогіі гістарычнага даследавання, якія ўздымаліся і абмяркоўваліся на 2-й Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў 10—11 красавіка 1997 г., а не толькі на міжнароднай навуковай канферэнцыі "Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання" 1—2 лютага 2001 г. у Мінску і на рэспубліканскай навуковай канферэнцыі "Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: Стан, здабыткі, супярэчнасці, перспектывы развіцця" 3—4 мая 2002 г. у Гродна (Г. М. Сагановіч, напрыклад, адзначае амаль поўную адсутнасць тэарэтычнага дыскусу ў галіне метадалогіі гістарычнага пазнання ў Рэспубліцы Беларусь у 90-я гады[1]. Гэта правільна ў тым выпадку, калі падсумоўваць такі дыскус толькі на падставе апублікаваных матэрыялаў).

Аднак у цэлым асэнсаванне праблем гістарычнага пазнання застаецца ў Рэспубліцы Беларусь на невысокім узроўні. Некаторыя сучасныя беларускія навукоўцы некрытычна ставяцца да выкладання гісторыказнаўчых праблем, не пазбягаюць прамога запазычання стэрэатыпных палажэнняў. Так, А. Г. Каханоўскі запазычвае ў прадстаўніка марксісцкай метадалогіі гісторыі М. А. Барга наступнае палажэнне: "У спецыфічным сэнсе гісторыя — навука аб заканамернасцях разгортвання ... сусветна-гістарычнага працэсу ... як узаемадзеянне этнапалітычных супольнасцяў"[2], не ўсведамляючы таго, што заканамернасці сусветна-гістарычнага працэсу — прадмет гістарыясофіі — галіны філасофскага пазнання і тэорыі гісторыі — навуковай дысцыпліны, альтэрнатыўнай ёй, а ўзаемадзеянне этнапалітычных супольнасцяў — прадмет паліталогіі і этналогіі.

---

[1] Сагановіч Г. М. Дзесяць гадоў беларускай гістарыяграфіі (1990—2000) // БГА. Т. 8. Сш. 1—2. Снежань 2001. С. 223.

[2] Каханоўскі Алесь. Гісторыя // ЭГБ. Т. 3. С. 32; Барг М. А. Категории и методы исторической науки. М., 1984. С. 23.

У палажэнні, якое сфармуляваў М. А. Барг (і ў іншых падобных выказваннях), на наш погляд, адчуваюцца наяўныя водгаласы двайнога гіпастазавання:

па-першае, гіпастазавання паняцця сусветнай гісторыі як эквіваленту гегелеўскага гіпастазавання "канкрэтнага наогул" у якасці сусветнага духу, самастойна існага, "арганічнай сістэмы" і ўзяцця яе аб'ектам пазнання. Ідэя самаразгортвання такога духу ў Г. В. Ф. Гегеля непарыўна звязана з ідэяй адзінства сусветнай гісторыі. Аднак гэтыя ідэі — вынік філасофскага пазнання, які мае гісторыка-філасофскую каштоўнасць і, мабыць, пэўную эўрыстычную каштоўнасць як перадумова пабудовы розных тэорый, але не больш таго. К. Ясперс, мяркуючы, што "гісторыя ахоплівае ўсю рэальнасць як такую", пры гэтым, аднак, лічыў "усеагульнае" не аб'ектыўна існуючым, а толькі "заўсёды ўласцівым нашаму разуменню"[3].

Калі ў выказванні: "сусветнасць гістарычнага працэсу … праяўляецца і ў шматлікіх кантактах краін, народаў, культур. У такіх адносінах сусветнасць гісторыі сама прадстае як працэс"[4] да тэрміна "працэс" не далучыць слова "лагічны", то змест яго належыць інтэрпрэтаваць так, што замест ідэі "сусветнага духу" ў ім выказваецца ідэя "гістарычнага працэсу", якая, з аднаго боку, быццам адпавядае ясперсаўскай гістарыясофіі і яе палажэнню пра пераўтварэнне лакальных культур і цывілізацый як суб'ектаў гістарычнага працэсу ў адзіную глабальную супольнасць — "адзіны мір чалавецтва на зямным шары". З другога боку, яна ўяўляе сабой аб'яднанне думак пра аб'ектыўную рэальнасць гістарычнага працэсу і пра яго сусветнасць, аб'яднанне, якое служыць перадумовай для акта гіпастазавання;

па-другое, палажэнне М. А. Барга фармулюецца ў рамках вучэння дыялектычнага матэрыялізму, паводле канцэпцый якога лічылася, што "самі ж законы існуюць аб'ектыўна, незалежна ад свядомасці людзей…"[5] Прадстаўнікі такога светапогляду не пераадольваюць традыцыю гіпастазавання "ідэй" або радавых паняццяў, распачатую Платонам, якую падвергнуў знішчальнай крытыцы Арыстоцель. Законы, як прыроды, так і гісторыі, не існуюць у рэчаіснасці, а з'яўляюцца вынікам дзейнасці суб'екта пазнання, працэсу даследчага адлюстроўвання ў паняццях і тэарэтычных схемах з'яў рэчаіснасці, працэсу, які абапіраецца на практыку. Прывядзём вызначэнне паняцця закона пры-

---

[3] Ясперс К. Смысл и назначение истории. М., 1991. С. 249—250.

[4] Барулин В. С. Социальная философия. Ч. 1. М., 1993. С. 247.

[5] Философский словарь. М., 1980. С. 116.

роды з пункту гледжання логікі, якое маецца ў дапаможніках па логіцы: усякі закон прыроды ўяўляе сабой сувязь, узаемадзеянне, адносіны паміж прадметамі і з'явамі тых ці іншых класаў. Клас прадметаў — вынік лагічнага мыслення суб'екта пазнання, выдзяляемыя абстрактна-мысленна (а значыць, і славесна-моўна) прадметы, "якасна падобныя ў нейкіх адносінах" (такое выдзяленне складае спецыфіку паняцця як формы мыслення)[6]. Адпаведна з гэтым рэферэнт паняццяў закона памылкова вызначаць як пэўную рэчаіснасць (аб'ектыўную рэальнасць), прымальна як пэўныя веды.

Законы прыроды ўяўляюцца з пункту гледжання гнасеалогіі ведамі, у якіх тлумачацца сувязі паміж даследуемымі з'явамі, з пункту гледжання логікі — паміж класамі прадметаў. У дэфініцыях паняцця закона, якое ахоплівае не толькі законы прыроды, фармулюецца, што "закон — унутраная і неабходная ўсеагульная і істотная сувязь прадметаў і з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці, сталае, базіснае, тое ў з'явах, што паўтараецца, не так часта змяняецца, ідэнтычна, адна са ступеняў пазнання чалавечага грамадства і ўзаемадзеяння з'яў"[7]. Такая дэфініцыя паняцця закона ахоплівае і законы мыслення, і законы грамадства, у тым ліку і іх разнастайнасць — гістарычныя законы. Але трэба разумець, што сувязі паміж з'явамі, якія ўстанаўліваюцца ў гістарычных даследаваннях, маюць іншы характар і не з'яўляюцца ўсеагульнымі.

Нягледзячы на тое што "...паняцце гістарычнага развіцця і паняцце закона ўзаемна выключаюць адно другое"[8], тым не менш філосафамі ў мінулым выказваліся меркаванні, што апісанні "каузальнай сувязі працэсаў у іх паслядоўнасці" ("сусветныя законы" К. Брэйзіга, "законы грамадскага жыцця" К. Маркса) дапушчальна лічыць "гістарычнымі законамі ў цесным сэнсе"[9]. Ёсць думка, што "...гістарычныя законы ўяўляюць сабой толькі варыяцыі законаў сацыялагічных"[10]. А чаму б у такім разе не характарызаваць іх і як варыяцыі паліталагічных законаў? Гэта значыць законаў, якія ўстанаўліваюцца ў рамках палітычнай (кажучы больш дакладна — паліталагічнай) сацыялогіі. Больш дакладнае наступнае меркаванне: гіс-

---

[6] Войшвилло Е. К., Дегтярев М. Г. Логика. М., 2001. С. 180—181.

[7] Кондаков Н. Е. Логический словарь-справочник. М., 1975. С. 178.

[8] Риккерт Генрих. Философия истории. СПб., 1908. С. 36.

[9] Вундт Вильгельм. Социальные законы // Философия истории. Антология. М., 1995. С. 144.

[10] Ковальченко И. Д. Методы исторического исследования. М., 1986. С. 51.

торыкі адкрываюць законы, але законы сацыялагічныя, паліталагічныя, выходзячы пры гэтым за межы мэт і асаблівасцяў канкрэтна-гістарычнага даследавання, "са сферы сваёй навукі"[11]. Пад гістарычнымі законамі разумеюцца законы, якія тычацца развіцця грамадства і якія ўстанаўліваюцца хутчэй у межах гістарыясофіі, а не розных грамадазнаўчых дысцыплін. У межах гістарыясофіі атрымліваюцца абагульненае апісанне і тлумачэнне з'яў і законы развіцця грамадства ў цэлым, якія дакладней абазначаць тэрмінам "агульна(універсальна)-гістарычныя законы".

К. Попер, зыходзячы з адрознення тэарэтычных і гістарычных навук, абгрунтоўваючы немагчымасць устанаўліваць на падставе гістарычных фактаў законы, якія маюць прадказальны характар, яшчэ ў 40-х гадах XX ст. высунуў тэзіс, паводле якога "...гісторык цікавіцца рэчаіснымі адзінкавымі або спецыфічнымі падзеямі, але не законамі або абагульненнямі"[12]. Такі тэзіс бяспрэчны і сёння, калі мець на ўвазе толькі канкрэтна-гістарычныя даследаванні. У канкрэтна-гістарычных даследаваннях (як лічыць П. Ласлет, у "традыцыйных гістарычных даследаваннях", адрозніваючы ад іх некалькі тыпаў (у яго — катэгорый) гістарычных даследаванняў, якія задуманы як уклад у сацыяльны аналіз[13]) вучоныя перыядызуюць канкрэтна-гістарычныя з'явы, высвятляюць іх генезіс, прычыны, характар, асаблівасці, сувязі (у тым ліку устойлівыя сувязі), тэндэнцыі развіцця з'яў і інш., аднак не класаў прадметаў, не ўстанаўліваюць "заканамернасці разгортвання сусветна-гістарычнага працэсу". Ажыццёўленыя імі апісанні і тлумачэнні з'яў дапушчальна трактаваць як ілюстрацыі разгортвання заканамернасцяў, якія ўстанаўліваюцца ў першую чаргу ў сацыялогіі і гістарыясофіі. У даследаваннях, якія праводзяцца прадстаўнікамі сумежных гістарычных дысцыплін, напрыклад у эканамічнай гісторыі, разглядаюцца тыпы, тыповыя рысы канкрэтных гістарычных з'яў.

Упартае імкненне савецкіх навукоўцаў адшукаць і абгрунтаваць гістарычныя заканамернасці — гэта перш за ўсё вынік "дагматычнага тлумачэння марксізму савецкімі грамадазнаўцамі"[14]. Але адкрыццё

---

[11] Ирибижданов Н. Клио перед судом буржуазной философии. М., 1972. С. 203.

[12] Поппер К. Нищета историцизма. М., 1993. С. 165.

[13] Ласслет Питер. История и общественные науки // Философия и методология истории. Благовещенск, 2000.

[14] Коломийцев В. Ф. Методология истории (от источника к исследователю). М., 2001. С. 147.

такіх законаў — справа не гісторыкаў. Зыходжанне імі з метадалагічных установак гістарычнага матэрыялізму прыводзіла іншы раз да няпоўнага ўлічвання спецыфікі канкрэтна-гістарычнага даследавання. Тая акалічнасць, што так званыя гістарычныя законы не ўстанаўліваюцца ў выніку гістарычных даследаванняў, не ўваходзяць у склад будуемых у іх канцэпцый, не дае, аднак, падстаў лічыць, як робяць некаторыя эпістэмолагі, гістарычную навуку "аспектам" "сістэматызуючых гуманітарных навук"[15].

Імкненне К. Гемпеля пастуліраваць гістарычнае тлумачэнне не інакш як праз падвядзенне пад законы тлумачыцца, на наш погляд, невыразнай карэляцыяй ім гнасеалагічных і эпістэмалагічных паняццяў. М. Мандэльбаум больш слушна разумеў каузальныя адносіны, якія звязваюць факты пра гістарычныя з'явы як формы залежнасці апавядання, г. зн. адносіў іх да эмпірычных залежнасцяў, іншай формы ведаў, чым эмпірычныя законы.

Польскі філосаф А. Шаф, як і значная частка прадстаўнікоў гістарычнага матэрыялізму, абгрунтоўваючы законы гісторыі, атаясамліваў іх з законамі марксісцкай тэорыі гісторыі[16], г. зн. з філасофскімі мадэлямі развіцця сусветна-гістарычнага працэсу. Шэраг аўтараў, у прыватнасці аўтары кнігі "Теоретические проблемы всемирно-исторического процесса" (М., 1979), трактавалі гістарычныя законы як пэўную рэчаіснасць, як фіксуемую прычынную сувязь падзей і як форму праявы сацыялагічнага закону, прычым, паводле іх пункту гледжання, гістарычны закон здольны праяўляцца ў гісторыі толькі аднойчы. На апошняе палажэнне А. І. Увараў слушна заўважыў, што: "Аднаразовая падзея (дакладней — каузальная сувязь падзей. — *Ю. Н.*) яшчэ не закон"[17]; дададзім — нават улічваючы розныя ступені агульнасці законаў.

Аўтары вучэбнага дапаможніка "Философия для аспирантов" (Р.-на-Д., 2002), які, дарэчы, зыходзячы з яго зместу, дакладней было б назваць "Філасофія навукі для аспірантаў", разумеюць законы навукі як адлюстраванні законаў аб'ектыўнага свету, што супярэчыць пала-

---

[15] Фабер К.-Г. Теория исторической науки // Современные исследования по философии истории. Ч. 2. М., 1977. С. 36, 40.

[16] Шафф А. Объективный характер законов истории. Некоторые проблемы марксистской методологии. М., 1959.

[17] Философские и методологические проблемы исторического познания (Обзор советской литературы за 1971—1981 гг.). Научно-аналитический обзор. М., 1982.

жэнню цытуемага імі Р. Фэймана пра тое, што "законы нярэдка не маюць прамых адносін да нашага вопыту"[18]. Канцэпцыя дубліравання законаў рэчаіснасці законамі навукі базіруецца на спекулятыўнай анталогіі і гнасеалогіі. У рамках дыялектычнага матэрыялізму яна базіравалася на мадэрнізаванай гегелеўскай філасофіі тоеснасці быцця і мыслення, а таксама на мадэрнізаванай лейбніцавай манадалогіі. У ёй абгрунтоўваецца наступны тэзіс: "Законы рэчаіснасці і законы навукі не належыць атаясамліваць … Законы рэчаіснасці — гэта аб'ектыўная сувязь і адносіны з'яў і працэсаў сусвету. Законы навукі — гэта адлюстраванне дадзеных аб'ектыўных сувязяў у свядомасці людзей у выглядзе сістэмы моўных знакаў, абагульненняў і г. д."[19] Сёння зразумела, што аб'ектыўныя сувязі — гэта сувязі класаў і з'яў, ідэальных аб'ектаў, вызначаючы гнасеалагічна, не што іншае, як рацыянальныя канструкцыі; вызначаючы эпістэмалагічна-тэарэтычныя схемы ў адносінах да рэчаіснасці, утварэнні якой канкрэтныя.

У падручніку для студэнтаў ВНУ і аспірантаў "Философия" пецярбургскіх аўтараў А. С. Карміна і Г. Г. Бярнацкага сцвярджаецца, што "паміж падзеямі гісторыі … існуюць некаторыя аб'ектыўныя залежнасці, якія ніякая свабода не можа змяніць. Падобныя залежнасці — гэта законы". Далей яны тлумачаць асаблівасці такіх законаў, але непаслядоўна, паколькі аўтары распавядаюць ужо пра гістарычныя заканамернасці, якія маюць статыстычны характар, і пра "суб'ектыўны фактар", які "ўваходзіць у сам змест аб'ектыўных законаў"[20]. Апошняя фармулёўка супярэчлівая, паколькі ўключэнне суб'ектыўнага аспекту ў аб'ектыўную з'яву робіць яе такой, што непрымальна яе характарызаваць як аб'ектыўную.

Некаторыя навукоўцы, якія займаліся праблемай гістарычных законаў, упэўнены, што для яе вырашэння неабходна выдзяленне розных форм гістарычных заканамернасцяў. Так, А. Я. Гурэвіч абгрунтоўвае погляд, паводле якога законы, якія дзейнічаюць у гісторыі, па ступені іх універсальнасці дзеляцца на асобныя групы: "1. Агульнасацыялагічныя законы … 2. Законы, якія з'яўляюцца агульнымі для некалькіх фармацый … 3. Законы (развіцця. — *Ю. Н.*) паасобных фармацый". У канчатковым выніку, паводле меркавання А. Я. Гурэвіча, усе яны — законы сацыялагічныя. Але толькі апошнія

---

[18] Кохановский В. П., Золотухин Е. Р., Лешкевич Т. Г., Фатхи Т. Б. Философия для аспирантов. Р.-на-Д., 2002. С. 288, 283.

[19] Методологические основы научного познания. М., 1972. С. 146.

[20] Кармин А. С., Бернацкий Г. Г. Философия. СПб., 2001. С. 279—280.

з іх — "спецыфічныя законы гісторыі" вывучаюцца гістарычнай навукай[21]. Такі пункт гледжання на гістарычныя заканамернасці прымальны, хаця ў ім ігнаруецца спецыфіка "падзейнай гісторыі".

Даводзячы да чытача свае высновы, што "законы гісторыі ўвогуле я называю грамадскімі законамі і ўмоўна падзяляю іх на гістарычныя і сацыялагічныя. Гістарычнымі можна называць законы, якія разгортваюцца на працягу якога-небудзь часу", Л. Я. Грынін выдзяляе, у прыватнасці, "законы агульначалавечага маштабу", а таксама звяртае ўвагу на "разнастайнасць шляхоў развіцця, мадыфікацый гістарычных законаў у сувязі са зменамі як у аб'ектыўных момантах, так і ў свядомасці людзей". Але яго наступны тэзіс "Гістарычныя законы пастаянна зменлівыя..."[22] абвяргае дапушчэнне пастуліравання законаў гісторыі грамадства. У ім змешваюцца паняцце закона як аб'ектыўнай сувязі жыццядзейнасці соцыумаў і паняцце закона як ведаў, з дапамогай якіх тлумачацца сувязі паміж з'явамі.

М. С. Розаў абгрунтоўвае метадалогію тэорыі гісторыі, патрэбную для ўстанаўлення сацыяльных і гістарычных законаў, якія ён выразна не адрознівае. Возьмем, напрыклад, першы з прапануемых ім законаў: "Кожны індывід канструіруе сваю ўласную суб'ектыўную рэчаіснасць"[23]. Такое сцвярджэнне з'яўляецца не сцвярджэннем пра сацыяльны або гістарычны закон, а хутчэй у ім выказваецца прэтэнзія на гнасеалагічнае палажэнне. Магчыма, падобныя распрацоўкі і маюць пэўную эўрыстычную карысць для пабудовы канцэпцый у межах міждысцыплінарнай галіны даследаванняў пад найменнем "тэорыя гісторыі" (гл. пра яе напрыканцы наступнага параграфа), але ніколькі не з'яўляюцца аргументам за наяўнасць гістарычных законаў у якасці вынікаў гістарычных даследаванняў.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ў даследаваннях у межах гістарычных дысцыплін не ўстанаўліваюцца такія вынікі даследавання, як законы (г. зн. веды пра сувязі паміж з'явамі, якія паўтараюцца

---

[21] Гуревич А. Я. Об исторической закономерности // Философские проблемы исторической науки. М., 1969. С. 51, 55.

[22] Гринин Л. Е. Философия, социология и теория истории (Опыт философско-социологического анализа некоторых общественных законов и построения теории всемирно-исторического процесса). Волгоград, 2000. С. 37, 53, 56, 329—330.

[23] Розов Н. С. Возможны ли "быстрые открытия" и накопление знаний в науке // Философские науки. Научное издание по философии, методологии и логике естественных наук. Новосибирск, 2002. С. 14.

для ўсяго класа разглядаемых з'яў), а законы, прапаноўваемыя гістарыёсафамі (напрыклад, закон выкліку і адказу, прапануемы А. Тойнбі), — спекуляцыі (псеўдаканструкцыі) у параўнанні з вынікамі строгага даследавання, тым не менш, маецца магчымасць, распрацоўваючы такі кірунак тэорыі гісторыі, як форму і залежнасць гістарычнага развіцця соцыумаў, устанаўліваць замест гістарычных законаў пэўныя эмпірычныя залежнасці, якія тычацца такой дзейнасці ў пэўны перыяд гісторыі (напрыклад, залежнасць прыросту насельніцтва краіны ад прыродных умоў).

## 2. АБ'ЕКТ І ПРАДМЕТ ГІСТАРЫЧНАГА ПАЗНАННЯ І ДАСЛЕДАВАННЯ

Асаблівасць гнасеалагічнага паняцця гістарычнага пазнання заключаецца ў тым, што яно ўтворана так, што ахоплівае сваім зместам не толькі канкрэтна-гістарычныя даследаванні і філасофскую рэфлексію, але і спецыяльна-гістарычныя даследаванні. Асаблівасць лагічнай структуры канкрэтна-гістарычнага даследавання заключаецца ў тым, што аб'ектамі дысцыплін, якія базіруюцца на такіх даследаваннях, выступаюць канкрэтна-гістарычныя з'явы (сведчанні аб якіх знаходзяць у крыніцах). Даследаванне ў межах большасці іншых навуковых дысцыплін, у параўнанні з гісторыкай, грунтуецца на лагічным агульнадысцыплінарным метадзе (спосабе пазнання), г. зн. даследаванні класаў прадметаў або тых момантах і аспектах з'яў, якія паўтараюцца. Канкрэтна-гістарычнае даследаванне ажыццяўляецца на аснове выкарыстання паняццяў, якія ўтвараюцца ў грамадазнаўчых дысцыплінах, у ім будуецца факталогія, храналогія і канцэпцыі канкрэтных гістарычных з'яў, але не будуецца тэорыя, г. зн. веды, арганізаваныя як сістэма, якая служыць інструментам практычнай дзейнасці і не з'яўляецца пэўным пунктам гледжання на з'явы, якія з дапамогай іх тлумачацца.

На першы погляд здаецца, што "гісторыя пазнае аб'ектыўную рэчаіснасць ... у такім значэнні гісторыя выступае як навука"[1]. Аднак, нягледзячы на тое, што аб'ект, на які першапачаткова накіравана пазнанне суб'екта (а гістарычнае пазнанне накіравана апасродкавана — праз крыніцы), — рэчаіснасць, якая знаходзіцца па-за межамі нашай свядомасці, мы, як суб'екты пазнання, ведаем рэчаіснасць толькі такой, якой "ствараем" яе, апрадмечваючы, аналітычна

---

[1] Иванов В. В. Методология исторической науки. М., 1985. С. 27.

назіраючы падзеі, іншы раз удзельнічаючы ў іх здзяйсненні, устанаўліваючы і абагульняючы факты, выкладаючы іх такім чынам, каб яны ўкладаліся ў пэўныя законы, мадэлі, тэорыі, канцэпцыі, тэарэтычныя і канцэптуальныя схемы. Ужо стагоддзе назад філосафамі было цвёрда засвоена, што "...мы ніколі не ведаем рэчаіснасці такой, якая яна ёсць на самой справе ... усякія веды ёсць ужо разам з тым ... перабудаванне рэчаіснасці"[2]. Сёння ж тыя, хто асэнсоўвае працэс пазнання, разумеюць не толькі розніцу паміж рэчаіснасцю і прадметнасцю (рэчаіснасцю, дадзенай суб'екту пазнання ў формах пачуццёвасці, мыслення і дзейнасці, ці, як прынята выражацца паводле традыцыі дыялектычнага матэрыялізму, — "практыкі"), г. зн. паміж аб'ектам і прадметам пазнання ("ведаць гісторыю і быць у ёй — розныя рэчы..."[3]), а і паміж рэчаіснасцю і рацыянальнасцю (г. зн. ведамі, тэрміналогіяй, фармалізаванай мовай, у якіх і з дапамогай якіх рэчаіснасць адлюстроўваецца).

Аднак, пакуль не адкарэлявана тэрміналогія, не выпрацаваны пераканаўча крытэрыі размежавання зместу паняццяў, у навуковай літаратуры не знікнуць гнасеалагічна невыразныя сцвярджэнні і прыблізныя разуменні. Возьмем, напрыклад, сцвярджэнне: "Аб'ект пазнання гістарычнай навукі — уся сукупнасць з'яў грамадскага жыцця на працягу ўсёй гісторыі грамадства"[4]. Вельмі складана і малавынікова разважаць пра аб'ект пэўнай сістэмы дысцыплін, у адрозненне ад разважання пра аб'ект пэўнага віду пазнання, і тым больш устанавіць яго (увогуле складана разважаць пра аб'ект пэўнай дысцыпліны ў цэлым, улічваючы тое, што адносна большасці дысцыплін выдзяляемы ўзроўні даследавання эмпірычны і тэарэтычны, у сувязі з чым аб'ект эмпірычнага даследавання — гэта звычайна пэўныя з'явы, а аб'ект тэарэтычнага даследавання — гэта, як правіла, пэўныя факты). Такая сукупнасць з'яў — гэта не аб'ект і не прадмет розных раздзелаў і галін яе, нават не прадмет так званай сусветнай гісторыі, гэта, хутчэй, адзін з прадметаў гістарыясофіі.

Пры ўжыванні выразу "аб'ект пазнання гістарычнай навукі" адсутнічае разуменне, што аб'ект пазнання — адна праблема, а аб'ект навуковай дысцыпліны — іншая, не кажучы ўжо пра разумен-

---

[2] Риккерт Генрих. Философия истории. С. 55; яго ж: Философия истории // Философия жизни. К., 1998. С. 208.

[3] Межуев В. М. Философия истории и историческая наука // История как объект философского знания. М., 1991. С. 5.

[4] Каханоўскі Алесь. Гісторыя. С. 33; яго ж: Гісторыя // БЭ. Т. 5. С. 274.

не розніцы філасофскага і нефіласофскага падыходаў да такога аб'екта рэфлексіі, як пазнанне. Устанаўленне і апісанне аб'екта і прадмета пазнання (і навуковага пазнання), абгрунтаванне суадносін паміж паняццямі пазнання і даследавання — справа гнасеалогіі. Вызначэнне аб'екатаў і прадметаў розных навуковых дысцыплін (г. зн. пэўных галін даследаванняў) — справа яе прадстаўнікоў; устанаўленне дысцыплінарнага статуса іх — справа навуказнаўцаў. Пры нефіласофскім (навуказнаўчым) падыходзе да прадмета даследавання ўстанаўліваецца не прадмет даследавання як сукупнасць ідэальных аб'ектаў (такі тэрмін ужывае ў сваіх эпістэмалагічных пабудовах В. С. Сцёпін) пэўнай дысцыпліны (такой сукупнасці адпавядае паняцце прадметнай галіны, якое ў межах логікі абазначаецца тэрмінам "універсум разважання"), а прадмет (тэматыка, праблематыка даследаванняў) пэўнай галіны даследаванняў. Паняцце такога прадмета мы, тэрміналагічна дыферэнцыруючы, прапануем падзяляць на паняцці прадметных рамак і прадметнага поля.

Да прадметнага поля пэўнай навуковай дысцыпліны (напрыклад, археаграфіі) або раздзела навукі (напрыклад, этнічнай гісторыі) мэтазгодна адносіць усё кола праблематыкі і тэматыкі, якія распрацоўваюцца ў іх межах (напрыклад, у прадметнае поле археаграфіі ўваходзіць распрацоўка правіл публікацыі гістарычных дакументаў старажытнага, сярэдневяковага, новага часу, распрацоўка метадалагічных прынцыпаў публікацыі гістарычных дакументаў і г. д.; у прадметнае поле этнічнай гісторыі ўваходзіць праблема рассялення славян, балтаў і іншых суперэтнасаў, праблема кантактаў балтаў і славян, маштабаў і глыбіні пранікнення іх асіміляцыі і г. д.).

Прадметныя рамкі пэўнай дысцыпліны — абагульненая фармулёўка праблематыкі (напрыклад, да прадметных рамак археаграфіі адносіцца методыка публікацыі пісьмовых гістарычных крыніц; этнічнай гісторыі — генезіс розных этнасаў). Дапушчальна і гранічна абагульненая фармулёўка прадметных рамак (напрыклад, прадмет археаграфіі — вывучэнне публікацыі гістарычных крыніц; прадмет этнічнай гісторыі — вывучэнне гістарычнага развіцця этнасаў).

Ёсць неадпаведнасць паміж філасофскім падыходам да вызначэння прадмета даследавання і навуказнаўчым устанаўленнем прадмета (прадметных рамак) пэўнай навуковай дысцыпліны. Аб'ект даследавання, які філасофскі вызначаецца як пэўная частка рэчаіснасці, нешта аб'ектыўна рэальнае, а прадмет даследавання як пэўныя характарыстыкі аспектаў аб'екта. Такая трактоўка іх не што іншае, як прынятая ў

межах гнасеалогіі трактоўка паняццяў аб'екта і прадмета пазнання, перанесеная ў навуказнаўчых дысцыплінах на паняцці аб'екта і прадмета даследавання. Сёння, як і раней, не толькі ў філасофскіх і ў навуказнаўчых працах даецца падобная трактоўка і адпавядаючая ёй дэфініцыя аб'екта і прадмета даследавання. Возьмем, напрыклад, дэфініцыю прадмета даследавання В. А. Шаршунова і Н. У. Гулько (дадзеную ў рамках прыкладнога навуказнаўства) як зафіксаванных у вопыце ўласцівасцяў і адносін аб'ектаў (чамусьці пра аб'ект даследавання яны кажуць у множным ліку). Дарэчы, няўдала фармулюецца імі трактоўка аб'екта даследавання: "Па адной і той жа тэме можа быць некалькі аб'ектаў. Значыць, тэма даследавання шырэй прадмета"[5], у якой змешваюцца паняцці аб'екта даследавання і тэмы яго як аб'екта канкрэтнага даследавання. Возьмем дэфініцыю прадмета даследавання У. К. Лукашэвіча (дадзеную ў рамках метадалогіі навукі), паводле якой ён — "цэласная сукупнасць узаемазвязаных устойлівых характарыстык аб'екта", а "ўстойлівыя характарыстыкі аб'екта — гэта тыя, якія неаднаразова ўзнаўляюцца ў рэчаіснасці..."[6]

Прадстаўнікі розных навуковых дысцыплін, нягледзячы на тое, што звычайна фармулююць вызначэнне аб'екта і прадмета даследавання ў адпаведнасці з нормамі філасофскага падыхода да іх, звычайна ўстанаўліваюць прадмет пэўнай навуковай дысцыпліны як абагульненне наяўнай у яе межах тэматыкі і распрацоўваемай праблематыкі, г. зн. насуперак прапаноўваемым імі дэфініцыям. Напрыклад, С. М. Каштанаў разумее аб'ект даследавання як "нешта матэрыяльнае", прадмет даследавання як задачы, мэты і метады даследавання, "рэканструкцыю працэсу", а прадмет археаграфіі вызначае не так, як належала вызначаць, разумеючы яго як прадмет даследавання ў адносінах да пэўнай дысцыпліны[7].

Лагічная структура канкрэтна-гістарычнага даследавання адрозніваецца ад лагічнай структуры даследавання ў большасці іншых навуковых дысцыплін. Гэта не звязана з тым, што ў гістарычным пазнанні з'явы даследуюцца праз апасродкаваныя эмпірычныя дадзеныя, дадзеныя гістарычных крыніц, сукупнасць якіх служыць умовай

---

[5] Шаршунов В. А., Гулько Н. В. Процесс научного творчества // Атэстацыя. 2002. № 5—6. С. 63.

[6] Лукашевич В. К. Основы методологии научного исследования. Мн., 2001. С. 39.

[7] Каштанов С. М. О предмете и объекте археографии // Отечественные архивы. 2002. № 3. С. 60—61.

для ўстанаўлення гістарычных фактаў, што абумоўлена спецыфікай аб'екта гістарычнага пазнання. Аб'ектам дапаможных гістарычных дысцыплін выступаюць не гістарычныя з'явы, а розныя віды гістарычных крыніц або метады іх апрацоўкі; аб'ектам гістарыяграфіі — сукупнасць канкрэтна-гістарычных даследаванняў. Аб'ектам раздзелаў і галін гісторыкі выступаюць канкрэтныя грамадскія з'явы (працэсы, падзеі, структуры і г. д.), не ўсе, а толькі з'явы гістарычныя, якія вызначаемы як з'явы мінулага, якія аказалі істотны ўплыў на станаўленне і ход развіцця грамадства.

Гнасеалагічна вызначаючы, аб'ектам пазнання ў цэлым, першапачатковым аб'ектам навуковага пазнання і аб'ектам эмпірычных дысцыплін бяруцца з'явы рэчаіснасці. Выдзяляемы розныя гістарычныя стандарты, тыпы і ідэалы навуковага пазнання (часта пры гэтым кажуць пра навуку, а не пра навуковае пазнанне). Нягледзячы на гэта, бесперспектыўна для вынікаў эпістэмалагічнага даследавання выдзяляць аб'екты розных тыпаў пазнання ў адрозненне ад аб'екта пазнання ў цэлым і аб'екта пэўных дысцыплін. Лагічна вызначаючы, у гістарычных, дакладней, у канкрэтна-гістарычных дысцыплінах, у адрозненне ад іншых, вывучаюцца канкрэтныя з'явы або іх тыпы, але не класы.

У XX ст. гісторыкі сталі не толькі вывучаць канкрэтныя гістарычныя з'явы, але і плённа распрацоўваць пытанні тыповых рыс сацыяльнай арганізацыі грамадства, даследаваць тыпы гаспадарання, ментальныя структуры, г. зн. праводзіць даследаванні ў форме "структурнай гісторыі". У гістарычных даследаваннях шырока ўжываецца палітыка-сацыяльны, эканамічны, сацыяльна-псіхалагічны і іншы грамадазнаўчы аналіз. Гэта паказвае на тое, што сацыяльная гісторыя, эканамічная гісторыя, гісторыя ментальнасцяў і г. д., калі наспела неабходнасць выдзяляць іх як асобныя навуковыя дысцыпліны, — ужо дысцыпліны сумежныя, якія распрацоўваюцца на стыку гістарычных і іншых сістэм дысцыплін. Сцвярджэнне "гісторыя — гэта адзіныя абсалютна канкрэтныя веды"[8] прымальна лічыць абгрунтаваным у адносінах да такой формы гістарычных даследаванняў, як "падзейная гісторыя", для тых даследаванняў, у якіх выкладаюцца канкрэтныя гістарычныя падзеі.

Гісторыя, калі разумець пад тэрмінам "гісторыя" абазначэнне паняцця ўсяго развіцця з'яў грамадства ў мінулым як цэласнага працэсу — прадмет не даследавання, а рэфлексіі, г. зн. філасофскага пазнання. Адшукванне заканамернасцяў развіцця сусветна-гістарычнага

---

[8] Гурина Мишель. Философия. М., 1998. С. 500.

працэсу было першапачаткова справай гістарыясофіі. Нельга прадбачыць і на аснове абагульнення фактаў, і з дапамогай строгіх метадаў (нават калі зыходзіць з імавернаснага падыходу да прадказання з'яў) тое, як будзе развівацца грамадства ў неабсяжнай будучыні. Тэорыю, паводле якой нельга прадказваць падзеі, нельга адносіць да навуковай (гэта не тычыцца логікі, матэматыкі, у межах якіх будуюцца спецыяльныя навуковыя тэорыі, для якіх непатрэбна функцыя прадказання), нягледзячы на тое, што ў яе ўключаюць законы.

Аналіз лагічнай структуры гістарычнага пазнання паказвае на тое, што тэорыю сусветна-гісторычнага працэсу немагчыма ператварыць у навуковую тэорыю з поўным наборам уласцівых для навуковай тэорыі функцый, г. зн. у дадзеным ракурсе — у тэорыю, якая мае функцыю прадказання, нават калі абапірацца пры яе распрацоўцы на прагностыку (галіну даследаванняў, якая асновай мае інфарматыку, сінергетыку, тэорыю дынамічнага праграміравання, тэорыю катастроф, тэорыю гульняў, тэорыю выпадковых працэсаў)[9]. Нельга прадказваць на аснове заканамернасцяў канкрэтны ход развіцця сусветна-гістарычнага працэсу, грамадскіх з'яў, паколькі немагчыма прадбачыць, якія здабыткі матэрыяльнай культуры, вынікі тэхналагічнага прагрэсу будуць дасягнуты, якія канкрэтныя касмічныя, геапалітычныя з'явы і г. д. магчымы адбыцца. Тое, што тэарэтычныя распрацоўкі сусветна-гістарычнага працэсу не могуць служыць інструментам практычнай дзейнасці, паказвае на памылковасць класіфікацыі такіх распрацовак, як тэорыі; іх дапушчальна характарызаваць як канцэпцыі.

Ёсць розныя погляды на тое, што разумець пад тэорыяй гісторыі. Гісторыкі, якія выкладаюць гісторыказнаўчыя погляды, звычайна выкарыстоўваюць гісторыказнаўчыя тэрміны, ніяк іх не характарызуючы і не апісваючы дэфінітыўна. Зразумела, гэта не іх справа. Так, Л. Мізэс у кнізе "Теория и история" разглядае праблемы і пытанні філасофіі гісторыі, дэтэрмінізму і матэрыялізму, філасофскай інтэрпрэтацыі гісторыі, сэнсу і каштоўнасці вывучэння гісторыі і г. д., г. зн. праблемы і пытанні, з якіх зразумела, што для кнігі больш падыходзіць назва "Тэорыя гісторыі"[10]. Філасофы-герменеўтыкі ўвогуле разумеюць пад гістарычнай тэорыяй галоўным чынам

---

[9] Бетяев С. И. Прогностика: первые шаги науки // Вопросы философии. 2003. № 4. С. 5.

[10] Мизес фон Людвиг. Теория и история. Интерпретация социально-экономической эволюции. М., 2001.

“найбольш ёмісты па магчымасцям рэпрэзентацыі катэгарыяльна-паняційны аппарат гістарычнай навукі”[11]. Гэта звязана з тым, што філосафы-герменеўтыкі замест гістарыясофіі прапануюць герменеўтыку ў якасці метадалагічнага базісу навук пра дух[12]. У савецкі час тэорыя гісторыі звычайна не выдзялялася з метадалогіі гісторыі, якая мела ў сваёй аснове вучэнне гістарычнага матэрыялізму.

Гісторыказнаўцы найчасцей ужываюць тэрмін “гістарычная тэорыя” ў значэнні навукова-тэарэтычных ведаў у прымяненні да гісторыкі. Беларускі гісторык М. А. Сакалова ўдакладняе адрозненне тэорыі гісторыі, г. зн. “канцэптуальных мадэляў гістарычнага працэсу” і гістарычнай тэорыі — “сістэмы тлумачэння, якія ўключаюць некалькі гіпотэз аб пэўным класе аб’ектаў”[13]. Нагадаем, што канцэпцыі гістарычнага працэсу выпрацоўваюцца ў межах гістарыясофіі. Калі вызначаць тэорыю як сістэму ведаў, а тлумачэнне як пэўную функцыю ведаў (гл. напрыканцы п. 6), то з пункту гледжання адкарэліраванай навуказнаўчай тэрміналогіі дакладней казаць пра тэорыю як веды (а не як пра тлумачэнне), якія тлумачаць з’явы. Акрамя таго, у гістарычным даследаванні вывучаюцца канкрэтныя з’явы, а не класы прадметаў. Тэорыя — сістэма ведаў, якая будуецца адносна аб’ектаў, якія лагічна вызначаюцца як класы прадметаў. У адпаведнасці з гэтым у гісторыцы і ў гістарыясофіі немагчыма атрымаць такі вынік даследавання, які б класіфікаваўся як тэорыя (у выпадку, калі прытрымлівацца строга карэляцыйна эксплікаванага паняцця тэорыі). Тэарэтычныя веды ў гісторыцы маюць форму канцэпцый (гл. п. 4).

Належыць адрозніваць негістарыясофскія канцэпцыі развіцця сусветнага грамадства (а таксама і асобных цывілізацый, геапалітычных рэгіёнаў і г. д.), у якіх раскрываюцца механізмы і заканамернасці развіцця грамадства, і на аснове якіх магчыма з пэўнай імавернасцю прадбачыць бліжэйшую будучыню, і якія іншы раз няўдала абазначаюцца як “тэорыя гісторыі”, і тэарэтычныя веды і падыходы грамадазнаўчых дысцыплін, што выступаюць у якасці метадалогіі правядзення гістарычнага даследавання. Увогуле, “тэорыя гісторыі” — супя-

---

[11] Лойко Л. Е. Герменевтика и историческая теория // Философы XX века. Ханс-Георг Гадамер. Материалы республиканских чтений-5. Мн., 2002. С. 136.

[12] Гадамер Х.-Г. Истина и метод. Основы философской герменевтики. М., 1988.

[13] Сакалова Марыяна. Першы дапаможнік па метадалогіі // Беларускі гістарычны агляд. Т. 4. Сш. 1—2. Снежань. 1997. С. 221.

рэчлівы тэрмін, паколькі гісторыя — гэта развіццё грамадства ў мінулым, а навуковая тэорыя — сістэма ведаў, адной з функцый якой з'яўляецца прадказанне.

М. Ф. Румянцава ўжывае выразы "тэорыя гісторыі", "тэорыя гістарычнага працэсу", "гістарычная тэорыя" ў аднолькавым значэнні. У гл. 2 першага раздзела вучэбнага дапаможніка "Теория истории" ёю выдзяляецца параграф "З якіх структурных элементаў будуецца тэорыя і што ў ёй галоўнае". Галоўным яна лічыць чалавека як суб'екта гістарычнага працэсу, важнейшымі элементамі — мэты гістарычнага пазнанння і катэгорыю часу. М. Ф. Румянцава сцвярджае: "Існуюць 2 тыпы тэорый гістарычнага працэсу: разумова-філасофскія і канкрэтна-гістарычныя", блытаючы тым самым паняцці спосабаў пабудовы навуковых тэорый і тыпаў гістарычных даследаванняў. Пазнаёміўшыся са зместам дадзенага параграфа, чытачы застануцца ў поўным няведанні наконт структуры тэорыі, што невыпадкова, паколькі аўтар яго не паказала і элементарных ведаў пра структуру навуковых ведаў. Сярод іншага выклікае здзіўленне выснова М. Ф. Румянцавай пра тое, што Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. не прывяла да змены грамадска-палітычнай фармацыі[14]. У гэтым мы ўбачылі і здзекаванне над папярэднімі ідэаламі.

Найбольш сур'ёзную спробу абгрунтаваць паняцце гістарычнай тэорыі сярод савецкіх метадолагаў гісторыі зрабілі Г. М. Іваноў, А. М. Коршунаў і Ю. А. Пятроў. Яны вызначылі 7 асноўных адзнак тэорыі як формы навуковага пазнання, у тым ліку першай адзнакай узялі "сістэматызацыю ведаў пра некаторы клас аб'ектаў", не звяртаючы ўвагі на тое, што ў адпаведнасці з гэтай адзнакай у гісторыцы немагчыма пабудаваць тэорыю. Больш таго, яны робяць выснову, паводле якой "...тэорыя ёсць абагульненыя і сістэматызаваныя веды пра клас аднародных фактаў, якія выражаюцца ў форме закона". Такое сцвярджэнне памылковае з пункту гледжання логікі і гнасеалогіі, паколькі разважаць карэктна пра класы прадметаў і сукупнасці фактаў, але не пра класы фактаў. Акрамя таго, у сцвярджэнні атаясамліваюцца тэорыі і законы: навуковая тэорыя ў іх — сістэма ведаў, а веды праяўляюцца як закон. Яшчэ яны робяць выснову пра тое, што гістарычная тэорыя "...хутчэй адносіцца да класа генетычных гістарычных тэорый, якія пабудаваны на абагульненні вялізнага

---

[14] Румянцева М. Ф. Теория истории. Учебное пособие. М., 2002. С. 32—33, 36, 37, 43, 57.

матэрыялу вопытных дадзеных (фактаў)"[15]. Але эмпірычная тэорыя — супярэчлівы пазнавальны змест, улічваючы тое, што тэарэтычныя і эмпірычныя веды — гэта супрацьлеглыя паняцці.

Нягледзячы на тое што імкненне распрацоўваць тэорыю ў межах гістарычных дысцыплін з'яўляецца недарэчнасцю, а распрацоўка тэорыі гісторыі — справа не гісторыкаў, сёння прадпрымаецца спроба неспекулятыўнай распрацоўкі тэорыі сусветна-гістарычнага працэсу ў межах тэорыі гісторыі як міждысцыплінаранай галіны даследаванняў. Такая галіна фарміруецца на стыку палітэканоміі, палітычнай сацыялогіі, этнасацыялогіі, сацыяльнай псіхалогіі, футуралогіі і гістарыясофіі. Тэорыя гісторыі — працяг і альтэрнатыва гістарыясофіі. У яе межах прадказваюцца тэндэнцыі развіцця грамадства ў агляднай будучыні. У якасці прыкладу распрацоўкі па тэорыі гісторыі спашлёмся на 2-ю і 3-ю часткі працы Л. Я. Грыніна "Философия, социология и теория истории" (Валгаград, 2000), якая падаецца як вучэбны дапаможнік для студэнтаў па сацыяльнай філасофіі і сацыялогіі. Л. Я. Грынін у гэтай працы выкарыстоўвае тэрміны "тэорыя гісторыі" і "тэорыя гістарычнага працэсу" як раўназначныя, аднак уключае ў распрацоўку па тэорыі гісторыі і глабальныя праблемы чалавецтва, і праблемы сучаснага і будучага развіцця грамадства, тым самым надаючы тэорыі гісторыі шырокія прадметныя рамкі. Л. Я. Грынін не абгрунтоўвае прадметныя рамкі тэорыі гісторыі як галіны даследаванняў, толькі выдзяляе тры галіны даследаванняў, звязаных з сусветнай гісторыяй, — філасофію гісторыі, сацыялогію гісторыі і тэорыю гісторыі.

Расійскі гісторык Н. Б. Сялунская, адзначаючы, што "сучасны стан гістарычнай навукі, вызначальныя тэндэнцыі яе развіцця не ствараюць фону, клімату, глебы для татальных тлумачальных мадэляў", указвае на "...неабходнасць пошуку некаторага метадалагічнага кансенсусу на падставе сінтэзу розных тэорый, каб не дапусціць усведамляемай небяспекі "парушэння адзінства гістарычных ведаў"[16]. На наш погляд, нягледзячы на ўзнікаючыя і змяняючыя адзін другога кірункі гістарычнага тлумачэння — гістарыцысцкі, сцыентысцкі, культуралагічны, належыць адрозніваць не толькі фор-

---

[15] Иванов Г. М., Коршунов А. М., Петров Ю. А. Методологические проблемы исторического познания. М., 1981. С. 215—216, 223.

[16] Селунская Н. Б. К проблеме объяснения в истории // Проблемы источниковедения и историографии. Материалы научных чтений памяти академика И. Д. Ковальченко. М., 2000. С. 52—53.

мы традыцыйнага гістарычнага даследавання — “гісторыю падзей” і “гісторыю структур”, але і розныя галіны даследаванняў: тыя, якія арыентаваны на вывучэнне канкрэтных з’яў, і тыя, якія арыентаваны на вывучэнне іх тыпаў, з акцэнтам на тлумачэнні іх.

Такім чынам, адрозніваючы паняцці аб’екта пазнання і даследавання ад паняцця аб’екта навуковай дысцыпліны, належыць усведамляць мэты, якія ставяцца пры распрацоўцы праблем аб’екта пазнання і даследавання і аб’екта пэўнай дысцыпліны. У першым выпадку мэта — паказаць, раскрыць адносіны пазнання і ведаў да рэчаіснасці; у другім — акрэсліць абстрактны аб’ект, адметны для пэўнай навуковай дысцыпліны, які б дазваляў адрозніваць яе па наяўнасці такога аб’екта ад іншых навуковых дысцыплін. Пры навуказнаўчым апісанні такога аспекту даследавання, як прадмет дысцыпліны, аптымальна выкарыстоўваць наступныя тэрміны: “прадметнае поле навуковай дысцыпліны” — у значэнні сукупнасці тэматыкі і праблематыкі, распрацоўваемых у кагнітыўных межах дысцыпліны; “прадметныя рамкі навуковай дысцыпліны” — абагульненая фармулёўка “прадметнага поля дысцыпліны” (“прадметныя рамкі навуковай дысцыпліны” акрэсліваюць яе кагнітыўныя межы); “прадметная галіна навуковай дысцыпліны” — сукупнасць пазнавальных зместаў ці кагнітыўных аб’ектаў (эмпірычных і тэарэтычных), якія выкарыстоўваюцца ў яе кагнітыўных межах.

## 3. ГІСТОРЫКАЗНАЎЧАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ

Сярод мноства значэнняў, у якіх ужываецца слова “гісторыя” [напрыклад, А. А. Ільін на пачатку працы “Философия истории” (М., 2003) выдзяляе 6 асноўных сэнсаў канцэпта “гісторыя”: 1) апавяданне, 2) падзея, 3) працэс развіцця, 4) сацыяльнае жыццё, 5) мінулае, 6) вывучэнне мінулага], пры асэнсаванні галіны гістарычнага пазнання звычайна засяроджваюць увагу на двух яго значэннях: адно з іх — паняцце мінулых грамадскіх з’яў, другое — паняцце апавядання пра гэтыя з’явы. У першым выпадку тэрмін “гісторыя” выкарыстоўваецца ў якасці сіноніма тэрміна “гістарычныя з’явы”, у другім — сіноніма тэрміна “гістарычнае апавяданне”. Заўважым, што апавяданне ў летапісах і іншых гістарычных крыніцах — тых, якія Л. М. Пушкароў класіфікуе як гістарычныя апавядальныя пісьмовыя гістарычныя

крыніцы[1], уяўляюць сабой не толькі апісанні падзей, але і пэўныя тлумачэнні іх (паводле падзелу гістарычнага даследавання М. Уайта[2], яны змяшчаюць "хроніку" — эмпірычныя выказванні і "гісторыю" — тлумачальныя выказванні).

Г. В. Ф. Гегель ужываў тэрмін "гісторыя" для абазначэння і паняцця здзейсненага мінулага і паняцця гістарычнага апавядання; разам з тым для абазначэння апошняга паняцця ён выкарыстоўваў і тэрмін "гістарыяграфія"[3]. Пасля такое тэрмінаўжыванне стала агульнапрынятым. У адпаведнасці з ім атрымліваецца, што ранняе летапісанне — таксама гістарыяграфія насуперак этымалагічнаму значэнню тэрміна (разгляд апавяданняў пра мінулае) і нягледзячы на тое, што ранняе летапісанне па спосабу вывучэння гістарычнага матэрыялу некрытычна, а па зместу яно (уключаючы і працы Герадота) легендарна (ці міфалагічна). Апошнюю акалічнасць адзначалі, дарэчы, удзельнікі міжнароднай канферэнцыі 23—24 красавіка 1998 г. "Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання", прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты.

Паступова прадстаўнікі заходнееўрапейскай філасофіі гісторыі адмовіліся ад ужывання тэрміна "гістарыяграфія" для абазначэння любога апавядання пра мінулае, разам з тым яны пачалі абгрунтоўваць (пачынаючы з Э. Бернхэйма) ідэю гістарыяграфіі як навукі аб гістарычнай думцы, лічачы, што гісторыя (г. зн. апавяданне пра мінулае) толькі праз гістарыяграфію (гістарычную думку разам з яе вывучэннем) пераўтворыцца ў навуку. Р. Дж. Калінгвуд, як і Г. В. Ф. Гегель, не адрозніваў тэрміны "гісторыя" і "гістарыяграфія" ў плане супрацьпастаўлення іх значэнняў для абазначэння паняццяў апавядання пра мінулае грамадства і вывучэння такіх апавяданняў, затое ён паклаў пачатак традыцыі адрознення навуковай гістарыяграфіі і данавуковай квазігістарыяграфіі[4]. Э. Бернхэйм і Р. Дж. Калінгвуд адносілі да гістарыяграфіі як даследаванні, так і наратывы, выдзяляючы навуковую гістарыяграфію па наяўнасці ў апавяданнях пра мінулае навуковай думкі. М. Мандэльбаум стаў адрозніваць гістарыяграфію як веды пра гістарычныя з'явы ад наратыву[5], аддзяляючы навукова-гістарычную думку,

---

[1] Пушкарев Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории. М., 1971. С. 267.
[2] White M. Foundetions of historical khowledge. N-Y.—L., 1965.
[3] Гегель Г. В. Ф. Философия истории. Соч. Т. 8. М.—Л., 1935.
[4] Коллингвуд Р. Дж. Идея истории. Автобиография. М., 1980.
[5] Mandelbaum M. Problem of historical khowledge. N-Y., 1938.

г. зн. веды, атрыманыя з дапамогай крытычных метадаў даследавання, ад данавуковай думкі пра мінулыя грамадскія з'явы. Такі погляд дазваляе абгрунтоўваць гісторыю (г. зн. сферу здабывання ведаў аб мінулым грамадства) як навуку ў якасці гістарыяграфіі. Пры такім разуменні і абгрунтаванні гістарыяграфіі не пераадольваецца, аднак, поўнасцю гегелеўскі "панлагізм", у прыватнасці погляд, паводле якога думка належыць як да суб'екта пазнання, так і з'яўляецца аб'ектам для апошняга; пры такім разуменні гістарычная думка — і аб'ект, і прадмет пазнання. Паводле Э. Бернхэйма, гістарыяграфія як навука аб гістарычнай думцы аформілася ў XVIII—XIX стст.[6] Але ідэя гістарыяграфіі як навукі пра гістарычнае мысленне атрымана ў межах спекулятыўнага тыпу рэфлексіі.

Складанасць адрознівання паняццяў, якія абазначаюцца тэрмінамі "гісторыя" і "гістарыяграфія", пры тым што не выпрацаваны выразныя крытэрыі адрознівання гістарычнага даследавання ад наратыву, павялічваюцца тым, што зусім акрэсліць мяжу паміж навуковымі тлумачэннямі гістарычных з'яў і данавуковымі вельмі складана. У старажытным летапісанні мы знаходзім розныя тлумачэнні гістарычных з'яў, хаця ў ім, зразумела, адсутнічае абгрунтаваная даследчая праблематыка, не ўжыты крытычныя метады пры пазнанні з'яў, але могуць быць наяўныя вынікі пэўнай гістарыяграфічнай працы. Так, калі Баркулабаўская хроніка (летапіс) — толькі наратыў і апавядальная гістарычная крыніца (паводле зместу яна, па тэрміналогіі Г. В. Ф. Гегеля, — "першапачатковая гісторыя"), то "Хроніка" М. Стрыйкоўскага — не толькі наратыў, але і абагульненне іншых наратываў, вынік гістарыяграфічнай працы, некрытычнага, "стыхійнага" даследавання гістарычных апавяданняў.

Паводле гегелеўскага варыянта тыпалагізацыі гістарычных даследаванняў (або "класіфікацыі пісьмовай гісторыі па метадах даследавання"[7]), дадзеную "Хроніку" належыць аднесці да двух з 4 падвідаў "рэфлектыўнай гісторыі": да "ўсеагульнай гісторыі" і да "крытычнай гісторыі" ("гістарыяграфіі гісторыі"); паводле тыпалагізацыі гістарычных даследаванняў Э. Бернхэйма, яе (як і Баркулабаўскі летапіс) прымальна адносіць да "рэфлектыўнай гістарыяграфіі". З гэтага пункту гледжання творы, падобныя "Хроніцы", неаптымальна

---

[6] Bernheim Lehrbuch der Historischen Methode and der Geschichtsphilosophie. Leipzig, 1903. H. 26—37.

[7] Уилкинз Б. Т. Гегелевская философия истории // Современные исследования по философии истории. М., 1977. Ч. 1. С. 102.

адносіць да канкрэтна-гістарычных даследаванняў і вызначаць як пэўную гістарыяграфію, а прымальна класіфікаваць толькі як спецыфічную форму наратыву. Калі разумець пад гістарыяграфіяй не спецыяльную навуковую дысцыпліну, якая вывучае канкрэтнае развіццё гісторыкі, у тым ліку і развіццё канцэпцый гістарычных з'яў, а атаясамляць з ёю пазнавальную дзейнасць так званай гістарычнай навукі па пабудове такіх канцэпцый і яе вынікі, то тады "Хроніку" належыць аднесці да прадгістарыяграфіі, і не больш таго, нягледзячы на тое, што яна ўкладзена ў XVII ст., у тым стагоддзі, на працягу якога былі выпрацаваны строгія прынцыпы і крытычныя метады канкрэтна-гістарычнага даследавання"[8].

Пазнавальную дзейнасць з выкарыстаннем выразнага паняційнага апарату і крытычных метадаў даследавання гістарычных з'яў не абавязкова абазначаць тэрмінам "гістарыяграфія", асабліва ўлічваючы тое, што такое слова ўжываецца і ў якасці назвы пэўнай навуковай дысцыпліны. У працэсе развіцця гістарычных дысцыплін вывучэнне пісьмовых крыніц на аснове абагульнення вопыту крытыкі іх, з мэтай рэканструкцыі гістарычных з'яў, было выдзелена ў асобную дысцыпліну пад найменнем "крыніцазнаўства"(сярод савецкіх вучоных С. Н. Валк у 1940 г. упершыню аддзяліў крыніцазнаўства ад іншых навуковых дысцыплін і вызначыў яе як "агульнае вучэнне пра дакумент"[9]). Вывучэнне канкрэтна-гістарычных даследаванняў, якое ўключае прадметны аналіз іх зместу, вылучана ў самастойную галіну даследаванняў пад найменнем "гістарыяграфія". У гістарыяграфічным даследаванні вывучаецца прадметна-змястоўнае ажыццяўленне такіх працэдур канкрэтна-гістарычнага даследавання, як выбар тэмы, пастаноўка праблемы, устанаўленне, крытыка і верыфікацыя гістарычных фактаў, аб якіх у крыніцах няма сведчанняў, ацэнка розных інтэрпрэтацый крыніц і розных тлумачэнняў гістарычных фактаў і іншых працэдур у канкрэтных даследаваннях, але не тыпы і лагічная структура такіх працэдур. У ім асвятляецца, як і якія філасофскія ідэі паўплывалі на змяненне форм гістарычных даследаванняў, але не паказваецца развіццё такіх ідэй, не ажыццяўляецца логіка-метадалагічны аналіз такіх форм.

Пэўная частка гісторыкаў, слушна адносячы метадалагічныя і эпістэмалагічныя тэмы да галіны філасофіі, у сваіх працах не пазбег-

---

[8] Блок М. Апология истории или ремесло историка. М., 1986. С. 48.

[9] Пронштейн А. П., Данилевский И. П. Вопросы теории и методики исторического исследования. М., 1986.

лі закранання такіх тэм. Так, М. Блок у кнізе "Апология истории или ремесло историка", дэкларатыўна размяжоўваючы рэфлексію над дзейнасцю гісторыкаў і філасофію, не вытрымлівае такога размежавання, паколькі разважае пра значэнне слова "гісторыя", дае нарыс логікі крытычнага метаду, робіць метадалагічныя заўвагі адносна гістарычнага даследавання наогул, г. зн. займаецца філасофіяй. Магчыма пры жаданні параўнаць М. Блока з мальераўскім персанажам, які не ведаў, што размаўляе прозай, але тут зноў справа ў недасканаласці гісторыказнаўчай тэрміналогіі. Абгрунтоўваючы метад гістарычнага назірання, М. Блок лічыў, што шмат якія сляды мінулага даступны прамому назіранню і таму тэарэтыкі гісторыі памыляюцца, сцвярджаючы пра аддаленасць аб'екта пазнання ад даследчыка[10]. Аднак у такім разважанні ён блытае інтэнцыю (накіраванасць) даследчыка на аб'ект і прадмет даследавання.

Прывядзём найбольш распаўсюджаныя значэнні некаторых гісторыказнаўчых тэрмінаў. "Гісторыя" — апавяданне пра мінулае; "гістарыяграфія" — вывучэнне гістарычных даследаванняў, у тым ліку і такіх апавяданняў; сукупнасць гістарычных даследаванняў, аб'яднаных агульнымі рысамі; тлумачэнне і навуковае даследаванне з'яў мінулага і яго вынікі; гістарычная навука; "хроніка" — такое апавяданне пра мінулае, у якім з'явы яго толькі апісваюцца; "наратыў" — гістарычнае апавяданне, у якім яны яшчэ і тлумачацца. Вынікі канкрэтна-гістарычных даследаванняў могуць падавацца ў форме наратыву (апавядання), а не толькі ў форме праблемнага разгляду, як веды пра мінулае грамадства, атрыманыя на падставе крытычных метадаў, інакш кажучы — як навукова абгрунтаванае апавяданне пра мінулае. Невыпадкова Г. А. Вінклер заўважыў, што "апавяданне таксама можа быць аналізам"[11], насуперак меркаванням У. Дрэя, для якога "апавяданне само па сабе не ёсць форма тлумачэння"[12]. "Наратывы", зыходзячы з класіфікацыі Л. М. Пушкарова, — гістарычныя апавядальныя пісьмовыя гістарычныя крыніцы (іншы тып пісьмовых крыніц, чым дакументальныя крыніцы). Паводле гэтай класіфікацыі дапушчальна адносіць да гістарычных крыніц таксама і навуковыя працы, у тым ліку і даследаванні, паводле

---

[10] Блок М. Апология... С. 31—32.

[11] Историческая наука в XX в. Историография истории нового и новейшего времени стран Европы и Америки. М., 2002. С. 411.

[12] Современные исследования по методологии истории. Реферативный сборник. М., 1977. Ч. II. С. 7.

Л. М. Пушкарова, гэта будуць навуковыя апавядальныя пісьмовыя гістарычныя крыніцы. Такое аднясенне зусім прымальнае ў тых выпадках, калі ў іх апавядаецца пра мінулае на падставе ўласных назіранняў аўтараў — удзельнікаў тых падзей, а таксама на падставе выкарыстання крыніц, якія страчаны. Вывучэннем гістарычных крыніц займаюцца, зразумела, у межах крыніцазнаўства; у выпадку вывучэння канцэпцый, наяўных у наратывах, належыць вызначаць такі разгляд, як гістарыяграфічнае крыніцазнаўства або крыніцазнаўчую гістарыяграфію.

Каб пазбегнуць бязглуздзіцы, што наяўнае пры сучасным выкарыстанні тэрміналогіі, з дапамогай якой апісваецца гістарычнае пазнанне, патрэбна яе ўпарадкаванне, прычым з увядзеннем новых тэрмінаў. Належыць адмовіцца, на наш погляд, ад выкарыстання выразу "гістарычная навука" ў якасці назвы сістэмы гістарычных дысцыплін. Ужываць слова "гістарыяграфія" толькі ў якасці наймення спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны, у якой вывучаецца развіццё розных кірункаў і раздзелаў гісторыкі. Для абазначэння вывучэння гісторыкамі пэўнай гістарычнай тэмы або праблемы маецца выраз "гістарыяграфія тэмы (праблемы)". Паняцце спецыфічнага дыскурсу, дзейнасці па пабудове гістарычных канцэпцый і яе вынікі абазначаць не тэрмінам "гістарыяграфія", а іншым, напрыклад "гістарыялогія". Слова "гісторыя" ўжываць у якасці гісторыказнаўчага тэрміна, толькі для абазначэння паняцця сукупнасці мінулых грамадскіх з'яў. Гэты тэрмін шырока распаўсюджаны ў гістарыясофіі ў якасці універсаліі як сродак ажыццяўлення рэфлексіі ў яе межах, але ён не вельмі прыдатны для патрэб гісторыказнаўчага апісання.

Калі зыходзіць з наступных значэнняў тэрмінаў: "гісторыя" — развіццё грамадства ў мінулым, "гісторыка" — навуковая дысцыпліна, якая складаецца з мноства раздзелаў і галін, у якіх вывучаюцца гістарычныя з'явы; "гістарыяграфія" — галіна даследаванняў, у якой вывучаецца развіццё гістарычных даследаванняў, то і ў найменнях раздзелаў гісторыкі больш аптымальна выкарыстоўваць слова "гісторыка", а не "гісторыя". У выпадку перанясення такой гісторыказнаўчай тэрміналогіі на мову навуковага абарачэння, кажучы пра "гісторыю Беларусі", трэба мець на ўвазе мінулае дзяржавы Рэспублікі Беларусь, а кажучы "гісторыка Беларусі" — раздзел навуковай дысцыпліны, у межах якой даследуецца такое мінулае.

Разуменне гістарыялогіі як дзейнасці, якая заключаецца ў пабудове гістарычных канцэпцый (і шырэй — як сферы пабудовы іх), даз-

валяе праводзіць пэўную тэрмінакарэкцыю. Напрыклад, у сказе: "Сёння ў гістарыяграфіі няма спрэчак адносна яе (так званай гістарычнай Літвы. — *Ю. Н.*) абсягу..."[13] замест тэрміна "гістарыяграфія" аптымальней ужываць тэрмін "гістарыялогія".

Такім чынам, з прычыны таго, што гісторыказнаўчая тэрміналогія дакладна не ўстаноўлена, гісторыказнаўчае апісанне атрымліваецца невыразным і дастаткова адвольным. Так, паўсюдна ўжываецца выраз "апісанне падзей", хаця калі падыходзіць да ўстанаўлення значэння тэрмінаў больш строга, то належыць казаць пра "рэканструкцыю падзей" і "гістарычнае апісанне", але не пра "апісанне падзей", паколькі апісанне — функцыя навуковых ведаў, у тым ліку і такіх форм іх, як канцэпцыя і факт, але не метад даследавання.

## 4. ГІСТАРЫЧНЫЯ ФАКТЫ І КАНЦЭПЦЫІ

Аглядаючы асноўныя значэнні тэрміна "канцэпцыя", якія ўжываюцца навуказнаўцамі (пэўны спосаб разумення, трактоўка якога-небудзь прадмета; асноўны пункт гледжання на вывучаемы прадмет; кіруючая ідэя для сістэматычнага асвятлення пэўнага прадмета; адзіная пэўная задума, галоўная ідэя даследавання; сістэма поглядаў на тое ці іншае разуменне з'яў і працэсаў), для мэт навуказнаўчага даследавання мы сфарміруем наступнае вызначэнне паняцця канцэпцыі: канцэпцыя — сістэма ведаў, у якой абгрунтоўваецца асноўны пункт гледжання на даследуемыя з'явы. Гістарычныя канцэпцыі з'яўляюцца асноўным вынікам гістарычнага даследавання.

Такія вынікі гістарычнага даследавання, як канцэпцыі пэўнай гістарычнай з'явы, нескладана адрозніваць ад гістарыяграфічных ведаў, атрыманых пры аналізе пабудовы такіх канцэпцый пэўнымі даследчыкамі. Напрыклад, пры вырашэнні праблемы генезісу ВКЛ Г. Лаўмянскім атрымана канцэптуальнае палажэнне аб тым, што ў ВКЛ літоўскага баярства было намнога больш чым рускага. Гістарыяграфічныя веды адносна канцэпцыі польскага гісторыка заключаюцца ва ўстанаўленні таго, з дапамогай якіх метадаў і на аснове якіх

---

[13] Краўцэвіч А. Дыскусія ці сварка? Пра магчымасць дыялогу паміж беларускімі і летувіскімі гісторыкамі // Гістарычны альманах. 2001. Т. 5. С. 171.

ведаў яна створана: на аснове палажэння пра тое, што "палітычная ўлада асобных тэрыторый вырашалася гушчынёй і якасцю рыцарскага, баярскага насельніцтва"[1]; больш таго, "...Лаўмянскі ўжываў для акрэслення этнічнай прыналежнасці ... шляхты крытэрый канфесійнай прыналежнасці"[2].

Калі зыходзіць з элементарнай тыпалогіі гістарычных ведаў (эмпірычныя — тэарэтычныя), то канцэптуальныя палажэнні ў лагічнай структуры гістарычых ведаў належыць адносіць да тэарэтычных ведаў. Як эмпірычныя веды, тады характарызуемы не толькі вынікі крытыкі дадзеных крыніц, але і вынікі аналітычнага назірання падзей, якія зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах. Выдзяленне тэарэтычнага і эмпірычнага ўзроўняў даследавання (навуковага пазнання) і ўвязванне з імі адпаведных ведаў вядзе да тэрміналагічных супярэчнасцяў, бо ў такім выпадку ў склад тэорыі (а ў гісторыцы — у склад "усечанай" тэорыі — канцэпцыі) уключаюцца веды, якія характарызуюцца як эмпірычныя веды. Увогуле, як магчыма казаць пра тэарэтычныя веды ў гісторыцы, калі ў ёй не ствараюцца тэорыі. Дастаткова казаць толькі пра веды, якія атрымліваюцца на тэарэтычным ўзроўні даследавання.

Факты — пэўныя веды, якія звычайна дэфініруюцца як апісанні рэчаіснага становішча спраў, працэсаў, з'яў рэчаіснасці і г. д. Зразумела, што яны здабываюцца пераважна або выключна на эмпірычным узроўні даследавання, таму непрымальна казаць пра тэарэтычныя факты. Роля фактаў у гістарычным пазнанні яшчэ больш вялікая, чым у іншых відах пазнання, паколькі яны "прадстаўляюць змест гістарычнага пазнання, з дапамогай якога раскрываюць канкрэтную гісторыю аб'екта"[3].

Магчымы розныя тыпалогіі фактаў. Напрыклад, А. І. Ракітаў, ствараючы тыпалогію гістарычных фактаў, выдзяляе экзістэнцыяльныя і кваліфікацыйныя факты, апошнія ў сваю чаргу падзяляе на фенаменалагічныя і эсенцыяльныя факты (тлумачачы, што "пералічаныя тыпы фактаў самі па сабе не з'яўляюцца выключнай прыналежнасцю гістарычных ведаў..."[4]). У гісторыцы апісаннямі рэчаіснага

[1] Краўцэвіч А. Фарміраванне канцэпцыі генезісу ВКЛ у польскай гістарыяграфіі // Беларускі гістарычны часопіс. 1998. № 1. С. 50.

[2] Краўцэвіч А. К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. Rzeszów, 2000. С. 45.

[3] Стефанов Н. Теория и метод в общественных науках. М., 1967. С. 137.

[4] Ракитов А. И. Историческое познание. Системно-гносеологический подход. М., 1982. С. 196—199.

становішча спраў аптымальней лічыць не факты, а рэканструкцыі. Возьмем сцвярджэнне: "Судзілі і вельмі часта расстрэльвалі тых, хто, ашуканы хлуслівай прапагандай, перайшоў мяжу з Заходняй Беларусі, каб жыць у шчаслівай сацыялістычнай краіне". Як веды, якія яно выражае, — гэта рэканструкцыя пэўнай з'явы. Разам з тым гэта сцвярджэнне пра факт (датычнае пэўнага становішча спраў). Наступнае сцвярджэнне: "Развязаны масавы тэрор супраць сялянства ў канцы 1929 г. сваімі хвалямі захапіў і іншыя сацыяльныя катэгорыі насельніцтва"[5] не з'яўляецца рэканструкцыяй. У ім праводзіцца пэўная канцэпцыя (тэрор савецкіх улад супраць насельніцтва). Разам з тым гэта і сцвярджэнне пра факт, бо яно адпавядае пэўнаму становішчу спраў рэчаіснасці.

У гісторыцы рэканструкцыі — веды, якія з'яўляюцца апісаннямі канкрэтных падзей, з'яў; факты — веды, у якіх апісваюцца тэндэнцыі падзей, тыповыя (характэрныя) падзеі, сукупнасці з'яў і г. д. На наш погляд, лагічная структура гістарычнага факта адрозніваецца ад лагічнай структуры факта ў тэарэтычных дысцыплінах. Інакш кажучы, тэрмін "навуковы факт" пры апісанні гістарычных ведаў абазначае іншае паняцце, чым пры апісанні прыродазнаўчых і грамадазнаўчых ведаў. Зразумела, што факт з'яўляецца асноўным вынікам даследавання не ў любых навуковых дысцыплінах; вынікі даследавання ў логіка-матэматычных, тэхніказнаўчых (напрыклад, у тэхналогіі і тэхніцы геолагаразведачных работ), у шэрагу спецыяльных дысцыплін (напрыклад, археаграфіі, дакументазнаўстве) нельга класіфікаваць як факты, належыць — як доказы, алгарытмы, правілы і г. д. Таму памыляюцца тыя культуролагі, у прыватнасці Ю. У. Раждзественскі, якія, абгрунтоўваючы паняцце факта культуры, трактуюць яго як абагульненне фактаў дапаможных гістарычных дысцыплін[6]. Ён, дарэчы, адносіць да такіх дысцыплін археалогію і этнаграфію, хаця для гэтых дысцыплін ужо даўно ўстаноўлены статус самастойных гістарычных дысцыплін.

Такім чынам, гістарычныя факты, у залежнасці ад зместу сцвярджэнняў пра факт, магчыма характарызаваць як канцэптпалажэнні і як рэканструкцыі гістарычных з'яў, розных іх момантаў і аспектаў у тым выпадку, калі пад рэканструкцыяй гістарычных з'яў разумець узнаўленне выключна канкрэтных з'яў. Факты атрымліваюцца ў

---

[5] Касцюк М. П., Міхнюк У. М. Рэпрэсіі — самае цяжкае злачынства дыктатарскага рэжыму // Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мн., 1995. С. 204.
[6] Рождественский Ю. В. Введение в культурологию. М., 2000. С. 11—12.

выніку строга праведзенага даследавання, тэорыі і канцэпцыі аптымальна лічыць толькі абагульненнямі, але не тлумачэннямі іх. Іншы раз складана класіфікаваць пэўныя выказванні як выказванні пра факты (ці выказванні фактаў) або як канцэптуальныя выказванні (ці канцэптпалажэнні). Напрыклад, сцвярджэнне Г. М. Сагановіча ў кнізе "Невядомая вайна 1654—1667 гг.": "Гэткія людзі (якія схілялі жыхароў гарадоў ВКЛ да капітуляцыі перад маскоўскімі войскамі. — *Ю. Н.*) былі і ў іншых гарадах Княства" выражае рэканструкцыю падзей, выказванне пра гістарычны факт, які ўстаноўлены на падставе крытыкі сведчанняў крыніц. Наступнае сцвярджэнне ў кнізе: "Але адкрыта пачынаць агрэсію (Масковіі супраць ВКЛ. — *Ю. Н.*) не выпадала. Трэба было дыпламатычна замаскаваць яе..." — ужо не толькі выказванне пра рэканструкцыю падзей, але і канцэптуальнае палажэнне, бо ў ім высвятляюцца асаблівасці адбыцця пачатку ваенных дзеянняў. Сцвярджэнне: "Маскоўская дзяржава пачала дзеянні ў значна пагоршанай для яе ваенна-палітычнай сітуацыі"[7] — канцэптпалажэнне, якое не належыць лічыць выказваннем пра рэканструкцыю. Разам з тым яго дапушчальна класіфікаваць як выказванне пра факт, паколькі дадзенае сцвярджэнне з'яўляецца апісаннем пэўнага становішча спраў; акрамя таго, яно верыфікуецца дадзенымі крыніц, г. зн. не крытэрызуецца як цалкам тэарэтычнае сцвярджэнне.

Складана праводзіць розніцу паміж гістарычнымі фактамі і канцэптпалажэннямі. Напрыклад, веды пра тое, што Ям-Запольскі мірны дагавор быў падпісаны 15.01.1582 г., і пра ўмовы яго падпісання — гістарычны факт. А вось сцвярджэнне М. В. Доўнар-Запольскага: "Гэтым мірам скончылася самастойная дыпламатычная і ваенная гісторыя ВКЛ" — канстатацыя факта, але разам з тым і канцэптпалажэнне, высновa, зробленая ім як на аснове абагульнення дадзеных крыніц, так і ўстаноўленых фактаў. Наступнае палажэнне: "З юрыдычнага пункту погляду акт уніі не спыніў ... самастойнасці ВКЛ ... Гэта быў акт парламентарнай уніі, які пакідаў суверэнныя правы ВКЛ"[8], — яўна канцэптпалажэнне або нават скарочаны варыянт канцэпцыі (хаця тлумачэнне, якое гэтае палажэнне дае, недыферэнцыраванае, у ім не закранаецца асобна палітычная і эканамічная самастойнасць краіны; з яго невядома, ці праводзіць М. В. Доўнар-Запольскі розніцу паміж паняццямі самастойнасці і незалежнасці дзяржавы). Заўважым, што каштоў-

[7] Сагановіч Генадзь. Невядомая вайна 1654—1667 гг. Мн., 1993. С. 204—205, 58.
[8] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994. С. 103, 102.

насць палажэнняў, якія не ўваходзяць у склад канцэпцый, абмежаваная, у параўнанні з каштоўнасцю іх ў складзе канцэпцыі.

Калі пагадзіцца з тым, што адны і тыя ж веды прымальна характарызаваць як гістарычныя факты і як канцэптуальныя палажэнні, якія тычацца іх, задача лагічнага аналізу гістарычных ведаў, як ні парадаксальна, палягчаецца. Тады ў гісторыцы дапушчальна ўключаць эмпірычныя дадзеныя (факты) у склад канцэпцый, падобна таму як у прыродазнаўстве пэўныя эмпірычныя законы ўваходзяць у склад тэорыі.

Канцэпцыі ў гісторыцы дапушчальна характарызаваць як тэарэтычныя веды, хаця здабываюцца яны і на эмпірычным узроўні даследавання, перш за ўсё ў выніку крытыкі сведчанняў крыніц. Пазіцыя тых савецкіх і беларускіх гісторыказнаўцаў, якія адносяць гістарычныя канцэпцыі да эмпірычных ведаў, абумоўлена іх меркаваннем, паводле якога тэарэтычныя веды пра гісторыю — гэта веды так званай тэорыі гісторыі, якія прадметна адрозніваюцца ад ведаў гістарыясофіі і тэорый грамадазнаўчых дысцыплін[9]. Гістарычныя канцэпцыі служаць сродкам і атрымання пазакрынічных ведаў у гістарычных даследаваннях. Гістарычныя канцэпцыі (іх яшчэ называюць тэорыямі "канкрэтнапраблемнага ўзроўню"[10]) — веды, якія здабываюцца ў выніку крытыкі крыніц, выкарыстання і экстрапаляцыі ведаў грамадазнаўчых дысцыплін, а таксама з дапамогай гістарыяграфічнага аналізу.

Іншы раз у навуковай літаратуры сустракаем логіка-гнасеалагічныя дэфініцыі паняцця тэорыі, якія падыходзяць і для вызначэння паняцця канцэпцыі, напрыклад, у такой фармулёўцы: "Тэорыя — лагічна-арганізаваная сістэма паняццяў і суджэнняў, якая выконвае асаблівыя пазнавальныя функцыі"[11]. Больш дакладна (у рамках логікі) тэорыю ўслед за А. Тарскім вызначаюць як "...клас усіх сказаў, сапраўдных ва ўсіх магчымых рэалізацыях некаторага класа"[12]; або як мноства выказванняў, якія замкнёныя адносна выводнасці (Смирнов В. А. Логические методы анализа научного знания. М., 2002). Гэта дэфініцыі паняцця тэорыі з пункту гледжання логікі, але не разгляд лагічнай структуры тэорыі, ажыццяўляемы ў рамках эпістэмалогіі.

---

[9] Лооне Ээро. Современная философия истории. Таллин, 1980. С. 168—169.

[10] Ковальченко И. Д. Методы... С. 40.

[11] Современная философия науки. Знание, рациональность, ценности в трудах мыслителей Запада. Хрестоматия. 2-е изд. М., 1996. С. 6.

[12] Курбатов В. И. Логика. М., 2001. С. 386.

Не толькі паўсюдна выкарыстоўваемым тэрмінам "тэорыя", але і тэрмінам "навуковая тэорыя" абазначаюць сёння розныя паняцці. Для пазбягання гэтага належыць выбраць выразныя крытэрыі аднясення ведаў да навуковай тэорыі. Такімі крытэрыямі мы прапануем браць наступныя: форму арганізацыі ведаў і функцыі іх. А асноўнымі адзнакамі навуковай тэорыі выдзяляем сістэму ўзаемазвязаных і несупрацьлеглых выказванняў і функцыю служыць інструментам эмпірычнай і практычнай дзейнасці.

Увогуле, у залежнасці ад (розніцы ў) лагічнай структуры сістэм ведаў і тыпу аб'ектаў даследавання, зыходзячы з такога крытэрыю аднясення вынікаў даследавання да тэорыі, як функцыя інструмента эмпірычнай і практычнай дзейнасці, прымальна выдзяляць логіка-матэматычныя, прыродазнаўчыя, грамадазнаўчыя, тэхніказнаўчыя і нават філасофскія (калі адносіць да філасофіі этыку) тэорыі, але не гістарычныя тэорыі. Паводле А. Тарскага, "...кожнае мноства выказванняў, якое змяшчае ўсе свае лагічныя вывады, будзе ўяўляць сабой замкнутую сістэму або тэорыю"[13]. Такая дэфініцыя — лагічная дэфініцыя паняцця тэорыі, прычым яна прыдатная, у асноўным, як дэфініцыя паняццяў лагічнай і матэматычнай тэорыі. Дэфініцыя паняцця тэорыі, паводле якой яна — "...найбольш развітая форма арганізацыі навуковых ведаў, цэласнае ўяўленне пра заканамернасці і істотныя сувязі пэўнай галіны рэчаіснасці"[14], — гэта хутчэй гнасеалагічная дэфініцыя, паколькі ў межах гнасеалогіі высвятляюцца адносіны ведаў да рэчаіснасці.

Дэфініцыя паняцця развітой навуковай тэорыі як формы навуковых ведаў "...якая змяшчае абагульняючыя абстрактныя канструкты і набор законаў, якія ўзнаўляюць даследуемы аб'ект у выглядзе пэўным чынам структураванай сукупнасці элементаў і іх карэляцый"[15] — эпістэмалагічная дэфініцыя паняцця навуковай тэорыі (выкарыстоўваемая і ў межах метадалогіі навуковага пазнання), прычым яна прыдатна для вызначэння пэўных ведаў як тэорыі і ў прыродазнаўчых, і часткова ў грамадазнаўчых дысцыплінах. Як эпістэмалагічнае характарызуем вызначэнне навуковай тэорыі, дадзенае В. С. Сцёпіным: тэорыя — асаблівы тып ведаў, які дазваляе атры-

---

[13] Рузавин Г. И. Логическая структура научных теорий // Методы логического анализа. М., 1977. С. 6.

[14] Краткий словарь по логике // Горский Д. П., Ивин А. А., Никифоров А. Л. М., 1991. С. 188.

[15] Лукашевич В. К. Основы... С. 18.

маць эмпірычную залежнасць як вынік з тэарэтычных пастулатаў[16]. Але такое вызначэнне непрыдатна для вызначэння тэорыі ў логіка-матэматычных, тэхнічных і філасофскіх дысцыплінах.

Калі выдзяляць адзнакай паняцця тэорыі функцыю інструмента практычнай дзейнасці, то гэта дазваляе лічыць, што ў шэрагу спецыяльных навуковых дысцыплін, у сістэму ведаў якіх не ўваходзяць факты, законы ці хаця б мадэлі даследуемых з'яў і працэсаў, будуюцца тэорыі. Возьмем археаграфію — дапаможную гістарычную дысцыпліну. Тэарэтычныя веды ў ёй — гэта канцэпцыі, тыпалогіі (у тэорыі археаграфіі), прадпісанні ці рэкамендацыі, правілы (у методыцы археаграфіі), у якіх абагульняюцца практычныя дадзеныя (г. зн. досвед падрыхтоўкі пісьмовых матэрыялаў да друку на аснове строгіх метадаў і з мэтаю забеспячэння гісторыкаў зручна чытаемымі тэкстамі пісьмовых гістарычных крыніц) і рэгламентуецца пэўная практычна-пазнавальная дзейнасць. Калі лічыць, што сістэму ведаў у спецыяльных навуковых дысцыплінах нельга класіфікаваць як тэорыю, то гэта будзе ўзгадняцца з палажэннем, паводле якога функцыя служыць інструментам практычнай дзейнасці, з'яўляецца заўсёды адзнакай не тэорыі, а тэарэтычных ведаў. У рамках метадалогіі навуковага пазнання веды, якія атрымліваюцца ў межах методыкі археаграфіі (або археаграфіі, калі зводзіць апошнюю толькі да распрацоўкі прынцыпаў і метадаў публікацыі пісьмовых дакументаў і матэрыялаў), — правілы, інструкцыі, рэкамендацыі, вызначаемыя як канкрэтна-навуковая метадалогія, "як форма асэнсавання рацыянальна абгрунтаваных аптымальных варыянтаў арганізацыі навуковай дзейнасці ў канкрэтнай навуковай дысцыпліне"[17].

Для В. А. Лектарскага навуковая тэорыя — гэта "сістэма навуковых ведаў, якая складаецца з усеагульных сцвярджэнняў (законаў), паміж якімі высвятляемы лагічныя сувязі..."[18] Але ў склад тэорыі могуць не ўваходзіць законы, а толькі тэарэтычныя схемы і мадэлі і эмпірычныя залежнасці, як гэта мае месца ў тэорыях тэхнічных дысцыплін [у склад такіх тэорый уваходзяць функцыянальныя, "паточныя" (г. зн. працэсуальна-функцыянальныя) і "структурныя" тэарэтычныя схемы даследуемых аб'ектаў[19]]. І тым не менш сістэмы ведаў

---

[16] Степин В. С. Теоретическое знание. М., 2000. С. 58.

[17] Лукашевич В. К. Основы... С. 33.

[18] Лекторский В. А. Эпистемология... С. 212.

[19] Горохов В. Г. Методологический анализ научно-технических дисциплин. М., 1984. С. 23—25.

у іх выконваюць функцыю інструмента практычнай дзейнасці. Законы матэматыкі і логікі — гэта спецыфічныя правілы, якія з'яўляюцца кампанентам вылічэння, у адрозненне ад законаў прыродазнаўчых дысцыплін — ведаў, у якіх устаноўлены сувязі паміж з'явамі, г. зн. што логіка-матэматычныя дысцыпліны таксама не адпавядаюць дэфініцыі тэорыі, якую прапаноўвае В. А. Лектарскі.

Г. І. Рузавін класіфікуе тэорыі ў залежнасці, як ён фармулюе, ад аб'ектыўных асаблівасцяў і адносін, якія ўласцівы прадмету даследавання тэорыі, па наступных асноўных тыпах: фенаменалагічныя, нефенаменалагічныя, дынамічныя, стахастычныя[20]. Іншы раз даюцца класіфікацыі тэорый, у якіх змешаны або аб'яднаны крытэрыі лагічнай структуры тэорыі і этапаў развіцця тэорый. Напрыклад, М. В. Паповіч і В. Н. Садоўскі выдзяляюць апісальныя, матэматызаваныя і дэдуктыўныя тэорыі[21]. Банальным у літаратуры па навуказнаўству з'яўляецца процідастаўленне эмпірычных і тэарэтычных навук. Хаця, зыходзячы з тэзіса пра два асноўныя спосабы атрымання новых ведаў — вопыта і разважання (які абгрунтоўвае, напрыклад, У. І. Курбатаў), эмпірычныя дысцыпліны аптымальней процідастаўляць дыскурсіўным.

У 60 — пачатку 70-х гадоў XX ст. савецкія філосафы і навуказнаўцы прапаноўвалі розныя тыпалогіі навуковай тэорыі, якія Л. Б. Бажанаў, падсумоўваючы, зводзіў да двух асноўных тыпаў — эмпірычных і матэматычных тэорый. Пры гэтым эмпірычныя тэорыі звычайна процідастаўляліся матэматычным[22], г. зн. што слова "эмпірычны" ў межах філасофіі і навуказнаўства не з'яўляецца адназначным тэрмінам, маючы розныя значэнні ў розных канцэпцыях.

Па аналогіі з выдзяленнем фенаменалагічнага і нефенаменалагічнага (назавём — субстанцыялагічнага) тыпу тэорый у прыродазнаўчых дысцыплінах выдзелім фенаменалагічныя і субстанцыялагічныя канцэпцыі ў гісторыцы, адпаведна тыя, у якіх тлумачыцца толькі ход падзей, і тыя, у якіх тлумачацца механізмы адбыцця падзей, сутнасць з'яў. Разгледзім з гэтых пазіцый змест кнігі М. В. Доўнар-Запольскага "Гісторыя Беларусі". Сукупнасць палажэнняў у ёй, у якіх тлумачыцца механізм складвання шляхецкага саслоўя — гэта субстанцыялагічная канцэпцыя, якой абагульняюцца факты, якія тычацца дадзенай з'явы.

---

[20] Рузавин Г. И. Научная теория. Логико-методологический анализ. М., 1978. Раздел 1. Гл. 2. С.

[21] Философская энциклопедия. М., 1971. С. 206.

[22] Баженов Л. Б. Строение и функции естественно-научной теории // Синтез современного научного знания. М., 1973. С. 395—397.

Сукупнасць палажэнняў, у якіх тлумачыцца агульны кірунак расійскай палітыкі на Беларусі ў першай палове XIX ст., — гэта фенаменалагічная канцэпцыя, якой абагульняюцца факты, датычныя адпаведных працэсаў і выкладаемыя побач з канцэпцыяй.

Е. Тапольскі і А. Данто палічылі б апошнюю канцэпцыю дэскрыптыўным тлумачэннем (гл. п. 6). Але, разважаючы строга, канцэпцыі — гэта веды, тлумачэнне — функцыя ведаў; з пункту гледжання логікі веды — гэта суджэнні, вывады. Сукупнасць суджэнняў, вывадаў з'яўляецца тлумачэннем адносна з'яў, наконт якіх устанаўліваюцца факты.

Незалежна ад таго, якое палажэнне дакладней — П. Дзюгэма: "Тэорыі тлумачаць эмпірычныя законы", У. Сэларэ: "Тэорыя тлумачыць толькі тое, чаму з'явы падпарадкоўваюцца пэўным эмпірычным законам у (пэўнай. — *Ю. Н.*) ступені...", гэтыя палажэнні датычацца асноўнай формы ведаў (і яе асноўнай функцыі), якая атрымліваецца ў выніку даследавання ў прыродазнаўчых і грамадазнаўчых, а таксама, мабыць, у тэхніказнаўчых дысцыплінах (за выключэннем, зразумела, цалкам ужытковых дысцыплін), аднак не ў гістарычных дысцыплінах. Трэба канстатаваць, што навуказнаўчае апісанне сёння не разлічана на апісанне працэсу гістарычнага даследавання. У выніку гістарычнага даследавання не ўстанаўліваюцца законы, не будуюцца тэорыі. Што ў такім выпадку тлумачаць (г. зн. упарадкоўваюць) гістарычныя канцэпцыі? Аптымальна, на наш погляд, адказваць — факты пра гістарычныя з'явы. Фармулёўка палажэння П. Дзюгэма на першы погляд супярэчлівая, улічваючы тое, што законы менавіта і ўваходзяць у склад тэорый прыродазнаўчых дысцыплін. Але, паводле П. Дзюгэма, навуковыя тэорыі — сістэмы аксіём і "правіл адпаведнасці". Яны не тлумачаць з'явы рэчаіснасці, апісваючы апошнюю, яны "прадстаўляюць" эмпірычныя законы, г. зн. упарадкоўваюць іх: "...тэорыя тлумачыць законы, аб'ядноўваючы іх у дэдуктыўную сістэму"[23].

На наш погляд, у межах гнасеалогіі як аптымальную належыць разглядаць наступную дэфініцыю: навуковая тэорыя — сістэма ведаў, якая з'яўляецца асноўным вынікам даследавання ў межах пэўных навуковых дысцыплін, дазваляе раскрываць сутнасць даследуемых з'яў, і служыць інструментам эмпірычнага даследавання адпаведнай дысцыпліны, а таксама ў галіне практычнай дзейнасці, звязанай з ёю. У межах эпістэмалогіі паняцце навуковай тэорыі вызнача-

---

[23] Лоўзі Джон. Гістарычныя ўводзіны ў філасофію навукі. Мн., 1995. С. 146—147, 216.

ецца інакш. У прыватнасці, па-рознаму дэфінітыўна апісваецца тэорыя ў першапачатковай фазе развіцця навуковай дысцыпліны і развітая навуковая тэорыя.

Калі ў прыродазнаўчых дысцыплінах гіпотэзы з'яўляюцца сродкам пабудовы тэорыі, а таксама, па меркаванню пэўнай часткі эпістэмолагаў, уваходзяць у склад апошняй у якасці дадатка ў адносінах да сцвярджэнняў аб законах[24], то ў гісторыцы гіпотэзы служаць сродкам пабудовы канцэпцый, але, на наш погляд, не ўваходзяць у іх склад, таму што гіпотэзы і канцэпцыі — аднапарадкавыя эпістэмалагічныя адзінкі. Калі вынікам даследавання атрымана канцэпцыя (веды, якія, у адрозненне ад тэорый, дапускаюць распрацоўку іншых канцэпцый па аднолькавай тэматыцы), то гэта робіць залішнім выдзяленне вынікам даследавання гіпотэз. У пэўнай ступені канцэпцыі і гіпотэзы як веды падобныя, у тым плане, што і тыя і іншыя — веды, якія нельга лічыць у пэўнай ступені сапраўднымі ведамі, аднак на гэтым падабенства такіх формаў ведаў заканчваецца. Праілюструем палажэнне аб тым, што гіпотэзы не ўваходзяць у склад гістарычных канцэпцый, прыкладам: меркаванне пра тое, што вялікі князь ВКЛ Вітаўт быў атручаны, паколькі ў гэтым былі зацікаўлены польскія ўлады, — гіпотэза, якая патрэбна для ўстанаўлення гістарычнага факта. А ў канцэпцыю развіцця палітычнай сістэмы ВКЛ у першай трэці XV ст. погляд на смерць Вітаўта ўваходзіць не ў якасці гіпотэзы, а канцэптуальнага палажэння, аднаго з палажэнняў, якія складаюць канцэпцыю.

Сёння значная частка метадолагаў навуковага пазнання не ўключае гіпотэзу ў склад тэорый. К. Попер абгрунтаваў погляд, паводле якога навуковае пазнанне развіваецца шляхам выключэння гіпотэз метадам спроб і памылак, а адбор гіпотэз можа прывесці да ведаў, якія з'яўляюцца сапраўднымі. В. С. Сцёпін, вызначаючы гіпотэзы як форму навуковых ведаў і важнейшы элемент іх структуры, лічыць гіпотэзы толькі перадумовай пабудовы тэорыі (разглядаючы ў першую чаргу тэорыю прыродазнаўчага тыпу). А ў склад тэорыі ён ўключае матэматычныя фармулёўкі законаў, тэарэтычныя схемы, эмпірычныя факты і эмпірычныя інтэрпрэтацыі, з тым удакладненнем, што "ў развітой навуцы тэарэтычныя схемы (толькі. — *Ю. Н.*) спачатку будуюцца як гіпатэтычныя мадэлі", інакш кажучы, гіпотэза — гэта форма ведаў, якая выступае стадыяй пабудовы тэарэтычнай схемы, але не канчатковым вынікам даследавання — тэарэтычнай схемай. Тэарэтычная схема мае першапачатковы гіпатэтычны

---

[24] Бунге Марио. Философия физики. М., 1975. С. 55.

варыянт, прычым "гіпатэтычныя мадэлі займаюць статус тэарэтычных уяўленняў пра некаторую галіну ўзаемадзеянняў толькі тады, калі пройдуць праз працэдуры эмпірычнага абгрунтавання"[25].

На наш погляд, характарыстыка вынікаў канкрэтна-гістарычнага даследавання як канцэптуальных, робіць залішнім іх характарыстыку як гіпатэтычных. У час знаходжання слухачоў на першых курсах павышэння кваліфікацыі "Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы гістарычнага пазнання: навуковы пошук і інавацыйныя тэхналогіі", якія праводзіў РІВШ БДУ ў пачатку 2002 г., даводзілася не аднойчы чуць меркаванне пра гіпатэтычнасць і адсюль бездаказальнасць гістарычных ведаў. Увогуле, характарыстыка вынікаў даследаванняў у навуковых дысцыплінах, за выключэннем матэматыкі і логікі, як даказальных або недаказальных, вельмі сумніцельна (толькі ў матэматыцы і логіцы даследаванне будуецца на разважанні, якое ёсць доказ, толькі ў лагічную структуру логіка-матэматычнага даследавання ўваходзіць такі элемент, як даказванне). К. Попер разумеў пад гіпатэтычнасцю гістарычных ведаў некалькі іншы змест. У працы "Objective knowledge" (Oxford, 1972) ён "...пазбаўляе гістарычныя веды аб'ектыўнага характару, настойваючы на іх гіпатэтычнасці"[26]. Прымальней разважаць не пра гіпатэтычнасць і бездаказальнасць, а пра аб'ектыўнасць, імавернасць гістарычных ведаў або абмежаванасць гістарычнага разумення.

В. С. Сцёпін, прытрымліваючыся тэзіса пра адсутнасць прынцыповага адрознення паміж прыродай пазнання ў прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных навуках ("іх адрозненне караніцца ў спецыфіцы прадметнай галіны"), вызначае элементам тэарэтычных ведаў такіх дысцыплін, як літаратуразнаўства, музыказнаўства, мастацтвазнаўства, тэарэтычныя схемы (мадэлі)[27]. Але калі падыходзіць да навуказнаўчай тэрміналогіі строга, то, паколькі тэарэтычныя пабудовы ў гэтых дысцыплінах не з'яўляюцца інструментам практычнай дзейнасці (напрыклад, тэорыя літаратуры не ўплывае на літаратурную дзейнасць — творчасць), аптымальна казаць не пра тэарэтычныя, а пра схемы і мадэлі, а таксама і палажэнні (пры характарыстыцы гістарычных раздзелаў гэтых дысцыплін). У адрозненне ад тэорый і канцэпцый прыродазнаўчых, тэхніказнаўчых і значнай часткі грамадазнаўчых дысцыплін, аснову якіх складаюць тэарэтычныя і

---

[25] Степин В. С. Теоретическое знание… С. 314, 327, 340.

[26] Салов В. И. Историцизм и современная буржуазная историография. М., 1977. С. 97.

[27] Степин В. С. Теоретическое знание. С. 100, 113.

канцэптуальныя схемы, аснову гістарычных канцэпцый складаюць канцэптуальныя не схемы, а палажэнні (напрыклад, у канцэпцыю этнічнага характару ВКЛ уваходзіць канцэптпалажэнне пра дамінуючую ролю ў палітычным жыцці ВКЛ XIV—XVI стст. паноў і землеўладальнікаў беларускіх зямель).

Такім чынам, нягледзячы на розны змест, які ўкладваецца сёння ў паняцці навуковага факта, канцэпцыі, тэорыі, магчыма адкарэліраваць іх адзін адносна другога і іншых навуказнаўчых паняццяў, установіць аптымальны асноўны змест тэрмінаў "навуковы факт, канцэпцыя, тэорыя", дапускаючы іх пэўную інтэрпрэтацыю ў розных навуказнаўчых дысцыплінах.

## 5. ТЫПАЛОГІІ ВЕДАЎ, МЕТАДАЎ І ЎЗРОЎНЯЎ ДАСЛЕДАВАННЯ

Распрацоўка тыпалогіі — прыём, які дазваляе ўпарадкоўваць назапашаныя веды. Безумоўна, марна рэкамендаваць даследчыкам прытрымлівацца адной якой-небудзь тыпалогіі. Але ўмовай пабудовы тыпалогіі з'яўляюцца выразныя крытэрыі пабудовы, несупярэчлівасць паняццяў, аргументаванасць выдзялення пэўных адзінак. Такія ўмовы далёка не заўсёды выконваюцца.

У сцвярджэннях вучэбнага дапаможніка "Методология истории" часам адсутнічае выразнае гісторыказнаўчае апісанне і разуменне. У ім, напрыклад, сцвярджаецца, што "гістарыяграфія дае ... эмпірычныя веды аб гісторыі. Гістарыясофія ... прадстаўляе тэарэтычныя веды аб гісторыі". Адзін з яго аўтараў і рэдактараў, А. М. Нечухрын, не заняўшы выразную гнасеалагічна-эпістэмалагічную пазіцыю, атаясамлівае эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні пазнання ў гістарычным даследаванні з эмпірычнымі і тэарэтычнымі ведамі, а апошнія з эмпірычным і тэарэтычным вытлумачэннем гістарычнага матэрыялу. Пры такім атаясамленні вучонаму складана завершыць наступны сказ: "Па сваім змесце гістарычныя веды нельга аднесці да чыста эмпірычнага ці да тэарэтычнага"[1]. Каб гэты сказ меў змястоўналагічную завершанасць, да яго трэба дадаць выраз "узроўняў навуковага пазнання (даследавання)" або іншы, які б абазначаў навуказнаўчае паняцце. Словы "эмпірычнае" і "тэарэтычнае" без далучэння да іх іншых слоў, выкарыстоўваемых у навуказнаўстве, невядома што

[1] Методология истории. Учебное пособие для студентов вузов. Мн., 1996. С. 28, 100—103, 201.

абазначаюць, акрамя выпадкаў, калі яны ўжываюцца ў якасці катэгорый, з дапамогай якіх сістэматызуюцца розныя базісныя паняцці.

У апошнім выпадку прынята лічыць, што "тэарэтычнае і эмпірычнае — філасофска-метадалагічныя катэгорыі, якія выражаюць расчлянёнасць навуковага пазнання на 2 узроўні"[2]. Нельга ўжываць асэнсавана словы "тэарэтычнае" і "эмпірычнае" [калі толькі не лічыць іх граматычнымі формамі, якія ўтвораны ад тэрмінаў "тэорыя" і "эмпірыя (вопыт)" — абазначэнняў паняццяў сферы тэарэтычнага мыслення і сферы разгортвання вопыту суб'екта пазнання], у адрозненне ад тэрмінаў "тэарэтычныя і эмпірычныя метады даследавання, тэрміны" і г. д., якія абазначаюць пэўныя паняцці, а не проста разрады іх. Увогуле, іх памылкова характарызаваць як катэгорыі, у тым выпадку, калі разумець пад катэгорыямі найбольш агульныя паняцці.

Крытыка М. А. Сакаловай недахопаў у "Методологии истории" абгрунтаваная. Разам з тым у выпадку яе крытыкі таго, як А. М. Нечухрын суадносіць эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні навуковага пазнання, М. А. Сакалова зыходзіць з традыцыйнага погляду на такія суадносіны, абапіраючыся, у прыватнасці, на погляды Э. Лооне[3], хаця айчынныя метадолагі гісторыі здольны абгрунтаваць уласны погляд па гэтай праблеме. Апошнім не былі выразна адкарэліраваны суадносіны паміж паняццямі эмпірычных ведаў і эмпірычнага ўзроўню даследавання; ім лічылася, з аднаго боку, што апрацоўка крыніц — гэта эмпірычны ўзровень пазнання ў гістарычнай навуцы, што бясспрэчна, з другога боку, што тлумачэнне (абагульненне) гістарычных фактаў адносіцца да эмпірычнага даследавання.

Між тым насуперак традыцыйнаму погляду на такія суадносіны сцвярджэнне Г. М. Сагановіча пра ваенна-палітычнае становішча Маскоўскай дзяржавы ў час пералому ў расійска-польскай вайне 1654—1667 гг. аптымальна адносіць да канцэптуальных ведаў, якія здабыты на эмпірычным узроўні даследавання, інакш — з дапамогай эмпірычных метадаў даследавання. А сцвярджэнне М. В. Доўнар-Запольскага, што акт Люблінскай уніі не спыніў самастойнасці ВКЛ — канцэптуальныя веды, здабытыя на тэарэтычным узроўні даследавання.

А. С. Кармін і Г. Г. Бярнацкі ў падручніку "Философия" выдзяляюць эмпірычны і тэарэтычны віды навуковых даследаванняў і адпавядаючыя ім узроўні навуковых ведаў, атаясамліваючы ў дадзеным выпадку паняцці даследавання і ведаў. Назваўшы пункты § 9.4 падруч-

---

[2] Краткий словарь... С. 181.

[3] Сакалова Марыяна. Першы дапаможнік па метадалогіі... С. 222—223.

ніка "Эмпірычнае даследаванне" і "Тэарэтычнае даследаванне", яны ў тэксце даюць дэфініцыю паняццям эмпірычных і тэарэтычных ведаў, г. зн. што фармулююць свае навуказнаўчыя ўяўленні тэрміналагічна непаслядоўна. Безумоўна, належыць разважаць пра эмпірычныя і тэарэтычныя ўзроўні менавіта навуковага даследавання, а не ведаў.

Акрамя таго, належыць усведамляць, што паняцці эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў даследавання і паняцці эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў (рацыянальнага) пазнання — гэта розныя па змесце паняцці, паколькі адрозніваюцца паняцці даследавання і пазнання. Паняцці эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў рацыянальнага пазнання ствараюцца такім чынам, што галоўнай адзнакай іх бярэцца спосаб перапрацоўкі пазнавальнага матэрыялу. Паняцці эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў даследавання аптымальна ўтвараць, беручы адзнакамі іх метад даследавання і даследчую накіраванасць. Эмпірычны ўзровень даследавання складаюць даследаванні, накіраваныя на ўстанаўленне фактаў і ажыццяўляемыя на аснове эмпірычных метадаў даследавання. Тэарэтычны ўзровень даследавання складаюць даследаванні, накіраваныя на пабудову сістэмы ведаў — тэорый або канцэпцый і ажыццяўляемы на аснове тэарэтычных метадаў даследавання. Зыходжанне з такой дэфініцыі робіць непрымальным уключэнне ў склад узроўняў ведаў, як гэта часта робяць навуказнаўцы, разважаючы пра веды ўзроўняў даследавання.

Яшчэ ў 60-я гг. XX ст. у савецкай метадалогіі навукі быў прыняты погляд, паводле якога эмпірычныя законы, нягледзячы на тое, што яны ўстанаўліваюцца на эмпірычным ўзроўні даследавання "...як і тэарэтычныя законы, адносяцца да аднаго і таго ж тыпу навуковых ведаў — да тэарэтычных ведаў"[4]. Сёння іх не прынята адносіць да тэарэтычных ведаў. В. С. Сцёпін адносіць да тэарэтычных ведаў прынцыпы, фундаментальныя і прыватныя тэарэтычныя законы, але не эмпірычныя законы[5]. Дарэчы, у кнізе "Теоретическое знание" ён увогуле не дае дэфініцыі тэарэтычных ведаў, але выдзяляе адзнакі іх і разглядае іх асаблівасці.

У такім выпадку да эмпірычных ведаў адносяцца факты, эмпірычныя дадзеныя і залежнасці (у тым ліку і законы). Але гіпотэзы дапушчальна адносіць як да эмпірычных, так і да тэарэтычных ведаў. Усе падобныя класіфікацыі ўзгадняюцца са стандартнай мадэллю

---

[4] Методологические основы... С. 151.

[5] Степин В. С. Системность теоретических знаний и процедура конструктивного обоснования // Теория и метод. М., 1987. С. 24.

ведаў, якая арыентавана на прыродазнаўчыя дысцыпліны. Для метатэарэтычнага апісання даследавання ў гісторыцы падыходзіць іншая мадэль ведаў, паводле якой канцэпцыі і канцэптуальныя палажэнні здабываюцца перш за ўсё на эмпірычным узроўні даследавання, у выніку крытыкі дадзеных гістарычных крыніц.

Сёння распаўсюджана гнасеолага-эпістэмалагічная канцэпцыя (якую абгрунтоўваюць расійскія логікі Я. К. Вайшвіла і М. Р. Дзегцяроў), паводле якой эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні пазнання разумеюцца як узроўні вышэйшай у параўнанні з пачуццёвай ступені пазнання — рацыянальнай ступені, а розныя адзінкі ведаў (паняцці, выказванні, тэорыі) таксама падзяляюцца па такіх узроўнях. Навуковае пазнанне пры гэтым не атаясамліваецца з рацыянальным пазнаннем, затое апошняе атаясамліваецца імі з абстрактным мысленнем[6]. Нагляднае мысленне ў такім выпадку не ўключаецца ні ў рацыянальную, ні ў пачуццёвую ступень пазнання. Але паняцце рацыянальнага пазнання змешваецца Я. К. Вайшвілам і М. Р. Дзегцяровым у пэўнай ступені з паняццем навуковага пазнання, паколькі імі выдзяляемы эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні рацыянальнага пазнання, хаця выдзяляць эмпірычны і тэарэтычны ўзроўні абгрунтавана толькі ў адносінах да навуковага пазнання і непрымальна ў адносінах да пазнання ў цэлым. Акрамя таго, калі разважаць аб паняццях дадзенай канцэпцыі паслядоўна, то відавочна прыйдзем да супярэчнасці: калі маюцца тэарэтычныя веды, а сярод іх такія веды, як тэорыі, то трэба дапускаць і тэарэтычныя тэорыі. Гэты прыклад моўнай часткі ілюструе незадавальненне выкарыстоўваемай сёння навуказнаўчай тэрміналогіяй.

Зразумела, што нельга распрацаваць аптымальную гісторыказнаўчую тэрміналогію, пакуль не распрацавана аптымальна навуказнаўчая. Карэліруючы значэнні навуказнаўчых тэрмінаў з мэтай адмежавання зместаў іх паняццяў, мы прыйшлі да высновы, што першасным паняццем належыць браць паняцце даследавання як спосабу ажыццяўлення спецыялізаванага тыпу пазнання, які ажыццяўляецца на падставе строгіх прынцыпаў і дакладных метадаў. Калі зыходзіць з дэфініцыі “даследаванне — працэс навуковага вывучэння якога-небудзь аб’екта (прадмета або з’явы — матэрыяльнай і ідэальнай) з мэтай высвятлення яго заканамернасцяў развіцця, і змены, і пераўтварэння яго ў грамадстве”[7], то паводле яе не толькі логіка-матэматычныя аперацыі, але і гістарычнае вывучэнне нельга адносіць да даследаван-

[6] Войшвилло Е. К., Дегтярев М. Г. Логіка. С. 10—11, 14.
[7] Кондаков Н. Е. Логический словарь-справочник. С. 217.

ня, паколькі ў іх не высвятляюцца заканамернасці. Мы прапануем галоўнай адзнакай паняцця даследавання браць ужыванне ў пазнанні строгіх прынцыпаў (і тэрміналогіі) і дакладных метадаў (і працэдур).

Гістарычнае даследаванне не мае вынікам выключна веды, якія характарызуюць як эмпірычныя, г. зн. веды, якія атрымліваюцца цалкам на эмпірычным узроўні даследавання. На нашую думку, тэрміны "эмпірычныя і тэарэтычныя веды" няўдалыя, паколькі абазначаюць паняцці канцэптуальнай схемы, у якой маюцца супярэчнасці. Асноўныя веды, якія атрымліваюцца ў выніку даследавання ў навуковых дысцыплінах аптымальна класіфікаваць па наступных формах: тэорыя (сістэма ведаў, у склад якой уваходзяць законы, тэарэтычныя схемы і мадэлі, кагнітыўныя інтэрпрэтацыі, а таксама факты), канцэпцыі, гіпотэзы, факты, эмпірычныя залежнасці і дадзеныя. Менавіта такія формы, але за выключэннем канцэпцый, якія найчасцей выдзяляюцца навуказнаўцамі, што збіваюцца на шаблон мадэлі прыродазнаўчага даследавання. Так, адзін з вядучых айчынных метадолагаў навукі У. К. Лукашэвіч, вызначаючы канцэпцыю як "асноўны пункт гледжання на з'явы", не выдзяляе яе як форму навуковага пазнання[8]. Тое ж робіць і адзін з вядучых расійскіх эпістэмолагаў В. С. Сцёпін, які ўключае ў склад навуковых ведаў толькі канцэптуальныя інтэрпрэтацыі[9].

Стэрэатыпная схема дзялення навук і адпаведна навуковых ведаў толькі на эмпірычныя і тэарэтычныя малапрыстасаваная для апісання вынікаў канкрэтна-гістарычнага даследавання. Гісторыка — фактуальна-канцэптуальная дысцыпліна, калі вызначаць яе статус у адпаведнасці з асноўнымі вынікамі даследавання. А такі вынік у яе межах, як навуковая тэорыя, недасягальны.

Увогуле, неўпарадкаванасць гісторыказнаўчай (шырэй — навуказнаўчай) тэрміналогіі цесна звязаны з дастатковай супярэчлівасцю гісторыказнаўчага і навуказнаўчага апісання, з ужываннем шматслойных паняццяў (паняцця навукі як сферы дзейнасці па вытворчасці ведаў і як грамадскага інстытута; паняцця гісторыі як мінулага і як яго вывучэння, як развіцця грамадства ў мінулым, узятага ў цэлым і як пэўных фрагментаў яго і г. д.). Адзначым, што шматслойныя паняцці зацямняюць вынікі навуковага пазнання; невыпадкова яны элімінуюцца з распрацовак навуковых дысцыплін.

---

[8] Лукашевич В. К. Основы… С. 90, 16—17.

[9] Степин В. С. Философская антропология и философия науки. М., 1992. С. 135.

Дапушчальна ўжываць больш інтэграванае метатэарэтычнае апісанне, напрыклад выдзяляць разам з эмпірычнымі і практычныя метады даследавання, разам з тэарэтычнымі і канцэптуальныя веды і г. д. Магчыма аптымальней разважаць не пра эмпірычныя і тэарэтычныя веды, а пра веды эмпірычных і тэарэтычных дысцыплін. Зыходзячы з меркавання, што паняцці эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў даследавання ствараюцца, галоўным чынам, з выдзяленнем адзнакі аб'екта, метадаў і задач даследавання, але не ведаў і тэрмінаў, то ўвогуле ўяўляецца немэтазгодным ствараць у якасці навуказнаўчых паняцці эмпірычных і тэарэтычных ведаў. Невыпадкова сёння эпістэмолагі канстатуюць, што "...супрацьпастаўленне тэарэтычныя—эмпірычныя веды аказалася няслушным. Абодва гэтыя паняцці набылі пэўную ўмоўнасць і сталі ўзаемазалежнымі"[10].

Калі выдзяляюцца тэарэтычныя веды і разам з тым такая форма ведаў, як тэорыя, то атрымліваецца даволі дзіўна, што тэорыя — сістэма ведаў, у якую могуць увахордзіць эмпірычныя законы і нават дадзеныя (напрыклад, у тэорыю адносных ўваходзяць эмпірычныя дадзеныя пра хуткасць распаўсюджвання святла ў вакууме), якія адносяцца да тэарэтычнага тыпу ведаў. Разам з тым другую асноўную форму ведаў, атрыманую ў выніку даследавання, — факт таксама нельга адносіць толькі да аднага тыпу ведаў — эмпірычнага, бо іншы раз факты атрымліваюцца на тэарэтычным узроўні даследавання (напрыклад, факт вярчэння Зямлі вакол Сонца быў устаноўлены М. Капернікам не ў выніку прамога назірання, а з дапамогай матэматычных разлікаў). У гісторыцы — у выніку гістарыяграфічнага аналізу. Канцэптуальныя палажэнні атрымліваюцца як на эмпірычным, так і на тэарэтычным узроўнях даследаванняў. Для захоўвання традыцыйнай тыпалогіі ведаў трэба дадаткова выдзяляць і канцэптуальныя веды як адзін з тыпаў ведаў.

Тэрмін "гістарычныя веды" неадназначны. Калі называць "гістарычнымі ведамі" толькі веды, атрыманыя ў межах гісторыкі, то гэта будзе дубліраваннем тэрміна "канкрэтна-гістарычныя веды". Больш таго, калі дапускаць, што гістарычныя веды здабываюцца і ў выніку не толькі строгага даследавання, але і апавяданняў пра мінулае, то патрэбна ствараць паняцце навукова-гістарычных ведаў як вынік адпаведнага пазнання, адрозніваючы яго ад паняцця гістарычных ведаў. Калі лічыць, што філасофія — сфера пазнання, адасобле-

---

[10] Гидилис Н. Л. Знание как целостность // Проблема знания в истории культуры. СПб., 2001. С. 85.

ная ад навукі, а да гістарычных ведаў адносіць і гістарыясофскія, то паняцце навукова-гістарычнага пазнання стане супярэчлівым.

Пры падзеле гістарычных ведаў у залежнасці ад іх адносін да вывучэння крыніц атрымліваюцца крынічныя і пазакрынічныя веды. Першыя здабываюцца пры ажыццяўленні трох з 12 асноўных працэдур, якія наяўны пры правядзенні канкрэтна-гістарычнага даследавання, другія — пры ажыццяўленні адзінаццаці[11]. Паняцце крынічных ведаў амаль не супадае па змесце з паняццем крыніцазнаўчых ведаў. Да крынічных ведаў адносяцца, напрыклад, веды пра колькасць асоб рыцарскага і баярскага звання ў ВКЛ, пра перавагу прадстаўнікоў пэўнага народа (этнасу) сярод такога сацыяльнага слою; пры фармулёўцы, напрыклад, палажэння пра тое, што дружынная арганізацыя ВКЛ будавалася па ўзору рускай формы дзяржаўнага ўкладу, даследчыкам недастаткова ведаў, якія яны атрымліваюць пры вывучэнні дадзеных крыніц, яны прыцягваюць і веды, аб якіх у крыніцах няма дадзеных, — пра механізм дзяржавы і яго структуры, г. зн. веды дзяржавазнаўства. Да крыніцазнаўчых ведаў адносяцца, у прыватнасці, выніі вывучэння ўплыву ўмоў, у якіх узніклі сведчанні, на іх паўнату, верагоднасць і дакладнасць. Таксама і пазакрынічныя веды — гэта не тэарэтычныя (канцэптуальныя), а толькі тып гістарычных пры пэўным падзеле іх.

Часам сустракаюцца фармулёўкі, з якіх зразумела, што навуказнаўцы не адрозніваюць іншы раз выразна навуказнаўчыя паняцці. Так, У. І. Курбатаў атаясамляе тэрміналагічна веды і пазнанне, навуковыя тэорыі з тэорыямі эмпірычных навук, фактуальныя тэорыі з тэорыямі эмпірычных навук[12]. У. Хв. Беркаў, разважаючы пра эмпірычныя і тэарэтычныя навукі, веды і ўзроўні, спачатку выдзяляе метады эмпірычных навук, а пасля непаслядоўна абазначае іх тэрмінам "практычныя метады навуковага пазнання"[13]. Заўважым, што навуказнаўцы, якія разам з тым і логікі, часта не пазбягаюць не толькі непаслядоўнасцяў але і супярэчнасцяў. У якасці прыкладу спашлёмся на працы У. Пірса[14].

---

[11] Топольски Ежи. О роли внеисточникового знания в историческом исследовании // Вопросы философии. 1973. № 5. С. 198.

[12] Курбатов В. И. Логика. С. 335—337.

[13] Берков В. Ф. Общая методология науки. Мн., 2001. С. 31, 78.

[14] Фримен Ю., Сколиновский Г. Поиски объективности у Пирса и Поппера // Эволюционная эпистемология и логика социальных наук. Карл Поппер и его критики. М., 2000. С. 273.

Калі метад інтэрпрэтацыі дадзеных крыніц (так званы гісторыка-герменеўтычны метад) належыць адносіць да эмпірычных метадаў даследавання, бо пры яго ўжыванні праводзіцца праца над эмпірычнымі дадзенымі (сведчаннямі крыніц), то метад аналізу гістарычных канцэпцый (абазначым яго тэрмінам "гістарыялагічны метад") належыць адносіць да тэарэтычных метадаў даследавання, паколькі ён заснаваны на параўнанні адных канцэпцый з іншымі і з устаноўленымі гістарычнымі фактамі. Выкарыстанне ў гісторыцы паняццяў грамадазнаўчых дысцыплін для пабудовы канцэпцый — іншы тэарэтычны метад гістарычнага даследавання (ён шырока ўжываецца ў сумежных гістарычных дысцыплінах). У 6-й главе раздзела XV "Нарысаў гісторыі Беларусі" І. Я. Марчанка і У. І. Навіцкі канцэпцыю вынікаў абвяшчэння суверэнітэту Беларусі будавалі з дапамогай паняццяў сацыяльнага прагрэсу і палітычнага прагрэсу[15], г. зн. з дапамогай паняццяў сацыялогіі і паліталогіі, а то і ўвогуле — сацыяльнай філасофіі.

Нельга настойваць на тым, што запазычанне паняццяў і ўвогуле абстрактных аб'ектаў і структур — сродак, спецыфічны для распрацовак гістарычных дысцыплін. У іншых навуковых дысцыплінах выкарыстоўваюцца паняцці і схемы тэорый іншых галін даследаванняў. У прыродазнаўчых дысцыплінах шырока выкарыстоўваюцца матэматычныя структуры, і не толькі як перадумова і сродак пабудовы іх тэорый, але і пэўныя матэматычныя паняцці ўваходзяць у склад тэорыі (напрыклад, у фізічную тэорыю ланцугоў уваходзіць паняцце графа[16]).

У савецкі час частка філосафаў навукі і навуказнаўцаў прытрымлівалася правіла, паводле якога "...асновай для выдзялення ўзроўняў метадалогіі павінны быць узроўні тэарэтычных ведаў пра рэчаіснасць". У адпаведнасці з ім І. Д. Кавальчанка выдзяляў 4 узроўні метадалогіі навуковага пазнання: агульнафіласофскі, філасофска-сацыялагічны, спецыяльна-навуковы і канкрэтна-навуковы (нават такі традыцыйны для савецкіх метадалогаў навукі падзел метадалогіі праводзіўся так, каб лішні раз падкрэсліць выключнае значэнне ў пазнанні вучэнняў дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму). Ад іх ён адрозніваў (некалькі непаслядоўна) 4 узроўні метадаў даследавання: філасофскі, агульнанавуковы, спецыяльна-навуковы і канкрэтна-навуковы метады[17]. У апошнім выпадку дакладней было б гаварыць пра тыпы, а не пра ўзроўні метадаў.

---

[15] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. Мн., 1995. С. 487.
[16] Бунге Марио. Философия физики. С. 217.
[17] Ковальченко И. Д. Методы... С. 35, 38—40.

У адпаведнасці з такім падзелам марксісцкі падыход да вывучэння гісторыі, які выпрацоўваўся на аснове аксіяматычна пабудаванага вучэння гістарычнага матэрыялізму, складаўся з наступных метадаў (і тэорый, якія ім адпавядаюць): "усеагульнага" метаду — дыялектыкі[18], агульнанавуковага метаду — матэрыялістычнай тэорыі гістарычнага працэсу, міждысцыплінарнага метаду — тэорыі грамадскага развіцця, канкрэтна-гістарычнага метаду — сацыяльна-класавага аналізу гістарычных з'яў[19].

У. К. Лукашэвіч выдзяляе толькі 3 тыпы навуковых метадаў у залежнасці ад ступені агульнасці: філасофскія метады, агульнанавуковыя падыходы і канкрэтна-навуковыя метады. Заўважым, што калі "...варыянты класіфікацыі навуковых метадаў ... дапускаюць адначасова ўключэнне адных і тых жа метадаў у розныя групы"[20], то з пункту гледжання логікі гэта аперацыя вызначаецца як тыпалогія, а не класіфікацыя. У навуказнаўстве агульнапрынята так званая традыцыйная класіфікацыя метадаў навуковага пазнання, але паколькі карыстанне ёю не дае несупярэчлівага апісання, сістэматызацыі метадаў, то прымальна карыстацца разам з ёю і шэрагам іншых тыпалогій метадаў даследавання (тое самае датычыцца, дарэчы, і класіфікацыі навук). Адзін і той жа метад даследавання ў залежнасці ад узятага крытэрыю атрымліваецца адносіць да рознага тыпу метадаў. Такое немагчыма ў строгай класіфікацыі, напрыклад у класіфікацыі біялагічных відаў. Тым больш, што класіфікацыя метадаў даследавання не праследуе практычную мэту, як тыпалогія дакументальных публікацый ажыццяўляецца ў археаграфіі з мэтай дапамогі археографам у іх эдыцыйнай працы, у падрыхтоўцы імі публікацый дакументаў (у якасці гістарычных крыніц) пэўнага мэтавага прызначэння. Класіфікацыя навук у тэарэтычным навуказнаўстве мае мэтаю служыць падмуркам для складання наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў.

Такім чынам, класіфікацыя як асаблівая форма арганізацыі навуковых ведаў, шматразраднай і шматступенчатай сістэматызацыі іх, неабходнай у якасці сродка ажыццяўлення даследаванняў, не патрэбна, на нашу думку, у метадалогіі навуковага пазнання, у якой дастаткова абмежавацца тыпалогіяй метадаў даследавання. Тыпалогія —

---

[18] Сушков И. М. О соотношении методов научного познания // Методологические проблемы научного исследования. Р.-на-Д., 1974. С. 5.

[19] Санцевич А. А. Методика исторического исследования. К., 1990.

[20] Лукашевич В. К. Основы ... С. 46.

больш простая форма арганізацыі ведаў. Навуказнаўцы звычайна не адрозніваюць спецыяльна класіфікацыю і тыпалогію як формы арганізацыі ведаў.

У. К. Лукашэвіч у вучэбным дапаможніку "Анатомия научного метода" выдзяляе і прыводзіць прыклады шасці змястоўных тыпалогій, фармальную тыпалогію, а таксама і традыцыйную класіфікацыю метадаў навукі[21]. Дапушчальна будаваць і іншыя тыпалогіі. Так, метады даследавання прымальна падзяляць у залежнасці ад ступені агульнасці: на агульнадысцыплінарныя, якія ўжываюцца ва ўсіх галінах даследаванняў без выключэнняў, напрыклад метад абагульнення; прыватнадысцыплінарныя, якія ўжываюцца ў некаторых галінах даследаванняў, напрыклад эксперымент, рэтраспектыўны метад; спецыяльныя, якія ўжываюцца толькі ў пэўнай галіне даследаванняў, напрыклад метад храналагічнай перыядызацыі гістарычных з'яў; метады крытыкі крыніц; у залежнасці ад узроўню даследавання — на практычныя, якія звязаны з пэўнай практычнай дзейнасцю, напрыклад метад збірання гістарычных крыніц; эмпірычныя, якія звязаны з назіраннямі і іх абагульненнямі; тэарэтычныя; у залежнасці ад характару ўзнікнення — на монадысцыплінарныя, якія ўзнікаюць у межах адной дысцыпліны, і міждысцыплінарныя, якія ўзнікаюць на стыку розных дысцыплін.

Разнабой у характарыстыцы метадаў даследавання вялікі, і зжыць яго зусім не ўяўляецца магчымым. У. К. Лукашэвіч класіфікуе мадэляванне як агульналагічны метад пазнання. В. Галубінцаў характарызуе яго як агульнанавуковы метад і эмпірычнага, і тэарэтычнага пазнання. Ён выдзяляе ў залежнасці ад ступені агульнасці метадаў усеагульныя, агульнанавуковыя, якія прывязваюцца ім да эмпірычнага і тэарэтычнага ўзроўняў пазнання, і прыватнанавуковыя метады. Апошнія ён разумее як метады, якія ўжываюць у межах толькі пэўных канкрэтных дысцыплін, г. зн. атаясамлівае прыватнадысцыплінарныя і спецыяльныя метады. Ён адносіць без усякага абгрунтавання метады мадэліравання, сінтэзу, аналізу, аналогіі, якія звычайна ў падобных класіфікацыях адносяць да агульналагічных метадаў, да агульнанавуковых метадаў[22]. У. Н. Сідарцоў, прапаноўваючы ўласны варыянт класіфікацыі метадаў гістарычнага даследавання, адносіць некаторыя метады як да агульналагічных ці філасофскіх метадаў, так і да такой разнавіднасці агульнанавуковых метадаў, як агульналагічныя прыёмы (метады

[21] Лукашевич В. К. Анатомия научного метода. Мн., 1999. С. 55.

[22] Современные концепции естествознания. Р.-на-Д., 1999. С. 8—9.

абагульнення і параўнання), або і да такой разнавіднасці іх, як метады тэарэтычнага даследавання (метад мадэлявання)[23]. Аўтары згаданага намі ў п. 1 падручніка "Философия для аспирантов" (Р.-на-Д., 2000) увогуле адносяць да агульналагічных метадаў і прыёмаў сістэмны падыход, структурна-функцыянальны метад і імавернасна-статыстычныя метады, г. зн. тыя сродкі даследавання, якія звычайна вызначаюцца як адпаведна агульнанавуковы падыход, тэарэтычны метад навуковага пазнання, спецыяльна-навуковыя метады.

Дапушчальна выдзяляць і розныя тыпы ўзроўняў даследавання (або навуковага пазнання). У залежнасці ад ступені агульнасці дапушчальна выдзяляць агульны і прыватны тыпы даследавання. У залежнасці ад функцыянальнага кірунку пазнання — апісальны, тлумачальны, прадказальны ўзроўні; у залежнасці ад сувязі з ведамі — фактуальны, канцэптуальны, тэарэтычны ўзроўні даследавання. Калі прытрымлівацца апошняй тыпалогіі, то сцвярджэнне Г. М. Сагановіча пра ваенна-палітычнае становішча Маскоўскай дзяржавы ў 1659 г. прымальна адносіць да вынікаў фактуальнага ўзроўню даследавання, а сцвярджэнне М. В. Доўнар-Запольскага пра тое, што акт Люблінскай уніі не спыніў самастойнасці ВКЛ, належыць адносіць да вынікаў канцэптуальнага ўзроўню даследавання.

Прытрымліванне толькі адзінай тыпалогіі ўзроўняў навуковага пазнання (эмпірычны — тэарэтычны ўзроўні) большасцю навуказнаўцаў абумоўлена ў пэўнай ступені зыходжаннем імі са спекулятыўнай устаноўкі І. Канта пра існаванне толькі двух узроўняў ("ствалоў") пазнання. Паводле аналогіі з традыцыяй выдзялення двух узроўняў пазнання [пачуццёвага і разумовага (рацыянальнага)], сталі выдзяляць і два ўзроўні навуковага пазнання.

Нямецкі метадолаг гісторыі Энгельберг канстатаваў, што ў 60-я гг. XX ст. "у ходзе дыскусій пра метады перыядызацыі гісторыі было ўстаноўлена, што немагчыма адшукаць адзіны і універсальна значны крытэрый упарадкавання гістарычных падзей"[24]. На наш погляд, не будзе перабольшаннем падобны пункт гледжання і ў адносінах да распрацоўкі крытэрыяў, якія дазваляюць ствараць тыпалогіі ведаў, метадаў і ўзроўняў даследавання. Таму ў мэтах навуказнаўчага (у тым ліку і гісторыказнаўчага) даследавання дапушчальна выка-

---

[23] Сидорцов В. Н. Методология исторического исследования (механизм творчества историка). Мн., 2000. С. 17, 21.

[24] Современные исследования по философии истории. Ч. 1 М., 1977. С. 67.

рыстоўваць розныя (г. зн. і неаптымальныя) падзелы ведаў, метадаў і ўзроўняў даследавання.

## 6. ГІСТАРЫЧНАЕ АПІСАННЕ І ТЛУМАЧЭННЕ

У гэтым параграфе мы паставілі на мэту не толькі даць дэфініцыю паняццям гістарычнага апісання і тлумачэння, але і высветліць, па магчымасці, гнасеалагічныя, эпістэмалагічныя і метадолаганавуковыя аспекты (і адрозненні ў змесце) паняццяў навуковага апісання і тлумачэння.

А. І. Ракітаў, адзначаючы, што адэкватных дэфініцый апісання ў метанавуковай літаратуры не знайсці, аналізуе канкрэтныя выпадкі гістарычнага апісання, разглядае розныя аспекты яго і тым не менш таксама не дае дэфініцыі паняцця гістарычнага апісання[1].

Мы прапануем кароткую дэфініцыю паняцця навуковага апісання, якая ўзгадняецца з дэфініцыяй паняцця апісання ў межах гнасеалогіі: навуковае апісанне — гэта фіксацыя вынікаў даследавання пэўнага аб'екта (пэўных з'яў), у якіх раскрываецца становішча спраў, датычнае яго. Эпістэмалагічна прымальна вызначаць апісанне як фіксацыю вынікаў эмпірычнага даследавання пэўнага аб'екта. Калі лічыць апісанне фіксацыяй вынікаў вывучэння аб'ектаў як на эмпірычным, так і на тэарэтычным узроўнях даследавання, то ў адпаведнасці з гэтым належыць адрозніваць у межах эпістэмалогіі, у тым ліку і тэрміналагічна, розныя формы апісання: эмпірычнае апісанне як фіксацыю вынікаў эмпірычнага даследавання аб'екта; тэарэтычнае апісанне — тэарэтычныя мадэлі даследуемых з'яў, фіксацыю вынікаў вывучэння аб'екта пераважна з дапамогай тэарэтычных тэрмінаў. Дапушчальна выдзяляць і спецыяльнае апісанне, фіксацыю вынікаў вывучэння пэўнага аб'екта ў спецыяльных мэтах; да такой формы апісання адносіцца, напрыклад, палеаграфічнае апісанне рукапісаў.

Апісанне — гэта функцыя розных форм ведаў — эмпірычных залежнасцяў, фактаў, канцэпцый, тэорый, але не законаў, паколькі законы выконваюць выключна функцыю тлумачэння. Форму выкладання гістарычнага даследавання аптымальней абазначаць тэрмінам "апавяданне", а не "апісанне". Этап даследавання, які заключаецца ў фіксацыі дадзеных назіранняў, вымярэнняў, эксперыментаў або выкладанні вынікаў інтэрпрэтацый крыніц, аптымальней абазначаць тэрмінам "эмпірычнае апісанне".

---

[1] Ракитов А. И. Историческое познание... Гл. 5.

У логіцы апісанне трактуецца як “прыём, падобны на вызначэнне”, прыём, які “ўжываецца ў выпадках, калі размова ідзе пра наглядна ўяўляемыя прадметы або з’явы”[2], прыём, які “…заключаецца ва ўказанні вонкавых адзнак прадмета, з’явы, падзеі. Ён мае мэтай замяніць непасрэднае сузіранне аб’ектаў і з’яўляецца як бы ўзнаўленнем адзінкавага прадмета, напрыклад горада, ваеннай бітвы, пэўнай асобы”. У падобных вызначэннях апісання як лагічнай працэдуры маецца няўзгодненасць: дэфініцыя трактуецца як працэдура, якая датычыцца і паняццяў, і прадметаў (аб’ектаў); адны прыёмы, якія падобны на дэфініцыю (апісанне, характарыстыка), датычацца толькі прадметаў; іншыя прыёмы, падобныя на дэфініцыю (адрозненне, параўнанне), датычацца і прадметаў (аб’ектаў) і паняццяў[3]. На наш погляд, лагічную працэдуру апісання прымяніцельна да гістарычных даследаванняў належыць вызначаць (або дадаваць да вызначэння) як ўзнаўленне канкрэтных прадметаў.

Шматзначнае слова “апісанне” ў логіцы заменена тэрмінам “дэскрыптыўнае выказванне”, што абазначае “…выказванне, галоўнай функцыяй якога з’яўляецца апісанне рэчаіснасці”[4]. Заўважым, што такое вызначэнне тэрміна “дэскрыптыўнае апісанне” недасканалае, паколькі ў выказванні, галоўнай функцыяй якога з’яўляецца апісанне, могуць апісвацца і не рэчаісныя працэсы і адносіны. Больш дакладным, на нашую думку, з’яўляецца наступнае логіка-эпістэмалагічнае вызначэнне (або дэфінітыўнае апісанне) паняцця навуковага апісання: апісанне — гэта функцыя ведаў, якая заключаецца ў адпаведнасці выказвання (або сукупнасці выказванняў) прадметнай вобласці пэўнага даследавання. Прычым апісанне можа мець розную ступень адпаведнасці апісваемаму.

В. Н. Пераверзеў, даючы дэфініцыю паняцця апісання: “Апісанне — фіксацыя вынікаў назірання тых ці іншых аб’ектаў з дапамогай тэрмінаў. У тым выпадку, калі фіксуюцца вынікі назірання эмпірычных аб’ектаў, мае месца эмпірычнае апісанне, а ў тым выпадку, калі фіксуюцца вынікі назірання абстрактных аб’ектаў, мае месца тэарэтычнае апісанне (дэскрыптыўная фармалізацыя). Апісанне — найбольш простая пазнавальная функцыя тэорыі”, трактуе апісанне пераважна эпістэмалагічна, што некалькі непаслядоўна, улічваючы тое, што ў дэфініцыі тлумачэння ён схіляецца да логіка-гнасеалагіч-

---

[2] Войшвилло Е. К., Дегтярев М. Г. Логика. С. 272.

[3] Курбатов В. И. Логика... С. 143.

[4] Краткий словарь по логике... С. 28.

най трактоўкі апошняга: "Тлумачэнне — раскрыццё сутнасці чагонебудзь, выяўленне тых дэдуктыўных узаемасувязяў паміж абстрактнымі аб'ектамі, у моц якіх маюць месца тыя ці іншыя веды пра даследуемы прадмет ... Тлумачэнне мае перадумовай апісанне некаторых зыходных ведаў пра аб'ект ... а таксама апісанне некаторых дадатковых ведаў больш агульнага характару ... тлумачэнне ў канчатковым выніку ўяўляе сабой нейкую лагічную выснову"[5].

У падобных дэфініцыях паняцця апісання яно падганяецца пад стандарт тыпу апісання, характэрнага для прыродазнаўчых дысцыплін. На самой справе ў гістарычным даследаванні адсутнічаюць вынікі непасрэднага назірання з'яў. Вынікі назіранняў, зафіксаваныя ў пісьмовых крыніцах, трактуюцца ў метадалогіі гісторыі не як апісанні, а як гістарычныя сведчанні, крынічныя дадзеныя. Назіранне абстрактных аб'ектаў — яўнае нацягванне, калі не спекулятыўнае меркаванне, улічваючы тое, што назіранне трактуецца звычайна як метад эмпірычнага даследавання, г. зн. даследавання аб'ектаў, дадзеных пачуццёва і ў практычнай дзейнасці. Акрамя таго, дэфініцыя апісання як тэрмінафіксацыі вынікаў назірання (ці нават выказванняў апавядальнага характару) і разам з тым як функцыі тэорыі з'яўляецца супярэчлівай (ва ўсякім разе неадкарэліраванай). Паколькі факты прымальна трактаваць як веды, якія з'яўляюцца вынікам назіранняў, то апісанне як тэрмінафіксацыю такіх вынікаў належыць трактаваць як тэкставыя ўвасабленні фактаў. Але, як вядома, факты агульнапрынята вызначаць як апісанні рэчаіснага становішча спраў, г. зн., інтэрпрэтуючы ў адпаведнасці з прыведзенай дэфініцыяй, як тэрмінафіксацыі такога становішча, што, пэўна, супярэчліва.

Дакладней вызначаць факты як веды пра рэчаісны стан спраў, а апісанні — як тэрмінаўвасабленні фактаў, ці як у гісторыцы — рэканструкцый, больш простай формы ведаў у параўнанні з фактамі. У гэтым выпадку калі зыходзіць з палажэння (якое неаптымальнае), паводле якога апісанне, тлумачэнне і прадказанне — гэта не функцыі ведаў, а стадыі даследавання, то належыць сцвярджаць, што на іх адпаведна назапашваюцца эмпірычныя дадзеныя пра з'явы, эмпірычныя залежнасці паміж імі, раскрываецца сутнасць даследуемых з'яў, прадбачыцца надыход з'яў, вылічаюцца яго крокі.

У згаданым вышэй вучэбным дапаможніку "Методология истории" у адным месцы яго апісанне атаясамляецца з апавяданнем ("рассказом"); у другім месцы апавяданне пра мінулае трактуецца ўжо як

[5] Переверзев В. Н. Логистика. М., 1995. С. 163—164.

"прадмет гісторыі"[6], што, па меншай меры, непаслядоўна. Цяжка зразумець, як магчыма пад апавяданнем — формай выкладання гістарычных ведаў уяўляць прадмет гісторыі, пэўныя бакі аб'екта гісторыі.

Такім чынам, гістарычнае апісанне аптымальна вызначаць як спосаб узнаўлення аб'екта гістарычнага пазнання — гістарычных з'яў шляхам фіксацыі вынікаў эмпірычнага даследавання адносна яго. Прымальна трактаваць гістарычнае апісанне і як функцыю ведаў (пераважна такой іх формы, як рэканструкцыя з'яў), у якіх адбіты розныя моманты, аспекты эмпірычнага даследавання гістарычных з'яў (у адрозненне ад прыродазнаўства, у якім эмпірычнае даследаванне мае асновай назіранне, вымярэнне, эксперыменты, у гісторыцы яно мае асновай інтэрпрэтацыю дадзеных крыніц), з дапамогай тэрміналогіі.

Гістарычнае апісанне, асабліва калі яно выкладаецца ў форме апавядання, у параўнанні з апісаннямі, здзейсненымі ў іншых навуковых дысцыплінах, мае значную колькасць недакладнай тэрміналогіі, метафарычных выразаў, алегарычных выказванняў (на некаторыя з іх звяртаем увагу ў п. 12), што, зразумела, дэфармуе вынікі строгага даследавання, складаючай часткай якога з'яўляецца ўжыванне адназначнай тэрміналогіі.

А. Данто, высвятляючы лагічную структуру апавядання, пераканаўча паказвае, што "...апавяданне ўжо па свайму характару ўяўляе сабой некаторую форму тлумачэння". Ён сцвярджае, што "...паведамленне пра тое, што здарылася, і тлумачэнне ... адбываюцца адначасова, апавяданне тлумачыць, паведамляе пра тое, што адбылося, яно гэта тлумачыць. Апісанне з дапамогай апавядання і гістарычнае тлумачэнне складаюць адно цэлае"[7]. А. Данто атаясамлівае ў пэўнай ступені апавяданне (як адну з форм тлумачэння) з апісаннем, а для пабудовы несупярэчлівай гісторыказнаўчай канцэпцыі ведаў зместы паняццяў апісання і тлумачэння перакрыжоўваць нельга. Але аптымальна ўжываць тэрмін "апавяданне" ў значэнні адной з форм гістарычнага выкладання, а тэрміны "апісанне" і "тлумачэнне" — у адпаведнасці з іх вызначэннем як функцый ведаў. У адпаведнасці з такім пунктам гледжання апавяданне (ці наратыў) як форма выкладання ведаў непрымальна характарызаваць як тлумачэнне (функцыю ведаў). Такое метатэарэтычнае апісанне прымальна ў тым выпадку, калі не ўжываць тэрмін "naratiwe" ў якасці пэўнай формы выкладання і пэўнай формы тлумачэння гістарычных з'яў, а мець два розныя

---

[6] Методология истории... С. 22, 137.

[7] Данто А. Аналитическая философия истории. М., 2002. С. 194.

тэрміны для абазначэння пэўнай формы апісання і пэўнай формы выкладання (у беларускай мове — "апавяданне" і "наратыў"). Апавяданне як форма тлумачэння заключаецца ў тлумачэнні паслядоўнасці адбыцця падзей, з'яў на мове паняццяў штодзённага пазнання.

Е. Тапольскі выдзяляе ў 5-й частцы (п. 21) кнігі "Metodologia historii" 5 тыпаў гістарычнага тлумачэння, у тым ліку і дэскрыптыўнае тлумачэнне[8], што на першы погляд дзіўна (супярэчлівы ўжо тэрмін "дэскрыптыўнае тлумачэнне"), паколькі пад апісаннем і тлумачэннем як пазнавальнымі зместамі звычайна маюць на ўвазе аднапарадковыя паняцці пэўных функцый тэорыі (і гэта будзе эпістэмалагічнай трактоўкай тлумачэння). Але Е. Тапольскі стварае паняцце дэскрыптыўнага тлумачэння як тып гістарычнага тлумачэння такім чынам, што ўключае сярод адзнак яго і адзнакі паняццяў іншых тыпаў тлумачэння. Такое паняцце, на яго думку, магчыма ствараць, паколькі гістарычнае апісанне змяшчае ў сабе ўсемагчымыя тыпы (у яго — "формы") тлумачэнняў. Аўтар кнігі не размяжоўвае поўнасцю змест паняццяў апісання і тлумачэння, таму што атаясамлівае ў пэўных выпадках апісанне і апавяданне. У. Дрэй, як было адзначана у п. 3, абгрунтоўваў супрацьлеглы погляд, паводле якога апавяданне — гэта не форма тлумачэння. Пад апавяданнем (або наратывам, ад англійскага "narative") у межах метадалогіі гісторыі трэба разумець першапачатковую гістарычную форму выкладання вывучэння гістарычных з'яў. Праблемны разгляд, іншая форма такога выкладання, узнікае значна пазней.

Тэрміны "навуковае апісанне" і "навуковае тлумачэнне" не ўжываюцца ў эпістэмалогіі (і шырэй — у навуказнаўстве) строга ў значэнні пэўных функцый тэорыі. Таму пры аналізе навуказнаўчых тэкстаў трэба звяртаць на гэта пільную ўвагу, а для пазбягання супярэчлівасцяў належыць уводзіць новыя навуказнаўчыя тэрміны, якія будуць разгружаць шматзначныя тэрміны. "Кажучы пра тлумачэнне як функцыю тэорыі, перш за ўсё маюць на ўвазе ўключэнне выказвання, якое апісвае дадзеную з'яву, падзею, сітуацыю, у мноства выказванняў, будуючых тэорыю ... тлумачэнне заключаецца ва ўключэнні эксплanандума ... у лік вытворчых выказванняў тэорыі"[9]. Такое эпістэмалагічнае вызначэнне паняцця тлумачэння прымальнае з улікам зыходжання з палажэння, паводле якога тэорыя як пазнавальная пабудова — гэта не сукупнасць сцвярджэнняў адносна пэў-

---

[8] Tapolski Jersy. Metodologia historii. W-wa., 1973. С. 473—484.

[9] Баженов Л. Б. Строение... С. 409.

нага аб'екта ў рамках навуковага пазнання, а сістэма ведаў, якая з'яўляецца інструментам практычнай дзейнасці і эмпірычнага даследавання. Няўдалая тут, на наш погляд, фармулёўка — замест "выказвання, якое апісвае" належыць выражацца "выказванне пра факты".

Тлумачэнне, як і апісанне, у навуковай літаратуры найчасцей вызначаецца як функцыя тэорыі (напрыклад: "тлумачэнне — адна з важнейшых функцый навуковай тэорыі і навукі ў цэлым"[10]). Дапушчальна, на наш погляд, трактаваць тлумачэнне шырока — як функцыю розных форм ведаў, у тым ліку і законаў. Пры дэдуктыўна-намалагічнай мадэлі навуковага тлумачэння выдзяляема адпаведная форма тлумачэння, якая заключаецца ў падвядзенні аб'екта тлумачэння (пэўных з'яў) пад пэўныя законы. Розныя мадэлі навуковага тлумачэння паказваюць на розніцу ў лагічнай структуры розных форм тлумачэння, але не адмаўляюць у вызначэнні тлумачэння як функцыі тэорыі. У межах метадалогіі навуковага пазнання тлумачэнне вызначаецца айчыннымі філосафамі як "від навуковай аргументацыі, якая арыентавана на выяўленне сутнасці даследуемага аб'екта"[11]. Зыходзячы з меркаванняў тэрміналагічнай несупярэчлівасці, паняцце такога віду аргументацыі, якая выкарыстоўваецца ў даследаваннях, належала б тэрміналагічна ўдакладняць як "тлумачэнне пры аргументацыі".

"Для тлумачэння якой-небудзь з'явы, — лічыць К. Гемпель, — неабходна выявіць яе прычыны або атрымаць тлумачэнне з якога-небудзь агульнага закона". На такі тэзіс К. Гемпеля В. С. Шмакаў слушна заўважае (хаця і з няўдалай фармулёўкай), што "...агульныя законы датычацца класаў падзей, выяўляючы ў іх заканамернасці"[12]. Сапраўды, законы тлумачаць з'явы, лагічна вызначаемыя як класы прадметаў, выяўляючы ўстойлівыя сувязі і рэгулярнасці ў іх. Канкрэтна-гістарычныя веды не тлумачаць з'явы, вызначаемыя як класы прадметаў, і адпаведна сярод іх не сустракаюцца законы. У гісторыцы пераважаюць такія віды тлумачэння, як тлумачэнне праз расказванне прычын падзей, праз пералічэнне мэт і матываў, а таксама і праз апавяданне пра ход падзей. Гэта значыць у гісторыцы маецца іншы стандарт тлумачэння, чым у прыродазнаўчых і іншых грамадазнаўчых дысцыплінах. К. Гемпель не ўлічваў спецыфікі гісторыкі, таго, што тлумачэнне праз закон як гістарычнае тлумачэнне выка-

---

[10] Краткий словарь по логике... С. 127.

[11] Лукашевич В. К. Основы... С. 65; Яскевич Я. С. Аргументация в науке. Мн., 1992.

[12] Шмаков В. С. Структура исторического знания и картина мира. М., 1990.

рыстоўваецца не ў канкрэтных, а ў сумежных гістарычных дысцыплінах, у якіх атрымліваюць веды пра тыпы з'яў, але тыпы з'яў — іншая лагічная характарыстыка, чым класы прадметаў. Такая крытыка К. Гемпеля датычыцца трактоўкі ім паняцця закона. Крытыка канцэпцыі навуковага тлумачэння К. Гемпеля У. Дрэем датычылася ўстанаўлення лагічнай структуры тлумачэння[13].

У канкрэтна-гістарычным даследаванні нярэдкім з'яўляецца тлумачэнне праз спасылку на пэўнае становішча спраў (г. зн. на факт), характар працэсу. Да такога роду тлумачэння адносім, напрыклад, наступныя сцверджанні: "Але з прычыны таго, што 60-я гады XIX ст. на Беларусі былі эпохай барацьбы, гэтая беларуская інтэлігенцыя, якая нараджалася, была не столькі прасякнута беларускім нацыянальным духам, колькі засвойвала сабе ідэю асаблівага мясцовага патрыятызму..."[14]; дамінуючае становішча ў ВКЛ займалі магнаты і шляхта беларускіх зямель, паколькі ў гэтай дзяржаве пераважала беларускае насельніцтва, панавала беларуская мова і культура.

Тое, што тлумачэнне і апісанне грамадскіх з'яў укладаецца ў рамках грамадазнаўчых дысцыплін у розныя тэарэтычныя схемы (у прыватнасці, у этналогіі маецца погляд на этнас як на адзіную супольнасць, якая гістарычна развіваецца, змяняючы са сваімі формамі і праявы і погляд, паводле якога этнас — спосаб існавання супольнасцяў у перадіндустрыяльным грамадстве, на змену якому прыходзіць такая супольнасць, як нацыя; у псіхалогіі адлюстраванне сувязяў паміж раздражняльнікамі тлумачыцца як узнікаючая без падмацавання безумоўнымі рэфлексамі і разам з тым тлумачыцца як абумоўленая менавіта пэўнымі рэфлексамі; у паліталогіі і палітычнай сацыялогіі палітычныя ўтварэнні дзеляцца на прымітыўныя, традыцыйныя, сучасныя і дзеляцца на масавыя, сегментарныя, мілітарныя, перадіндустрыяльныя і г. д.; у сацыялогіі дэвіянтных паводзін дэвіянтныя адхіленні ў паводзінах тлумачацца абумоўленымі псіхічнымі адхіленнямі, разам з тым тлумачацца абумоўленыя сумесным дзеяннем псіхалагічных і сацыялагічных фактараў) і пры тым, што тэрміналогія ў межах гэтых дысцыплін устаноўлена, паказвае на тое, што ў грамадазнаўчых дысцыплінах будуюцца, ва ўсякім разе ў большасці і на сучасным этапе іх развіцця, не навуковыя тэорыі (г. зн. у дадзеным аспекце разумеючы тэорыю як вынік даследавання, універ-

---

[13] Дрей У. Еще раз к вопросу об объяснении действий людей в исторической науке // Философия и методология истории. Благовещенск, 2001. С. 42—44.

[14] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя... С. 367.

сальны ў адносінах да тлумачэння кожнага факта, не дапускаючы альтэрнатыўных тлумачэнняў), а навуковыя канцэпцыі (г. зн. у дадзеным аспекце разумеючы канцэпцыю як вынік даследавання, наяўнасць якога не абвяргае поўнасцю і тым самым дапускае альтэрнатыўныя тлумачэнні, іншыя погляды).

Тое, што ў большасці грамадазнаўчых дысцыплін амаль не выпрацоўваюцца агульнапрынятыя канцэпцыі, навуказнаўцы (напрыклад, В. М. Розін) часта звязваюць з тым, што такія дысцыпліны сталі выдзяляцца з філасофіі толькі ў новы час[15]. Але такі тэзіс зусім не бясспрэчны. Сінергетыку пачалі распрацоўваць нядаўна, але ў ёй маецца агульнапрынятая тэорыя. Такая адсутнасць хутчэй звязана з прыродай пазнання ў грамадазнаўчых дысцыплінах. Акрамя таго, некаторыя філосафы навукі, у прыватнасці той жа В. М. Розін, праводзяць погляд, паводле якога пры гуманітарным падыходзе да даследавання “даследчыкі па-рознаму бачаць адзін і той жа эмпірычны матэрыял (з’яву) і таму па-рознаму інтэрпрэтуюць яго ў гуманітарнай навуцы”[16]. Такое сцвярджэнне, калі зыходзіць з палажэння пра недапушчальнасць тлумачэнняў, альтэрнатыўных таму, якое наяўна ў тэорыі, узгадняецца з тэзісам пра прынцыповую немагчымасць атрымліваць вынікам даследавання ў грамадазнаўчых (або, як сёння выражаюцца, “сацыяльна-гуманітарных”) дысцыплінах тэорыі.

Навуковае тлумачэнне — гэта зусім не навуковыя веды, не тэорыя і не канцэпцыя. Паняцці навуковага тлумачэння і тэорыі як сістэмы ведаў — розныя паняцці [пэўная частка філосафаў, навуказнаўцаў, гісторыказнаўцаў (напрыклад, той жа К. Гемпель) атаясамліваюць у значнай ступені паняцці навуковай тэорыі і навуковага тлумачэння]. Канцэпцыі, тэорыі, канцэптпалажэнні, тэарэтычныя схемы — не тлумачэнні, а веды, якія выконваюць (апасродкавана) функцыю тлумачэння з’яў рэчаіснасці, з’яўляючыся абагульненнем і ўпарадкаваннем вынікаў эмпірычнага даследавання. Законамі тлумачаць з’явы, інакш, законы — не кампанент тлумачэння, а структурны элемент тэорыі.

У. І. Курбатаў, разглядаючы структуру тэорыі эмпірычных навук, абгрунтоўвае пункт гледжання, паводле якога “і тлумачэнне, і прадказанне па сутнасці спраў уяўляюць лагічную выснову з тэорыі”[17]. Тлумачэнне як лагічны вывад з тэорыі — лагічнае вызна-

---

[15] Кармин А. С., Бернацкий Г. Г. Философия. С. 420.
[16] Розин В. М. Типы и дискурсы научного мышления. М., 2000. С. 81.
[17] Курбатов В. И. Логика. С. 377.

чэнне навуковага тлумачэння, якое не падыходзіць да вызначэння паняцця гістарычнага тлумачэння.

Пад гістарычным тлумачэннем аптымальна разумець функцыю гістарычных ведаў, адрозніваючы ад яго гістарычны падыход да вывучэння пэўных з'яў. Калі будаваць дэфініцыю паняцця гістарычнага тлумачэння ў адпаведнасці з гнасеалагічнай дэфініцыяй паняцця навуковага тлумачэння, без акцэнта на тлумачэнне ў якасці функцыі тэорыі, калі, напрыклад, "тлумачэнне — раскрыццё сутнасці вывучаемага аб'екта праз устанаўленне закона або сістэмы законаў, якім падпарадкоўваецца дадзены аб'ект, або шляхам устанаўлення тых адносін і сувязяў аб'екта, якія вызначаюць яго істотныя характарыстыкі"[18], то тады гістарычнае тлумачэнне вызначаецца як раскрыццё істотных аспектаў з'яў (генезісу, характару, сувязяў, прычын адбыцця, асаблівасцяў, тэндэнцый развіцця канкрэтных гістарычных з'яў) шляхам абагульнення фактаў, інтэрпрэтацыі дадзеных крыніц, выштурхоўвання гіпотэз, выкарыстоўвання метаду (прыёму) ідэалізацыі і г. д.

Пад гнасеалагічнай дэфініцыяй агульных навуказнаўчых паняццяў мы разумеем такую дэфініцыю, у якой разважаецца пра сутнасць з'яў, а не пра спецыфіку і лагічную структуру метадаў даследавання, лагічныя высновы, верыфікацыю і ўмовы ісцінасці, як належыць разважаць пра дэфініцыі іх у межах метадалогіі навуковага пазнання, логікі, эпістэмалогіі. Увогуле, мы ўпэўнены, што ў выпадку дэфініцыі паняццяў, якія абазначаюцца шматзначнымі тэрмінамі, трэба звяртаць увагу на тое, у межах якой навуковай дысцыпліны даецца дэфініцыя. У межах навуковага пазнання памылкова даваць дэфініцыю паняццяў увогуле, а не ў межах пэўнай дысцыпліны.

---

[18] Лукашевич В. К. Основы... С. 92.

# ГЛАВА 2
# НЕКАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ГІСТАРЫЯГРАФІІ
## 7. МІНІ-НАРЫС УЖЫВАННЯ ТЭРМІНА “ГІСТАРЫЯГРАФІЯ” Ў САВЕЦКІ І ПОСТСАВЕЦКІ ЧАС

Нягледзячы на тое што мы ўжо вызначылі аптымальным выразшэннем ўжываць тэрмін “гістарыяграфія” ў значэнні спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны, важна прасачыць на выразах і тэрмінах, якія ўжываюцца савецкімі і постсавецкімі гісторыкамі, ці магчымыя тут альтэрнатывы.

Сярод савецкіх вучоных мелася агульная тэндэнцыя ўстанаўлення прадметных рамак гісторыі навукі, якая заключалася “...ва ўскладненні гістарыяграфічных ідэй і паглыбленага на гэтай аснове разумення прадмета гісторыка-навуковых ідэй”. Пры гэтым адзначалася, што не высветлена, што лічыць за пачатак гістарыяграфічных ведаў[1]. Пераходзячы да асноўнай тэндэнцыі ўстанаўлення предметных рамак гістарыяграфіі, адзначым, што “эвалюцыя разумення прадмета гістарыяграфіі ў савецкай літаратуры ішла ў напрамку ад ... гісторыі гістарычнай думкі да ... гісторыі гістарычнай навукі і да ... гісторыі гістарычных ведаў, узятых ва ўсіх формах і праявах”[2]. Як вынік пашыранага тлумачэння гістарыяграфіі як навуковай дысцыпліны і новага абгрунтавання яе прадмета[3] агульнапрынятым стала вызначэнне гістарыяграфіі як навуковай дысцыпліны, якая вывучае гісторыю гістарычнай навукі[4]. Разам з тым выказвалася думка, што “прыйшоў час перадолець шматграннасць тэрміна «гістарыяграфія»... слова «гістарыяграфія» павінна ўжывацца там, дзе размова ідзе аб аналізе літаратуры па якой-небудзь праблеме”[5]. Усведамлялася, што “метадалагічны ана-

[1] Старостин Б. А. К вопросу о начале историографического знания // Методологические проблемы историко-научных исследований. М., 1982. С. 58.

[2] Сахаров А. М. О предмете историографических исследований // Методология истории и историография. М., 1981. С. 104.

[3] Шмидт С. О. О методике выявления и изучения материалов по истории исторической науки. Труды МГИАИ. Т. 22. М., 1985; Шмидт С. О. О предмете советской историографии и некоторых принципах ее истолкования // История СССР. 1962. № 1.

[4] Советская историческая энциклопедия (СИЭ). Т. 6. С. 510.

[5] Сахаров А. М. О предмете... С. 127.

ліз без апоры на гісторыка-навуковы аналіз беспрадметны", а "гісторыка-навуковы аналіз без метадалогіі не быў бы эфектыўным"[6].

Прадметнае поле дысцыпліны, якая мае найменне "гістарыяграфія", разнастайнае, яно ўключае ў сябе праблемы гісторыі і сацыялогіі навукі: развіцця навуковых суполак, адносін паміж вучонымі і дзяржаўнымі ўладамі і г. д., акрамя таго, у яго ўваходзіць і крытычны разгляд канцэпцый. Такі разгляд патрабуе эпістэмалагічнага і метадалагічнага аналізу матэрыялу. Таму нельга зводзіць гістарыяграфічнае даследаванне толькі да рэтраспектыўнага асвятлення развіцця ведаў. Гістарыяграфічныя працы ствараюцца розныя па характару. Манаграфія У. М. Міхнюка "Становление и развитие исторической науки в Советской Белоруссии (1917—1941 гг.)" (Мн., 1984) — гэта тыповая праца па гісторыі гісторыкі, у якой прасочваецца арганізацыя гістарычных даследаванняў у пэўнай краіне ў пэўны час і даецца канцэптуальны аналіз найбольш істотных для развіцця гісторыкі пэўнай краіны даследаванняў. Артыкул В. П. Грыцкевіча "Пераадолець інерцыю стылю"[7], маючы ў асноўным сюжэт пра гістарыялагічныя пабудовы адной асобы, прырошчвае гістарыяграфічныя веды: паказвае як марксісцкі падыход да гістарычных з'яў і пэўныя абставіны жыцця ўплывалі на навуковую дзейнасць Л. С. Абэцэдарскага; паказвае як, з дапамогай якіх установак будаваў канкрэтны гісторык пэўныя канцэпцыі. А вось калі ўзяць артыкул А. К. Краўцэвіча "Фарміраванне канцэпцыі генезісу ВКЛ у польскай гістарыяграфіі" ("Беларускі гістарычны часопіс", № 1, 1998), то ў ім не толькі асвятляецца і крытычна разглядаецца будова пэўнай канцэпцыі гісторыкамі пэўнай краіны, але даецца варыянт вырашэння канкрэтна-гістарычнай праблемы (інакш кажучы — дабудоўваецца пэўная канцэпцыя).

Відавочна і дыферэнцыяцыя, якая адбываецца з галіной даследаванняў пад найменнем "гістарыяграфія". Сёння для яе нельга ўстанаўліваць тыя прадметныя межы, якія былі раней, калі ў іх уціскалі гісторыю развіцця ўсіх гістарычных дысцыплін. У апошні час у межах розных спецыяльных (і дапаможных) гістарычных дысцыплін выдзяляецца гісторыя развіцця гэтых дысцыплін у якасці раздзела іх. Так, напрыканцы 80-х гадоў XX ст. канстатавалася, што "...склалася

---

[6] Очиров Д. Э. Проблема наглядности и синтез философско-методологического и историко-физического знания // Методологические проблемы историко-научных исследований. М., 1982. С. 222.

[7] Грыцкевіч В. Пераадолець інерцыю стылю // Адраджэнне. Гістарычны альманах. Вып. 1. Мн., 1995.

асобная галіна даследаванняў, прысвечаная гісторыі археалогіі"[8]. Даследаванне па гісторыі археалогіі, разам з сацыёлага-навуковым вывучэннем, уключае і аналіз вывучэння археалагічных помнікаў, рэтраспектыўнае вывучэнне развіцця археалагічных ведаў. Тэндэнцыя дыфэрэнцыяцыі зусім не азначае, што гістарыяграфія як асобная дысцыпліна страчвае свой прадмет, застаючыся толькі агульным найменнем для сукупнасці галін даследаванняў.

Разам з тым пэўныя тэмы, сюжэты гісторыі развіцця спецыяльных і дапаможных гістарычных дысцыплін па-ранейшаму ўключаюцца ў гістарыяграфічныя даследаванні, г. зн. гістарыяграфія не з'яўляецца выключна гісторыяй гісторыкі. Так, "матэрыял гісторыі археаграфіі выкарыстоўваецца ў агульнай гістарыяграфіі для пабудовы цэльнай карціны развіцця гістарычнай навукі ва ўсіх яе праявах"[9]. Прымальна выдзяляць "агульную гістарыяграфію" як раздзел гістарыяграфіі, які вывучае развіццё гісторыкі на ўсім працягу яго, але не развіццё сістэмы гістарычных дысцыплін. Але усё роўна як веды будуць атрымліваццa, у асноўным, у розных прыватных раздзелах гістарыяграфіі (напрыклад, такім яе раздзелам, як гістарыяграфія новага і найноўшага часу краін Заходняй Еўропы і Амерыкі).

Амаль у кожнай працы гісторыкі ўжываюць тэрмін "гістарыяграфія", прычым у розных значэннях. Значэнні тэрміна "гістарыяграфія", якія выкарыстоўваліся ў савецкі час у працах аб гістарычнай навуцы[10] і выкарыстоўваюцца ў постсавецкі[11], не поўна адпавядаюць практыцы, улічваючы тое, што гістарыяграфія — гэта не гісторыя гістарычнай навукі або развіцця ўсіх гістарычных дысцыплін, а гісторыя гісторыкі. Зусім невытлумачальным з'яўляецца выраз "сама гістарычная навука", які іншы раз сустракаецца ў працах аб гістарычнай навуцы[12]. Ён абазначае спекулятыўнае паняцце: яго, мабыць, не растлумачаць выразна і тыя, хто яго ўжывае. Выкарыстанне тэрміна "гістарыяграфія" ў значэнні гістарычнай навукі, гісторыі, распрацоўваемай як навука, атрымана спекулятыўным чынам у межах гнасеалогіі, якая распрацоўвалася раней, і сёння з'яўляецца архаізмам.

---

[8] Вяргей В. С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР. 1919—1941 гг. Мн., 1991. С. 3.

[9] Добрушкин Е. М. Основы археографии. М., 1992. С. 25.

[10] СИЭ. Т. 6. С. 455.

[11] Шаўчук Ігар. Гістарыяграфія // ЭГБ. Т. 3. С. 15; Біч М. В. Гістарыяграфія // БЭ. Т. 5. С. 273.

[12] СИЭ. Т. 6. С. 455, 588.

Немэтазгодна абазначаць гэтым тэрмінам сукупнасць даследаванняў гістарычных з'яў, якія аб'яднаны агульнымі рысамі, паколькі для абазначэння гэтага дастаткова будзе ўжывання выразаў "даследаванні пэўнай плыні (кірунку, школы) гісторыкі". Такую плынь, калі разумець пад ёй сукупнасць поглядаў пэўных гісторыкаў, дакладней абазначаць не тэрмінам "гістарыяграфічная плынь", а тэрмінам "гістарычная (або гістарыялагічная) плынь". Пры ўжыванні выразу "гістарыяграфія пэўнага раздзела гісторыі" для абазначэння сукупнасці даследаванняў па пэўнаму раздзелу гісторыкі не ўлічваюць таго, што пад гістарыяграфіяй належыць разумець не падобныя сукупнасці, а вывучэнне такіх сукупнасцяў, у першую чаргу наяўных у даследаваннях канцэпцый гістарычных з'яў. Сукупнасць канкрэтна-гістарычных даследаванняў — аб'ект гістарыяграфіі, але не значэнне тэрміна "гістарыяграфія".

Не зусім зразумелы без дадатковага тлумачэння выраз "гістарыяграфія БССР", які быў распаўсюджаны некалькі раней (гл., напрыклад: Копысский З. Ю., Чепко В. В. Историография БССР. Эпоха феодализма. Мн., 1986): калі ён абазначае раздзел гістарыяграфіі, у якім асвятляецца развіццё даследаванняў па гісторыі Беларусі, то аптымальна выражацца "гістарыяграфія гісторыі БССР", калі — раздзел гістарыяграфіі, у якім асвятляецца развіццё гісторыі грамадства ("гісторыкі") у пэўнай краіне, то належыць і выражацца адпаведна "беларуская савецкая гісторыя грамадства (гісторыка)" або "гісторыка ў БССР". Выраз "гістарычная навука ў БССР" абазначае больш шырокае паняцце, паколькі да сістэмы гістарычных дысцыплін адносяць не толькі гісторыку, але і археаграфію, археалогію і г. д.

Некаторыя сучасныя навукоўцы ўжываюць выраз "традыцыйны накірунак савецкай гістарычнай навуцы", разам з тым прыбягаюць для перадачы паняцця такога кірунка і да выразу "савецкая гістарыяграфія"[13]. Класік айчыннай гісторыкі М. В. Доўнар-Запольскі ўжываў выраз "польскія і рускія працы па вывучэнні Беларусі", а не "гістарыяграфія гісторыі Беларусі", і выраз "польская гістарычная навука" замест "польская гістарыяграфія"[14]. Класік айчыннага крыніцазнаўства М. М. Улашчык трактаваў гістарыяграфію неадназначна: "Гістарыяграфія — гэта спіс прац на вызначаную тэму, хаця б і з кароткім іх зместам. Гістарыяграфія павінна паказаць змену пунктаў погляду роз-

---

[13] Грыцкевіч В. Пераадолець... С. 127, 135.

[14] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя... С. 370—371.

ных аўтараў, развіццё ідэй"[15]. У. І. Пічэта выкарыстоўваў розныя гісторыказнаўчыя выразы, што бачна з назваў артыкулаў: "Новыя працы па гісторыі Беларусі", "Гісторыя Беларусі ў савецкай гістарыяграфіі".

Ужыванне тэрміна "гістарыяграфія" ў розных значэннях ускладняе разуменне яго ў гістарычнай і гісторыказнаўчай літаратуры. А. П. Грыцкевіч, аналізуючы навуковую спадчыну Ус. М. Ігнатоўскага і робячы агульную ацэнку працы "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", адзначае, што "яна была першай ступенню ў распрацоўцы гісторыі Беларусі як самастойнага прадмета" (г. зн. у распрацоўцы пэўнага раздзела гісторыкі), што Ус. М. Ігнатоўскі "прыняў новы падыход да гістарычных фактаў" (г. зн. марксісцкі) і што яго праца на аснове такога падыходу "застаецца да нашага часу адным з каштоўных твораў беларускай гістарыяграфіі"[16]. Ахарактарызаваную з дапамогай выразу "беларуская гістарыяграфія" дадзеную працу прымальна разумець і як уклад у айчынную гісторыку (шырэй — у гістарычную навуку Беларусі), і як уклад у нацыянальны кірунак у даследаваннях па гісторыі Беларусі (прадстаўніком такога накірунку Ус. М. Ігнатоўскі з'яўляўся да 1921 г.).[17]

Паняцце гістарычнага кірунку блізка па змесце да паняцця, якое перадаецца звычайна праз выраз "нацыянальная гістарыяграфічная канцэпцыя" (мы метатэарэтычна перадаем яго праз выраз "нацыянальная гістарыялогія"). Належыць тэрміналагічна адрозніваць гістарычную канцэпцыю мінулага сваёй краіны або народа, у якой адстойваюцца гістарычныя інтарэсы сваёй нацыянальнасці (або нацыі), пэўны метадалагічны падыход да вывучэння мінулага, уласцівы для пэўных гістарычных кірункаў, і развіццё гісторыкі прадстаўнікамі пэўнай краіны (або нацыянальнасці). Пэўная нацыянальная гістарыялогія (або, як сёння звычайна кажуць, "гістарыяграфія") не абавязкова распрацоўвае нацыянальную гістарычную (або, як прынята выражацца, "гістарыяграфічную") канцэпцыю, нацыянальна пазітыўна арыентаваную канцэпцыю мінулага свайго этнасу; менавіта так развівалася гісторыка ў БССР. Прадстаўнікі нацыянальнай гісторыкі ("гістарыяграфіі") могуць

---

[15] Улашчык М. М. Заўвагі на некаторыя раздзелы рукапісу "Белоруссия в XIII — середине XVI в." // БГА. Т. 3. Сш. 1. Травень 1996. С. 31.

[16] Грыцкевіч А. П. Погляды У. М. Ігнатоўскага на гісторыю Беларусі феадальнага перыяду // Акадэмік У. М. Ігнатоўскі: Матэрыялы навуковых чытанняў, прысвечаных 110-годдзю з дня нараджэння. Мн., 1993. С. 56.

[17] Мялешка В. І., Палуян У. А. Гісторыя, археалогія // Інстытут беларускай культуры. Мн., 1993. С. 88.

прытрымліваццa метадалагічнага падыходу не нацыянальнага, а інша-га кірунку. Напрыклад, некаторыя гісторыкі Рэспублікі Беларусь, працягваючы прытрымлівацца традыцыйнага "вялікадзяржаўнага" кірунку пры распрацоўцы гісторыі Беларусі, абгрунтоўваюць погляд, паводле якога да 1918 г. беларускі этнас не меў сваёй дзяржаўнасці.

У вышэй разгледжаных выпадках ужывання тэрміна "гістарыяграфія" размова ідзе пра распрацоўку гісторыі гісторыкі краіны, развіццё пэўнага раздзела гісторыкі. І. М. Ігнаценка і А. С. Кароль, адзначаючы, што Ус. М. Ігнатоўскі "стаяў ля вытокаў нацыянальнай гістарыяграфіі", ужывалі тэрмін "гістарыяграфія" і ў іншым значэнні: "погляду на гісторыю", "падыходу да гістарычных падзей"[18]. У іншай працы І. М. Ігнаценка ўжываў тэрмін "гістарыяграфія" (кажучы аб савецкай гістарыяграфіі) у значэнні навуковага погляду на гістарычную праблему і больш шырока — у значэнні ідэй і канцэпцый пэўнай традыцыі тлумачэння гістарычных з'яў[19]. З такім поспехам для абазначэння гэтага прымальна выкарыстоўваць і іншы тэрмін, аднак не такі шматзначны, напрыклад тэрмін "гістарыялогія".

Важнасць устанаўлення прадметных рамак (прадмета) гістарыяграфіі для айчыннай гісторыкі мы бачым у тым, што яно дазваляе суразмерваць прадметныя палі гістарыяграфіі і метадалогіі гісторыі пры распрацоўцы вучэбных курсаў для студэнтаў, пры складанні праграмы-мінімум для здачы кандыдацкага мінімуму па спецыяльнасці з шыфрам — 07.00.09.

## 8. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ЯК НАВУКОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Гістарыяграфію трэба вызначаць менавіта як спецыяльную гістарычную дысцыпліну таму, што ў яе межах вынікі даследаванняў не прызначаны для "абслугоўвання" гісторыкі і для набыцця канкрэтна-гістарычных ведаў, а маюць уласную каштоўнасць. У яе рамках не праводзіцца мяжа паміж вывучэннем развіцця гісторыкі і крытыч-

[18] Ігнаценка І. М., Кароль А. С. Ігнатоўскі — гісторык // Акадэмік У. М. Ігнатоўскі... С. 36—37.

[19] Ігнаценка І. М. Беларусь напярэдадні і ў першыя гады савецкай улады // Нарысы гісторыі Беларусі. Ч. 2. Мн., 1995. С. 56.

ным разглядам гістарычных канцэпцый. Гістарыяграфія мае спецыфічны дысцыплінарны статус, што праяўляецца ў неўключэнні яе ў склад такой спецыяльнасці, як гісторыя навукі і тэхнікі ў Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых работнікаў Рэспублікі Беларусь. Калі выдзяляць навуказнаўства ў якасці асобнай сістэмы дысцыплін, то гістарыяграфія не будзе ўваходзіць у яе.

Сёння вучоныя звычайна дастаткова выразна фармулююць аб'ект і прадмет (прадметныя рамкі) гістарычных дысцыплін, зусім дастаткова для падкрэслівання іх даследчай адметнасці. Так, фармулюецца, што "аб'ект крыніцазнаўства — сукупнасць гістарычных крыніц, прадмет — вывучэнне крыніц ... у задачы методыкі ўваходзіць крытыка крыніц..."[1] Не выклікае асаблівых непаразуменняў і вызначэнне прадметных рамак гістарыяграфіі. А. В. Кліменка ў главе 1-й т. 1 вучэбнага дапаможніка для ВНУ ў двух тамах "Историография истории России до 1917 г." (М., 2003) дастаткова падрабязна і выразна вызначае кола задач гістарыяграфіі як спецыяльнай гістарычнай дысцыпліны, таму пры пералічэнні такіх задач мы адсылаем да гэтага дапаможніка.

Выклікае непаразуменне пры знаёмстве з дадзеным дапаможнікам тое, што А. В. Кліменка, спасылаючыся на працы Н. Л. Рубінштэйна, Р. А. Кірэевай, Н. І. Калеснік, адносіць фарміраванне гістарыяграфіі як самастойнай навуковай дысцыпліны (у Расіі) да XIX ст.; разам з тым у ім выдзяляецца, у прыватнасці, старажытнаруская гістарыяграфія. Тэрміналагічнае ўзгадненне патрабуе тут іншага выразу; прымальна будзе казаць пра старажытнарускую гістарыялогію.

Адзначым, што трактоўкі гістарыяграфічнага даследавання, якія даюцца гістарыёграфамі і гісторыказнаўцамі, іншы раз даволі супярэчлівыя, а прадметнае поле гістарыяграфіі ўсталёўваецца па-рознаму. Так, В. В. Касалапаў, лічачы, з аднаго боку, што "гістарыяграфічнае даследаванне ... прадстаўляе сабой тэорыю даследавання той ці іншай тэмы ... Задачай гістарыяграфічнага аналізу з'яўляецца гісторыя саміх гістарычных ведаў ... гістарыяграфія не ахоплівае ні метадалагічных, ні лагічных, ні гнасеалагічных ведаў", з другога боку, сцвярджае, што "па сваіх задачах і мэтах гістарыяграфія прадугледжвае ... глыбокі і змястоўны аналіз гістарычных ідэй..."[2] Гэтым тэзісам ён схіляецца ў значнай ступені да думкі пра неад'емнасць у гістарыяграфічным даследаванні метадалагічнага, лагічнага і гнасеалагічнага аналізу.

---

[1] Грыцкевіч Валянцін. Крыніцазнаўства //ЭГБ. Т. 4. С. 276—277.

[2] Косолапов В. В. Методология... С. 253—255.

Т. А. Валодзіна, падводзячы вынікі дыскусій 60-х гадоў XX ст. расійскіх гісторыкаў па тэарэтычных праблемах гістарыяграфіі, паведаміла, што "...удзельнікі дыскусій сышліся на меркаванні, што гістарыяграфія з'яўляецца гістарычнай навукай, а па змесце ўключае ў сябе такія фактары развіцця навукі, як агульная канцэпцыя гістарычнага працэсу, даследчая праблематыка, прыёмы даследавання, новыя метадалагічныя пытанні, уключэнне новых крыніц, новыя арганізацыі форм навукі", а пазней у прадмет гістарыяграфіі былі ўнесены сацыяльныя аспекты развіцця гістарычных дысцыплін, гістарычная свядомасць[3]. Падтрымліваючы вызначэнне статуса гістарыяграфіі як гістарычнай, а не навуказнаўчай дысцыпліны, мы абгрунтоўваем погляд, паводле якога такія прадметныя палі, як разгляд канцэпцый сусветнагістарычнага працэсу, агульныя пытанні метадалогіі гістарычнага даследавання, адносяцца, насуперак вынікам згаданай дыскусіі, меркаванням некаторых айчынных гісторыкаў і гісторыказнаўцаў, да прадметных рамак метадалогіі гісторыі (або, пашыраючы апошнія, — да гісторыказнаўства), але не гістарыяграфіі. Тэматыкай гістарыяграфіі з'яўляецца ўплыў універсальных і прыватных канцэпцый гістарычнага працэсу на развіццё гістарычных даследаванняў. На памылковасць уключэння тэматыкі гісторыі філасофіі ў прадметнае поле гістарыяграфіі ўказваў А. М. Сахараў у вышэйзгаданым артыкуле.

У Рэспубліцы Беларусь распрацоўваецца пераважна адзіны раздзел гістарыяграфіі — гістарыяграфія гісторыі Беларусі. У навуковадаследчых установах краіны няма ніводнага структурнага падраздзялення, у назву якога ўваходзіла б слова "гістарыяграфія", і гэта нягледзячы на тое, што ў Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь устаноўлена спецыяльнасць з шыфрам — 07.00.09, састаўной часткай якой выдзелена гістарыяграфія. Такое становішча бачна і ў т. 3 "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", у якім змешчаны артыкул "Гістарыяграфія" і артыкул "Гістарыяграфія гісторыі Беларусі", якія напісаны супрацоўнікамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і большы за папярэдні ў 15 разоў.

За выключэннем гістарыяграфіі, у іншых навуковых дысцыплінах не ўзнікае неабходнасці ў адрозненні назвы дысцыпліны ад аднолькавага тэрміна, якія абазначае пэўны від дыскурсу, датычны гэтай дысцыпліны. Амаль кожная навуковая дысцыпліна (за выключэннем, як правіла, тых, якія існуюць непрацяглы час) мае раздзел, у

---

[3] Володина Т. А. О расширении предмета историографических исследований (к постановке вопроса) // Проблемы источниковедения... С. 312—315.

якім ажыццяўляецца рэтраспектыўнае асвятленне станаўлення і развіцця яе, у тым ліку ведаў і метадаў іх атрымання. Іншы раз галіны даследаванняў, звязаныя з падобным асвятленнем, аб'ядноўваюць у адну комплексную дысцыпліну пад найменнем "гісторыя навукі" з мноствам адпаведных раздзелаў. Разуменне гістарыяграфіі як сферы пабудовы гістарычных ведаў канчаткова заблытвае сваеасаблівасць такога ўжывання наймення, як "гістарыяграфія".

У іншых сістэмах дысцыплін для галін даследаванняў, звязаных з вывучэннем іх развіцця, не ўзнікла неабходнасці ва ўтварэнні найменняў "фізікаграфія", "соцыёграфія" і г. д. Такое ўтварэнне адлюстроўвае спецыфіку спецыяльна-гістарычнага даследавання, ды і гістарычнага пазнання ў цэлым. Канкрэтна-гістарычнае даследаванне ажыццяўляецца такім чынам, што ў ім набывае істотнае значэнне прадметна-змястоўнае вывучэнне, у тым ліку, і крытыка вынікаў даследавання, перш за ўсё канцэпцый. Ажыццяўленне такога вывучэння патрабуе выдзялення яго ў якасці спецыяльнай дысцыпліны, якая не ўваходзіць у склад гісторыі навукі, пад найменнем "гістарыяграфія", у адрозненне ад іншых сістэм дысцыплін, у якіх гісторыя фізікі, гісторыя сацыялогіі і г. д. не выдзяляюцца як спецыяльныя дысцыпліны, а з'яўляюцца толькі раздзеламі гісторыі навукі.

Крытычнае вывучэнне канкрэтных гістарычных крыніц і крытычнае вывучэнне канкрэтна-гістарычных даследаванняў ажыццяўляецца гісторыкамі ў якасці састаўной часткі даследавання па пэўнай тэме або праблеме (напрыклад, этнагенезісу беларусаў), якое імі праводзіцца. Такую дзейнасць дапушчальна лічыць крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай, але памятаючы, што гэта не крыніцазнаўчае і гістарыяграфічнае даследаванне (г. зн. спецыяльна-гістарычнае), а толькі частка канкрэтна-гістарычнага даследавання. Пэўная гістарыяграфія — гэта вывучэнне развіцця арганізацыі гістарычных даследаванняў, іх вынікаў і метадаў, гісторыя гісторыкі пэўнага часу, пэўнай краіны.

Гістарыяграфія гісторыі пэўнай краіны, пэўнага раздзела гісторыкі, пэўнай гістарычнай школы (плыні, кірунку) — раздзелы гістарыяграфіі. Тое, што адносяць да гістарыяграфіі пэўнай гістарычнай тэмы (напрыклад гістарыяграфія ўзнікнення ВКЛ, гістарыяграфія ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі і г. д.), — гэта састаўная частка гістарычнага даследавання, але не пэўныя раздзелы гістарыяграфіі.

У працэсе канкрэтна-гістарычнага даследавання вывучаецца літаратура па тэме або праблеме. І іншы раз мы сустракаем ужывае-

мыя для абазначэння сукупнасці прац па пэўнай тэме або праблеме выразы “гістарыяграфія па тэме (або праблеме)” з акцэнтам на крытычны разгляд выкладзеных у ёй канцэпцый. Такое выдзяленне атрымала асаблівае найменне, якое ўключае слова “гістарыяграфія” і разам з тым служыць у якасці наймення галіны даследаванняў, звязаная з вывучэннем развіцця гістарычных ведаў.

# ГЛАВА 3
# НЕКАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ НАВУКАЗНАЎСТВА

## 9. МЕТАДОЛАГАНАВУКОВАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ

Не будзе перабольшаннем сцвярджаць пра падкрэсліванне прадстаўнікамі ўсіх навуковых дысцыплін важнасці выкарыстоўваемых імі метадалагічных сродкаў. У прыватнасці, у савецкі час шэрагам вучоных галоўнай задачай гістарыяграфіі ставілася вывучэнне развіцця метадалогіі гістарычнай навукі[1], вывучэнне метадалогіі гістарычнага даследавання, узятай у яе гістарычным развіцці, паказ развіцця і змены тэорый, з пазіцый якіх вывучаўся гістарычны працэс[2]. Лічылася, што "самым жа важным у працэсе пазнання з'яўляецца яго метадалогія ... для вывучэння гістарычнай навукі важна не толькі, якія высновы і ацэнкі атрыманы ў выніку даследавання, а перш за ўсё — якім шляхам гэтыя высновы і ацэнкі дасягнуты, на падставе якога падыходу да матэрыялу, якога светапогляду, якога разумення гісторыі ў цэлым..."[3] Разам з тым пры выкладанні сваіх уяўленняў пра іх яны выкарыстоўваюць неадкарэліраваную метадолаганавуковую (і шырэй — навуказнаўчую) тэрміналогію.

Пры вывучэнні поглядаў савецкіх навуказнаўцаў на метадалогію, выдзяляюцца два пункты погляду: 1) метадалогія — сукупнасць метадаў або вучэнне аб метадах; 2) метадалогія адрозніваецца ад метаду[4]. У гісторыказнаўчай літаратуры сустракаліся дэфініцыі: "Метадалогія гісторыі — тэорыя гістарычнага пазнання"[5] і абгрунтоўвалася, што "...метадалогія ... як тэорыя метадаў ... у метадзе прыводзіцца ў дзеянне з дапамогай методыкі ... праз "лагічныя правілы і працэдуры". А разам з тым сцвярджалася, што "метадалогія ёсць тэорыя навукова-пазнавальнай дзейнасці, накіраваная на распрацоўку метадаў навуковага пазнання..."[6]

---

[1] Сахаров А. М. О предмете... С. 112.
[2] Черепнин Л. В. Русская историография до XIX века. М., 1957. С. 11.
[3] Сахаров А. М. О предмете... С. 143—144.
[4] Зевелев А. И. Историографическое исследование: методологические аспекты. М., 1987. С. 12—13.
[5] СИЭ. Т. 9. С. 378.
[6] Ковальченко И. Д. Методы... С. 37.

Тэрмін "метадалогія" сярод савецкіх вучоных і навуказнаўцаў ужываўся і ў значэнні сукупнасці ўстановак (г. зн. стаў адпавядаць не паняццю сукупнасці метадаў прыёмаў даследавання, а паняццю сукупнасці прадпісанняў (установак), якімі рэгламентуецца правядзенне даследавання): "паняцце метадалогіі ў сваім першапачатковым значэнні трактавалася як вывучэнне метадаў даследавання. Паступова ў гэтае паняцце стаў укладацца не столькі яго першапачатковы сэнс, колькі сукупнасць афіцыйных патрабаванняў да гістарычнай навукі"[7].

Падагульнена, што да 60-х гадоў XX ст. "...сярод заходніх вучоных зацвердзіліся 2 асноўныя паняцці метадалогіі: 1) метадалогія — сукупнасць прыёмаў і спосабаў, якія выкарыстоўвае навука; 2) прынцыпы арганізацыі і даследавання, "нормы", пры дапамозе якіх афармляюцца працэдуры і тэхніка". Лічылася, што "...метадалогію не трэба змешваць з філасофіяй ... што грамадскія навукі павінны самі распрацоўваць сваю метадалогію сваімі ўласнымі намаганнямі"[8]. Доўгі час суадносіны паняцця метадалогіі з блізкімі да яго па змесце паняццямі працягвалі заставацца не зусім выразнымі.

Значны крок у дыферэнцыраваным апісанні базісных метадолаганавуковых паняццяў зрабіў У. К. Лукашэвіч. Ён выразна адрознівае метадалогію, "другую па ступені агульнасці (пасля гнасеалогіі) форму рэфлексіі над пазнавальнымі дзеяннямі ў сферы навукі"; метадалогію навуковага пазнання — "вучэнне пра метады пазнання, структуру і дынаміку навуковых ведаў"; навуковы метад — "сістэму прадпісанняў, якія рэгламентуюць пазнавальныя дзеянні даследчыка"; метады навукі — існуючыя ў навуцы метады; акрамя таго, выдзяляе паняцце метаду пазнання[9].

Сучасны беларускі метадолаг гісторыі, актыўны ўклад якога ў арганізацыю гісторыказнаўчай дзейнасці ў краіне нельга не адзначыць, У. Н. Сідарцоў вызначае метадалогію гісторыі як "даследаванне практычных праблем пазнання гісторыі, яе прыроды, прынцыпаў і метадаў". Пры такой фармулёўцы ў прадметнае поле метадалогіі гісторыі ўключаюцца і праблемы гнасеалогіі і эпістэмалогіі. Ім адзначаецца, што "перад ёй (метадалогіяй гісторыі. — *Ю. Н.*) стаіць важная задача па ўдасканаленні паняційнага апарату", выкарыстоўваемага ў

---

[7] Костюк М. П. Современные подходы к историческим исследованиям и национальная концепция истории Беларуси // Метадалагічныя праблемы гістарычнай навукі. Мн., 1993. С. 43.

[8] Стефанов Н. Теория и метод в общественных науках. С. 156.

[9] Лукашевич В. К. Анатомия ... С. 14, 89—90, 55, 70, 117.

гістарычных даследаваннях. Некалькі дзіўна фармулюецца У. Н. Сідарцовым думка пра функцыі дадзенай дысцыпліны: "...метадалогія (даследавання, гісторыі? — *Ю. Н.*) дае магчымасць трымаць навукова значнае разуменне гістарычнай рэальнасці..."[10], бе тлумачэння паняцця, абазначаемага апошнім выразам.

Вядучы польскі метадолаг гісторыі Е. Тапольскі ў 2-й частцы "Прадмет метадалогіі гісторыі" згаданай вышэй кнігі абгрунтоўвае метадалогію гісторыі як асобную навуковую дысцыпліну, якая складаецца з трох раздзелаў: 1) прагматычнай; 2) апрагматычнай; 3) прадметнай метадалогіі гісторыі; апошняя разумеецца ім як, прынамсі, філасофія гісторыі[11]. Пры такім падзеле штучна аб'ядноўваюцца ў прадметныя рамкі адной дысцыпліны часткі прадметных палёў розных дысцыплін — метадалогіі гісторыі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства.

І беларускі, і польскі гісторыказнаўцы ўстанаўліваюць занадта вялізныя прадметныя межы для метадалогіі гісторыі [вялізныя ў параўнанні з іх межамі з пункту гледжання размеркавання навуказнаўчых дысцыплін, якога мы прытрымліваемся (выкладаецца ў наступным параграфе)]. Надзвычай шырокія прадметныя межы былі ўстаноўлены для метадалогіі гісторыі і ў савецкі час. Гэта была дысцыпліна, якая базіравалася на вучэнні гістарычнага матэрыялізму (якое прадстаўляла сабой "...сукупнасць тэорый, ідэй, прынцыпаў ацэнак і г. д., высунутых і абгрунтаваных К. Марксам" і іх інтэрпрэтацый"[12]) і з'яўлялася канцэптуальным інструментам не толькі гістарычнага даследавання, але і сацыялагічнага, паліталагічнага і г. д. Прадметнае поле такой метадалогіі гісторыі ахоплівала ў значнай ступені прадметныя палі сацыяльнай філасофіі, гістарыясофіі, гнасеалогіі. Акрамя таго, у яе кагнітыўных межах абгрунтоўваліся ідэалагічныя ўстаноўкі. Апошнія былі метадалагічным сродкам даследавання, прытрымліванне якіх не дазваляла гісторыкам цалкам нетэндэнцыйна падыходзіць да вывучэння гістарычных з'яў.

Занадта шырокія прадметныя межы бяруцца сёння філосафамі і для філасофіі гісторыі. Так, Я. С. Яскевіч, акрэсліваючы прадметныя рамкі філасофіі гісторыі, уключае ў іх прадметныя палі гістарыяграфіі ("разуменне прыроды гістарычнага працэсу, выяўленне грунтоўных прынцыпаў і пачаткаў гістарычнага быцця"), гнасеалогіі ("рэфлектыўна-аналітычнае асэнсаванне спецыфікі і структуры гістарыч-

[10] Сідарцоў Уладзімір. Метадалогія гісторыі // ЭГБ. Т. 5. С. 119—120.
[11] Tapolski Jersy. Metodologia... С. 31—36.
[12] Барулин А. С. Социальная философия. С. 28.

ных ведаў"), эпістэмалогіі і метадалогіі гісторыі ("раскрыццё механізмаў узаемадзеяння і спецыфікі гістарычнага апісання", "структура і метады гістарычных ведаў")[13].

А. Данто адрознівае два тыпы даследаванняў па філасофіі гісторыі: 1) субстантыўную філасофію гісторыі, пры якой займаюцца апісаннем, як ён выражаецца, "усёй гісторыі", і 2) аналітычную філасофію гісторыі, якая "...не проста звязана з філасофіяй, яна і ёсць філасофія, але філасофія, якая ўжываецца для вырашэння спецыяльных канкрэтных праблем, якія ўзнікаюць як у практыцы вывучэння гісторыі, так і ў субстантыўнай філасофіі гісторыі"[14]. Атаясамленне А. Данто метадалогіі гісторыі з філасофіяй безпадстаўнае, паколькі філасофскія дысцыпліны — такія тэарэтычныя дысцыпліны (у іх межах ствараюцца спецыфічныя тэорыі — універсальныя), якія не арыентаваны на вырашэнне практычных праблем навуковага пазнання. Арыентаваныя на вырашэнне такіх праблем тэарэтычныя дысцыпліны (у тым ліку і метадалогія гісторыі) належыць адносіць да навуказнаўчых, а не філасофскіх дысцыплін.

Навуковым дысцыплінам, у межах якіх вывучаюцца і распрацоўваюцца даследчыя сродкі, надаюць найменні, першым словам якіх выступае як "методыка" так і "метадалогія". Часта тэрмінамі "методыка даследавання" і "метадалогія даследавання" абазначаюць аднолькавае паняцце метадалагічных сродкаў даследавання, хаця аптымальней абазначаць імі розныя паняцці, адпаведна распрацоўку працэдур пэўнай даследчай дзейнасці і вывучэнне базісных сродкаў ажыццяўлення пэўнай даследчай дзейнасці. Акрамя таго, прымальна разумець пад методыкай і метадалогіяй даследавання розныя тыпы метадалагічных сродкаў даследавання. Пры меркаванні: "метадалогія ахоплівае розныя галіны тэарэтычнага пазнання, г. зн. тэарэтычныя навукі"[15] належыць лічыць, што методыка ахоплівае розныя галіны эмпірычнага пазнання.

Іншы раз выраз "метадалогія гістарычнага даследавання" ўжываецца як сінонім наймення "метадалогія гісторыі", наймення пэўнай навуказнаўчай дысцыпліны, што няўдала, улічваючы тое, што выраз "метадалогія даследавання" ўжываецца і ў значэнні сукупнасці срод-

---

13 Философия истории: основные понятия, проблемное поле, исследовательские программы. Материалы для курсов "Теоретико-методологические проблемы исторического познания". Научный поиск и инновационные технологии / Подготовлено Я. С. Яскевич. "Б. м. в.", 2002. С. 2.

14 Данто А. Аналитическая философия истории. С. 11.

15 Стефанов Н. Теория... С. 139.

каў, пры дапамозе якіх атрымліваюцца веды пра гістарычныя з'явы. Апрача так званага гістарычнага метаду, які "...як адзін з метадаў даследавання гістарычнай навукі наогул накіраваны на канкрэтнае ўзнаўленне гістарычных працэсаў ... на адлюстраванне канкрэтных падзей"[16] і які ў межах гісторыкі пераўтвараецца ў спецыяльна-гістарычныя метады (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны і г. д.), вучоныя-гісторыкі выкарыстоўваюць спецыяльныя метады іншых дысцыплін. Іншы раз яны не запазычваюць іх, а самі распрацоўваюць. Так, распрацоўка метаду сацыяльна-псіхалагічнага аналізу гістарычных з'яў у якасці антрапалагічнага падыходу да гісторыі ментальнасці прадстаўнікамі школы "Аналаў" вялася незалежна ад распрацовак прадстаўнікоў так званай сацыялогіі пазнання[17].

Прымальна падзяляць сродкі правядзення даследавання на матэрыяльныя (прыборы, пробныя аб'екты), метадалагічныя (падыходы, прынцыпы, метады, прыёмы, працэдуры), канцэптуальныя (тэарэтычныя і канцэптуальныя схемы і мадэлі) і эўрыстычныя (ідэі, гіпотэзы, фармулёўкі праблем). Прымальна выдзяляць і базісныя сродкі — пэўны метадалагічны базіс. У залежнасці ад ступені агульнасці такія сродкі прымальна падзяляць на тыпы: агульныя і прыватныя, адрозніваючы тым самым агульнаметадалагічныя і прыватнаметадалагічныя сродкі даследавання і пазначаючы іх рознымі тэрмінамі.

Зразумела, што гістарычнае даследаванне нельга ажыццявіць, не маючы метадалагічны базіс. У апошні ўваходзяць не толькі метадалагічныя, але і канцэптуальныя сродкі даследавання. Сапраўды, гістарычныя канцэпцыі і канцэптпалажэнні служаць не толькі аб'ектам гістарыяграфічнага вывучэння, але выступаюць і мадэлямі-метадамі пры правядзенні гістарычных даследаванняў ("тэарэтычныя веды — не проста абагульненне вынікаў вопыту, гэта — спосаб атрымання новых ведаў"). Паколькі "ў якасці адносна самастойнага метаду навуковага даследавання можа разглядацца тая тэорыя (веды), выкарыстанне якой у практыцы навукова-даследчай працы гарантуе правільнае вырашэнне адпаведнага тыпу задач"[18], то атрымліваецца сцвярджаць, што выкарыстанне ведаў гістарыяграфіі, а галоўным чынам менавіта гістарыяграфіі пэўнага раздзела гісторы-

---

[16] Уваров А. И. Гносеологический анализ в исторической науке. Калинин, 1973. С. 167.

[17] Гуревич А. Я. Исторический синтез и школа "Анналов". М., 1993. С. 47—48.

[18] Стефанов Н. Теория... С. 254.

кі, — спецыфічны метад даследавання, які з'яўляецца адным з базісных сродкаў правядзення канкрэтна-гістарычнага даследавання.

Возьмем, напрыклад, наступнае канцэптпалажэнне: "Мікалаеўскі ўрад паставіў мэтай абрусіць край, але не дасягнуў гэтага...", бо "меры ўрада ... не здабылі сімпатый беларускай нацыянальнасці..."[19] Яно і сёння служыць мадэллю-метадам для даследавання сацыяльна-палітычнага і культурнага развіцця жыхароў Заходняга краю Расійскай імперыі. У гістарыяграфіі адпаведнай тэматыкі не выяўлена яго тэндэнцыйнасці. Канцэптпалажэнне пра тое, што беларускія сяляне ў XVI—XVII стст. імкнуліся трапіць пад уладу рускіх цароў і гэта было прычынай антыфеадальных паўстанняў у ВКЛ[20], служыла для часткі беларускіх савецкіх гісторыкаў мадэллю-метадам для даследавання кантактаў рускага і беларускага народаў. Сёння гістарыяграфічная крытыка ацэньвае яго як неабгрунтаванае.

Гісторыкі выкарыстоўваюць звычайна не проста высновы гістарычных даследаванняў, але і вынікі іх гістарыяграфічнага разгляду. З гэтага, аднак, не вынікае, што маецца такі раздзел гістарыяграфіі, як методыка гістарыяграфіі. У савецкі час частка навукоўцаў пад метадалогіяй гістарыяграфіі разумела дапаможную гістарычную дысцыпліну, якая распрацоўвае методыку правядзення даследавання па гісторыі гістарычнай навукі[21]. Некаторыя савецкія гісторыказнаўцы, у прыватнасці Э. Лооне, адносілі да метадалогіі гістарыяграфіі вучэнне гістарычнага матэрыялізму (у асноўным — тэорыю фармацый), лічачы пры гэтым гістарыяграфію навукай у якасці нефіласофскай тэорыі гісторыі: "Гістарыяграфія — ...атрыманне, стварэнне новых ведаў аб чалавецтве"[22].

Базісным сродкам правядзення канкрэтна-гістарычнага даследавання з'яўляюцца прынцыпы і метады крытыкі крыніц. Да істотных метадалагічных сродкаў яго належыць адносіць і метад выкарыстання ведаў грамадазнаўчых дысцыплін для аналізу гістарычных з'яў. Напрыклад, этналагічны аналіз гістарычных фактаў на аснове палажэння пра тое, што этнікас адрозніваецца ад этнасу: сацыяльна-класавы аналіз фактаў на аснове палажэння пра тое, што ў грамадстве выдзяляюцца пэўныя сацыяльныя класы, якія маюць розныя адносіны да сродкаў вытворчасці і розныя палітычныя інтарэсы — прыватнана-

---

[19] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя... С. 273.

[20] Грыцкевіч В. П. Абэцэдарскі Л. С. // ЭГБ. Т. 1. С. 25.

[21] Зевелев А. И. Историографическое исследование: методологические аспекты...

[22] Лооне Ээро. Современная философия... С. 63, 65, 136, 85.

вуковыя метады, якія ўжываюцца ў гістарычным даследаванні. А вось палажэнні пра тое, што беларускі этнас склаўся пры змешванні балцкіх і славянскіх плямёнаў, што беларускае сялянства ў большасці адмоўна ставілася да правядзення калектывізацыі ў БССР, — веды археалогіі, гістарычнай лінгвістыкі, гісторыі Беларусі, якія могуць выкарыстоўвацца як канцэптуальны сродак даследавання.

Не спыняюцца дыскусіі паміж айчыннымі метадолагамі гісторыкі наконт таго, які выраз аптымальней ужываць для абазначэння сацыяльна-класавага аналізу гістарычных з'яў — "класавы метад" або "класавы падыход". Безумоўна, безпадстаўна выражацца — "класавы падыход", улічваючы тое, што падыход трактуецца як сукупнасць метадаў і прынцыпаў і ўвогуле — метадалагічных сродкаў, неабходных для распрацоўкі тэм і вырашэння праблем пэўнай навуковай дысцыпліны. Выкарыстанне гісторыкамі канцэпцыі класавай барацьбы і іншых падобных канцэпцый палітычнай сацыялогіі для аналізу гістарычных з'яў — гэта не распрацоўка імі класавага падыходу, а запазычванне міждысцыплінарнага метаду для канцэптуальнага аналізу назапашанага матэрыялу пра гістарычныя з'явы — гэта сацыялагічны падыход да вывучэння гістарычных з'яў як састаўная частка метадалагічнага гістарыялагічнага падыходу.

У працэсе развіцця навуковага пазнання выпрацоўваюцца гістарыялагічныя падыходы да вывучэння гістарычных з'яў — марксісцкі, пазітывісцкі, постмадэрнісцкі і інш. Выкарыстанне паняційнага апарату і метадалагічных распрацовак пэўных навуковых дысцыплін для вывучэння гістарычных з'яў дазваляе ствараць метады, якія тыпалагізуюцца як прыватнадысцыплінарныя метады даследавання. Разам з тым прымальна казаць пра сацыялагічны, сацыяльна-псіхалагічны, сінергетычны і г. д. падыходы да вывучэння гістарычных з'яў. Няўдала казаць пра сацыялагічны, сінергетычны і іншыя метады ў гісторыцы, г. зн. пра метадалагічны метад. Аптымальна тэрміналагічна адрозніваць такую форму падыходу да вывучэння гістарычных з'яў ад той формы падыходу, да якой адносіцца пазітывісцкі, марксісцкі і іншыя падыходы, абазначаючы апошнія праз выраз "(метадалагічна-)гістарыялагічны падыход да вывучэння гістарычных з'яў".

Такім чынам, метадалогія пэўнага (сацыялагічнага, фізічнага і г. д.) даследавання — гэта сукупнасць метадаў даследавання, прадпісанняў, метадалагічных прынцыпаў і падыходаў у галіне гістарычнага пазнання, да гэтага належыць дадаваць таксама сукупнасць гістарыялагічных падыходаў да даследавання па пэўнай тэме.

## 10. УДАКЛАДНЕННЕ ПРАДМЕТНЫХ МЕЖАЎ МЕТАДАЛОГІІ НАВУКІ, ЭПІСТЭМАЛОГІІ І МЕТАДАЛОГІІ ГІСТОРЫІ

Суадносіны паміж гнасеалогіяй, метадалогіяй навукі і метадалогіяй гісторыкі добра раскрыты для свайго часу (пачатку XX ст.) А. С. Лапа-Данілеўскім, які сцвярджаў, што "тэорыя пазнання ляжыць у аснове метадалогіі навукі, але не ўключае яе ў сябе … З прычыны цеснай сувязі паміж тэорыяй пазнання і метадалогіяй навукі апошняя можа развівацца, дапаўняючы агульную тэорыю пазнання … Вывучэнне метадалогіі мае значэнне не толькі для пабудовы навукі, але і для яе развіцця". Ён лічыў, што метадалогія гісторыі распадаецца на 2 часткі: "тэорыю гістарычных ведаў" і "вучэнне аб метадах гістарычнага мыслення"; а "ўласна гістарычную метадалогію" вылучаў у якасці асобнай галіны даследаванняў[1].

Працэсы дыферэнцыяцыі і інтэграцыі, якія адбываюцца з прадметнымі палямі навуковых дысцыплін (а нас тут цікавяць навуказнаўчыя і гісторыказнаўчыя дысцыпліны), патрабуюць новага асэнсавання і пэўнага пераразмеркавання прадметных межаў іх у адпаведнасці з гэтымі працэсамі, у прыватнасці з улікам таго, што з 60—70-х гадоў XX ст. "…метадалагічная праблематыка філасофіі навукі стала апасродкаваная гісторыяй навукі…"[2], што іншы раз такую тэматыку, як развіццё гістарыясофскіх ідэй, уключаюць у прадметнае поле гістарыяграфіі. Яшчэ сустракаюцца памылковыя погляды пры суаднясенні галін даследаванняў, датычных да вывучэння працэсу і асаблівасцяў пазнання. Так, І. Д. Кавальчанка ў кнізе "Методы исторического познания" сцвярджае, што метадалогія — састаўная частка гнасеалогіі. Калі ў працах І. Канта гнаселагічныя і метадолаганавуковыя аспекты, безумоўна, адрозніць складана, то напрыканцы XX ст. уключэнне метадалогіі навуковага пазнання ў склад іншай дысцыпліны — гнасеалогіі, бяспрэчна, з'яўляецца памылкай (неаптымальнай класіфікацыяй).

Айчынныя гісторыказнаўцы па дадзенаму пытанню не могуць заняць выразную пазіцыю. У згаданым вышэй вучэбным дапаможніку "Методология истории" не маецца ўласнага меркавання яе аўтараў па пытанні суадносін гісторыказнаўчых дысцыплін. У ёй ёсць толькі наступнае выказванне аднаго з аўтараў: "Гістарычная эпістэмалогія — метадалогія гістарычнага пазнання — ахоплівае і гістарыяграфію і гіс-

---

[1] Лаппо-Данилевский А. С. Методология истории. Ч. 1: Теория исторического познания. СПб., 1910. С. 3, 11, 15—16.

[2] Современная философия науки… С. 9.

тарыясофію"[3], са спасылкай на працу А. І. Ракітава. У Ракітава, наадварот, наяўнае супрацьлеглае па зместу выказванне: "Гістарычная эпістэмалогія — тэорыя гістарычнага пазнання, якая ахоплівае гістарыясофію і гістарыяграфію". Аўтары "Методологии истории" пераставілі апошнія словы і замянілі слова "тэорыя" на слова "метадалогія", не зразумеўшы, што ад гэтага сэнс выказвання змяніўся на супрацьлеглы. Выказванне атрымалася проста абсурднае, калі прытрымлівацца меркавання, што эпістэмалогія — галіна даследаванняў, у якой вывучаецца навуковае пазнанне, а метадалогія гістарычнага пазнання — сукупнасць сродкаў яго ажыццяўлення. Калі пад выразам "метадалогія гістарычнага пазнання" мець на ўвазе навуказнаўчую дысцыпліну (якую звычайна называюць "метадалогіяй гісторыі"), то і тады выказванне не будзе верным, паколькі большасць навуказнаўцаў адрозніваюць эпістэмалогію ад метадалогіі навуковага пазнання. Той жа А. І. Ракітаў, наадварот, лічыў мэтазгодным поўнасцю размежаваць метадалогію гісторыі і гістарычную эпістэмалогію. Хаця ён фармуляваў адмежаванне эпістэмалогіі ад метадалогіі гісторыі не зусім паслядоўна, "...ужыванне тэрміна «эпістэмалогія» з'яўляецца зусім мэтазгодным для абазначэння праблем і рашэнняў, якія тычацца выключна даследавання навуковага пазнання"[4], улічваючы тое, што вывучэнне метадаў даследавання з'яўляецца разам з тым вывучэннем навуковага пазнання.

У. К. Лукашэвіч лічыць, што "суадносіны логікі навуковага пазнання з тэорыяй пазнання і метадалогіяй па іх прадмету можа быць дастаткова выразна размеркавана, калі карыстацца найбольш агульнымі ўяўленнямі пра кампанентны склад пазнавальнай дзейнасці і сувязь гэтых кампанентаў у межах навуковай пазнавальнай дзейнасці", і прыходзіць да высновы, што "...прадмет тэорыі пазнання аказваецца суаднесеным перш за ўсё з даследаваннямі сутнасці, агульных перадумоў і магчымасцяў пазнання ў духоўным спасціжэнні рэальнасці, прадмет метадалогіі навукі — з даследаваннем рацыянальна абгрунтаваных механізмаў прырошчвання ведаў, прадмет логікі навуковага пазнання — з асэнсаваннем сістэмы ведаў як выніку навуковага пазнання"[5].

Сёння такое размеркаванне навуковых дысцыплін, у якіх вывучаецца працэс і розныя аспекты навуковага пазнання, трэба ацэньваць як найбольш абгрунтаванае, у параўнанні з іншымі пунктамі

---

[3] Методология истории... С. 28.
[4] Ракитов А. И. Историческое познание... С. 146, 22.
[5] Лукашевич В. К. Анатомия... С. 15—16.

гледжання на праблему размеркавання прадметных межаў такіх дысцыплін. Часта навуказнаўцы далучаюць да гэтых трох дысцыплін і філасофію навукі, не ўлічваючы таго, што эпістэмалогія і метадалогія навуковага пазнання — дысцыпліны, якія менавіта з філасофіі навукі і выдзеліліся, пазбаўляючы апошнюю большай часткі яе прадметнага поля. Так, у працы Т. Г. Ляшкевіч "Философия науки: Традиции и новации" (М., 2001) выдзелены 4 такія дысцыпліны — эпістэмалогія, гнасеалогія, метадалогія і філасофія навукі. Аднак філасофія навукі — гэта не навуказнаўчая дысцыпліна, а раздзел філасофіі, у якім разглядаюцца пытанні, якія звязаны з рэфлексіяй над такім пазнавальным зместам, як навука. Разам з тым выраз "філасофія навукі" часам выкарыстоўваецца сёння ў якасці агульнай назвы для эпістэмалогіі і метадалогіі навуковага пазнання.

Прымаючы дадзенае У. К. Лукашэвічам вызначэнне прадметных рамак гэтых дысцыплін, мы лічым аптымальным прытрымлівацца іншых іх найменняў: замест "метадалогія навукі" — "метадалогія навуковага пазнання", паколькі вывучэнню ў ёй падлягае менавіта навуковае пазнанне, ажыццяўляемае спосабам даследавання, без вывучэння навукі як інстытуцыянальнага ўтварэння; замест "тэорыя пазнання" — "гнасеалогія", паколькі ў рамках гнасеалогіі разглядаюцца пытанні, якія выходзяць за межы пабудовы тэорыі пазнання; замест "логіка навуковага пазнання" — "эпістэмалогія". Прымальна для абазначэння дысцыпліны, у якой будуюцца канцэпцыі адносна метадаў даследавання, якія разглядаюцца ў цэлым, і найменне "агульная метадалогія навукі", але толькі ў выпадку, калі аптымальнае выдзяленне прыватных раздзелаў яе, у якіх вывучаюцца метады даследавання ў пэўных галінах даследаванняў — "метадалогіі фізікі, сацыялогіі (або фізічных, сацыялагічных дысцыплін)" і г. д. Выраз "метадалогія даследавання" аптымальна ўжываць у межах навуказнаўства для абазначэння сукупнасці базісных сродкаў даследавання.

Найменне "логіка навуковага пазнання" не зусім дакладнае, паколькі ў прадметныя рамкі навуковай дысцыпліны, якой яно надаецца, уключаецца вывучэнне ведаў, то належыць казаць пра логіку вынікаў навуковага пазнання, г. зн. перш за ўсё пра логіку навуковых ведаў. А ў якасці абазначэння дысцыпліны, якая займаецца такім вывучэннем, ужо выкарыстоўваецца найменне "эпістэмалогія". Да логікі навуковага пазнання варта адносіць кірункі філасофіі (маржбургскую школу неаканціянства, "Венскі гурток"), у межах якіх пры вырашэнні праблем метадалогіі навуковага пазнання і эпістэмалогіі

шырока выкарыстоўваліся сродкі логікі (інакш — у якіх пераважаў лагіцысцкі падыход), чым асобную навуказнаўчую дысцыпліну. У межах эпістэмалогіі будуюцца канцэпцыі дынамікі развіцця ведаў.

Г. Башляр, заснавальнік гістарычнай школы ў філасофіі навукі, разумеў філасофію навукі шырока, як галіну даследаванняў, датычных прыроды і метадаў навук, а эпістэмалогію — як філасофію навукі, у такіх прадметных рамках, як крытычнае вывучэнне прынцыпаў, гіпотэз і вынікаў у розных навуках для ўстанаўлення лагічнага паходжання іх каштоўнасцяў і іх аб'ектыўнага значэння[6]. К. Попер разумеў эпістэмалогію як тэорыю навуковага пазнання, перш за ўсё як тэорыю, якая спрабуе патлумачыць статус навукі і яе рост, і атаясамляў логіку пазнання і метадалогію навукі[7]. Прадметныя рамкі эпістэмалогіі і метадалогіі навукі ўстанаўліваюцца такім чынам, што значная частка навуказнаўчай тэматыкі ўключаецца ў прадметныя палі як эпістэмалогіі, так і метадалогіі гісторыі. Возьмем дэфініцыю: "Метадалогія навукі — галіна навуказнаўства, якая даследуе структуру навуковых ведаў, сродкі і метады навуковага пазнання, спосабы абгрунтавання і развіцця ведаў"[8]. Паводле яе пэўная тэматыка, якую К. Попер адносіць да эпістэмалогіі, адносіцца да метадалогіі навукі.

Сёння частка заходніх навуказнаўцаў і філосафаў выразна не адрознівае не толькі прадметныя межы навуказнаўчых дысцыплін, але і найменні ў іх адносінах да гэтых межаў. Так, Дж. Лоўзі ў кнізе "Гістарычныя ўводзіны ў філасофію навукі" выразна не адрознівае прадметнае поле метадалогіі навукі і іншых сумежных дысцыплін, найменні "філасофія навукі" і "эпістэмалогія" ён ужывае ў якасці сіноніма наймення "метадалогія навукі"[9]. Іншая частка іх, у прыватнасці Р. Караціні, адрознівае эпістэмалогію ("навуку, якая крытычна ацэньвае законы і фундамент розных навук") і метадалогію (што "займаецца апісаннем метадаў, якія выкарыстоўвае навука")[10].

---

[6] Веретенникова Л. М. Эпистемологические основы философии науки Гастона Башляра // Научная рациональность и структуры повседневности. Тезисы научной конференции. Санкт-Петербург. 22—23 ноября 1999 г. СПб., 1999. С. 78.

[7] Эволюционная эпистемология и логика социальных наук Карла Поппера и его критики. М., 2000. С. 56, 309.

[8] Краткий словарь по логике... С. 106—107.

[9] "Уводзіны" // Лоўзі Дж. Гістарычныя ўводзіны ў філасофію навукі. Мн., 1994. С. 9—11.

[10] Каратини Р. Введение в философию. М., 2003. С. 480.

Той жа К. Попер у артыкуле "Логіка сацыяльных навук" абгрунтоўвае канцэпцыю навуковага пазнання (пры значным атаясамленні паняццяў навукі і пазнання), паводле якой пачатак навуковага пазнання звязаны са стварэннем праблемы (а зыходны пункт навуковай працы — пазнанне, якое стварае праблему), г. зн. бярэ прадметам навуказнаўчай дысцыпліны, якую называе "эпістэмалогія", разгляд структуры навуковых ведаў (няхай і пад вуглом дасягнення сапраўдных ведаў). Для распрацоўкі ўмоў дасягнення сапраўднасці ведаў патрэбна высветліць структуру навуковых ведаў. На наш погляд, такое высвятленне немэтазгодна адносіць да задач іншай дысцыпліны.

Калі размяркоўваць прадметныя межы навуказнаўчых дысцыплін, зыходзячы не з таго, як яны склаліся, а з улікам метатэарэтычнага адрознення сродкаў і вынікаў даследавання, то тады вывучэнне метадаў належыць аднесці да справы адной дысцыпліны, а вывучэнне ведаў адыходзіць да кампетэнцыі другой. У гэтым выпадку размеркаванне прадметных межаў, на наш погляд, залежыць у пэўнай ступені ад таго, якой дэфініцыі паняццяў пазнання, даследавання, ведаў як вынікаў пазнання прытрымліваюцца навуказнаўцы. Размеркаванне ўскладняецца і тым, што зместы паняццяў даследавання, пазнання і выкладання іх вынікаў перасякаюцца, напрыклад для ўсіх гэтых паняццяў агульная такая адзнака, як выдзеленасць прадмета.

Пункт погляду, паводле якога даследаванне лагічнай структуры ведаў не адносіцца да прадметнага поля метадалогіі навуковага пазнання, сустракаем пры не зусім выразным абгрунтаванні ў некаторых савецкіх філосафаў. Як адзначалася вышэй, А. І. Ракітаў імкнуўся абгрунтоўваць погляд, у адпаведнасці з якім "метадалогія ў вузкім сэнсе слова ўяўляе сабой спецыяльную дысцыпліну, задача якой — тэарэтычнае даследаванне, аналіз, рэканструкцыя, апраўданне і абгрунтаванне метадаў адпаведнай дзейнасці"[11]. Хаця зусім адмяжоўваць эпістэмалогію ад метадалогіі навуковага пазнання не атрымліваецца, паколькі, як адзначалася ў папярэднім параграфе, пэўныя веды выкарыстоўваюцца і ў якасці метаду даследавання, г. зн. іх аналіз мэтазгодны і ў рамках метадалогіі навуковага пазнання.

Пераходзячы ад разгляду прадметных рамак метадалогіі навуковага пазнання і эпістэмалогіі да разгляду прадметных межаў усіх галін даследаванняў, у якіх праводзяцца пераважна навуказнаўчыя даследаванні, мы лічым, што немэтазгодна выдзяляць метадалогію, эпістэмалогію, гісторыю, сацыялогію і інш. фізікі, сацыялогіі, гісто-

---

[11] Ракитов А. И. Историческое познание… С. 23.

рыкі і г. д., дастаткова выдзяляць толькі навуказнаўства фізікі, сацыялогіі, гісторыкі (інакш — фізіказнаўства, сацыёлагазнаўства, гісторыказнаўства) і г. д. Выдзяленне метадалогіі гісторыі, як і іншых галін, пераважна навуказнаўчых даследаванняў, у якіх вывучаюцца асаблівасці, лагічная структура, развіццё ведаў і метадаў даследавання розных сістэм навуковых дысцыплін (філасофіі фізікі і г. д.) з шырокім прадметным полем, на нашу думку, мэтазгодна, толькі для такіх дысцыплін напрошваюцца іншыя найменні — "гісторыказнаўства", "фізіказнаўства" і г. д.

Немэтазгодна выдзяляць такія галіны даследаванняў, як гнасеалогія, эпістэмалогія і г. д. гісторыі, як сёння робяць часта гісторыказнаўцы, у тым ліку і айчынныя. Дастаткова выдзеліць дысцыпліну з найменнем "гісторыказнаўства", без уключэння ў яе прадметнага поля праблем гістарыяграфіі. Праблемы, якія прыпісваюць гнасеалогіі гісторыі, уключаюцца ў прадметныя палі гісторыказнаўства і гістарыяграфіі. Так, вывучэнне таго, "...як пазіцыя гісторыка, абумоўленая часам і яго становішчам, дазваляе яму дасягаць пазнання гістарычнага працэсу ў яго інварыянтнасці"[12], — праблема не гнасеалогіі, як лічыць Н. І. Смаленскі, а гістарыяграфіі, пры вырашэнні якой будзе карысны гнасеалагічны аналіз. У межах гнасеалогіі не займаюцца распрацоўкай падобных праблем недастаткова агульнага характару.

Калі адвяргаць вузкую тарактоўку навуказнаўства як навуковай дысцыпліны, якая займаецца распрацоўкай дзяржаўнага рэгулявання навукі, рэкамендацый па павышэнні эфектыўнасці навуковай дзейнасці, ужываючы для такой галіны даследаванняў найменне "прыкладное навуказнаўства", нягледзячы на тое, што такая трактоўка сёння пераважае (гл.: Лешкевич Т. Г. Философия науки: Традиции и новации), а зыходзіць з шырокай трактоўкі навуказнаўства, то, прымаючы пад увагу маштаб і разгалінаванасць даследаванняў, якія тычацца розных аспектаў функцыяніравання навукі як сферы грамадскай дзейнасці і розных момантаў навуковага пазнання, мэтазгодна выдзяляць сістэму навуказнаўчых дысцыплін. У гэтую сістэму, на нашую думку, уваходзяць эпістэмалогія, метадалогія навуковага пазнання, прыкладное навуказнаўства, навукаметрыя, сацыялогія навукі, псіхалогія навукі, навуказнаўства, якое складаецца з шэрагу раздзелаў — гісторыказнаўства, фізіказнаўства, сацыёлагазнаўства і г. д. Пры шырокай трактоўцы навуказнаўства як сістэмы дысцыплін, да

---

[12] Смоленский Н. И. Проблема инвариантности истории // Проблемы источниковедения... С. 414.

навуказнаўчых дысцыплін дапушчальна адносіць не толькі метадалагічныя дысцыпліны, але і пэўныя галіны метатэарэтычных даследаванняў, у тым ліку метаматэматыку і металогіку.

Сацыялогія ведаў — галіна даследаванняў, якая ўваходзіць у склад сацыялогіі, а не навуказнаўства. Прадметнае поле гісторыі навукі ў значнай ступені размяркоўваецца сярод прадметных палёў розных навуказнаўчых дысцыплін і раздзелаў навуказнаўства. Устанаўленне для эпістэмалогіі і метадалогіі навуковага пазнання статуса навуказнаўчых дысцыплін не адмаўляе вызначэння іх як міждысцыплінных галін даследаванняў на стыку навуказнаўства і філасофіі. Вялізная галіна даследаванняў, якая звязана з вывучэннем асаблівасцяў навуковага пазнання, аформілася спачатку як філасофія навукі і логіка навуковага пазнання (г. зн. як часткі філасофіі і логікі). Аднак паступова апошнія пераўтвараюцца ў такія дысцыпліны, як метадалогія навуковага пазнання і эпістэмалогія. Прычым дысцыплінарны статус гэтых навуковых дысцыплін належыць вызначаць да выдзялення сістэмы навуказнаўчых дысцыплін, як філасофскія дысцыпліны.

Мы лічым, што выдзяленне навуказнаўства як сістэмы навуковых дысцыплін, а ў Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь як галіны навукі, сёння наспела. А выдзяленне навуказнаўства як комплекснай дысцыпліны, раздзеламі якой з'яўляюцца гісторыказнаўства, фізіказнаўства і г. д., мэтазгодна, зыходзячы з крытэрыю кампактнасці, з улікам удакладнення прадметнага зместу галін даследаванняў.

Напрыканцы параграфа звернем увагу на тое, што пэўная частка гісторыкаў і гісторыказнаўцаў адмаўляе гістарычнай навуцы [маючы на ўвазе, галоўным чынам, гісторыю грамадства (гісторыку), а не археалогію, этнаграфію і г. д.] у статусе навукі, не маючы выразных навуказнаўчых уяўленняў[13], або падганяючы мадэль навуковага пазнання пад стандарт, прыняты для прыродазнаўчых дысцыплін, або па іншых падставах. Увогуле іх тэзіс гучыць дзіўна: гістарычная навука — гэта не навука. Наконт такога адмаўлення трэба сказаць наступнае: адносенне гісторыкі да навуковых дысцыплін, да навукі, залежыць ад таго, што разумець пад навукай і навуковай дысцыплінай.

Дж. Пасмар, лічачы, што "менавіта гісторыя — не літаратура і не навука, але перапляценне некаторых іх уласцівасцяў", указвае, што "калі пад навукай разумець спробу высвятліць, што ж на самой

---

[13] Бойцов М. А. Вперед к Геродоту! // Казус. Индивидуальное и уникальное в истории. М., 1999; Дискуссия по статье М. А. Бойцова // Там же. С. 74—75.

справе адбываецца, то гісторыя ёсць навука. Калі ж мець на ўвазе пад навукай пошук тэарэтычных абагульненняў, то гісторыя не будзе навукай..."[14] Падобныя разважанні магчыма працягваць.

Калі разумець пад навукай сферу грамадскай дзейнасці, якая мае мэтаю назапашванне ведаў, што тлумачаць і прадказваюць працэсы і з'явы, з чым сутыкаюцца соцыумы ў сваёй дзейнасці, то, зыходзячы з такога пункту гледжання, безумоўна, нельга адносіць гісторыку да такой сферы. Разумеючы пад навукай дзейнасць, якая заключаецца ў вытворчасці верагодных ведаў, у тым ліку і фактаў, безумоўна, належыць сцвярджаць, што гісторыка — навука (нягледзячы на тое, што гістарычныя веды не падлягаюць непасрэднай верыфікацыі, а іншы раз яны — толькі імавернасныя).

Калі разумець пад навукай навуковае пазнанне, г. зн. пазнанне, ажыццяўляемае спосабам даследавання, у якім веды атрымліваюцца на аснове крытычных метадаў і строгіх прынцыпаў, то належыць прызнаць, што, безумоўна, гісторыка магчыма распрацоўвацца такім чынам, хоць працам па гісторыі грамадства, якія здзяйсняліся да XVII ст., амаль без выключэння нельга надаваць статус навуковых прац.

Калі адносіць галіну даследаванняў да навукі, зыходзячы з крытэрыю будовы ў яе межах навуковай тэорыі (г. зн. сістэмы верагодных ведаў, якія з'яўляюцца інструментам практычнай дзейнасці), то і некаторыя іншыя гістарычныя дысцыпліны (напрыклад, археалогія) пазбаўляюцца статуса навуковых дысцыплін.

---

[14] Пасмор Дж. "Объективность истории" // Философия и современные философско-исторические концепции (критический анализ). М., 1990. С. 142.

# ГЛАВА 4
# НЕКАТОРЫЯ ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І ФІЛАСОФСКІЯ ПРАБЛЕМЫ ЭТНАЛОГІІ

## 11. ЭТНАЛОГІЯ ЯК НАВУКОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

Перш чым разглядаць дысцыплінарны статус этналогіі, звернем увагу на ступень ужывання паняційнага апарату тэорыі этнасу айчыннымі гісторыкамі. Апошнія значную ўвагу ўдзяляюць вызначэнню этнічнага характару ВКЛ. Так, прадстаўнік нацыянальна-дзяржаўнага кірунку айчыннай гісторыкі І. А. Юхо адстойвае наступнае канцэптуальнае палажэнне: “Дамінуючае становішча ў дзяржаве займалі паны цэнтральных (беларускіх) зямель, бо ВКЛ была ўтворана на беларускай тэрытарыяльнай, этнаграфічнай і культурнай аснове…”[1]

Другі айчынны прадстаўнік гэтага гістарыялагічнага накірунку М. П. Касцюк, адзначаючы, што “...важнае значэнне мае праблема характару ВКЛ, наколькі яго можна лічыць беларускай дзяржавай”, і абапіраючыся пры вырашэнні праблемы на погляды У. І. Пічэты, робіць выснову, што “ВКЛ — сваеасаблівая форма нашай дзяржаўнасці”, і разам з тым паведамляе, што “Беларускія і літоўскія гісторыкі прыйшлі да кампраміснага рашэння, што беларускі бок будзе лічыць ВКЛ беларуска-літоўскай дзяржавай, а літоўскі бок — літоўска-беларускай”, не ўдакладняючы, які этнас дамінаваў у сацыяльна-палітычным жыцці дзяржавы. Прычым ён заўважае, што “такое вырашэнне не з’яўляецца аптымальным. Яго можна разглядаць як пэўны этап на шляху да ісціны”[2], г. зн. да завяршэння пабудовы канцэпцыі этнічнага характару ВКЛ.

Яшчэ адзін прадстаўнік айчыннай гісторыкі Я. К. Новік, разглядаючы канцэпцыю стварэння ВКЛ, сцвярджае, што факты пра дамінаванне ў ВКЛ літоўскіх феадалаў, пра значнае пераважванне іх над беларускімі і польскімі феадаламі дазваляюць зрабіць выснову, што да сярэдзіны XV ст., а таксама і пазней — у XVI ст. ВКЛ з’яўлялася літоўска-беларускай дзяржавай. Аднак пасля гэтага ён фармулюе палажэнне, якое зусім супрацьлеглае папярэдняму тэзісу: “ВКЛ … не з’яўляецца ні беларуска-літоўскай, ні літоўска-беларускай … гэта

---

[1] Юхо І. А. ВКЛ. Дзяржаўны і палітычны лад // ЭГБ. Т. 2. С. 401.

[2] Касцюк М. П. Гістарычны вопыт беларускага народа: вывучэнне і выкарыстанне // Беларусістыка. Беларусь: гістарычны лёс народа і культуры. Мн., 1995. С. 16.

паліэтнічная дзяржава чатырох асноўных народаў — беларускага, рускага, украінскага і літоўскага..."[3]

Аналіз пастаноўкі і вырашэння гісторыкамі праблемы этнічнага характару ВКЛ паказвае на недастатковае выкарыстанне паняційнага апарату тэорыі этнасу, без якога вынікі не толькі даследаванняў па этнічнай гісторыі, а і некаторых тэм у іншых раздзелах гісторыкі нельга выкласці на мове строгага даследавання. Пабудова ў межах этнічнай гісторыі канцэпцый развіцця розных этнасаў мае ўмовай зыходжанне з пэўных тэарэтычных і канцэптуальных схем. У этналогіі, аднак, пакуль не выпрацавана агульнапрынятай тэорыі этнасу, а маюцца толькі розныя канцэпцыі этнічных з'яў; паняцце этнасу не эксплікавана. Адзначым, тым не менш, што адсутнасць агульнапрынятай тэорыі этнасу не перашкаджае гісторыкам дастаткова паспяхова даследаваць этнічныя з'явы.

Ужыванне этналагічных паняццяў у працах прадстаўнікоў айчыннай гісторыкі грунтоўна разгледжана ў артыкуле М. А. Сакаловай[4]. Мы спынімся ў гэтай главе, галоўным чынам, на разглядзе тэарэтычных і філасофскіх праблем этналогіі.

Сёння адзначаецца, што "агульнапрынятага разумення тэрміна «этналогія» не існуе. Пад этналогіяй разумеюць навуковую дысцыпліну, якая вывучае і параўноўвае вынікі працы этнографаў у эмпірычных даследаваннях", а таксама разумеюць частку этнаграфіі, і тэрміналагічны эквівалент навуковай дысцыпліны пад найменнямі "сацыяльная (культурная) антрапалогія"[5].

На наш погляд, этналогія — гэта комплексная навуковая дысцыпліна, якая адносіцца да грамадазнаўчых дысцыплін, у межах якой будуецца тэорыя этнасу і канцэпцыі розных этнічных працэсаў і з'яў. Яна не мае ідэалагічнага характару, насуперак сцверджанням шэрагу заходнееўрапейскіх аўтараў[6], калі яго не прыўносіць у яе. Сёння этналогія знаходзіцца, на наш погляд, на той стадыі развіцця навуковай дысцыпліны, які, паводле выразу І. Лакатаса, характарызуецца як "непаспелая навука". Этналогія абапіраецца і на дадзеныя іншых наву-

---

[3] Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Ад старажытных часоў па люты 1917 г. Мн., 1998. С. 101, 163.

[4] Сакалова Марыяна. Пра разуменне паняццяў "нацыя" і "этнас" у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі // Гістарычны альманах. Т. 6. 2000.

[5] Словарь. Культура и культурология / Сост. и ред. А. И. Кравченко. М., 2003. С. 912.

[6] Кола Доменик. Политическая социология. М., 2001. С. 344.

ковых дысцыплін, такіх сталых, як антрапалогія, лінгвістыка, і нядаўна аформіўшыхся, такіх, як генагеаграфія, этнагеноміка. Для яе распрацоўкі патрэбны і дадзеныя тых галін даследаванняў, якія яшчэ больш непаспелыя, чым яна, у прыватнасці, той галіны, якую ўмоўна назавём "этнанаасфералогія". У прыватнасці, для яе распрацоўкі будуць карыснымі дадзеныя пра сувязь этнічнай свядомасці з наасферай, якую іншы раз інтэрпрэтуюць як наяўнасць у этнасаў эгрэгараў.

Шэраг айчынных сацыёлагаў [аўтараў вучэбнага дапаможніка "Социология" (Мн., 1998)] сцвярджаюць, што "...у сацыялогіі, як у ніводнай іншай навуцы, гэта праблема (прадмета сацыялогіі. — *Ю. Н.*) ускладнілася па чыста тэрміналагічных акалічнасцях", звяртаюць увагу на шматзначнасць тэрмінаў "аб'ект" і "прадмет". На нашую думку, справа тут не ў шматзначнасці гэтых тэрмінаў, а перш за ўсё ў змешванні паняццяў сацыяльнага і грамадскага. Дарэчы, зусім непрымальны іх тэзіс пра тое, што ў кантэксце вызначэння прадмета сацыялогіі ў цэлым паняцці аб'екта і прадмета даследавання супадаюць, паколькі такія паняцці, як і паняцці аб'екта і прадмета пэўнай навуковай дысцыпліны, і створаны для таго, каб не супадаць. Абгрунтоўваюць яны гэты тэзіс, зыходзячы са спекулятыўных гнасеалагічных поглядаў, на што паказвае, напрыклад, наступнае выказванне: "...прадмет пазнання любой навукі з філасофскага пункту гледжання вызначаецца менавіта як аб'ект адлюстравання"[7].

Яшчэ ў 80-я гады XX ст. у навуковай і вучэбнай літаратуры па сацыялогіі было распаўсюджана вызначэнне аб'екта сацыялогііі як развіццё грамадства ў цэлым[8]. Гэта была спадчына таго, што пэўны час у прадметнае поле сацыялогіі ўключаліся любыя тэмы, звязаныя з развіццём грамадства. Даследчык гісторыі сацыялогіі Э. А. Капітонаў ўвогуле адносіць да так званай прадсацыялогіі грамадазнаўства, г. зн., акрамя, уласна, сацыялогіі, уключае ў яе і палітычную эканомію, і гістарыяграфію, пад якой ён разумее гістарыясофію, і статыстыку[9]. У апошняе дзесяцігоддзе аб'ект сацыялогіі вызначаецца амаль заўсёды больш дакладана — як сацыяльныя з'явы грамадства (нягледзячы на неэксплікаванасць паняцця сацыяльнага). І толькі зрэдку — як грамадства (гл. вызначэнне ў дапаможніку: Перов Г. О.,

---

[7] Елсуков А. Н., Бабосов Е. М., Данилов А. Н. и др. Социология: Учебное пособие / Под ред. А. Н. Елсукова. Мн., 1998. С. 68—69.

[8] Краткий словарь по социологии. М., 1988. С. 336.

[9] Капитонов Э. А. История и теория социологии. Социология XIX века. Учебное пособие. М., 2000. С. 122.

Самыгин Г. И. Социология. Р.-на-Д., 2002). Патлумачваецца, у прыватнасці, В. Г. Ізохам у артыкуле "Грамадства" ў даведніку "Новейший философский словарь" (М., 1998), што "грамадства — гэта паняцце, якое фіксуе прадмет сацыяльнай філасофіі" (дакладна, дарэчы, аб'ект, а не прадмет).

Аб'ект этналогіі прымальна вызначаць як этнічныя з'явы, датычныя этнічных груп (у першую чаргу — этнічнасць і этнічныя сувязі), адрозніваючы яго ад аб'екта сацыялогіі — сацыяльных з'яў, датычных сацыяльных груп (у першую чаргу — сацыяльнага ладу грамадства і сацыяльных адносін у ім). Разам з тым мы ўстанаўліваем прадметныя межы этналогіі даволі вузка, паколькі лічым яе дысцыплінай, у межах якой распрацоўваюцца тэорыя этнасу, шэраг канцэпцый (у тым ліку канцэпцыя этнічнасці), гісторыя этналагічнай думкі, праводзяцца даследаванні, датычныя этнічнага складу насельніцтва розных краін, і не больш таго. Тым самым, мы не прымаем шырокага разумення прадметных межаў этналогіі, якое распаўсюджана ў расійскіх этнолагаў, у прыватнасці ў аўтараў (А. П. Садохіна і Т. Г. Грушавіцкай) і рэцэнзентаў падручніка для ВНУ "Этнология". Апошнія абгрунтоўваюць этналогію як дысцыпліну, якая складаецца з 7 раздзелаў (дарэчы, не выдзяляюць пры гэтым у яе складзе тэарэтычную этналогію — раздзел, у якім распрацоўваецца тэорыя этнасу). Некаторыя галіны даследаванняў, якія яны выдзяляюць як раздзелы, з якіх складаецца этналогія (этнасацыялогія, эканамічная этналогія), іншыя спецыялісты адносяць да раздзелаў другіх адпаведных дысцыплін — сацыялогіі, эканомікі. І хаця аўтары падручніка адзначаюць наяўную сёння і мяркуюць пра далейшую дыферэнцыяцыю этналагічнай навукі[10], двайное класіфікацыйнае аднясенне дадзеных галін даследаванняў непрымальнае з пункту гледжання тэарэтычнага навуказнаўства (дысцыпліны, у рамках якой вывучаецца статус навуковых дысцыплін і распрацоўваюцца класіфікацыі іх), паводле якога належыць дакладна ўстанаўліваць, да якой сістэмы дысцыплін адносіцца пэўная галіна даследаванняў (або не адносіцца — у выпадку, калі яна вызначаецца як асобная комплексная дысцыпліна).

Мы не адмаўляем першапачаткова выдзяленне этналогіі ў якасці полідысцыплінарнай галіны даследаванняў або нават сістэмы дысцыплін, калі яно наспела і мае сур'ёзныя падставы. Аўтары "Этнологии", выдзяляючы пэўныя галіны даследаванняў (у прыватнасці,

---

[10] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология. Учебник для студ. высш. учебн. завед. М., 2000. С. 18—20.

этнасацыялогію) як раздзелы этналогіі, у другім месцы падручніка характарызуюць іх ужо не як раздзелы, а як "навуковыя дысцыпліны" і як "міждысцыплінарныя навукі", акрамя таго, пры выдзяленні этнапаліталогіі ўстанаўліваюць для яе статус галіны ("отрасли") этналогіі[11]. Пры шырокай трактоўцы этналогіі, калі быць паслядоўным (г. зн. пагалоўна ўключаць у яе склад галіны даследаванняў, датычныя вывучэння этнічных з'яў, якія часта выдзяляюцца і як раздзелы іншых дысцыплін), да яе належыць адносіць, напрыклад, і этнаніміку — раздзел анамастыкі, якая, у сваю чаргу, з'яўляецца раздзелам (або дысцыплінай) мовазнаўства. Зразумела, што гэта недапушчальна ўжо з пункту гледжання іерархіі дысцыплінарных адзінак. Належыць уключаць тады ў этналогію як сістэму дысцыплін і этнічную гісторыю. Калі этнаніміка — раздзел сістэмы дысцыплін, то этнічную гісторыю прымальна абгрунтаваць як сумежную навуковую дысцыпліну, якая складаецца з сукупнасці раздзелаў (этнічная гісторыя беларусаў, палякаў і г. п.). Аднак няма ніякіх падстаў для абгрунтавання яе ў якасці раздзела этналогіі.

У тым выпадку, калі з'явіцца значная колькасць гістарычных даследаванняў, у якіх наяўны этналагічны аналіз і шырока выкарыстоўваецца апарат тэорыі этнасу, патрэбна будзе казаць пра выдзяленне этнічнай гісторыі як асобнай дысцыпліны. Для адрознівання яе статуса ад таго статуса, які яна мае як раздзел дысцыпліны, для тэрміналагічнага замацавання становішча мэтазгодна ўводзіць і новае найменне такой галіны даследаванняў, як, напрыклад, "этналагічная гісторыя". Даследаванні па этнічнай гісторыі (калі іх не абмяжоўваць толькі праблемамі этнагенезісу) у межах гісторыкі не што іншае, як распрацоўкі па этнапалітычнай, этнасацыяльнай гісторыі. Тэмы і праблемы, прысвечаныя менавіта этнічнай гісторыі, выконваюцца і вырашаюцца ў межах этналогіі.

Сапраўды, пры ўстанаўленні статуса некаторых галін даследаванняў, звязаных з вывучэннем этнасаў, бывае складана класіфікаваць іх. З 80-х гадоў XX ст. выдзяляецца галіна даследаванняў пад найменнем "этнасацыялогія". Значная частка замежных і некаторыя айчынныя сацыёлагі ўстанаўліваюць для этнасацыялогіі статус эмпірычнай сацыялагічнай дысцыпліны[12] або раздзела сацыялогіі. Некаторыя расійскія сацыёлагі галоўнымі задачамі этнасацыялогіі лічаць раскрыццё "сацыяльнай абумоўленасці этнічных з'яў", "нацыянальнай разнастайнасці

---

[11] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология... С. 299.

[12] Бабосов Е. М. Прикладная социология. Учебное пособие. Мн., 2001. С. 85.

сацыяльных працэсаў і з'яў"[13]. Разам з тым сустракаецца вызначэнне этнасацыялогіі як сумежнай дысцыпліны: "этнасацыялогія — навуковая дысцыпліна, якая даследуе этнічныя працэсы ў розных сацыяльных групах і сацыяльныя працэсы ў розных нацыянальных асяроддзях і рэгіёнах, на стыку этнаграфіі і сацыялогіі"[14]. Некаторыя сацыёлагі, у тым ліку і аўтары вучэбнага дапаможніка "Социология", будуючы разгалінаваную схему узроўняў сацыялагічных ведаў і выдзяляючы ўслед за Р. Мэртанам тэорыі сярэдняга ўзроўню (г. зн. не фундаментальныя і не прыкладныя) у сацыялогіі, да такіх тэорый адносяць і этнасацыялогію. Яны абмяжоўваюць задачу апошняй, як вызначаем са знаёмства з дапаможнікам, вывучэннем этнічных груп, якія атаясамліваюць з этнічнымі меншасцямі[15]. Але заўважым, што паняцце этнічнай групы — гэта паняцце этналогіі, а не сацыялогіі.

У шэрагу сацыялагічных прац, у якіх разглядаецца склад сістэмы сацыялагічных дысцыплін, этнасацыялогія ўсё ж не значыцца. Так, у вучэбным дапаможніку для ВНУ (пад рэд. А. М. Ялсукова) "Социология" (Мн., 2003) этнасацыялогія сярод выдзяляемых канкрэтна-сацыялагічных дысцыплін не значыцца. Не значыцца яна і ў структуры сацыялагічных ведаў, якая выкладаецца ў падручніку "Социология" (Мн., 2002), дзе адказным рэдактарам з'яўляецца П. Д. Паўлянюк, а аўтарамі больш за 20 вучоных, сярод якіх шмат акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў РАН.

Адной з падстаў для фарміравання погляду выдзялення этнасацыялогіі ў якасці раздзела або дысцыпліны сацыялогіі, з'яўляецца, мабыць, змешванне паняццяў грамадскага і сацыяльнага. Пра адрозненне паняццяў грамадства і сацыяльнасці, у адпаведнасці з якімі надаюцца характарыстыкі грамадскага і сацыяльнага, сведчыць, напрыклад, выраз "сацыяльная структура грамадства". Тое, што сацыялогія — гэта толькі частка грамадазнаўства, адна з тых дысцыплін, якія адносяцца да грамадазнаўчых, таксама служыць аргументам на карысць несупадзення зместу паняццяў грамадскага і сацыяльнага.

---

[13] Арутюнян Ю. В., Дробижева Л. М., Кондратьев В. С., Сусоколов А. А. Этносоциология: цели, методы и некоторые результаты исследования. М., 1984. С. 6.

[14] Бялявіна В. М. Этнасацыялогія // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 548.

[15] Касьянов В. В., Нечипуренко Д. И., Самыгин Г. М. Социология. Учебное пособие. Р.-на-Д., 2000. С. 67, 208—209.

Нягледзячы на паспяховую распрацоўку сацыялагічных праблем, змешванне паняццяў сацыяльнага і грамадскага, соцыуму і грамадства ў літаратуры па сацыялогіі пакуль не выключана. Так у "Современном гуманитарном словаре-справочнике" (М., 1999) значэнні тэрмінаў не адкарэліраваныя. У ім сцвярджаецца, што "грамадства можна разглядаць як вышэйшую ступень соцыуму", разам з тым "грамадства — ... сукупнасць гістарычных форм жыццядзейнасці людзей"[16], і разам з тым у ім паведамляецца, што "грамадства" і "соцыум" часта ўжываюцца як сінонімы.

У грамадазнаўчых дысцыплінах (а гістарычныя дысцыпліны несумненна адносяцца да грамадазнаўчых, паколькі іх веды выконваюць функцыю тлумачэння грамадскіх з'яў або садзейнічаюць гэтаму) для дасягнення мэт іх даследаванняў неабавязковы скрупулёзны карэляцыйны аналіз ствараемай тэрміналогіі. Дастаткова разумець (мадэліраваць) суб'ектамі пэўныя грамадскія змены, вывучаемыя ў іх межах, пэўныя супольнасці, такія мадэлі эпістэмалагічна характарызуемыя, як эмпірычныя ідэальныя аб'екты. Аднак выкарыстанне ў іх кагнітыўных межах некаторых шматзначных тэрмінаў, у прыватнасці тэрмінаў "грамадскі" і "сацыяльны", іншы раз стварае паняційную блытаніну.

У рамках этналогіі, як і этнаграфіі, і так званай культурнай антрапалогіі вывучаюць з'явы, якія тычацца розных этнічных груп супольнасцяў, у рамках этнапсіхалогіі і этнасацыялогіі — этнічныя складаючыя псіхалагічных і сацыяльных з'яў у грамадстве. Пакідаючы пытанне пра мэтазгоднасць іх выдзялення, разгледзім, як навуказнаўча ўстанаўліваецца дысцыплінарны статус для міждысцыплінных галін даследаванняў, да якіх адносіцца і этнасацыялогія. Выраз "міждысцыплінарная галіна даследаванняў" трэба ўжываць для вызначэння характару ўзнікнення пэўных галін, а пры вызначэнні дысцыплінарнага статуса галін даследаванняў такую галіну ўсё роўна належыць адносіць да пэўнай сістэмы дысцыплін або вызначаць комплекснай дысцыплінай.

Возьмем эканамічную сацыялогію. Большасць айчынных сацыёлагаў лічаць яе раздзелам сацыялагічнай навукі[17]. Такое меркаванне адбіта і ў Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь, у выдзяленні спецыяльнасці з шыфрам — 22.00.03. Хаця пры такім дысцыплінарным статусе для гэтай галіны напрошваецца іншае найменне — "сацыялогія эканомікі", што і

---

[16] Гуревич П. С. Современный гуманитарный словарь-справочник. М., 1999. С. 383, 282.

[17] Социологический словарь. Мн., 1991. С. 513.

робяць некаторыя спецыялісты ў гэтай галіне даследаванняў, у прыватнасці аўтары вучэбнага дапаможніка для ВНУ "Экономическая социология" І. К. Галко і Я. З. Ламаносаў. Яны так фармулююць прадметныя рамкі (лічаць — аб'ект) эканамічнай сацыялогіі: "...чалавек як састаўная частка вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання; разнавіднасці сацыяльных супольнасцяў, звязаныя з эканамічнымі адносінамі; сацыяльна-эканамічныя сувязі і працэсы". (Дарэчы, фармулёўка, якая, яны лічаць, служыць вызначэннем прадмета эканамічнай сацыялогіі, хутчэй падыходзіць да вызначэння задач яе.) Пры гэтым яны адносяць да сацыяльных супольнасцяў мясцовыя Саветы дэпутатаў, выканаўчыя і распарадчыя органы[18], што памылкова з пункту гледжання агульнай сацыялогіі, у кагнітыўных рамках якой да сацыяльных супольнасцяў агульнапрынята адносіць утварэнні, што ўзнікаюць натуральна-гістарычна, а не ствараюцца штучна.

Паколькі аб'ект эканамічнай сацыялогіі — як эканамічныя, так і сацыяльныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, а адзін з прадметаў — сацыяльныя механізмы развіцця вытворчасці і рынку, то дысцыплінарны статус яе належыць устанаўліваць так: міждысцыплінарная галіна даследаванняў, якая з'яўляецца або сумежнай сацыялагічнай дысцыплінай, або комплекснай дысцыплінай, калі характар і маштаб даследаванняў у гэтай галіне паказваюць на мэтазгоднасць такога выдзялення.

Ёсць выпадкі, калі пэўная міждысцыплінарная галіна даследаванняў пераўтвараецца не толькі ў сумежную навуковую дысцыпліну, уключаемую ў склад сістэмы дысцыплін (напрыклад, архівазнаўства ў склад гістарычных дысцыплін), але і ў комплексную навуковую дысцыпліну, якая не ўключаецца ў пэўную сістэму дысцыплін. Такой комплекснай дысцыплінай вызначаема дакументазнаўства, якое, дарэчы, было вылучана ў свой час з архівазнаўства. У Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь дакументазнаўства і архівазнаўства складаюць адну спецыяльнасць з шыфрам — 05.25.02. Аднясенне дакументазнаўства ў Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь да тэхнічных навук фармальнае, паколькі пад тэхнічнымі навукамі маецца на ўвазе пэўны тып навуковых дысцыплін, але не сістэма іх. "Электроніка", напрыклад, найменне комплекснай навуковай дысцыпліны (або нават сістэмы дысцыплін) і тэрмін для абазна-

---

[18] Галко И. К., Ломоносов Е. З. Экономическая социология. Мн., 2001. С. 163—164, 167.

чэння групы спецыяльнасцяў у дадзенай Наменклатуры. Але "дакументальная інфармацыя" — толькі тэрмінаабазначэнне групы спецыяльнасцяў (якой адпавядаюць дакументазнаўства і архівазнаўства), але не найменне сістэмы дысцыплін.

У Наменклатуры спецыяльнасцяў навуковых супрацоўнікаў Рэспублікі Беларусь дакументазнаўства і архівазнаўства прадстаўлены як часткі спецыяльнасці такой галіны навукі, як тэхнічныя навукі. І калі дакументазнаўства, сапраўды, адпавядае статусу комплекснай навуковай дысцыпліны, якая характарызуецца як тэхнічная дысцыпліна, то архівазнаўства найчасцей прынята адносіць да гістарычных дысцыплін (і як вынік гэтага — яе належыць характарызаваць як грамадазнаўчую дысцыпліну). Так, айчынны гістарыёграф У. М. Міхнюк адносіць архівазнаўства да дапаможных гістарычных дысцыплін (дарэчы, у пачатку яго артыкула ў "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" рэдактарамі выдання чамусьці ўраўнаваны спецыяльныя гістарычныя навукі і дапаможныя гістарычныя дысцыпліны, хаця ў тэксце артыкула выразна праводзіцца адрозненне паміж імі[19]). Іншы раз архівазнаўства вызначаюць як ужытковую культуразнаўчую навуку[20].

Пры ўстанаўленні дысцыплінарнага статуса галін даследаванняў прапануем зыходзіць з двух палажэнняў: 1. Галіна даследаванняў, для якой акрэслены адметны аб'ект і спецыфічны метад, вылучаецца як самастойная галіна даследаванняў, інакш кажучы — навуковая дысцыпліна; 2. У залежнасці ад структуры і прадметнага складу аптымальна выдзяляць стандартныя, комплексныя (тыя, якія маюць раздзелы), сумежныя навуковыя дысцыпліны і, нарэшце, сістэмы навуковых дысцыплін.

Калі этналогія — комплексная навуковая дысцыпліна, то этнасацыялогію належыць вызначаць як яе раздзел. Калі этналогія — сістэма дысцыплін, то этнасацыялогію належыць вызначаць як сумежную этналагічную дысцыпліну. Пытанне пра тое, ці паспела сёння этнасацыялогія для выдзялення яе ў якасці навуковай дысцыпліны, застаецца канчаткова нявырашаным. Мы прытрымліваемся пункту погляду, паводле якога выдзяленне этналогіі ў якасці асобнай грамадазнаўчай дысцыпліны (а не гістарычнай дысцыпліны, пэўным чынам пашыранай этнаграфіі), а тым больш у якасці сістэмы дысцыплін увогуле робіць залішнім выдзяленне этнасацыялогіі (або сацыялогіі этнічнасці) у якасці сацыялагічнай дысцыпліны.

---

[19] Міхнюк У. М. Спецыяльныя гістарычныя навукі // ЭГБ. Т. 6. Ч. 1. С. 390—391.
[20] Рождественский Ю. В. Введение... С. 9.

Зыходзячы з выдзяляемых у адпаведнасці са склаўшайся дыферэнцыяцыяй галін сацыялагічных ведаў (гл. яе выкладанне ў вучэбным дапаможніку для студэнтаў гуманітарных ВНУ "Социология" (М., 1998) пад рэдакцыяй прафесара Лаўрыненкі), мэтазгодна абгрунтоўваць этнасацыялогію, адносячы яе да групы сацыялагічных галін, у рамках якіх характарызуюць сацыяльную структуру грамадства, яе элементы і ўзаемадзеянні паміж імі. Аднак калі выдзяляць этналогію ў якасці асобнай грамадазнаўчай дысцыпліны, то тады апошняя адымае ад сацыялогіі прадметнае поле, выдзяляемае для этнасацыялогіі.

Тое, што ў паняційным апараце сацыялогіі маюцца паняцці этнічнай групы і нацыі, яшчэ не з'яўляецца аргументам на карысць выдзялення этнасацыялогіі як дысцыпліны (або раздела) сацыялогіі, таму што ў этналогіі выпрацаваны свой паняційны аппарат, у якім паняцці этнічнай групы і нацыі напоўнены іншым зместам.

## 12. ТЭРМІНАЛОГІЯ ЭТНАГІСТАРЫЧНАГА ВЫКЛАДАННЯ

Неўдасканаленасць этналагічнай тэрміналогіі ў пэўнай ступені ўплывае на этнагістарычнае выкладанне. У тым, што большасць беларускіх гісторыкаў і этнолагаў адносяць фарміраванне беларускай народнасці (г. зн. гістарычнай формы беларускага этнасу) да XIV—XVI стст.[1], а расійскія этнолагі лічаць, што "…канчаткова фарміраванне беларускага этнаса адбылося даволі позна — у канцы XIX ст"[2], няма канцэптуальнага разыходжання, маецца толькі тэрміналагічная неўдасканаленасць.

Дарэчы, вызначаючы строга, этнагістарычныя тэмы і сюжэты, наяўныя ў канкрэтна-гістарычных працах, нельга аднасіць цалкам да гісторыка-этналагічных распрацовак. Яны, калі адмесці ўбок магчымыя ў іх ідэалагічныя ўстаноўкі, з'яўляюцца не ў меншай ступені паліталагічнымі, сацыялагічнымі, чым этналагічнымі (мабыць, з прычыны змешвання паняццяў этналогіі, паліталогіі, сацыялогіі), у іх паказваецца як фарміраванне этнічнай свядомасці, так і складванне культурнай і сацыяльна-эканамічнай цэласнасці на пэўнай дзяржаўнай тэрыторыі.

Слова "беларусы" ўжываецца гісторыкамі ў значэннях як нацыі, якая сфарміравалася напрыканцы XIX — пачатку XX ст. на пэўнай тэрыторыі, так і насельніцтва, грамадзян Рэспублікі Беларусь. Разам

---

[1] Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Мн., 1994. С. 195.
[2] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология… С. 200.

з тым яно ўжываецца і як сінонім тэрміна “беларускі этнас”, якому адпавядае ідэальны аб’ект, — этнас, які пачаў фарміравацца ў XIII ст. (ці раней) на тэрыторыі, акрэсленай вярхоўямі Дняпра, Заходняй Дзвіны і Заходняга Буга, што бачна з наступнага выказвання: “Фальклор беларусаў перыяду фарміравання народнасці...”[3] Калі ў гэтым адмаўляць, то дадзенае выказванне трэба разумець так: фальклор грамадзян Рэспублікі Беларусь (або беларускай нацыі) перыяду фарміравання беларускай народнасці, што, зразумела, з’яўляецца абсурдам. Тут (і ў іншых падобных выпадках ужывання слова “беларусы”) аптымальней будзе выражацца — “продкі беларусаў”. Як мы пакажам у наступных параграфах, у межах строга распрацоўваемай этналогіі “этнас” з’яўляецца агульным тэрмінам да шэрагу тэрмінаў, аднак не абазначэннем паняцця супольнасці, якая існуе ў розныя гістарычныя перыяды, паколькі такое паняцце хутчэй гістарыясофскае, чым этналагічнае, і тым самым спекулятыўнае, хаця пры гэтым і навукова-эўрыстычнае.

Яскравы прыклад неўпарадкаванасці гістарычнай тэрміналогіі дае дыскусія беларускіх гісторыкаў А. К. Краўцэвіча і В. Л. Насевіча на старонках “Беларускага гістарычнага агляду” ў 1998 г. Адзначаючы важнасць прытрымлівання дакладнай тэрміналогіі для выкладання вынікаў даследавання, мы лічым, што не трэба перабольшваць значэнне гістарычнай (у тым ліку этнагістарычнай) тэрміналогіі для мэт гістарычнага даследавання. Нягледзячы на тое што канцэптуальныя апісанні, якія здзяйсняюцца ў межах гісторыкі, у тым ліку этнічнай гісторыі, часта метафарычныя і тэрміналагічна шматзначныя, гэта не перашкаджае даследчыкам паспяхова абагульняць факты і тлумачыць гістарычныя з’явы з дапамогай тэарэтычных тэрмінаў. Разам з тым гэта вядзе да канцэптуальнай дэфармацыі.

Возьмем выказванне Р. Радзіка: “Рускія эфектыўна паўсталі супраць фармавання беларускай нацыі, дайшлі да фізічнага вынішчэння беларускіх нацыянальных асяродкаў”. Яно недакладна ўжо таму, што пра 20-я гады XX ст. нельга казаць, як пра дзейнасць рускіх або рускай дзяржавы, дакладна казаць пра дзейнасць савецкіх дзяржаўных інстытутаў, цэнтральных устаноў. Возьмем іншае сцверджанне гэтага аўтара: “Большасць цяперашніх беларусаў успрымае сябе ў катэгорыях рэгіянальна-культурных, а не палітычных”[4]. На першы погляд гэта этнасацыяльная інтэрпрэтацыя пэўных фактаў.

---

[3] Церашковіч П. У., Чаквін І. У. Беларусы / ЭГБ. Т. 1. Мн., 1993. С. 464, 468.
[4] Радзік Рышард. Беларусы (Погляд з Польшчы). Мн., 2002. С. 71, 142.

Аднак, калі зыходзіць з агульнапрынятай дэфініцыі нацыі, гэта сцвярджэнне зусім нявернае, паколькі яно азначае, што большасць беларусаў не ўсведамляюць сваю прыналежнасць да сацыяльна-эканамічнай цэласнасці, якая складаецца і ўзнаўляецца на базе агульнай тэрыторыі, эканамічных сувязяў, мовы, асаблівасцей культуры, псіхалагічнага складу і этнічнай самасвядомасці. Іншы сучасны беларус можа ўспрыняць такое выказванне і як абразу.

Возьмем канцэптуальнае палажэнне: "У сярэдзіне XIII — XIV ст. усе землі Беларусі паступова ўвайшлі ў склад поліэтнічнай дзяржавы ВКЛ..."[5] "ВКЛ" — скарочаная назва феадальнай дзяржавы, а таксама адпавядаючай ёй краіны (дзяржаўнай тэрыторыі). "Землі Беларусі" — выраз, які ўжываецца для абазначэння паняцця тэрыторыі, на якой кампактна пражываў беларускі этнас (геаграфічна акрэсленай вярхоўямі Дняпра, Заходняй Дзвіны і Заходняга Буга). Калі зыходзіць толькі са значэнняў тэрмінаў гэтага сцвярджэння, то яго трэба разумець так, што пэўная этнічная тэрыторыя ўвайшла ў склад сістэмы палітычных і іншых органаў, якая мела назву "ВКЛ". Дакладней будзе казаць, што ў XIII ст. пэўныя падзеі прывялі да ўзнікнення новай краіны пад назвай "ВКЛ" (або што землі Беларусі адпавядалі часткі краіны з назвай "ВКЛ").

У тым выпадку, калі "этнас" — толькі агульны тэрмін, ужыванне слова "беларусы" для абазначэння насельніцтва Рэспублікі Беларусь (а таксама і БССР), у адрозненне ад ужывання слова "расіяне" для абазначэння насельніцтва Расійскай Федэрацыі (а таксама і Расійскай імперыі), недакладна, паколькі частка такога насельніцтва ўсведамляе сябе па паходжанні не беларусамі. Тое ж самае і ў іншых выпадках супадзенне этнонімаў з палітонімамі. Аптымальней выкарыстоўваць слова "беларусы" ў межах этнічнай гісторыі толькі як назву канкрэтнай этнапалітычнай супольнасці, прадстаўнікі якой — грамадзяне Рэспублікі Беларусь усведамляюць сваю прыналежнасць да беларускай культуры. Пра жыхароў Рэспублікі Беларусь дакладней казаць — "насельніцтва Рэспублікі Беларусь". Этнапалітычную супольнасць не належыць атаясамліваць з жыхарамі, якія жыццядзейнічаюць на пэўнай тэрыторыі. Некаторыя жыхары пэўнай краіны могуць і не ўваходзіць у этнапалітычную супольнасць, выпадаць з сукупнасці адносін, якія яе складаюць, не ўсведамляць сваю прыналежнасць да пэўнай культуры.

Возьмем, напрыклад, Бельгію. Частка насельніцтва яе ўсведамляла і ўсведамляе сябе фламандцамі, частка — валонамі. Разам з тым

[5] Церашковіч П. У., Чаквін І. У. Беларусы... С. 464.

жыхары яе лічаць сябе і бельгійцамі. З пункту гледжання анталогіі выказванне пра тое, што бельгійцы або фламандцы і валоны ў 1830 г. паўсталі супраць галандскага кіравання і звергли яго, ацэньваецца як метафарычнае (з пункту гледжання эпістэмалогіі — як выкарыстанне прыёму ідэалізацыі), паколькі рэальна змагаліся за незалежнасць краіны не этнічныя і нават не этнасацыяльныя супольнасці, а соцыумы — канкрэтныя вайсковыя падраздзяленні і фарміраванні, прадстаўнікі якіх усведамлялі сябе этнічна валонамі, фламандцамі (анталагічна кажучы, рэальна змагаліся прадстаўнікі пэўных адзінстваў, якія ідэальна ўсведамлялі сябе прадстаўнікамі пэўных этнасаў).

Этнонім "ліцвіны" ў XIV—XVIII стст. ужываўся для назвы жыхароў ВКЛ, пераважна заходніх беларусаў і ўсходніх летувісаў[6], інакш — люцічаў, калі прымаць гіпотэзу П. Урбана, або, калі яе не прымаць, часткі аўкштайтаў (у час этнічнай асіміляцыі продкаў летувісаў і беларусаў, ці міжэтнічнай інтэграцыі іх у пазнейшыя часы і ў час этнічнай кансалідацыі продкаў летувісаў) і насельніцтва беларускага Панямоння[7]. У XVI—XVIII стст. назва "ліцвіны" ўжывалася і як тапонім. Больш таго, "у XVI—XVIII стст. назва ліцвіны набыла гучанне палітоніма — дзяржпалітычнага вызначэння ўсяго насельніцтва ВКЛ, аднак адрознівалася ад літоўцаў … усіх беларусаў праваслаўнай веры і палешукоў"[8]. У апошнім выпадку, на наш погляд, дакладней вызначаць назву "ліцвіны" не як палітонім, а як палітэтнонім (або, мабыць, патронім), улічваючы страту незалежнасці ВКЛ пасля Люблінскай уніі 1569 г. і тое, што частка жыхароў зямель Беларусі ўсведамлялі сваю прыналежнасць да былой дзяржаўнай тэрыторыі ВКЛ. Увогуле мэтазгоднай, на наш погляд, з'яўляецца дыферэнцыяцыя этнонімаў на мікра-, суб-, макра-, паліт-, суперэтнонімы, улічваючы тое, што "ў сучаснай літаратуры існуе мноства разуменняў тэрміна "этнонім" — ад абазначэння нацый … да назвы жыхароў якой-небудзь вёскі яе суседзямі"[9].

Тэрмінам "дзяржаўнасць" у грамадазнаўчых дысцыплінах і ў гісторыцы часам абазначаюць першапачатковыя, невялікія, несуверэнныя формы палітычнай арганізацыі грамадства і разам з тым сістэмы палітычных органаў. Зыходзячы з такіх значэнняў тэрміна і раз-

---

[6] Зайкоўскі Э., Чаквін І. Ліцвіны // ЭГБ. Т. 4. С. 382.
[7] Насевіч В., Карашчанка І. Літоўцы // ЭГБ. Т. 4. С. 387.
[8] Зайкоўскі Э., Чаквін І. Ліцвіны… С. 382.
[9] Рогалеў А. Ф. Этнаніміка // Беларуская мова. Энцыклапедыя. Мн., 1994. С. 632.

важаючы строга, нельга сцвярджаць пра развітую форму палітычнай арганізацыі грамадства ў беларусаў у часы існавання Полацкага княства, але прымальна казаць пра тое, што продкі беларусаў (этнасы, з якімі пераемныя беларусы) мелі дзяржаўнасць. Разам з тым падобныя выказванні недастаткова выразныя з прычыны шматслойнасці тэрміна "дзяржава". Але, зыходзячы з прапануемага намі адрознення тэрмінаў "дзяржаўнасць" (асноўная форма палітычнай арганізацыі грамадства) і "дзяржава" (спецыфічнае аб'яднанне людзей, якому адпавядае сістэма палітычных, гаспадарчых і іншых устаноў, якія функцыяніруюць у адпаведнасці з пэўнымі заканадаўствам і прававымі нормамі), прымальна казаць, што продкі беларусаў мелі ў IX—X стст. дзяржаўнасць (прычым такую форму яе, як народная дэмакратыя) і складалі незалежныя дзяржавы — Полацкае, Смаленскае і Турава-Пінскае княствы.

Сёння айчынныя гісторыкі працягваюць дыскусіраваць наконт наяўнасці ў продкаў беларусаў дзяржавы да 1919 г. Частка іх, у прыватнасці А. К. Краўцэвіч, абгрунтоўвае пункт гледжання, паводле якога ўсходнеславянскі элемент разам з балцкім элементам мелі ўласную дзяржаву — ВКЛ[10]. Іншая частка іх, у прыватнасці С. Я. Рассадзін, прытрымліваецца пункту гледжання, паводле якога беларусы (ці продкі беларусаў) да стварэння БССР не мелі ўласнай дзяржавы[11]. Некаторыя гісторыкі, у прыватнасці П. Ц. Петрыкаў, лічаць, што да стварэння БССР беларусы, пражываючы ў розных дзяржавах, мелі дзяржаўнасць, аднак не мелі ўласнай дзяржавы[12]. На наш погляд, формулы — "пэўны этнас, народ стварыў, меў дзяржаву" — ідэалагемы. Калі лічыць, што ў некаторыя моманты сусветнай гісторыі плямёны рэарганізуюцца ў дзяржавы, страчваючы статус суб'екта яе, і не атаясамляюць паняцці дзяржавы і дзяржаўнай улады, то, разважаючы пра сувязь этнасаў і дзяржаў, пачынаючы з такіх момантаў, належыць казаць, што этнасы складаюць дзяржаву (або адпавядаюць ёй), а не маюць яе.

Агульнапрынята палажэнне, паводле якога ў межах еўрапейскага сярэднявечча, верхняя мяжа якога акрэсліваецца XV ст., не існавала нацый і нацыянальных дзяржаў. Некаторыя беларускія вучоныя, у прыватнасці Г. М. Сагановіч, лічачы, што "...гісторыя Беларусі мае нейкія ўласныя ... не заходнееўрапейскія межы ... паміж эпохамі",

---

[10] Краўцэвіч А. К. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. 2000.

[11] Рассадзін С. Дар незалежнасці // Беларуская думка. 2003. № 6.

[12] Пертыкаў П. Асноўныя этапы гістарыяграфіі Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2003. № 4.

акрэсліваюць верхнюю мяжу сярэднявечча ў гісторыі Беларусі XVIII ст.[13] З гэтага напрошваецца выснова, што на гэты час у беларусаў не магло быць нацыянальнай дзяржавы. Але такая выснова будзе вынікам паліталагічнага падыходу да праблемы дзяржаўнасці этнасаў. У адпаведнасці з варыянтам тэорыі этнасу, які абгрунтаваў Ю. В. Брамлей, яна фармулюецца інакш: ці быў кампактным этнасам этнас, з якім пераемная беларуская нацыя, ці меў ён цэнтралізаваную арганізацыю палітычнай улады. Паводле Ю. В. Брамлея, пэўны этнас на розных стадыях развіцця грамадска-эканамічнай фармацыі меў або не меў этнасацыяльны арганізм. Пры этналагічным падыходзе, які прапануецца намі да разгляду пры пабудове тэорыі этнасу, такая праблема ацэньваецца як штучная ў межах этналогіі. Пры ім этнасацыяльным супольнасцям ставіцца ў адпаведнасць насельніцтва пэўных краін. Выказванні пра дзяржаўнасць народаў прапанаваны ў межах канцэпцыі палітычнага ўжытку.

З пункту гледжання логікі выказванні: беларусы, немцы і г. д. стварылі сваю дзяржаву — маюць няпэўна-ісцінаснае значэнне, паколькі тэрмін "дзяржава" і этнонімы "беларусы", "немцы" — шматзначныя. Значэнне іх удакладняецца ў іншых выказваннях. З пункту гледжання анталагічнага аналізу падобных выказванняў вынікае, што ім адпавядаюць спекулятыўныя ўяўленні, якія зыходзяць з гістарыясофскай установкі, паводле якой этнасы і пасля ўзнікнення дзяржаўнасці з'яўляюцца суб'ектамі геапалітыкі. А між тым, калі вызначаць неспекулятыўна, суб'екты сусветнай гісторыі, як і суб'екты грамадскай дзейнасці, — такія грамадскія ўтварэнні, якія па ступені ўзаемадзеяння індывідаў характарызуюцца анталагічна не як супольнасці, а як аб'яднанні, саюзы, адзінствы (пэўныя ваенныя фарміраванні, палітычныя партыі і кланы і г. д.) і якія мы за адсутнасцю спецыяльна ўведзенага тэрміна абазначаем тэрмінам "соцыум". Дзеянні такіх утварэнняў прыводзяць да гістарычных падзей, у тым ліку стварэння новай дзяржавы ў пэўнай краіне.

З пункту гледжання эпістэмалогіі падобныя выказванні пра стварэнне пэўнымі этнасамі сваёй дзяржавы з'яўляюцца мовай канцэптуальнага апісання і тлумачэння (ажыццяўляемых з дапамогай прыёму ідэалізацыі), якая адрозніваецца ад мовы фактуальнага апі-

---

[13] Сагановіч Генадзь. Да праблемы перыядызацыі беларускай гісторыі: сярэднявечча і новы час // М. М. Улашчык і праблемы беларускай гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і археаграфіі (да 90-х угодкаў вучонага). Мінск. Міжнародная навуковая канферэнцыя. 14—15 лютага 1996 г. Мн., 1997. С. 59.

сання. У рамках гісторыкі пераважае фактуальнае апісанне. Прыклад выказвання, якое з'яўляецца фактуальным апісаннем: "Фактычна, з 15 па 18 лютага (1918 г. — *Ю. Н.*) Сакратарыят (Народны сакратарыят. — *Ю. Н.*) быў адзінай уладай на Беларусі"[14].

Шэрагу даследчыкаў пры вывучэнні грамадскіх з'яў складана адразу вызначыць статус пэўных утварэнняў індывідаў як этнасаў або як соцыумаў. Так, для І. Р. Шафарэвіча цяжка вызначыць несупярэчліва анталагічны статус яўрэяў, ён сцвярджае, што апошнія — нацыя, этнічная рэлігія, сплаў таго і другога, сацыяльны слой і (або) нават вялікая сям'я. Калі сфармуляваць гэтыя яго намаганні па ўстанаўленні статуса яўрэяў на мове сучаснай сацыялогіі, то яўрэі будуць ахарактарызаваны як сацыяльны інстытут або сацыяльная арганізацыя. Але і такая выснова не будзе вернай, паколькі сацыя(та)льныя інстытуты і арганізацыі трактуюцца як штучныя аб'яднанні (гл. такую трактоўку ў дапаможніку "Социальная философия и социология" (М., 2002)), а пры разглядзе феномена так званага яўрэйства не абавязкова выдзяляемы аб'яднанні такога характару.

Няма ніякіх падстаў пры этналагічным аналізе такога пазнавальнага зместу, як утварэнне з саманазвай "яўрэі", для надання яму асаблівага статуса. Маюцца сукупнасці індывідаў, прадстаўнікі якіх усведамляюць агульнасць свайго паходжання; сукупнасці, якія ўсведамляюць прыналежнасць да пэўнай культуры, краіны; сукупнасці, якія складаюць пэўныя соцыумы рознай ступені арганізаванасці, і інш. І. Р. Шафарэвіч параўноўвае, як ён выражаецца, "яўрэйства" з біялагічным арганізмам[15]. Але мадэль пэўнага мноства індывідаў як звыш(супер)арганізма не больш як метафара. Адносна строгага даследавання падобныя аналогіі спекулятыўныя, для мэт яго яны марныя. Арганізмы, разглядаючы таксанамічна-анталагічна, — індывіды, якія ўяўляюць структурна-функцыянальна арганізаванае цэлае, соцыумы ж — сукупнасці індывідаў пэўнай ступені арганізаванасці, якія складаюцца гістарычна і ўяўляюць цэласнасць куматоіднага характару. Пазіцыя, якую заняў І. Р. Шафарэвіч пры ўстанаўленні этнічнага статуса яўрэяў — пазіцыя ідэалагічная. Пазіцыя, пазбаўленая ідэалогіі ў этнагістарычным даследаванні, заключаецца ў зыходжанні з паняційнага апарату пэўнай навуковай дысцыпліны, у дадзеным выпадку апарату этналогіі і сацыялогіі.

---

[14] Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя… С. 485.

[15] Шафоревич И. Р. Трехтысячелетняя загадка. История еврейства и перспективы современной России. СПб., 2002. С. 333—334, 318, 223.

Як тэрмін "нацыя", так і тэрмін "дзяржава" ўжываюцца ў навуковай літаратуры ў некалькіх асноўных значэннях, апошні ў значэннях: структураванай супольнасці з пэўнай арганізацыяй палітычнай ўлады кіравання сацыяльнымі працэсамі на пэўнай тэрыторыі; палітычнага інстытута, які ўяўляе сабой інстытуцыялізаваную палітычную ўладу; цэнтралізаванай арганізацыі ўлады; саюзу пэўнай часткі насельніцтва, які складаецца з мэтай рэгулявання палітычных адносін пэўных соцыумаў (варыянт такога паняцця дзяржавы: "Дзяржава, тэрытарыяльна суверэнны саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды і маёмасці"[16]). Сустракаецца і погляд (у гістарыясофскай працы Г. Ю. Любарскага, ахарактарызаванай апошнім як "глабальнае гістарычнае даследаванне"), паводле якога "дзяржава — ёсць матэрыялізаванае права..."[17] Ад Платона ідзе традыцыя трактоўкі дзяржавы як цэнтралізаванай арганізацыі палітычнай улады. У рамках сацыялогіі і паліталогіі для абазначэння такога паняцця выкарыстоўваецца тэрмін "дзяржаўная ўлада".

Тэрмін "грамадства" ўжываецца ў значэннях: пэўнага соцыуму, палітычнага суграмадства, нацыі як антаганіста роду, сацыяльнага арганізма, які ўяўляе сабой сукупнасць індывідаў і ўмоў іх сумеснага жыцця, і інш. Тэрмін "улада" ўжываецца ў значэннях: сукупнасці органаў улады, адносін падпарадкавання ў дзейнасці індывідаў, абумоўленых неабходнасцю ва ўзгодненых дзеяннях іх; права адных індывідаў кіраваць другімі індывідамі, ажыццяўляючы тым самым сваю волю, і інш. Напрыклад, у расійскім падручніку для ВНУ "Социальная структура общества" А. М. Якаўлева сцвярджаецца: "Улада ёсць здольнасць кантраляваць паводзіны іншых, незалежна ад іх згоды"[18]. Падобная дэфініцыя ў рамках сацыялогіі непрымальная, паколькі ў апошняй для тлумачэння палітычных з'яў аптымальна зыходзіць з паняцця арганізацыі, а з паняцця здольнасці пры тлумачэнні з'яў зыходзяць у рамках псіхалогіі. У падручніку "Курс политологии" сцвярджаецца, што "паняцце «ўлада» адносіцца да ліку шырока выкарыстоўваемых: «улада бацькоў», «улада сям'і»..."[19] Але паняцце ўлады (лагічна вызначаючы, гранічна агульнае паняцце) адрозніваецца не толькі па аб'ёме, але і па змесце ад паняццяў "улада сям'і", "улада ідэалогіі" і г. д.

---

[16] Юхо Язэп. Дзяржава // ЭГБ. Т. 3. Мн., 1996. С. 237.

[17] Любарский Г. Ю. Морфология истории: сравнительный метод и историческое развитие. М., 2000. С. 47.

[18] Яковлев А. М. Социальная структура общества. М., 2003. С. 22.

[19] Курс политологии. Учебник. М., 2002. С. 67.

Пад дзяржаўнай уладай звычайна разумеюць цэнтралізаваную ўладу, якая падтрымліваецца дзяржаўнымі ўстановамі і ажыццяўляецца праз іх, але пад палітычнай уладай — галоўную форму ўлады, якая заключаецца ў кіраванні рознымі грамадскімі арганізацыямі ў рэгуляванні адносін паміж імі. Паняцці дзяржаўнай улады і палітычнай улады не супадаюць па змесце. Пэўную ступень і велічыню палітычнай улады могуць мець і недзяржаўныя ўстановы. Дзяржаўная палітыка, калі зыходзіць з дэфініцыі, паводле якой палітыка — сфера грамадскай дзейнасці, якая ахоплівае дзейнасць па кіраванні сацыяльнымі групамі, па дасягненні і ўтрыманні пэўных форм улады, — гэта палітычная дзейнасць, якая ажыццяўляецца органамі дзяржаўнай ўлады. У краіне ажыццяўляецца і недзяржаўная палітыка, суб'ектамі якой выступаюць недзяржаўныя ўстановы. Паняцці дзяржаўнай палітычнай улады, дзяржаўнай улады, палітычнай улады, дзяржаўнай палітыкі, недзяржаўнай палітыкі эксплікуюцца, безумоўна, у межах паліталогіі. Але такая эксплікацыя ўзгадняецца з паняццямі дзяржавы, грамадства, палітыкі і іншымі шматслойнымі паняццямі, эксплікуемымі ў межах сацыяльнай філасофіі.

Шматслойныя паняцці (г. зн. мысліцельныя ўтварэнні, у якіх наяўны некалькі змястоўных пластоў) не маюць выразнай выдзеленасці прадмета мыслення, таму яны з'яўляюцца адзнакай непаспелага этапу развіцця навуковага пазнання, эўрыстычнымі сродкамі пабудовы тэорый і канцэпцый; іх змест належыць удакладняць і дыферэнцыраваць у межах тэорый навуковых дысцыплін. У межах розных грамадазнаўчых дысцыплін і філасофскіх кірункаў, у ствараемых ў іх канцэпцыях тэрміны, якія абазначаюць радавыя паняцці — "ўлада", "культура" "грамадства", "дзяржава" і г. д., маюць розныя значэнні і кантэксты. У рамках грамадазнаўчых дысцыплін даследуюцца, вызначаючы лагічна, класы прадметаў; у рамках філасофскіх дысцыплін разглядаюцца найбольш шырокія па аб'ёму паняцці.

У працэсе развіцця навуковага пазнання ў адносінах да прыродазнаўчых, а сёння — і грамадазнаўчых дысцыплін філасофскае пазнанне ўсё больш прызначаецца для абгрунтавання і абслугоўвання навуковага пазнання, асноўнай мэтай яго выступае складанне протатэарэтычнага апарату навуковых дысцыплін, а галоўнай функцыяй — навукова-эўрыстычная. У такой сітуацыі адной з задач філасофскіх дысцыплін, у прыватнасці сацыяльнай філасофіі, і навуказнаўчых дысцыплін, у прыватнасці гісторыказнаўства, з'яўляецца аналіз шматзначных тэрмінаў, эксплікацыя, удакладненне зместу выкарыстоўваемых

паняццяў, стварэнне і ўвядзенне адметных тэрмінаў для паняццяў, якія выражаюцца шматзначнымі словамі, напрыклад для паняццяў дзяржаўнай палітыкі, дзяржаўнай улады, палітычнай улады.

## 13. АНАЛІЗ БАЗІСНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ ЭТНАЛОГІІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВА

Пры выкладанні асноў этналогіі абмяжоўваюцца паказам асноўных канцэпцый этнічных працэсаў, пабудовы тэорыі этнасу без разгляду перадумоў іх. Такі разгляд абавязковы пры выкладанні фундамента этналогіі. Ён уключае, у прыватнасці, аналіз тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца не ў некаторых, а ва ўсіх грамадазнаўчых дысцыплінах ("дзяржава", "культура" і г. д.). На нашую думку, супярэчлівыя вызначэнні паняццяў, выкарыстоўваемых грамадазнаўцамі, — пераважна вынік недасканалага паняційнага апарату і неадкарэліраванай тэрміналогіі. Сустракаюцца і заведама памылковыя вызначэнні. Так, аўтар вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ "Основы социологии" (М., 2002) А. І. Краўчанка атаясамлівае этнічныя і кроўнароднасныя супольнасці, адносіць да іх род, сям'ю, клан, племя, народнасць і нацыю.

У межах сацыяльнай філасофіі, як указваюць аўтары вучэбнага дапаможніка "Социальная философия и социология" "...тэрмін «грамадства» ... трактуецца ў двух сэнсах: як сацыяльнасць увогуле (антытэза прыроднаму пачатку) і як арганізацыйная форма сумеснай дзейнасці людзей", апошняе, інакш кажучы, сацыяльнае ў прыватнасці або калектыўнае. Пры гэтым паняцці сацыяльнага і грамадскага атаясамліваюцца. Аўтары тлумачаць, што тэрмін "сацыяльнае" супадае ў пэўных значэннях з тэрмінамі (яны выражаюцца — "паняццямі") "соцыум", "грамадства" і інш.; што "ў шырокім сэнсе паняцце грамадства абазначае сацыяльнасць увогуле", а "...у вузкім значэнні паняцце "грамадства" трактуецца як асаблівая форма калектыўнага надіндывідуальнага быцця людзей". Разам з тым яны паведамляюць, што "паняцце «сацыятальнае» выкарыстоўваецца ў сацыялогіі для характарыстыкі грамадства ў цэлым, усёй сістэмы грамадскіх адносін"[1], г. зн. супадае па зместу з паняццем грамадскага. З атаясамлення паняццяў грамадскага (грамадства) і сацыяльнага (сацыяльнасці) выцякае, што і этнічныя супольнасці і палітычныя партыі і г. д. — гэта ўтварэнні сацыяль-

[1] Социальная философия и социология. Учебное пособие. М., 2002. С. 9, 19—20, 50—52.

ныя. А пры характарыстыцы сацыяльных класаў і страт як сацыяльнага з боку тэрміналагічнага атрымліваецца абсурд. Заўважым таксама, што характарыстыка “над(па-за)індывідуальнае” датычыцца паняцця грамадства; а для паняцця калектыўнага жыцця людзей (а не жывёл) аптымальна падыходзіць характарыстыка “між(інтэр)індывідуальнае”.

Паняцце этнасу ў этналогіі як спецыфічнай супольнасці ствараецца без выдзялення адзнакі абумоўленасці сацыяльнай стратыфікацыяй грамадства. Тое, што этнасы — з’ява грамадская, яшчэ не дае падстаў для характарыстыкі іх сацыяльнымі супольнасцямі, асабліва ў тым выпадку, калі адрозніваць паняцце грамадскіх з’яў і працэсаў як усіх праяў, якія адбываюцца з грамадскімі ўтварэннямі, ад паняцця сацыяльных з’яў і працэсаў як такіх з’яў і працэсаў, якія звязаныя ў першую чаргу са становішчам сукупнасцяў індывідаў у грамадстве і міжіндывідуальнымі адносінамі. Калі ўстанавіць слова “грамадства” аптымальна ў рамках сацыяльнай філасофіі і гістарыясофіі ў якасці тэрмінаабазначэння толькі паняцця сферы разгортвання ўсемагчымых працэсаў узаемадзеяння розных утварэнняў індывідаў, то тым самым будзе ўпарадкаваная, у значнай ступені, базавая тэрміналогія гэтых галін рэфлексіі.

Этнічная свядомасць фарміруецца бездатычна да адносін прадстаўнікоў этнасу (пэўных індывідаў) да іх (індывідаў) сацыятальных узаемадзеянняў (наяўнасць узаемадзеяння, дарэчы, адзнака паняцця сацыяльных груп, а не паняццяў этнічных груп і супольнасцяў, паколькі індывіды, з якіх складаюцца буйныя этнасы, пераважна не ўзаемадзейнічаюць паміж сабой); бездатычна сацыяльнага становішча, галоўнага, на наш погляд, крытэрыя для выдзялення сацыяльных супольнасцяў сярод іншых грамадскіх утварэнняў індывідаў. Сацыятальная свядомасць фарміруецца так, што цалкам абумоўлена сувяззю з сацыятальнымі ўстановамі і інстытутамі.

З пункту гледжання анталагічнага паняцця грамадскага ўтварэння індывідаў таксанамічна аптымальна дзяліць іншыя пазнавальныя зместы на аб’яднанні — утварэнні, дзейнасць якіх скаардынаваная і ўпарадкаваная; адзінствы — ўтварэнні, дзейнасць якіх, акрамя таго, узгодненая і мэтанакіраваная, і супольнасці — ўтварэнні, якія праяўляюцца, галоўным чынам, у пэўнай грамадскай свядомасці, якая мае асновай пэўную ідэнтыфікацыю іх прадстаўнікоў, аднак не ў дзейнасці. Зыходзячы з такога падзелу канкрэтныя этнасы (напрыклад, беларусы, палякі), пэўныя соцыумы (напрыклад, пралетарыі, студэнты) таксанамічна — супольнасці; канкрэтныя палітычныя партыі, канфесіі — аб’яднанні; сем’і, палітычныя, эканамічныя кланы — адзінствы.

Разам з тым прадстаўнікі супольнасцяў могуць прымаць удзел у падзеях, зачэпкай і прычынай якіх з'яўляюцца адносіны да іх супольнасці з боку іншых этнасаў, а таксама і соцыумаў. У гэтым выпадку дапушчальна казаць, што супольнасці ўваходзяць у стадыю актуалізацыі, знаходзяцца ў дынамічным стане (напрыклад, падчас нацыянальнага руху, студэнцкіх хваляванняў), але пры гэтым супольнасці належыць разглядаць не як суб'ект, а толькі як субстрат рэальных грамадскіх дзеянняў, якія прыводзяць да грамадскіх падзей.

Агульны аб'ект грамадазнаўчых дысцыплін, у тым ліку этналогіі і сацыялогіі, дапушчальна ўстанаўліваць як з'явы, якія адбываюцца з рознымі грамадскімі ўтварэннямі. Прычым, калі ўводзіць у паняційны апарат сацыяльнай філасофіі паняцце сацыятальнага, карэлятам якога з'яўляецца паняцце соцыуму, і калі вызначаць паняцце сацыятальнага як сферу ўсемагчымых форм (менавіта) дзейнасці (а не свядомасці) грамадскіх утварэнняў індывідаў (паняцце сацыятальнага больш вузкае па аб'ёме за паняцце грамадскага і значна шырэй паняцця сацыяльнага, якое ахоплівае толькі з'явы, якія тычацца міжіндывідуальных адносін ўзаемадзейнічаючых соцыумаў і грамадскага становішча сукупнасцяў індывідаў), то для кожнай сістэмы дысцыплін, якія класіфікуюцца як грамадазнаўчыя, выдзяляемы адметны аб'ект: для паліталогіі — гэта з'явы, якія тычацца дзейнасці соцыумаў пэўнага віду, тых грамадскіх утварэнняў, якія ўдзельнічаюць у барацьбе за ўладу; для этналогіі — гэта з'явы, якія тычацца этнасаў; для сацыялогіі — сацыяльныя з'явы, г. зн. з'явы, звязаныя з міжіндывідуальнымі адносінамі, якія тычацца дзейнасці соцыумаў (за выключэннем такіх адносін у палітычных утварэннях індывідаў), а не псіхалагічных рэакцый, і з'явы, звязаныя з грамадскім становішчам сукупнасцяў індывідаў.

Найбольшую складанасць пры рэфлексіі над базіснымі грамадазнаўчымі паняццямі ўяўляе карэляцыя зместаў і эксплікацыя паняццяў дзяржавы і палітыкі. У дэфініцыях паняцце палітыкі падобна наступнаму: "Палітыка — дзейнасць, якая звязана з адносінамі паміж класамі, нацыямі і іншымі сацыяльнымі групамі, ядром якой з'яўляецца заваяванне, утрыманне і выкарыстанне дзяржаўнай улады"[2]. Змешваюцца ў пэўнай ступені зместы паняццяў палітыкі, палітычнай улады і дзяржаўнай палітыкі. Пры фармулёўцы: "Вызначэнне палітыкі як сферы грамадскага жыцця па кіраванні дзяржавай больш агульнае і адэкватнае практыцы"[3] атрымліваецца, што такім пазнавальным

[2] Философский словарь. С. 286.
[3] Горелов А. А. Политология. Учебник. М., 2002. С. 8.

зместам, як канкрэтная палітыка (напрыклад, палітыка СССР), адпавядаюць рэальныя ўтварэнні. Між тым палітыку, безумоўна, належыць трактаваць як перш за ўсё грамадскую дзейнасць індывідаў, накіраваную на заваяванне, утрыманне ўлады і яе ўжыванне.

Частка заходніх тэарэтыкаў-палітолагаў, лічачы, што "сучаснае паняцце палітычнага ... трэба выводзіць з сутнасці сучаснай палітычнай дынамікі", абгрунтоўваюць погляд, паводле якога "практычная рэалізацыя ўніверсальнай каштоўнасці — свабоды — у грамадскай сферы з'яўляецца сучасным паняццем палітычнага"[4] (прычым філасофскім паняццем палітычнага). На нашую думку, выкарыстанне тэрміна "палітычны" ў рамках сацыяльнай філасофіі ў абгрунтоўваемым імі значэнні, калі і не зыходзіць з ідэалагічных установак, то, ва ўсякім разе, безперспектыўнае.

Ш. Дэбаш і Ж.-М. Пант'е, прынцыпова адмаўляючы ў магчымасці адназначна ўстанавіць тэрмін "палітыка", выдзяляюць два падыходы да вызначэння і эксплікацыі паняцця палітыкі: 1. Праз паняцце дзяржавы: "Палітыка характарызуе дзяржаву ў тым сэнсе, што захады дзяржавы найчасцей кваліфікуюцца як палітыка, без увагі на тое, ці гаворка ідзе аб дзеях замежнай або ўнутранай палітыкі ... Але ці зводзіцца палітыка да дзяржавы? Напрыканцы мінулага (г. зн. XIX ст. — *Ю. Н.*) некаторыя думалі менавіта так, адкуль і паходзіць назва «статология» (што значыць "дзяржавазнаўства")..."; 2. Праз паняцце ўлады[5].

У значнай частцы грамадазнаўцаў, нягледзячы на пастаяннае ўжыванне імі тэрміна "дзяржава", няма выразных уяўленняў пра паняцце дзяржавы. Возьмем, напрыклад, наступнае сцвярджэнне: "Як грамадскі інстытут дзяржава ўзнікла прыкладна на тысячу гадоў раней лакальных цывілізацый, калі саюзы палітычных плямёнаў сталі ўстойлівымі і з'явілася магчымасць сфарміраваць нейкі надплемянны палітычны эканамічны орган, які выконваў заваявальную функцыю, фінансавую функцыю па зборы падаткаў (дані), карную функцыю і тым самым, праводзіў у жыццё прынцып глабалізацыі. Але яшчэ да гэтага (г. зн. да ўзнікнення дзяржавы. — *Ю. Н.*) дзяржа-

---

[4] Хеллер А. Пересмотренное понятие политического // Современная политическая теория. М., 2001. С. 471, 473, 462.

[5] Дэбаш Шарль, Пант'е Жан-Мары. Уводзіны ў палітыку. Мн., 1996. С. 11, 15—16.

ва брала на сабе шэраг сацыяльных і эканамічных функцый...”[6] У гэтым сцвярджэнні змешваюцца паняцці сацыяльнага і палітычнага, фінансавай і палітычнай функцый, дзяржавы і палітыкі.

Аўтар падручніка для ВНУ “Всеобщая история права и государства” У. І. Графскі сцвярджае, што “ўся гісторыя сацыяльных супольнасцяў (калектыўнасцяў) распадаецца на два вялікія перыяды — перыяд племяннога жыцця і перыяд нацыянальных дзяржаў”[7], г. зн. пад сацыяльнымі супольнасцямі ён разумее прыблізна тое, што мы абгрунтоўваем як соцыум. Пры гэтым У. І. Графскі не дае дэфініцыі паняцця дзяржавы, хаця для падручніка гэта трэба рабіць, мабыць, абавязкова. Тое, што ён не выдзеліў такі перыяд гісторыі соцыумаў, як перыяд данацыянальных дзяржаў, паказвае на тое, што ён “растварае” паняцце дзяржавы сярод іншых паняццяў.

В. М. Розін трактуе пазнавальны змест (паняцце) дзяржавы ў трох аспектах: “...па-першае, дзяржава — гэта сістэма сацыяльных інстытутаў (у назве падпараграфа 2.2 цытуемай кнігі, дзяржава вызначаецца ім толькі як сацыяльны інстытут. — *Ю. Н.*) (палітычных, эканамічных, культурных, грамадскіх). Па-другое, дзяржава ўваходзіць у сістэму “грамадства — дзяржава”. Па-трэцяе, яна выступае таксама як “кансалідаваны суб’ект...”, прычым “кансалідаваны суб’ект стварае сацыяльным інстытутам (г. зн. і дзяржаве. — *Ю. Н.*) патрэбныя рэжымы функцыяніравання”[8]. Як бачна, выкладанне такога пазнавальнага зместу, як дзяржава, у яго недастаткова адкарэліравана. У падобных трактоўках не робіцца высnова пра наяўнасць розных аднатэрміновых паняццяў дзяржавы. Дзяржава як “кансалідаваны суб’ект” — гэта пэўны соцыум, канкрэтнае грамадскае ўтварэнне, якое ўяўляе сабой сістэму органаў улады і кіравання, а таксама іншых устаноў у пэўнай краіне, а дзяржава як сацыятальны інстытут — гэта пэўная форма арганізацыі грамадскай дзейнасці індывідаў.

Іншае паняцце дзяржавы абгрунтоўвае Л. Я. Грынін, які трактуе дзяржаву як “цэнтр грамадскай арганізацыі”, але пры гэтым “цэнтр яшчэ не ёсць уся сістэма, якая складаецца з палітычных адзінак”. Ён адзначае, што “ў дадзяржаўны перыяд такімі адзінкамі выступаюць у залежнасці ад грамадства сям’я, род, племя, саюз плямёнаў або нешта падобнае ... яны адначасова маглі быць вытворчымі, духоўнымі

---

[6] Базылев Н. И. Глобализация национальной экономики: сущность, тенденции, последствия // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 2002. № 6. С. 8.
[7] Графский В. И. Всеобщая история права и государства. М., 2002. С. 44.
[8] Розин В. М. Типы... С. 145—146.

або этнічнымі". Разам з тым Л. Я. Грынін атаясамляе такія адзінкі з першымі дзяржавамі[9]. Мы абгрунтоўваем іншы погляд, паводле якога дзяржава як соцыум — суб'ект грамадскай дзейнасці, які змяняе ў гэтай ролі племя (або саюз плямёнаў). Сапраўды, што паняцце дзяржавы як цэнтра грамадскай арганізацыі мае пэўную перавагу над іншымі паняццямі дзяржавы, якая заключаецца ў тым, што калі дзяржава — такі цэнтр, то ён застаецца дзейнічаць незалежна ад таго, у якім стане знаходзяцца соцыумы ў пэўнай краіне (нягледзячы, напрыклад, на анархію). Калі дзяржава — соцыум, які ўяўляе сабой сістэму палітычных органаў, розных гаспадарчых установаў, то пры пэўным стане гэтая сістэма можа не функцыяніраваць, пры тым што палітыка (пэўнага роду грамадская дзейнасць) іншымі соцыумамі працягвае ажыццяўляцца. Гэта будзе аргументам за тое, што дзяржава як грамадскае ўтварэнне мае перарывісты характар.

Для О. Шпенглера: "дзяржава — гэта форма народа, форма — гэта абстрагіраванне ад жыццёвага патоку", і "толькі выдуманая тэарэтыкамі дзяржава ўяўляе сабой сістэму"[10]. Тым не менш, калі спрабаваць эксплікаваць паняцце дзяржавы больш рацыянальна, то аналіз яго дазваляе выдзеліць два асноўныя змястоўныя пласты яго: 1) асноўная форма палітычнай арганізацыі грамадства; 2) пэўны соцыум, сістэма сацыятальных арганізацый, у першую чаргу палітычных.

Карэліруючы зместы базісных паняццяў сацыяльнай філасофіі, мы лічым, што прымальна выдзяляць два розныя паняцці дзяржавы, і ўстанаўліваем у яе межах як аптымальнае наступнае значэнне тэрміна "дзяржава": сістэма ў першую чаргу дзейнічаючых на пэўнай тэрыторыі органаў улады і кіравання насельніцтвам краіны, якія прызнае большасць насельніцтва краіны (а дакладней — якім яна падпарадкоўваецца), органаў, што ажыццяўляюць кантроль над тэрыторыяй краіны і рэгулююць прававыя адносіны розных груп насельніцтва, а таксама гаспадарчых, гандлёвых, выхаваўчых, медыцынскіх і іншых сацыяльных установаў, якія падпарадкоўваюцца органам улады і кіравання. Калі ў межах сацыялогіі створана шматслойнае паняцце дзяржавы, з выдзяленнем дзяржавы як віду (тыпу) сацыяльнага інстытута, то ў межах сацыяльнай філасофіі мы прапаноўваем эксплікаваць паняцце дзяржавы так, як вышэй выкладзена. Канкрэтная дзяржава (напрыклад, ВКЛ, ЗША) — утварэнне куматоіднага характару, пэўны соцыум.

---

[9] Гринин Л. Е. Философия... С. 171.
[10] Шпенглер О. Закат Европы. Очерки морфологии мировой истории. Т. 2. М., 1999. С. 470—471.

Будзем адрозніваць тэрміны "дзяржава" і "дзяржаўнасць" наступным чынам: першы ўжываць у значэнні соцыуму, якому адпавядае сістэма органаў улады і кіравання, а таксама гаспадарчых і іншых устаноў; другі — у значэнні асноўнай палітычнай формы арганізацыі грамадства, што прыйшла на змену той форме арганізацыі, паняцце якой абазначаецца тэрмінам "радавы лад". Такое тэрмінаўжыванне адпавядае палажэнню, паводле якога ў часы пасля ўзнікнення дзяржаўнасці асноўнай палітычнай форме арганізацыі грамадства адпавядаў пераважна такі соцыум, як дзяржава, а ў часы да ўзнікнення дзяржаўнасці формам арганізацыі грамадства палітычнай — радавому ладу і эканамічнай — абшчыне адпавядаў такі соцыум, як племя або саюз плямёнаў. Племя (якое звычайна этналагічна характарызуецца як этнас) з'яўляецца соцыумам. Пасля ўзнікнення дзяржавы ўтварэнні індывідаў, якія характарызуюцца як этнасы, ужо нельга разглядаць як соцыум. З улікам дадзенага адрознення нельга дзяліць грамадскія ўтварэнні, якія дзейнічалі да часоў узнікнення дзяржаўнасці, на этнічныя і этнапалітычныя. Да ўзнікнення такой формы арганізацыі грамадства, як дзяржаўнасць, прымальна казаць пра этнасы як пра суб'екты сусветнай гісторыі, але з моманту ўзнікнення дзяржаўнасці суб'ектамі яе становяцца дзяржавы.

З узнікненнем дзяржаўнасці (дзяржаўнага ладу) ствараецца іншы тып сацыятальных адносін, чым той, які быў да яе ўзнікнення, такі тып, пры якім грамадскія ўтварэнні індывідаў, што характарызуюцца як этнасы, трэба трактаваць ужо не як суб'ект грамадскай дзейнасці, а толькі як субстрат яе. Канстытуіраванне адначасова такіх суб'ектаў грамадскай дзейнасці, як дзяржава і этнас (племя, народнасць, нацыя), з'яўляецца неадэкватным філасофскім асэнсаваннем паняццяў грамадскай дзейнасці і сусветна-гістарычнага працэсу. Народнасці і нацыі, як і пэўныя (так званыя рэальныя) сацыяльныя групы (напрыклад, рабы, феадалы, гараджане, сяляне), памылкова характарызаваць суб'ектамі грамадскай дзейнасці. Апошнімі выступаюць канкрэтныя соцыумы (напрыклад, канкрэтныя вайсковыя падраздзяленні рабоў, дзяржаўныя ўстановы, натоўпы гараджан, сялянскія абшчыны).

Новая, распаўсюджаная сёння ў межах філасофіі трактоўка культуры як сістэмы надбіялагічных праграм чалавечай дзейнасці, паводзін і камунікацый няслушная тым, што рэферэнт такога паняцця культуры не ўказваецца выразна. Абазначэнне паняцця такой сістэмы тэрмінам "культура" дасцца непаслядоўна. Напрыклад, В. С. Сцёпін у артыкуле "Культура" ў "Новейшем философском сло-

варе", зыходзячы з падобнай трактоўкі культуры, сцвярджае, што "праграмы дзейнасці, паводзін і зносін складаюць корпус культуры ... У сваёй сукупнасці і дынаміцы яны ствараюць гістарычна назапашаны вопыт"[11]. Тым самым, тэрмін "культура" ўжываецца аўтарам і ў значэнні, якое адпавядае новай канцэптуальнай трактоўцы культуры, і ў значэнні сукупнасці вынікаў розных форм жыццядзейнасці індывідаў, г. зн. у распаўсюджаным раней асноўным значэнні тэрміна. Увогуле ў апошні час ў навуковай і вучэбнай літаратуры сустракаюцца адвольныя дэфініцыі паняцця культуры. Так, П. С. Гурэвіч лічыць, што культуру "...можна вызначыць як феномен, які народжаны ... творчай дзейнасцю чалавека, накіраванай на пошук сакральнага сэнсу быцця"[12]. Такая дэфініцыя падышла б, мабыць, да паняцця рэлігійнай, этычнай або эзатэрычна-філасофскай культуры, але непрымальна ў адносінах да паняцця культуры.

А. Я. Фліэр, нягледзячы на тое, што выдзяляе базавыя структуры культуры, і паведамляючы, што "ёсць усе падставы лічыць, што сістэма сацыяльных норм і з'яўляецца квінтэсенцыяй культуры як такой", не абазначае такія структуры (нормы), у адрозненне ад В. С. Сцёпіна, праз тэрмін "культура", вызначаючы паняцце культуры традыцыйна: "Культура — ...сукупнасць парадкаў і аб'ектаў, якія створаны людзьмі ў дадатак да прыроды"[13].

С. У. Лур'е ў вучэбным дапаможніку для ВНУ "Историческая антропология» (М., 1997) у главе 6 пералічвае трактоўкі і дэфініцыі паняцця культуры, наяўныя ў межах этналогіі, паведамляючы, што ў заходняй навуцы сёння найбольш прыняты сімвалічная і адаптыўная трактоўкі культуры. З яе аналізу паняцця культуры выцякае, што ў межах этналогіі (антрапалогіі) яно не эксплікавана і не дыферэнцыравана.

В. М. Розін у дадатку да сваёй кнігі "Культорология. Учебник" (М., 2003) праводзіць шэраг дэфініцый паняцця культуры, якія адпавядаюць шасці асноўным тыпам (апісальнаму, гістарычнаму, нарматыўнаму, псіхалагічнаму, структурнаму, генетычнаму) такіх дэфініцый, што выдзяляюцца амерыканскімі антраполагамі А. Крэберам і

---

[11] Степин В. С. Культура // Новейший философский словарь / Под ред. А. А. Грицанова. Мн., 1998. С. 310.

[12] Гуревич Н. С. Философия культуры. М., 2001. С. 37.

[13] Флиер А. Я. Культурология для культурологов. Учебник для магистрантов, аспирантов, докторантов и студентов, а также преподавателей культурологии. М., 2002. С. 39, 119.

К. Клакханам. З гэтых дэфініцый бачна, што вызначаемыя паняцці культуры — гэта розныя пазнавальныя зместы, пераважную большасць якіх мэтазгодна абазначаць не праз тэрмін "культура", а іншымі тэрмінамі — "культурныя каштоўнасці", "сацыятальныя стэрэатыпы паводзін" і г. д.

Ю. У. Раждзественскі канстатуе, што маюцца 2 асноўныя разнавіднасці тлумачэння слова "культура": "а) культура — форма камунікацый, прынятая ў дадзеным грамадстве або грамадскай групе, і б) культура — сукупнасць дасягненняў людзей. Першае тлумачэнне блізка філасофскай антрапалогіі, другое — практыкам бібліятэчнай, архіўнай, музейнай працы"[14]. І ў межах этналогіі тэрмін "культура" ўжываецца найчасцей у апошнім значэнні. Дэфініцыі паняцця культуры этнолагі даюць таксама супярэчлівыя, як і філосафы. Так, у вышэйзгаданым вучэбным дапаможніку "Этнология" ў слоўніку спецтэрмінаў вызначаецца: "Культура — звышбіялагічны выпрацаваны і перадаваемы спосаб чалавечай дзейнасці і адаптыўны механізм, які аблягчае чалавеку жыццё ў сусвеце", а ў тэксце дапаможніка тэрмін "культура" ўжываецца і ў іншых значэннях, у прыватнасці, у значэнні вынікаў форм жыццядзейнасці этнасаў: "Кожная культура з'яўляецца вынікам дзейнасці свайго творцы — этнасу або этнічнай групы"[15].

Выкарыстанне аднаго слова ў розных значэннях у межах розных галін пазнання і даследавання ў якасці тэрмінаў — звычайная справа. Але гэта нязручна ва ўжытку, а ў межах строгага даследавання недапушчальна. Чаму б у межах таго ж культуразнаўства не карыстацца тэрмінам "камунікатыўная культура", і іншымі — у мэтах тэрмінаадрознення розных паняццяў культуры.

Л. М. Шыхіраў налічвае 5 асноўных, як ён даводзіць, падыходаў да культуры (г. зн. да трактоўкі такога пазнавальнага зместу, як культура): філасофскі, культурна-антрапалагічны, сацыялагічны, семіятычны, сацыяльна-псіхалагічны. Спасылаючыся на Л. Іоніна, ён выдзяляе "ядро паняцця" (пад якім разумее асноўныя сэнсы ці зместы паняцця) культуры і пералічвае трактоўкі паняцця культуры, якія існуюць у межах розных галін пазнання[16]. На нашую думку, надышоў час разважаць не пра розныя трактоўкі паняцця культуры, а пра розныя паняцці культуры ў межах розных навуковых дысцыплін.

---

[14] Рождественский Ю. В. Введение… С. 3.

[15] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология… С. 291, 221.

[16] Шихирев Л. Н. Введение в российскую деловую культуру. М., 2000. С. 14, 29—30.

Паняцце цывілізацыі прымальна, а мабыць, і аптымальна, вызначаць як агульны ўзровень развіцця культуры натуральна-гістарычна выдзяляемых рэгіёнаў, але не як буйную супольнасць, якая выдзяляецца па спецыфічнасці датычных да яе рыс культуры, перш за ўсё матэрыяльнай, як вызначаецца нярэдка ў гістарыясофіі (для абазначэння паняцця такіх груп падыходзіць тэрмін "цывілізацыйныя супольнасці"). Часам сцвярджаюць (напрыклад, П. С. Гурэвіч у кнізе "Современный гуманитарный словарь-справочник") пра шматзначнасць паняцця цывілізацыі (хаця дакладней казаць пра шматслойнасць яго, а пра шматзначнасць — тэрміна "цывілізацыя"), пра тое, што цывілізацыя — сінонім культуры, у вузкім сэнсе — матэрыяльнай культуры, аднак больш дакладна казаць пра яе, як пра пэўны ўзровень культуры. Гэта будзе культурасофскай трактоўкай культуры. У межах гістарыясофіі цывілізацыі канстытуіруемы і ў якасці суб'ектаў сусветнай гісторыі (напрыклад, у працах А. Тойнбі яны трактуюцца як дыскрэтныя адзінкі сацыяльнай арганізацыі).

У межах сацыяльнай філасофіі выкарыстоўваецца паняцце сфер грамадства як сфер разгортвання розных працэсаў узаемадзеяння соцыумаў. Пры ўжыванні дзейнаснага падыходу ствараецца паняцце сфер грамадскай дзейнасці (пры гэтым узаемадзеянне трактуецца як разнастайнасць дзейнасці). Звычайна выдзяляюцца такія тыпы грамадскай дзейнасці, як палітыка, эканоміка, сацыяльнасць, культура. У падручніку "Философия" (Мн., 2003), які выйшаў пад агульнай рэдакцыяй У. К. Лукашэвіча, Я. З. Волчака, як і ў падручніку В. С. Баруліна "Социальная философия", выдзелены наступныя сферы жыцця грамадства: матэрыяльна-вытворчая (ці эканамічная), палітычная, сацыяльная і духоўная. У згаданым у пачатку параграфа навучальным дапаможніку "Социальная философия и социология" выдзяляюцца такія сферы грамадскага жыцця, як вытворчасць, сацыяльнае кіраванне, палітыка, духоўная вытворчасць.

Асноўнымі сацыяльнымі інстытутамі выдзяляюцца інстытуты: сям'і і шлюбу, палітычныя (дзяржава), эканамічныя (вытворчасць), выхавання (навука і культура), рэлігіі[17]. Як бачна, вытворчасць вызначаецца ў працах сацыёлагаў і філосафаў і сферай грамадскага жыцця, і сацыяльным інстытутам. Гэта паказвае на неабходнасць размежавання паняційнага апарату сацыялогіі і (сацыяльнай) філасофіі, пры якім у апошні не ўключаецца паняцце сацыяльнага інстытута, а ў першы — паняцце сфер грамадства. У межах апошняга мэтазгодна

---

[17] Кравченко А. И. Основы социологии… С. 55.

выдзяляць, акрамя тыпаў, і віды грамадскай дзейнасці, у прыватнасці такія, як гаспадарка, гандаль, фінансы, рэлігія, навука, выхаванне, медыцына, юстыцыя. Апошнія выдзеленыя сферы грамадскай дзейнасці належыць адрозніваць ад сацыя(та)льных інстытутаў: царквы, дзяржавы, арміі і інш. Адносна сфер грамадскай дзейнасці належыць выдзяляць яе суб'екты.

Суб'ектамі грамадскай дзейнасці мы вызначаем выключна соцыумы. (Пры гэтым раўназначным тэрміну "соцыум" з'яўляецца тэрмін "сацыятальны", а не "сацыяльны".) Да іх нельга адносіць этнасы і сацыяльныя класы, паколькі грамадскія ўтварэнні такіх тыпаў не ажыццяўляюць грамадскую дзейнасць. Між тым сёння такая трактоўка нацый і сацыяльных класаў у працах па сацыяльнай філасофіі з'яўляецца звычайнай справай. Так, Ю. І. Сямёнаў у падручніку (Социальная философия / Под ред. И. А. Голозода. М., 2003) у XII лекцыі выдзяляе суб'ектамі гісторыіі народ, нацыю, масу, натоўп, сацыяльныя класы. З тым жа поспехам у якасці суб'ектаў гісторыі магчыма абгрунтоўваць мужчын і жанчын.

Айчынны сацыёлаг Я. М. Бабосаў так абгрунтоўвае характарыстыку этнасаў як сацыяльных супольнасцяў: "Паколькі этнас як сацыяльная супольнасць функцыяніруе ў якасці сацыяльнай сістэмы ... (то. — *Ю. Н.*) ён выконвае ў адносінах да ўваходзячых у яго склад асоб пэўныя сацыяльныя функцыі"[18]. Тое, што пэўныя сукупнасці індывідаў вывучаюцца ў якасці сістэм, нельга прымаць аргументам на карысць вызначэння этнасаў як сацыяльных супольнасцяў. У тым выпадку калі зыходзіць з дэфініцыі паняцця сацыяльнай супольнасці як любой сукупнасці індывідаў, якая выдзяляецца па сацыяльна значных адзнаках, то этнасы прымальна трактаваць (характарызаваць) як сацыяльныя супольнасці. Але ў гэтым выпадку канкрэтныя сацыяльныя супольнасці як пазнавальныя зместы вызначаюцца канструктамі, г. зн. ім нельга паставіць у адпаведнасць рэчаісныя ўтварэнні. У гэтым выпадку, калі слова "сацыяльны" ўжываецца ў значэнні, аднолькавым са значэннем слова "грамадскі", пад соцыумамі разумеюцца "...стабільныя сацыяльныя супольнасці, якія прыкметныя адзінствам жыццядзейнасці людзей і як след гэтага — агульнасцю культуры"[19]. Заўважым, што з адзінства жыццядзейнасці прадстаўнікоў пэўнага соцыуму (напрыклад, палітычнай партыі) зусім не вынікае агульнасць іх культу-

---

[18] Бабосов Е. М. Прикладная социология... С. 87.

[19] Гуревич П. С. Современный гуманитарный словарь-справочник. С. 383.

ры, тым больш што аўтар прыведзенага тэзіса П. С. Гурэвіч не ўдакладняе, якое паняцце культуры ім маецца на ўвазе.

Аўтар вучэбнага дапаможніка "Прикладная социология" Я. М. Бабосаў, пэўна, зыходзячы з агульнапрынятай у сацыялогіі трактоўкі сацыяльнай супольнасці як гістарычна склаўшайся супольнасці з устойлівымі сацыяльнымі сувязямі, пры гэтым адным з відаў сацыяльнай супольнасці выдзяляе этнічныя супольнасці, сярод якіх выдзяляюцца род, нацыя, аднак не этнас, пры аналізе этнічных супольнасцяў зыходзіць з этналагічнага адрознення і супрацьпастаўлення этнасаў і нацый (змешваючы тым самым сацыялагічныя і этналагічныя паняцці), фармулюючы, што "справа ў тым, што на пэўным этапе сацыяльна-гістарычнага развіцця … этнас паступова ператвараецца ў нацыю". Але пры такім адрозненні этнасу ад нацыі памылкова сцвярджаць, што "самасвядомасць этнасу … рэалізуецца ў такіх паняццях, як «мая Радзіма»…", паколькі такое ўяўленне (або пакультурасофскі — універсалія культуры) да ўзнікнення нацый не стваралася. Я. М. Бабосаў сцвярджае, што "Этнасацыялогія ўдзяляе першарадную ўвагу высвятленню спецыфічных асаблівасцяў этнасу як сацыяльнай супольнасці". У слоўніку ключавых сацыялагічных тэрмінаў дапаможніка адсутнічае тэрмін "сацыяльная супольнасць", з дэфініцыі этнасацыялогіі ў адпаведнай главе кнігі вынікае, што сацыяльныя супольнасці — гэта "складаныя сацыяльныя сістэмы, якія дынамічна развіваюцца". Прычым у гэтай дэфініцыі сацыёлаг разважае пра аб'екты этнасацыялогіі (г. зн. і пра этнасы) як пра этнічныя і нацыянальныя супольнасці, а выдзяляючы асаблівасці этнасу як сацыяльнай супольнасці, характарызуе яго толькі як сацыяльную супольнасць — "наяўнасць выразных адзнак, якія адрозніваюць этнас ад іншых сацыяльных супольнасцяў"[20].

Мала таго што Я. М. Бабосавым этнас вызначаецца як сацыяльная супольнасць (г. зн. паняцце этналогіі характарызуецца з дапамогай паняцця сацыялогіі), ім яшчэ лічыцца, што этнас "складае спецыфічнае сацыяльнае асяроддзе, у якім фарміруецца, развіваецца і дзейнічае кожная канкрэтная асоба, якая належыць да дадзенай этнічнай супольнасці". У іншых месцах дапаможніка сацыёлаг сцвярджае, насуперак сваім ранейшым вызначэнням, што этнас "…спецыфічная прыродна-сацыяльная і антрапалагічная супольнасць людзей, якая ўзнікла і развіваецца на аснове прыродна-ландшафтных умоў…" і што "…этнас з'яўляецца фундаментальным антрапагенетычным

[20] Бабосов Е. М. Прикладная социология… С. 85—86, 93.

утварэннем, якое забяспечвае этнічнае адзінства пэўнай супольнасці людзей…", г. зн. што ў яго выкладанні этнасацыялогіі трактоўка этнасу супярэчлівая. Не лепшым чынам Я. М. Бабосаў характарызуе паняцце нацыіі: "нацыя выступае як поліэтнічнае і надэтнічнае сацыяльнае адзінства". Тут належыць выбраць нешта адно — этнічнае або надэтнічнае. (І чаму раптам "адзінства", калі ў іншых месцах дапаможніка, у тым ліку і ў слоўніку, нацыя разумеецца як супольнасць?) Я. М. Бабосаў не толькі не здолеў эксплікаваць паняцці этнасу і нацыі, але і прапанаваў невыразныя ўяўленні пра іх чытачам вучэбнага дапаможніка. Мабыць, адной з падстаў з'яўлення такіх невыразных уяўленняў з'яўляецца тое, што тэрміны "этнас" і "нацыя" маюць у межах этналогіі і сацыялогіі розныя значэнні.

Акрамя таго, што Я. М. Бабосаў не адрознівае выразна сацыялагічнае і этналагічнае паняцці этнасу і нацыі (што сёння шырока распаўсюджана сярод даследчыкаў), ён гіпастазуе этнас, г. зн. этналагічнае паняцце. Так, выдзяляючы сярод шэрагу сацыяльных функцый этнасу абарончую функцыю як функцыю "гістарычна зыходную і вельмі важную, асабліва на першапачатковых стадыях этнагенезу", ён выказваецца пра абарончую функцыю, "…якая праяўляецца ў тым, што этнас як своеасаблівы сацыяльны арганізм абараняе інтарэсы ўваходзячай у яе склад асобы…"[21] Дзе можна ўбачыць, каб сукупнасць індывідаў, складаючых не палітычную групоўку або сям'ю, а народнасць, абараняла асабістыя інтарэсы яе прадстаўнікоў?

У іншым вучэбным дапаможніку "Общая социология" Я. М. Бабосаў, разглядаючы этнанацыянальную сферу грамадства (прычым тэрмін "этнанацыянальная сфера грамадства", на наш погляд, няўдалы: ужываць яго ідэнтычна, напрыклад, выразу "эканомікагаспадарчая сфера грамадства"), атаясамляе паняцці этнічнасці і этнічнай супольнасці, зноў (пасля аналізу прац Л. М. Гумілёва, Дж. Йінгера, М. Нэша) паўтарае дэфініцыю этнасаў як прыроднасацыяльных і антрапалагічных супольнасцяў, дэфініцыю нацыі як поліэтнічнай сацыяльнай супольнасці[22] (якія дае ў "Прикладной социологии"), характарызуючы этнасы, як і нацыі, сацыяльнымі супольнасцямі. Застаецца толькі здзіўляцца, як гэта злучэнне антрапалагічных супольнасцяў дае сацыяльную супольнасць.

---

[21] Бабосов Е. М. Прикладная социология… С. 470, 88—89, 94—93, 88, 87.

[22] Бабосов Е. М. Общая социология. Уч. пос. для вузов. Мн., 2002. С. 211, 216, 220.

У дадзеных дапаможніках Я. М. Бабосаў выразна не адрозніває паняцці сацыяльнай групы і сацыяльнай супольнасці, што бачна з ніжэй прыведзенай ім трактоўкі сацыяльнай супольнасці: "Сацыяльная супольнасць ... уяўляе сабой узаемадзеянне індывідаў, якая (якое. — *Ю. Н.*) абумоўлена падабенствам або адзінствам іх інтарэсаў..."[23] (чаму ўзаемадзеянне? З прычыны такога таксанамічнага звядзення сукупнасці індывідаў да пэўнага тыпу дзеяння нават няверна граматычна пабудаваны сказ), г. зн. што яго трактоўка сацыяльных супольнасцяў ідэнтычна агульнапрынятаму ў сацыялогіі вызначэнню паняцця сацыяльных груп, напрыклад, у такой фармулёўцы: "Сацыяльная група — любая ўстойлівая група людзей, якая знаходзіцца ва ўзаемадзеянні і аб'яднаная агульнымі інтарэсамі і мэтамі"[24]. Ідэнтычная фармулёўка маецца ў іншых выданнях па сацыялогіі, прыведзена ў артыкуле К. А. Карасцялёвай "Сацыяльная група" ў даведніку "Новейший философский словарь" (Мн., 1998).

Сапраўды, слушным, на наш погляд, разам з супрацьпастаўленнем этнасаў і нацый у межах этналогіі з'яўляецца ў рамках сацыялогіі выдзяленне нацыянальных груп як падкласа рэальных сацыяльных груп разам са стратыфікацыйнымі, этнічнымі і тэрытарыяльнымі групамі, паколькі нельга ўтварыць паняцце этнічных сацыяльных груп па адзнаках, якія б дазвалялі адносіць да такіх груп і роды, і нацыі.

На наш погляд, у межах сацыялогіі няверна вызначаць этнічныя супольнасці як сацыяльныя групы, зыходзячы са стандартнай дэфініцыі паняцця апошняй (як групы, члены якой знаходзяцца ва ўзаемадзеянні і маюць агульныя інтарэсы), паколькі члены такой групы не маюць агульных інтарэсаў і мэт (карэкціруючы неадпаведнасць такога вызначэння з пункту гледжання сацыяльнай філасофіі, дададзім, што яны ўвогуле не маюць мэт, звязаных з грамадскай дзейнасцю), а прадстаўнікі буйных груп у большасці не ўступаюць паміж сабой ва ўзаемадзеянне. У межах этналогіі такое вызначэнне зусім непрымальнае, паколькі паняццем этналогіі з'яўляецца паняцце этнічнай, а не сацыяльнай групы.

Калі зыходзіць з палажэння, што "пад сацыяльнай групай прынята разумець любую сукупнасць людзей, якія выдзяляюцца па сацыяльна значных крытэрыях, такімі з'яўляюцца пол, узрост, нацыянальнасць, раса, прафесія, месца жыхарства, даход, улада, выхаванне і

---

[23] Бабосов Е. М. Общая социология... С. 11.
[24] Социология. Энциклопедия. М., 2003. С. 943.

некаторыя іншыя"[25], то пры вызначэнні этнічнай супольнасці як сацыяльнай групы атрымліваецца, што ўжываецца лагічны прыём вызначэння, які тэрмінаабазначаецца як "круг у вызначэнні", або яго разнавіднасці: сацыяльная група вызначаецца па адзнацы нацыянальнасці, а этнічная супольнасць (у тым ліку і нацыя) — гэта сацыяльная група.

У розных выкладаннях асноў сацыялогіі аднымі і тымі ж тэрмінамі абазначаюцца нярэдка розныя паняцці, а паняцці, як правіла, неаднастайныя, як вынік гэтага сустракаюцца непаслядоўнасці ў выкладанні. Так, у вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй С. А. Хмялеўскай "Социальная философия и социология" (М., 2002) непаслядоўна тлумачыцца паняцце сацыяльнай супольнасці, дзе сцвярджаецца, што "ў адрозненне ад іншых арганізацый і інстытутаў, свядома ствараемых людзьмі, супольнасці ўзнікаюць натуральна-гістарычна…", і пры гэтым з выдзяляемых у ім сярод сацыяльных супольнасцяў этнічных — роду, клана, племені, абшчыны, народнасці, нацыі, сям'і ніводную не лічаць арганізацыяй, і толькі апошнюю лічаць сацыяльным інстытутам. Прапануемае ў дапаможніку паняцце сацыяльнага інстытута разнастойнае: сацыяльны інстытут — "сукупнасць асоб, устаноў (у адзінстве з матэрыяльнымі сродкамі), якія ажыццяўляюць канкрэтную сацыяльную функцыю", "набор мэтанакіраваных арганізаваных стандартаў паводзін", "сацыяльны інстытут — гэта пэўная арганізацыя сацыяльнай дзейнасці". У ім паведамляецца, што "пад арганізацыяй разумеецца … штучнае аб'ядананне інстытуцыялізаванага характару…"[26] Для пазбягання шматзначных тэрмінаў трэба было б для пачатку выражацца — "пад сацыяльнай арганізацыяй".

Не абавязкова абазначаць адным і тым жа тэрмінам "сацыяльны інстытут" і паняцце комплексу стандартаў грамадскіх паводзін, і паняцце сукупнасці грамадскіх устаноў. У навуковай літаратуры (у "Слоўніку сацыялагічных тэрмінаў", якія прапануе У. Маруцік) аднастайнае вызначэнне паняцця сацыяльнага інстутута як усталяванага і ўжываемага ўзору паводзін, у адпаведнасці з якім сям'я трактуецца як сацыяльная супольнасць, а не як сацыяльны інстытут[27]. Пазбягае шматстайнага паняцця сацыяльнага інстытута і К. А. Карасцялёва: "Сацыяльны інстытут — адносна ўстойлівая форма арганізацыі сацыяльнага жыцця, якая забяспечвае ўстойлівыя сувязі і адносіны ў

[25] Кравченко А. И. Основы социологии… С. 76.
[26] Социальная философия и социология. С. 103, 112—113, 117.
[27] Суінджвуд Элан. Сціслая гісторыя сацыялагічнай думкі. Мн., 1999. С. 322, 343.

рамках грамадства. Сацыяльныя інстытуты належыць адрозніваць ад канкрэтных арганізацый і сацыяльных груп"[28].

В. С. Барулін дае невыразную дэфініцыю паняцця сацыяльнай супольнасці, зыходзячы са спекулятыўных установак дыямата, таксанамічна зводзячы супольнасці да сувязяў індывідаў "Сацыяльная супольнасць — якасна цэласнае ўтварэнне, якое аб'ектыўна складаецца ў грамадстве і ўключае ўстойлівыя сувязі людзей..."[29] Выразна фармулюе дэфініцыю сацыяльнай супольнасці і Д. М. Булынка: "Сацыяльная супольнасць — сукупнасць людзей, выдзяляемых па крытэрыю тэрытарыяльных і культурных параметраў і аб'яднаных устойлівымі сувязямі і адносінамі. Нейкая колькасць людзей (чаму не сукупнасць? — *Ю. Н.*) становіцца сацыяльнай супольнасцю ... таму што іх сувязь набывае характар узаемаўплыву і ўзаемавызначэння (узаемадзеяння)". Зыходзячы з такой дэфініцыі, нельга разглядаць этнічныя супольнасці як сацыяльныя. Тым не менш аўтар дэфініцыі непаслядоўна выдзяляе відамі сацыяльных супольнасцяў сацыяльныя групы, класы, нацыі, што ўжо супярэчліва, у прыватнасці, таму, што сацыяльныя класы не выдзяляюцца па тэрытарыяльных і соцыёкультурных адзнаках.

А. І. Краўчанка, выкладаючы асновы сацыялогіі і разглядаючы грамадства як сацыяльную сістэму, выдзяляе базісным паняццем паняцце сацыяльнага інстытута (якое, паводле яго канцэптуальнай мадэлі, шматслойнае: сацыяльныя інстытуты ўяўляюць "...рэальную сукупнасць людзей, якія працуюць у дадзенай сферы, а таксама, сістэму канкрэтных законаў, упраўленчых рашэнняў і практычных мерапрыемстваў", яшчэ яны і "гіганцкая сацыяльная сістэма, якая ахоплівае сукупнасць статусаў і роляў, сацыяльных норм, сацыяльных арганізацый"). Рэальныя сацыяльныя групы ён падзяляе на стратыфікацыйныя, этнічныя і тэрытарыяльныя. Акрамя іх, А. І. Краўчанка выдзяляе такія адзінкі сацыяльных сістэм, як агрэгаты, сацыяльныя арганізацыі, і зноў жа сацыяльныя супольнасці. Сацыёлаг тлумачыць, што "ён (тэрмін «сацыяльная супольнасць») ужываецца ў двух значэннях ... У шырокім сэнсе ён выступае сінонімам сацыяльнай групы ўвогуле. У вузкім сэнсе сацыяльнымі супольнасцямі называюць толькі тэрытарыяльныя групы" Пры такім выкладанні атрымліваецца, што сацыяльныя групы, якія не з'яўляюцца тэрытарыяльнымі, г. зн. стратыфікацыйныя і этнічныя, не адносяцца да

[28] Коростелева Е. А. Новейший философский словарь. С. 661.
[29] Барулин В. С. Социальная философия. 2-е изд. М., 2002. С. 86.

этнічных супольнасцяў пры зыходжанні з вузкага паняцця соцыуму. Разам з тым нацыя вызначаецца ім як "неабмежаваная тэрытарыяльнымі рамкамі палітычная групоўка"[30], г. зн. ужо не толькі не як тэрытарыяльная група і не як сацыяльная супольнасць, а як супольнасць палітычная. Зразумела, што такое выкладанне не зусім паслядоўнае.

У працах па агульнай сацыялогіі і сацыяльнай філасофіі анталагічны аналіз або павярхоўны, або зусім адсутнічае. Так, А. С. Кармін і Г. Г. Бярнацкі ў падручніку "Философия" выдзяляюць наступныя часткі, з якіх складаецца грамадства: сацыяльныя структуры, якія дзеляцца на сацыяльныя групы, супольнасці і арганізацыі, прычым атаясамліваючы часта такія адзінкі. Яны зыходзяць з сацыялагічнага падыходу, пры якім "належыць адрозніваць абстрактныя і рэальныя групы людзей"[31]. Аднак пры такім адрозненні анталагічныя і гнасеалагічныя аспекты праблемы імі не раздзяляюцца.

У працах па сацыялогіі падзел сацыяльных груп на рэальныя і намінальныя праводзіцца без уліку вызначэння анталагічнага статуса ствараемых пазнавальных зместаў. На самой справе пол звычайна значыцца ў пераліку рэальных сацыяльных груп першым. Пол — біялагічная адзінка, матэрыяльная ўласцівасць (або структура), адзнака, характэрная для жывых істот. У грамадскай рэчаіснасці гэта ўласцівасць трансфармуецца, прадстаючы як пэўныя свядомасць і роля. Нягледзячы на тое што ў сацыялогіі мужчыны і жанчыны разглядаюцца як рэальныя сацыяльныя групы, з пункту гледжання анталагічна арыентаванай сацыяльнай філасофіі іх памылкова вызначаць суб'ектамі грамадскай дзейнасці ў адрозненне ад канкрэтных соцыумаў (напрыклад, такіх, як канкрэтныя мужчынскія клубы і феміністкія арганізацыі).

## 14. ЭТНІЧНЫЯ І ЭТНАПАЛІТЫЧНЫЯ СУПОЛЬНАСЦІ

Трактоўка паняцця этнасу задаецца ў тэорыі этнасу (а не ў сацыялагічных тэорыях), перш за ўсё ў прынятай у ёй тэарэтычнай схеме. Пры пабудове тэорыі этнасу прапануецца разгледзець наступную базісную схему. У залежнасці ад тэрытарыяльнай адзнакі этнасы

---

[30] Кравченко А. И. Основы... С. 58, 76 — 80.
[31] Кармин А. С., Бернацкий Г. Г. Философия. С. 224.

(г. зн. сукупнасці індывідаў, якія звязаны этнічнай ідэнтыфікацыяй) падзяляюцца на этнічныя групы і супольнасці. Субэтнасы і суперэтнасы з'яўляюцца этнічнымі групамі, паколькі адзіная тэрыторыя не з'яўляецца іх адзнакай. У залежнасці ад характару ўзнікнення прымальна выдзеліць два тыпы такіх супольнасцяў: этнічны і этнапалітычны. Першае паняцце мае падкласамі паняцці народнасці і нацыянальнасці як гістарычных тыпаў этнічнай супольнасці; другое — паняцці народа і нацыі. Этналагічнае паняцце нацыі як тыпу этнасупольнасці мае аднолькавы аб'ём з паліталагічным паняццем нацыі.

Паміж гэтымі гістарычнымі тыпамі ёсць паралельная адпаведнасць. Напрыклад, у XVI—XVIII стст. існавала народнасць пад назвай "беларусы" і народ пад назвай "ліцвіны"; у XX ст. існуе нацыянальнасць пад назвай "палешукі" і нацыя пад назвай "беларусы". Да ўзнікнення дзяржаўнасці (асноўнай формы арганізацыі грамадства, якая прыходзіць на змену радавому ладу) соцыумы, характарызуемыя як этнічныя супольнасці, г. зн. першапачатковы гістарычны тып іх, — плямёны, якія яшчэ непадзяліліся на этнічныя і этнасацыяльныя.

Не прымаючы агульнапрынятую сярод савецкіх і выкарыстоўваемую шэрагам постсавецкіх вучоных тыпалогію этнасу (плямёны — народнасці — нацыі), мы надаем паняццям нацыі, нацыянальнасці, народнасці і народа новы змест. Пры фармулёўцы "нацыянальнасць — тэрмін для абазначэння прыналежнасці чалавека або групы людзей да пэўнай этнічнай супольнасці"[1] не бачна, чым нацыянальнасць адрозніваецца ад этнічнасці. Акрамя таго, яна, на наш погляд, не вельмі ўдалая з пункту гледжання логікі, паколькі тэрміны — гэта моўнае выражэнне паняццяў, а абазначаюць пэўныя рэальныя з'явы і ўтварэнні (працэсы, рэчы, супольнасці і г. д.), дадзеныя або не дадзеныя пачуццёва, а таксама ідэальныя аб'екты ў межах семантыкі (дысцыпліны, у якой вывучаюцца адносіны моўных знакаў да абазначаемага) імёнамі, але не тэрмінамі (тэрмін не выдзяляецца як семантычная катэгорыя). Прыналежнасць да канкрэтных этнасаў перадаюць пэўныя этнонімы (напрыклад, "беларус", "курд").

У адпаведнасці з прапаноўваемай тэарэтычнай схемай тэрмінам "нацыянальнасць" абазначаецца супольнасць, прадстаўнікі якой усведамляюць агульнасць свайго гістарычнага паходжання і лёсу і якая выдзяляецца па агульных рысах культуры і асаблівасцях псіхалагічнага складу (у першую чаргу паводле стэрэатыпа паводзін), а нацыя трактуецца як этнапалітычная супольнасць, прадстаўнікі якой

---

[1] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология... С. 292.

усведамляюць сваю прыналежнасць да пэўнай краіны, дзяржавы. Індывіды, якія складаюць пэўную нацыю, могуць уваходзіць і ў склад іншых супольнасцяў, у тым ліку і нацыянальнасцяў. У адпаведнасці з дадзенай схемай належыць выдзяляць розныя ідэнтыфікацыі, уласцівыя этнасам, — этнічную і этнапалітычную свядомасці. У тых выпадках, калі прадстаўнікі этнасу ўдзельнічаюць у барацьбе за ўладу, маюць адносіны да дзейнасці па кіраванні дзяржавай, трэба казаць ужо пра палітычную дзейнасць, але не этнасу, а часткі яго. Паводле дадзенай схемы не выключаецца чатырохслойная этнічная самасвядомасць індывідаў: напрыклад, дапускаецца, што некаторыя людзі могуць усведамляць сябе данскімі казакамі (субэтнічная самасвядомасць), рускімі (этнічная), расіянамі (этнапалітычная) і славянамі (суперэтнічная) і ўжываць адпаведна тры этнонімы і палітонім.

Прытрымліванне дадзенай схемы пры апісанні этнічных з'яў дазваляе, на нашую думку, дакладна абагульняць факты, звязаныя са з'явамі неаднаслойнай этнічнай ідэнтыфікацыі. Напрыклад, у Рэчы Паспалітай адны і тыя ж жыхары беларускіх зямель усведамлялі сябе і ліцвінамі, і прадстаўнікамі польскай дзяржавы. Аналізуючы гэты факт, Р. Радзік кажа пра "шматузроўневасць, іерархію ў самавызначэнні тагачасных эліт"[2]. Сёння некаторыя жыхары Беластоцкага ваяводства, тыя, якія складаюць этнічную групу з назвай "палякі беларускага паходжання", у адрозненне ад груп, якім даюцца этналагічныя назвы "польскія беларусы" і "беларусы Польшчы", "падкрэсліваюць сваю «беларускасць», але адначасова выказваюцца за моцныя сувязі з Польшчай і яе культурай"[3], г. зн. маюць не толькі этнічную, але і этнапалітычную свядомасць.

Зыходзячы з такой схемы, належыць лічыць, што ў 20—30-я гады XX ст. існавала нацыянальнасць, якая карысталася назвай "беларусы" і адпавядала двум нацыям — польскай і савецкай, што ў 40—80-я гады XX ст. мелася этнічная супольнасць (нацыянальнасць), якая карысталася этнонімам "немцы", а індывіды, якія яе ўтваралі, адносіліся разам з тым да такіх утварэнняў, як заходне- і ўсходнегерманскія нацыі. Безумоўна, беларусаў у сярэдзіне XX ст. і немцаў з канца 40-х і да канца 80-х гадоў XX ст. нельга разглядаць як сацыяльна-эканамічную

---

[2] Радзік Р. Беларусы… С. 38.

[3] Рагачевич Н. В. Типология форм самоопределения жителей Белостокского воеводства // Приоритеты интеллектуальной элиты в развитии мировой цивилизации. Материалы Междунар. науч.-теор. конф., ноябрь 2002 г. Мн., 2002. С. 318.

цэласнасць, як гэта належыць рабіць, зыходзячы з агульнапрынятай дэфініцыі нацыі.

Возьмем, напрыклад, да разгляду супольнасць, якая мае этнонім "палешукі". Айчынны этнолаг В. А. Кахновіч канстатуе, што "вылучаецца 4 асноўныя пазіцыі ў дачыненні вызначэння берасцейска-пінскіх палешукоў: 1) беларуская; 2) украінская; 3) самабытная (незалежная); 4) руская (племянная)", і робіць выснову, што "падаюцца магчымымі толькі 2 асноўныя пазіцыі ў вызначэнні этнічнай прыналежнасці палешукоў: ці то ўкраінцы, ці то беларусы". Дарэчы, асноўным чыннікам у фарміраванні этнасаў і нацый ён лічыць некалькі нечакана — палітычны: "...галоўным чыннікам для яе (этнасу як сістэмы. — *Ю. Н.*) з'яўляюцца палітычныя інтарэсы, барацьба, вынікі. І нацыя ў такім выпадку — прадукт палітычнай зацікаўленасці"[4]. Пры зыходжанні са схемы этнічныя — этнапалітычныя супольнасці неабходнасць у вызначэнні этнічнага статуса палешукоў знікае. У такім выпадку яны разглядаюцца як канкрэтная нацыянальнасць, што праяўляецца ва ўсведамленні агульнасці гістарычнага лёсу, адметнасці рыс этнічнай культуры і псіхалагічнага складу; у выкарыстанні этноніму; разам з тым яны з'яўляюцца прадстаўнікамі пэўнай нацыі, што праяўляецца ва ўсведамленні прыналежнасці да пэўнай дзяржаўнай тэрыторыі (г. зн. краіны з назвай "Беларусь"), а таксама, мабыць, і да нацыянальнай (г. зн. беларускай) культуры.

Л. М. Гумілёў характарызаваў аб'ект даследавання, які ён абазначаў як "этнас", як з'яву не сацыяльную або біясацыяльную, а як геаграфічную ці, дакладней, біясферную[5]. У яго канцэпцыі этнагенезу не пераадолены канчаткова спекулятыўныя гістарыясофскія ўстаноўкі, у адпаведнасці з якімі грамадскія ўтварэнні трактуюцца як арганізмы, дзе адбываюцца метамарфозы, што праходзяць розныя фазы развіцця (устаноўкі, што зыходзяць з канцэпцый прадстаўнікоў "філасофіі жыцця" А. Бергсона, О. Шпенглера і інш.). Калі трактаваць этнас як супольнасць, прадстаўнікі якой усведамляюць сваё культурна-гістарычнае адрозненне ад іншых супольнасцяў, то зразумела, што тады геаграфічныя ўмовы выдзяляемы толькі як апасродкаваны фактар фарміравання этнасаў, і то больш у старажытныя часы. Вучэнне этнагенезу Л. М. Гумілёва, нягледзячы на наяўныя ў ім спекулятыўныя ўстаноўкі, прымальна ацэньваць паводле яго змес-

---

[4] Кахнович В. А. Спроба этнічнага самавызначэння палешука // Приоритеты… С. 296.

[5] Гумилев Л. Н. Конец и вновь начало. М., 2001. С. 29.

ту як пазітыўную спекуляцыю, ці як эўрыстыку на шляху пабудовы канцэпцый у межах этналогіі і этнасфералогіі.

Адзначым, што спекулятыўныя паняцці этнасу ў працах, якія выходзяць з паметкай "навуковае выданне", сустракаюцца і сёння. Так, І. Л. Коган у сваёй працы "Этнопсихологические основания культурогенеза" (Мн., 2001) выкладае зусім дзівосную гіпотэзу абумоўленасці культурнай дзейнасці чалавека неўсвядомленай цягай жывых істот да ідэальнага і, шырока выкарыстоўваючы для тлумачэння культурных з'яў паняцці фізікі, кібернетыкі і псіхааналізу (сінтэзуючы пры гэтым фрэйдызм з разнавіднасцю платанізму), абгрунтоўвае погляд на этнас як на псіхафізічнае і прыродна-сацыяльнае адзінства, як на вышэйшую ступень напружання купіда, інакш — цягі да ідэальнага ("купіда — гэта энергія неўсвядомленага або ўсвядомленага руху да відавых, радавых або ўсеагульных мэт"[6]). Зразумела, што выказванні пра такую цягу, як і пра лібіда, якія абгрунтоўвае З. Фрэйд, немагчыма верыфікаваць. Але калі ў пачатку XX ст. (у той час, калі З. Фрэйд абгрунтаваў паняційны апарат псіхааналізу) спекулятыўныя гіпотэзы ў даследаваннях належыць ацэньваць як эўрыстычны сродак пабудовы навуковых тэорый, то сёння, з вышыні назапашаных ведаў, у тым ліку ведаў гнасеалогіі і метадалогіі навуковага пазнання, відавочна, што такія гіпотэзы ў рамках навуковых дысцыплін безвыніковыя. Канстытуіраванне "схаваных якасцяў" (да іх прымальна аднесці і абгрунтаванае І. Л. Коганам купіда) было характэрна ў прыродазнаўчых даследаваннях да часу так званай другой навуковай рэвалюцыі і было пераважна зжыта да часоў трэцяй навуковай рэвалюцыі ў прыродазнаўстве, г. зн. яшчэ ў XVIII ст.

Л. М. Гумілёў, абвяргаючы палажэнне пра сацыяльную сутнасць этнасаў, прыводзіў прыхільнікам сацыяльнай сутнасці этнасаў такі аргумент: "Калі мы ўжываем слова "сацыяльны" ў нашым, марксісцкім, сэнсе, мы павінны разумець пад гэтым форму калектыўнага быцця, звязаную з вытворчасцю, — "грамадства"[7], г. зн. што ён ужываў слова "сацыяльнае", як і слова "грамадскае", для абазначэння паняцця калектыўнай жыццядзейнасці індывідаў, аддзяляючы ад такой дзейнасці калектыўныя дзеянні насякомых. Падобнай шырокай трактоўкі сацыёлагі прытрымліваюцца і сёння[8]. На наш погляд, карэ-

---

[6] Коган И. Л. Этнопсихологические основания культурогенеза. С. 70.

[7] Гумилев Л. Н. Конец… С. 24.

[8] Яковлев А. М. Социальная структура общества. Учебник для студентов вузов, обучающихся по специальности "юриспруденция". М., 2003.

ляцыйна аптымальным (адносна іншых базісных паняццяў грамадазнаўства) будзе трактаваць паняцце сацыяльнага вузка — як плоскасць міжіндывідуальных адносін узаемадзейнічаючых соцыумаў (і як вынік такіх узаемадзеянняў — становішча індывідаў у грамадстве), што дазваляе разважаць пра сацыяльныя адносіны ў розных сферах грамадства (армія, сям'я і г. д.).

Л. М. Гумілёў зыходзіў з устаноўкі, паводле якой этнасы — рэальныя ўтварэнні, якія з'яўляюцца асноўнымі суб'ектамі сусветнагістарычнага працэсу. Падобныя ўстаноўкі і сёння сустракаюцца ў творах значнай часткі даследчыкаў, якія закранаюць праблемы, звязаныя з этнасамі. Але памылкова трактаваць этнасы як суб'екты сусветнай гісторыі, паколькі анталагічны аналіз паказвае (гл. п. 15), што нельга ўстанавіць рэферэнтам канкрэтнага этнасу рэальнае ўтварэнне. У межах этналогіі сёння канчаткова не знята гістарыясофскае паняцце этнасу як утварэння, якое існуе працяглы гістарычны час і з'яўляецца суб'ектам грамадскай дзейнасці. Прыўнясенне гістарыясофскай устаноўкі мы бачым у тым, што пэўны этнас спачатку ствараецца як народнасць, а пасля існуе як нацыя. Слова "этнас" мы ўжываем у этналогіі як агульны тэрмін для абазначэння шэрагу паняццяў, але з гэтага не вынікае, што пераемныя паміж сабой этнічныя супольнасці належыць лічыць адным і тым жа этнасам. І хоць гістарыясофскі нагружанае паняцце этнасу не перашкаджае паспяхова праводзіць эмпірычныя даследаванні этнічных з'яў, з яго нельга зыходзіць пры пабудове тэорыі этнасу. Тое, што ў этнагістарычным даследаванні абапіраюцца на спекулятыўныя ўстаноўкі, азначае толькі, што яго канцэптуальныя вынікі метадалагічна дэфарміраваны.

Этналагічная і гістарыясофская трактоўкі этнасу адрозніваюцца. Гістарыясофская трактоўка яго адпавядае абгрунтаванню этнасу ў якасці суб'ектаў сусветнай гісторыі. Акрамя сацыялагічнай, палігалагічнай і этналагічнай трактоўкі нацыі, магчыма і гістарыясофская трактоўка яе. Менавіта, такую трактоўку прапанаваў К. Маркс, для якога нацыі — гэта супольнасці, якія гістарычна развіваюцца і абумоўлены эканамічнымі і палітычнымі чыннікамі, форма пэўнага этапу развіцця чалавецтва.

Правядзенне адрознення паміж паняццямі нацыі і нацыянальнасці мы знаходзім яшчэ ў О. Баўэра ў яго працы "Нацыянальнае пытанне і сацыял-дэмакратыя", якая мае палітычную накіраванасць. У ёй нацыі трактуюцца як палітычныя ўтварэнні, выдзяляемыя па тэрытарыяльнай адзнацы, а нацыянальнасці — як культурныя ўтва-

рэнні без такой адзнакі. У існуючых распрацоўках тэорыі этнасу, на наш погляд, акрамя тэрміналагічнай неўдасканаласці (напрыклад, "...слова «нацыянальнасць» неадназначнае, а галоўнае, яно абмежаванае пры ўжыванні яго да розных грамадска-эканамічных фармацый"[9]), маецца канцэптуальная недапрацаванасць. Мы маем на ўвазе не правядзенне адрознення паміж супольнасцямі, прадстаўнікі якіх усведамляюць адзінства свайго паходжання, і супольнасцямі, прадстаўнікі якіх усведамляюць сваё дачыненне да пэўнай дзяржавы, краіны. Апошняя свядомасць не з'яўляецца этнічнай, разам з тым яе непрымальна характарызаваць як палітычную.

Факт наяўнасці ў адных сукупнасцяў індывідаў свядомасці адметнасці свайго гістарычнага паходжання, рыс культуры (і рыс псіхалагічнага складу) і ідэнтыфікацыі з супольнасцю, якую ўтварае такая сукупнасць, і факт наяўнасці ў іншых сукупнасцяў індывідаў свядомасці сваёй прыналежнасці да пэўнай дзяржавы, краіны (якія мы канцэптуальна абгрунтоўваем праз выдзяленне паняццяў этнічнай і этнапалітычнай супольнасці) устанаўліваюць многія этнолагі. Так, В. А. Цішкоў, з аднаго боку, указвае, што "ва ўсім свеце паняцце нацыянальнасці раўназначна грамадзянству...", а з другога — цытуе тое месца Еўрапейскай канвенцыі па грамадзянству, дзе сказана: "грамадзянства азначае прававую сувязь паміж паасобнай асобай і дзяржавай і не ўказвае на этнічнае паходжанне гэтай асобы", г. зн., што паводле канвенцыі паняцце нацыянальнасці нераўназначна паняццю грамадзянства. Нягледзячы на супярэчлівасць дадзенага выкладання, В. А. Цішкоў выказвае слушную думку, што "ўсведамленне чалавекам прыналежнасці да аднаго або некалькіх народаў і культур носіць асабісты і зменлівы характар. Важней для чалавека — гэта самавызначэнне па прыналежнасці да дзяржавы..."[10]

Пункт гледжання на неабходнасць адрознівання этнічных і этнасацыяльных супольнасцяў абгрунтоўваюць, хоць не зусім несупярэчліва і непаслядоўна, А. С. Кармін і Г. Г. Бярнацкі, якія сцвярджаюць, што "гістарычны падыход прыводзіць да неабходнасці выдзеліць ... два розныя значэнні, якія набывае паняцце "этнас" у розных кантэкстах: па-першае, этнас як этнагенетычная супольнасць (яе часам называюць проста этнічнай); па-другое, этнас як этнасацыяльная супольнасць. Этнагенетычная супольнасць — гэта сацыяльная група, членаў якой аб'ядноўвае свядомасць генетычнай сувязі з іншымі прадстаўні-

---

[9] Историческая наука. Вопросы методологии. М., 1986. С. 254.
[10] Тишков В. А. Этнология и политика. М., 2001. С. 93—94.

камі гэтай групы (этнічная свядомасць)". Этнічную самасвядомасць яны выдзяляюць адзінай адзнакай этнічнай супольнасці. А. С. Кармін і Г. Г. Бярнацкі тлумачаць, што "гістарычныя ўмовы, у якіх існуюць этнасы, ствараюць рознага роду сацыяльныя сувязі, якія аб'ядноўваюць людзей не па этнічных адзнаках … У выніку над этнагенетычнымі супольнасцямі надстройваюцца этнасацыяльныя супольнасці … Этнасацыяльнай супольнасцю называецца супольнасць, абумоўленая адзінствам не толькі ўласна этнічных, але і сацыяльна-эканамічных адзнак". Але этнічная супольнасць у іх трактоўцы — гэта не грамадскае ўтварэнне, сутнасць якога заключаецца ў грамадскай свядомасці і праяўляецца праз этнічнасць, а рэальная сацыяльная група, г. зн. група, члены якой знаходзяцца ва ўзаемадзеянні і тым самым маюць сацыяльныя сувязі (палітычныя, гаспадарчыя і іншыя). У адпаведнасці з такой трактоўкай памылкова сцвярджаць, як яны робяць, што сацыяльная сувязь маецца толькі ў этнасацыяльных супольнасцяў. Адзначым, што элементы "лагічнага круга" ў тэарэтычных пабудовах, якія тычацца этнасу, уласцівы не толькі ім, але і ўсім даследчыкам, якія трактуюць этнасы як сацыяльныя групы.

А. С. Кармін і Г. Г. Бярнацкі адзначаюць, што "асновай аб'яднання нацыянальных супольнасцяў у адных выпадках становіцца палітычны фактар (дзяржава), у другіх — рэлігія, у трэціх — барацьба з заваявальнікамі, у чацвёртых — культурная інтэграцыя і інш.", г. зн. у іх трактоўцы этнасацыяльная супольнасць — гэта наяўнасць у сацыяльнай групы не толькі этнічнай самасвядомасці, але і розных сацыяльных сувязяў. З іх фармулёўкі "нацыя аб'ядноўвае ў сабе некалькі этнасаў"[11], закрываючы вочы на тое, што ў іх выкладанні этнасы не супрацьпастаўляюцца нацыям, этнічныя і этнасацыяльныя супольнасці разумеюцца як этнасы, хаця ў другой кнізе [Кармин А. С. Культурология (М., 2003)] ён абазначае тэрмінам "этнас" толькі паняцце этнагенетычных, але не этнасацыяльных супольнасцяў, атрымліваецца, што яны гіпастазуюць паняцце сацыяльнай групы. Трактоўка без гіпастазавання заключаецца ў палажэнні, паводле якога часткі сукупнасці індывідаў, якія складаюць пэўныя этнагенетычныя супольнасці, могуць складаць пэўную этнасацыяльную супольнасць.

У вучэбным дапаможніку (Астаповский В. Е., Божанов В. А., Малиновский В. И. История белорусской государственности. Мн., 2002) этнас трактуецца як устойлівая сукупнасць людзей, якая склалася гістарычна на пэўнай тэрыторыі і мае агульныя мову, культуру,

---

[11] Кармин А. С., Бернацкий Г. Г. Философия. С. 236—238.

быт, гістарычныя рысы, саманазву. Асноўнымі формамі этнасу пры гэтым выдзяляюцца род, племя, народнасць, нацыя. Але хіба індывіды, якія складаюць нацыю, маюць агульны быт?

У навуковай і даведачнай літаратуры наяўныя непаслядоўнасці ў характарыстыцы этнасаў. Так, С. Дубянецкі, з аднаго боку, лічыць, што нацыя — гэта "...устойлівая этнасацыяльная супольнасць людзей, якія пражываюць на адной тэрыторыі...", з другога боку, разглядаючы ўмовы фарміравання беларускай нацыі, характарызуе плямёны, з якіх складаліся народнасці, папярэднікі нацыі (этнасацыяльнай супольнасці), ужо этнічнымі супольнасцямі[12].

У "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" этнічная група тлумачыцца як частка этнасу і паведамляецца, што этнас "пры этнічнай класіфікацыі народаў свету выступае як асноўны від этнічнай супольнасці", пры гэтым паняцце этнічнай супольнасці не тлумачыцца, але тлумачыцца паняцце этнічнай агульнасці, характарызуемае як група людзей, у той час як этнас вызначаецца як этнічная супольнасць. Асноўнае адрозненне паміж этнасам і этнічнай агульнасцю паводле тлумачэння энцыклапедыі заключаецца ў адсутнасці ў апошняй этноніма (Чаквін Ігар. Этнас; Мядзянік Уладзімір. Этнічная супольнасць; Чаквін І., Мядзянік У. Этнічная група // ЭГБ. Т. 6. Кн. 2. Мн., 2003). З такога кароткага агляду тлумачэння паняційнага апарату этналогіі вынікае, што ў энцыклапедыі пададзена таксанамічна і лагічна неўпарадкаваная тэрміналогія.

У падручніку "Этнология" этнас трактуецца як сукупнасць індывідаў, выдзяляемая па адзнаках агульнасці тэрыторыі, рыс культуры, этнічнай свядомасці, і этнонім, этнічная супольнасць, выдзяляемая па адзнаках агульнасці тэрыторыі, сацыяльна-эканамічных сувязяў, спецыфікі культуры і этнасвядомасці; а "племя — адна з найбольш старажытных форм этнічнай супольнасці, якая складаецца з радоў". Пры гэтым народнасць і нацыя вызначаюцца як гістарычныя тыпы этнасу. Але выдзяленне двух блізкіх па зместу базісных паняццяў — паняццяў этнасу і этнічнай супольнасці — з'яўляецца, пэўна, "множаннем сутнасцей", г. зн. метадам, спекулятыўнасць якога паказаў У. Окхам. Не толькі аўтары падручніка, але і пэўная частка іншых этнолагаў уключаюць у змест этналагічнага паняцця нацыі змест паняцця нацыі, выкарыстоўваемага ў палітычнай сацыялогіі і паліталогіі — адзнаку сацыяльна-эканамічнай цэласнасці. Калі этнас у трактоўцы аўтараў падручніка не з'яўляецца сацыяльна-эканаміч-

---

[12] Дубянецкі С. Нацыя // ЭГБ. Т. 5. С. 303—304.

най цэласнасцю і прадугледжвае сваім гістарычным тыпам нацыю як этналагічнае паняцце, то чаму нацыя, якая ў іх трактоўцы ўяўляе сацыялагічнае паняцце, "уяўляе сабой сацыяльна-эканамічную цэласнасць, якая складаецца і ўзнаўляецца на аснове тэрыторыі і эканамічных сувязяў"[13]. У адпаведнасці з такімі вызначэннямі паняццяў этнасу і этнасупольнасці не будзе супярэчлівым характарызаваць народнасць і нацыю як тыпы не толькі этнасу, але і этнасупольнасці.

Прапануецца трактаваць у межах этналогіі этнічныя групы як сукупнасці індывідаў, якія ў рэчаіснасці з'яўляюцца носьбітамі этноніма, грамадскай свядомасці (свядомасці адзінства паходжання, агульнасці рыс культуры, прыналежнасці да пэўнай дзяржавы, краіны) і адпаведнай ідэнтыфікацыі. Такое паняцце пазбаўлена адзнакі інтэракцыі (узаемадзеяння), наяўнай у паняцці сацыяльнай групы. Выдзяленне этнічных груп прадугледжвае наяўнасць у іх этнічных сувязяў, але гэта — іншая адзнака, чым адзнака інтэракцый.

Расійскі філосаф Ю. І. Сямёнаў, дыферэнцыравана падыходзячы да трактоўкі этнасу, выдзяляе ў структуры этнасу этнічнае ядро, этнічную перыферыю, этнічную дыяспару і тлумачыць, што ў пэўнай ступені этнасы магчыма падраздзяляць на субэтнасы. Пры гэтым ён тлумачыць, што этнічныя групы, якія не маюць самасвядомасці, "усяго толькі этнаграфічныя групы". Ён выдзяляе раннія, познія і пазнейшыя гістарычныя тыпы этнасаў, сацыорныя нацыі і этнічныя нацыі, разглядае суадносіны паміж этнічнымі супольнасцямі[14].

Паводле меркаванняў англійскіх сацыёлагаў Д. і Дж. Джэры: "Этнас — агульная расавая, моўная або нацыянальная ідэнтычнасць у сацыяльнай групы ... Этнас — недакладны тэрмін, выклікае некаторую ступень канцэптуальнай блытаніны"[15].

Пры такой дэфініцыі этнасу паняцці этнасу і этнічнасці атаясамліваюцца. Паспрабуем эксплікаваць паняцце этнасу ў адпаведнасці з карэлятыўным суаднясеннем зместу базісных паняццяў грамадазнаўства і зыходзячы з палажэння, паводле якога пра аднолькавыя этнічныя з'явы ствараюцца розныя канцэптуальныя схемы і мадэлі. У межах этналогіі абгрунтоўваюцца розныя паняцці этнасу. Але выкарыстанне паняцця этнасу, з адначасовым выкарыстаннем

---

[13] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология... С. 299, 297, 292—293.

[14] Социальная философия. Учебник / Под ред. И. А. Говозода. М., 2003. С. 241, 253—254, 257.

[15] Большой толковый социологический словарь. М., 2001. Т. 2. С. 498.

блізкага да яго па змесце паняцця этнічнай супольнасці, перашкаджае ўдасканаленню яе паняційнага апарату.

Разам з тым у этналогіі выкарыстоўваецца і паняцце этнасу як этнічных груп (супольнасцяў), якія папярэднічаюць такім супольнасцям, як нацыі. Тэрмін "этнас" ужываецца ў межах этналогіі як агульны тэрмін для абазначэння ўсякіх этнічных груп і супольнасцяў. У рамках сацыялогіі ён не ўжываецца ў якасці тэрміна, які абазначае адзінку паняційнага апарату сацыялогіі; акрамя таго, у іх тэрміны "этнічная супольнасць" і "нацыянальная супольнасць" выкарыстоўваюцца як эквівалентныя[16]. У рамках сацыяльнай філасофіі мы лічым дапушчальным ужываць тэрмін "этнас" для абазначэння паняцця грамадскага ўтварэння, якое праяўляецца ў этнічнасці (этнічнай грамадскай свядомасці).

Належыць адрозніваць трактоўку этнасу ў межах сацыялогіі, філасофіі і этналогіі. У межах сацыялогіі выдзяляюцца не этнасы, а этнічныя або этнічна-тэрытарыяльныя сацыяльныя групы (г. зн. групы, якія выдзяляюцца па адзнаках узаемадзення іх членаў і адзінай тэрыторыі), а таксама этнічныя сацыяльныя супольнасці пры зыходжанні з шырокага паняцця сацыяльнай супольнасці як любой сукупнасці людзей, якая выдзяляецца па сацыяльна значных крытэрыях. У межах сацыяльнай філасофіі, якая распрацоўваецца на аснове анталагічнага аналізу, выдзяляюцца этнічныя грамадскія ўтварэнні, анталагічны статус якіх — ідэальныя грамадскія ўтварэнні. У межах этналогіі, калі не змешваюцца паняцці з апарату этналогіі і сацыялогіі, этнічныя групы і супольнасці выдзяляюцца перш за ўсё паводле адзнак этнічнай свядомасці і агульных рыс культуры.

У межах этналогіі паняцці нацыі і народнасці ўтвараюцца такім чынам, што ў адпаведнасці з імі канкрэтныя нацыі і народнасці разумеюцца як суб'екты грамадскай дзейнасці, у адносінах да якіх розныя сацыяльныя інстытуты выступаюць не падобнымі суб'ектамі, а толькі формамі арганізацыі іх дзейнасці. Улічваючы тое, што асноўным крытэрыем прыняцця тэарэтычных схем у прыродазнаўчых і грамадазнаўчых дысцыплінах застаецца іх прыдатнасць для абагульнення фактаў, у яе межах, мабыць, немэтазгодна элімінаваць з паняццяў, абазначаемых праз тэрміны "народнасць", "нацыя", сэнс геапалітычных супольнасцяў, суб'ектаў сусветнай гісторыі, абмяжоўваючы-

---

[16] Социология. Учебник для вузов / Отв. ред. Г. О. Осипов, Л. П. Москвичев. М., 2002. С. 308—314.

ся іх трактоўкай як супольнасцяў, звязаных з ідэнтыфікацыяй па агульных рысах культуры і па паходжанні.

А. І. Краўчанка слушна выдзяляе два асноўныя значэнні тэрміна "этнас": "Этнас — 1) збіральная назва для вялікіх па колькасці kroў-народнасных груп людзей, якія ствараюць племя, народнасць або нацыю; 2) група людзей, члены якой падзяляюць агульную назву і элементы культуры, асацыіруюць сябе з асаблівай тэрыторыяй, маюць міф пра агульнае паходжанне і агульную гістарычную памяць..."[17] Прычым трактоўка этнасу, адпавядаючая другому значэнню тэрміна "этнас", нягледзячы на тое, што яна змешчана ў даведніку па культуралогіі, з'яўляецца такой трактоўкай яго, якую мы абгрунтоўваем як цалкам этналагічную (розніца паміж прапануемай намі і яго трактоўкай заключаецца ў тым, што ў А. І. Краўчанкі этнасы бяруцца вузка — толькі як групы, але не супольнасці). Трактоўка этнасу, якая адпавядае першаму значэнню яго, хутчэй сацыялагічная, а не этналагічная. Пры гэтым яна занадта супярэчлівая: якія ж гэта нацыі і народнасці kroўнароднасныя групы?

Айчынны вучоны М. Ф. Піліпенка ў кнізе "Возникновение Белоруссии: Новая концепция" заняў недастаткова выразную пазіцыю пры выкладанні паняццяў этналогіі. З аднаго боку, ён сцвярджае, што "этнічная тэрыторыя найчасцей — галіна сумеснага пражывання этнасу", з другога боку — тлумачыць, што этнічную тэрыторыю "...стварае і выдзяляе, адрознівае ад іншых этнічных тэрыторый своеасаблівае спалучэнне элементаў матэрыяльнай, сацыяльнай, духоўнай культуры, гутарковай мовы, г. зн. мовы самасвядомасці". Пры выкладанні зместу паняццяў наяўныя элементы "лагічнага круга": "Этнічная тэрыторыя ўяўляе сабой складанае гісторыка-культурнае ўтварэнне. Яно непарыўна звязана з этнасам, адзнакай якога часта з'яўляецца, асабліва ў перыяд яго фарміравання. Таму этнічнай тэрыторыі ўласцівыя многія рысы этнасу"[18]. І хаця дэфініцыя этнасу ў яго выкладанні адсутнічае, тым не менш з выкладання магчыма вывесці, што этнас — гэта сукупнасць індывідаў, якія маюць агульныя рысы культуры і дазваляюць адрозніваць іх ад іншых такіх сукупнасцяў.

Дарэчы, у дэфініцыях паняцця этнасу звычайнай справай з'яўляецца невыразнае ўжыванне тэрміна "культура". Так, у навуковых працах П. У. Церашковіча знаходзім наступную дэфініцыю: "Этнас —

[17] Словарь. Культура и культурология... С. 913.
[18] Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. Мн., 1991. С. 11.

міжпакаленная група людзей, якія аб'яднаны доўгім сумесным пражываннем на пэўнай тэрыторыі, агульнай мовай, культурай і самасвядомасцю". Шырокае паняцце культуры мае падкласам паняцце мовы. Калі ўжываць вузкае паняцце культуры, то належыць тэрміналагічна ўдакладніць, якія элементы культуры маюцца на ўвазе, калі прыпісваюцца этнасу, — звычаі, фальклор і г. д. Разам з тым П. У. Церашковіч прытрымліваецца погляду, паводле якога "паняцце этнасу адлюстроўвае ў поўнай ступені толькі ўласцівасці этнічных супольнасцяў індустрыяльнай эпохі — нацый"[19]. Адсюль, зыходзячы з прапануемай ім дэфініцыі, належыць лічыць такія пазнавальныя зместы, як этнічныя супольнасці і міжпакаленныя групы людзей з пераемнай культурай і самасвядомасцю, эквівалентамі. Мабыць, больш аптымальным было б казаць пра міжпакаленныя ўтварэнні людзей на пэўнай тэрыторыі як пра этнічныя супольнасці, а не этнічныя групы.

На наш погляд, паняційны апарат этналогіі і сацыялогіі будуецца без дастатковай карэляцыі грамадазнаўчых паняццяў, без дастатковага ўліку анталагічных перадумоў яго пабудовы. Пры ўдасканаленні паняційнага апарату сацыялогіі не будзе марным улічванне пабудоў сацыяльнай філасофіі, у якіх пераважае анталагічны аналіз паняццяў грамадазнаўства. Мы, адрозніваючы паняцці сацыяльнай групы і сацыяльнай супольнасці як базісныя паняцці сацыялогіі і паняцці этнічнай групы і этнічнай супольнасці як базісныя паняцці этналогіі ад паняццяў сацыяльнай грамадскай і этнічнай грамадскай супольнасці як паняццяў сацыяльнай філасофіі (пазначаемых як "этнасы" і "со́цыосы"), прапануем у межах апошняй падзяляць грамадскія ўтварэнні індывідаў (якія лагічна вызначаюцца як сукупнасці прадметаў) на соцыумы, сацыяльныя і этнічныя супольнасці. Соцыумы, у адрозненне ад этнічных і сацыяльных грамадскіх супольнасцяў, вызначаюцца як утварэнні сацыятальныя.

Крытэрый аднясення грамадскіх утварэнняў індывідаў да рэальных грамадскіх утварэнняў — наяўнасць грамадскай дзейнасці. Крытэрый аднясення да соцыумаў — арганізаванасць такой дзейнасці. Адсутнасць у этнічных і сацыяльных грамадскіх супольнасцяў пэўнай арганізацыі ажыццяўлення дзеянняў, інстытуалізацыі, не дазваляе адносіць іх да соцыумаў. Тым самым, наяўнасць арганізацыі дзейнасці адрознівае соцыумы як рэальныя грамадскія ўтварэнні ад грамадскіх супольнасцяў як ідэальных грамадскіх ўтварэнняў.

---

[19] Терешкович П. В. Нация // Новейший философский словарь. Мн., 1998. С. 856.

Паколькі вузкае паняцце сацыяльнай супольнасці ўтвараецца паводле адзнакі тэрытарыяльнага адзінства, то і этнічныя супольнасці лічацца сацыяльнымі супольнасцямі. Але гэта сацыялагічная трактоўка этнічных супольнасцяў. У постсавецкай этналогіі этнічныя супольнасці трактуюцца па-рознаму, але звычайна як сукупнасці індывідаў, якія маюць этнічную свядомасць, агульныя рысы культуры і пражываюць на пэўнай тэрыторыі. Калі ў межах этналогіі паняцці народнасці і нацыі вызначаюцца па адзнацы пэўнай тэрытарыяльнай цэласнасці, то гэта не значыць, што ў іх прыўносіцца адзнака паняцця сацыяльных супольнасцяў, паняцця сацыялогіі, паколькі тэрытарыяльная адзнака не з'яўляецца адзнакай, якая манапалізуе пры пабудове тэарэтычных схем сацыялогіі.

У рамках сацыялогіі сярод сацыяльных супольнасцяў выдзяляюцца, у адпаведнасці з тэрытарыяльнай адзнакай і адзнакай характару ўзнікнення (натуральна-гістарычны або штучны), этнічныя супольнасці. У падручніку для ВНУ "Социология" (М., 2002) этнічныя супольнасці адносяцца да сацыяльна-тэрытарыяльных супольнасцяў, пры гэтымі нацыі лічацца этнічнымі групамі. У рамках культуралогіі выдзяляюцца лакальныя культуры ("пад словам «культура» магчыма таксама разумець лакальную культуру, г. зн. культуру некаторай канкрэтнай гістарычна пэўнай супольнасці ... Асаблівае месца сярод лакальных культур займаюць этнічная і нацыянальная культуры, якія ствараюцца паасобнымі плямёнамі, народнасцямі, нацыямі"[20]) па адзнацы агульных культурных рыс. Калі не ствараць паняцце этнічнай супольнасці ў рамках этналогіі па адзнаках тэрыторыі і рыс культуры, то застаецца выдзяляць этнасы па адзнаках гістарычнай памяці (усведамлення агульнасці паходжання і гістарычнага лёсу) і наяўнасці этноніма. Акрамя вышэй пералічаных адзнак, паняцце этнічнай супольнасці, як і паняцце этнічнай групы, выдзяляецца і па адзнацы этнічных сувязяў. Але гэта не супярэчліва, паколькі пры стварэнні паняцця этнічных сувязяў ужо адштурхоўваюцца ад паняцця этнічнай супольнасці. Трактоўка этнічных супольнасцяў і груп як утварэнняў, якім уласцівы этнічныя сувязі, зыходзіць з разумення этнасу як тэрытарыяльнай адзінкі і суб'екта грамадскай дзейнасці.

Прадстаўнікі пэўнай этнічнай супольнасці (напрыклад, татары) адрозніваюць прадстаўнікоў іншых этнічных супольнасцяў (напрыклад, рускіх) не па месцы жыхарства, а па рысах культуры, псіхалагічнаму складу, антрапалагічнаму абліччу, этноніму і ўваходзяць пры

---

[20] Кармин А. С. Культурология. С. 32.

гэтым у этнапалітычную супольнасць (пад назвай "расіяне"). Таму мы лічым, што тэрытарыяльная адзнака пры стварэнні паняццяў этнічных груп і супольнасцяў у этналогіі не асноўная (або нават неабавязковая).

Паводле П. Р. Рыбіцкага, належыць адрозніваць патэнцыяльны і актуалізаваны стан грамадскай сувязі ў адпаведнасці з крытэрыем прыпісвання першага стану вялікім грамадскім структурам, а другога — дробным і сярэднім. П. Р. Рыбіцкі (услед за ім і Р. Радзік) дапускае этнічную сувязь рознага характару: "Сувязь у малых грамадскіх структурах абапіраецца на непасрэдныя кантакты паміж людзьмі і пастаянна актуалізуецца ў кантактах і адносінах гэтага тыпу". А з сувяззю, якая "аб'ядноўвае вялікія грамадскія структуры ... асацыіруецца абсяг агульных паняццяў, якія могуць у рознай ступені ўсведамлення ахопленымі ёю людзьмі"[21]. Але мы лічым тэарэтычную схему, якую абгрунтоўваюць польскія сацыёлагі, таксанамічна неаптымальнай; аптымальна трактаваць этнічныя сувязі як паняцце, выдзяляемае па адзнацы наяўнасці міжіндывідуальных (паводле нашай тэрміналогіі — "сацыяльных") кантактаў, а этнічная свядомасць як паняцце, выдзяляемая па наяўнасці сукупнасці этнічных уяўленняў (па агульнасці звычаяў, гістарычнага лёсу і г. д.).

Навошта выдзяляць патэнцыяльны тып этнічнай сувязі, калі разам з апошнім атрыбутам этнасу і іншымі атрыбутамі (якія польскія сацыёлагі лічаць свядомасць і тоеснасць) дастатковым будзе вызначаць такі пазнавальны змест, як этнічная свядомасць? Навошта ўвогуле прыпісваць этнасу сацыятальныя кантакты, улічваючы тое, што этнас у межах этналогіі абгрунтоўваецца і трактуецца як супольнасць, выдзяляецца па агульных рысах культуры? Р. Радзік так і характарызуе нацыю — "культурная супольнасць", але пры гэтым прыпісвае нацыі грамадскія сувязі. Ён сцвярджае: "Мы лічым нацыяй супольнасць, якая характарызуецца максімальным грамадскім пашырэннем нацыянальнай сувязі, а таксама максімальнай ... інтэнсіўнасцю. Нацыянальная сувязь абапіраецца на нацыянальную свядомасць (і тоеснасць), якая знаходзіць свой выраз у нацыянальнай ідэалогіі" Тым самым нацыянальная сувязь (або этнічная сувязь нацый), г. зн. грамадская сувязь вялікіх супольнасцяў, фактычна зводзіцца ім, як і П. Р. Рыбіцкім, да нацыянальнай свядомасці, аднак тым не менш пакідаецца атрыбутам, самастойнай адзінкай нацыі, мабыць, прымаючы

---

[21] Цыт. па арт.: Радзік Р. Ад этнічнага згуртавання да палітычнай супольнасці // БГА. Т. 5. Сш. 2 (9). Мн. Снежань 1998. С. 300—301.

пад ўвагу тое, што нацыі — тэрытарыяльныя супольнасці. Цалкам супярэчлівым будзе, адрозніваючы нацыянальную сувязь і нацыянальную свядомасць і абгрунтоўваючы грамадскую сувязь атрыбутам буйных этнічных супольнасцяў, сцвярджаць, што "кожная вялікая грамадская група з'яўляецца прыдуманай супольнасцю"[22]. Як жа яна прыдуманая, калі ёй прыпісваюцца рэальныя грамадскія сувязі?

Адвяргаючы мэтазгоднасць стварэння паняцця этнічнай супольнасці па адзнацы грамадскай сувязі, мы не характарызуем этнасы як структуры (г. зн. сувязі элементаў і форму арганізацыі сістэмы) зыходзячы з крытэрыя арганізаванасці сукупнасці індывідаў, кажучы спрошчана, няма арганізацыі — няма і структуры. Прынята лічыць, што "структура — неад'емны атрыбут усіх рэальна існуючых аб'ектаў і сістэм. У свеце няма і не можа быць цел без структуры..."[23] Аднак этнічныя супольнасці не рэальныя матэрыяльныя, а ідэальныя грамадскія ўтварэнні. Пры стварэнні паняцця пра іх галоўнай адзнакай бяруць рысы культуры. Канкрэтныя этнасы як супольнасці, якія маюць этнічную свядомасць, — ідэальныя ўтварэнні грамадскай рэчаіснасці, а паняцце пра такія супольнасці ствараецца па адзнацы культурных рыс.

Пры аналізе этнічных утварэнняў выдзяляюцца не дэтэрмінісцкія сувязі (сувязі паміж класамі з'яў), а структурныя сувязі (упарадкаваныя сувязі паміж элементамі сістэмы). Паколькі этнас аптымальна трактаваць як супольнасць, выдзяляемую па агульных рысах культуры, у адрозненне ад сацыяльнавй групы, выдзяляемай па адзнацы ўзаемадзеяння элементаў сістэмы, то няма неабходнасці прыпісваць этнасам і сувязі паміж элементамі, разглядаючы іх як сістэмы. Паняцце этнічнай супольнасці аптымальна ствараць бездатычна да адзнакі сацыяльнай сувязі, паколькі індывіды, якія складаюць пэўны этнас, г. зн. пражываюць на пэўнай тэрыторыі, маюць пэўную этнічную свядомасць і агульныя рысы культуры, разам з тым складаюць розныя соцыумы і ажыццяўляюць узаемадзеянне паміж індывідамі, якія складаюць этнасы, праз соцыумы ці ў соцыумах. Такім чынам, мы лічым сацыятальныя сувязі (напрыклад, выкладчык — студэнт, вытворца — гандляр — спажывец) адзнакай выключна соцыумаў.

Пэўны род процiборства, які адбываецца ў адпаведнасці з прынцыпам этнічнай розніцы, вызначаецца як этнічны (і нацыянальны) канфлікт Але ў канкрэтных этнічных канфліктах непасрэдны ўдзел

---

[22] Радзік Р. Ад этнічнага згуртавання... С. 315.
[23] Философский словарь. М. 1980. С. 355.

прымаюць не этнасы, нацыі, а соцыумы. Толькі на першы погляд здаецца, што ў грамадскіх узаемадзеяннях, у тым ліку і ў этнічных канфліктах, удзельнічаюць этнасы, нацыі. Пры больш дэталёвым аналізе вынікае, што ў грамадстве побач з этнічнымі ўтварэннямі ўсюды існуюць соцыумы, інакш — сацыятальныя ўтварэнні індывідаў (палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя і інш.), якія аптымальна вызначаць не як форму арганізацыі этнічных супольнасцяў, а як самастойныя адзінкі ці суб'екты грамадскай дзейнасці, прычым удзел іх у грамадскіх падзеях з'яўляецца непасрэдным. Напрыклад, у этнічных канфліктах непасрэдны ўдзел прымаюць перш за ўсё дзяржаўныя, палітычныя і ваенныя арганізацыі; нават ў дробных этнасутыкненнях, у прыватнасці на базарах, непасрэдны ўдзел прымаюць удзельнікі сацыяльнага агрэгату, мікрасацыяльнай групы, якія з'яўляюцца прадстаўнікамі розных этнічных і этнапалітычных супольнасцяў, а не этнасы.

У адным і тым жа даведніку "Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя" паняцце нацыі вызначаецца па-рознаму. Так, І. У. Чаквін паведамляе, што паняцце этнасу ўжываецца з пачатку XX ст. расійскімі вучонымі ў якасці збіральнага паняцця, "для вызначэння розных этнічных супольнасцяў — племя, народнасці, нацыі"[24], а П. У. Церашковіч сцвярджае, што "нацыя — тып этнасацыяльнай супольнасці людзей, якая прыходзіць на змену феадальнай народнасці і ўзнікае на аснове капіталістычнага або сацыялістычнага спосабу вытворчасці"[25].

У артыкуле "Нацыя" навуковага даведніка "Социология. Энциклопедия" (Мн., 2003) П. У. Церашковіч паведамляе, што маюцца два асноўныя падыходы да разумення нацыі: як палітычнай супольнасці грамадзян у дзяржаве (паліталагічныя нацыі) і як этнічнай супольнасці (з адзінай мовай і этнічнай свядомасцю). Значная частка этнолагаў адрознівае этнасы як этнічныя супольнасці даіндустрыяльнага грамадства і нацыі як супольнасці грамадства постіндустрыяльнага. На наш погляд, аптымальней казаць не пра адрозненне этнасаў і нацый як супольнасцяў, паколькі ў гэтым выпадку маецца на ўвазе этнічная супольнасць як від сацыяльнай супольнасці, а пра адрозненне розных этнасаў, этнічных груп і супольнасцяў у розныя гістарычныя эпохі, што выдзяляюцца ў адпаведнасці з крытэрыем развіцця вытворчасці.

П. В. Аляксееў вызначае, што "нацыя — гэта гістарычна склаўшаяся ўстойлівая форма супольнасці людзей, якія маюць, як правіла, агульнасць тэрыторыі, эканомікі, рысы традыцыйнай культуры і псі-

---

[24] Чаквін І. У. Этнас // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 547.
[25] Церашковіч П. У. Нацыя // Тамсама. С. 364.

халагічнага складу".[26] Аднак падабенства рыс псіхалагічнага складу — адзнака этнасу (і, мабыць, этнічнай нацыі), але не (усякай) нацыі.

Нацыянальная дзяржава — гістарычны тып дзяржавы, разам з полісам, імперыяй і іншымі тыпамі. Канкрэтная дзяржава, зыходзячы анталагічна з прапануемага намі таксанамічнага падзелу паняццяў сацыяльнай філасофіі, — сістэма узаемазвязаных аб'яднанняў, але не супольнасцяў. Анталагічна разглядаючы, пэўная нацыянальная дзяржава — гэта адпаведнасць сістэме аб'яднанняў пэўнай этнічнай грамадскай супольнасці. Анталагічна вызначаюцца як рэальныя канкрэтныя дзяржавы, сем'і, працоўныя калектывы і г. д., але не канкрэтныя нацыі. У тым выпадку, калі пад дзяржавай мець на ўвазе сістэму палітычных органаў улады і кіравання, а таксама іншых устаноў, то нельга палічыць адначасова суб'ектам грамадскай дзейнасці і дзяржаву, і нацыю. Нацыю ў такім выпадку належыць трактаваць не як пэўнае аб'яднанне (рэальнае грамадскае ўтварэнне), а толькі як супольнасць (ідэальнае грамадскае ўтварэнне). Індывіды, з якіх складаецца нацыя, разам з тым з'яўляюцца прадстаўнікамі і ўдзельнікамі розных соцыумаў (пэўнай дзяржавы, сям'і, палітычнай партыі, працоўнага калектыву і г. д.). Канкрэтная нацыя, у адрозненне ад канкрэтных дзяржаў, не з'яўляецца суб'ектам грамадскай дзейнасці.

Д. Кола сцвярджае, што "Еўропа з'яўляецца тым месцам, дзе ўзнікае асаблівая палітычная форма — дзяржава-нацыя, дзе праяўляецца тэндэнцыя накладвання адно на другое палітычнага суверэнітэту і культурнай аднароднасці". Тым самым галоўнымі адзнакамі нацыі ён бярэ як палітычна-тэрытарыяльную цэласнасць, так і культурную. Д. Кола слушна тлумачыць паліталагічнае паняцце нацыі: "Нацыя ёсць не што іншае, як дзяржава-нацыя і палітычная форма тэрытарыяльнага суверэнітэту над падданымі і культурная (моўная і/або рэлігійная) гомагенізацыя групы, якая, накладваючыся адна на другую, ствараe нацыю"[27].

Нацыя як культурная і тэрытарыяльная цэласнасць — ідэальны аб'ект, ствараемы ў этналогіі і сацыялогіі. У грамадскай рэчаіснасці такому пазнавальнаму зместу, як канкрэтная нацыя, адпавядае сукупнасць індывідаў, якая праяўляецца як этнічнасць. Падмацуем апошняе палажэнне прыкладам.

---

[26] Алексеев П. В. Социальная философия. Уч. пос. М., 2003. С. 37

[27] Кола Доменик. Политическая социология. С. 374, 351.

Дзяржава з назваю "СССР" у гады Вялікай Айчыннай вайны не здолела б мабілізаваць народныя масы для супраціўлення захопнікам краіны, якое праявілася, у тым ліку ў масавых выпадках патрыятызму і гераізму, калі б не было савецкай нацыі, г. зн. этнапалітычнай супольнасці, прадстаўнікі якой усведамлялі прыналежнасць да краіны з назвай "СССР" і яе ідэалагічнага аналага — сацыялістычнай радзімы. Мабілізацыя дзяржаўнымі ўстановамі або палітычнымі супольнасцямі жыхароў краіны, якія ўсведамляюць сваю прыналежнасць да яе і разам з тым карыстаюцца рознымі этнонімамі, у часы войнаў на барацьбу з ворагам, на змаганне за незалежнасць служыць аргументам на карысць таго, што нацыя праяўляецца як пэўная грамадская свядомасць, і не з'яўляецца аргументам на карысць існавання нацый і нацыянальнасцей як рэальных грамадскіх утварэнняў, бо ў рэальных падзеях вайны ўдзельнічаюць не нацыі і нацыянальнасці, а пэўныя соцыумы, перш за ўсё органы ўлады і вайсковыя падраздзяленні.

Па меркаванні Р. Радзіка: "...нацыя з'яўляецца супольнасцю з моцна ўсталяванымі сувязямі, якія вынікаюць з усведамлення яе членаў калектыўнага бачання сябе як культурна-гістарычнага адзінства ... Гэтая супольнасць існуе праз інстытуцыялізацыю свайго грамадска-культурнага быцця"[28]. Такое разуменне нацыі не з'яўляецца выключна этналагічным, паколькі ў яго прыўносіцца паняцце сацыяльнага інстытута. Аднак у сацыялогіі нацыя не выдзелена як сацыяльны інстытут.

Пакуль не распрацаваная агульнапрынятая тэорыя этнасу. Ад этнолагаў патрабуецца тэарэтычная мадэль этнасу [пад тэарэтычнай мадэллю маецца на ўвазе не спецыяльная тэорыя (як разумеў, напрыклад, М. Бунге[29]), а мадэль даследуемага аб'екта (прыблізна тое, што М. Бунге абазначаў тэрмінам "мадэльны аб'ект")], так кажучы, "рабочае паняцце", якое дазваляе даследчыкам праводзіць назіранні над этнічнымі з'явамі, здзяйсняць інтэрпрэтацыі крыніц, якія сведчаць пра іх. Даследчыкам патрэбна толькі такая мадэль этнасу, якая "працуе". Разам з тым, каб пазбегнуць спекуляцый, такое паняцце павінна ўтварацца ў пэўных метадалагічных рамках.

---

[28] Радзік Р. Ад этнічнага згуртавання ... С. 325—326.

[29] Бунге Марио. Философия физики. М., 1975. С. 71.

## 15. АНТАЛАГІЧНЫ СТАТУС ЭТНАСАЎ

У межах гісторыкі, археалогіі, этнаграфіі будуюцца ідэальныя аб'екты, якія ствараюцца на эмпірычным узроўні даследавання, яны з'яўляюцца вынікам абагульнення фактаў. Адной з перадумоў пабудовы канцэпцый у іх з'яўляецца выкарыстанне паняццяў грамадазнаўчых дысцыплін, у тым ліку і паняццяў этнасу, сацыяльнага класа і культуры. На аснове гэтых паняццяў задаюцца канцэптуальныя схемы, якія задзейнічаны пры правядзенні даследаванняў. Паняцці, якія абазначаюцца тэрмінамі "этнас", "сацыяльны клас", "культура" і г. д., дазваляюць гісторыкам, археологам, этнографам, даследуючы аб'екты, апісваць і тлумачыць гістарычныя з'явы, але з гэтага не вынікае, што ў іх рэпрэзентуецца так званая аб'ектыўная рэальнасць. "Аб'ектыўная рэальнасць", як вядома, тэрмін філасофіі, які абазначае паняцце рэчаіснасці, наяўнай па-за межамі свядомасці суб'екта пазнання. Іншы раз адзначаюць, што "калі гісторыкі і "адлюстроўваюць" гістарычную рэчаіснасць, то адлюстраванне гэта ўключае ў сябе ўсе тыя «папраўкі», якія адпавядаюць сучаснай карціне свету"[1]. Больш слушным наконт адпаведнасці паняццяў як пэўных ведаў рэчаіснасці будзе сцвярджаць тое, што эфектыўнасць апісання і тлумачэння як функцый тэорыі і ўвогуле ведаў залежыць (карэлятыўна) не ад таго, ці з'яўляюцца паняцці тэарэтычных схем рэпрэзентантамі з'яў рэчаіснасці, а ад выкарыстоўваемых у даследаванні метадалагічных сродкаў.

Ужо простае разважанне паказвае, што такія пазнавальныя зместы, як этнасы, нацыі, рабы, мяшчане і г. д., — абстракцыі (вызначаючы лагічна), ідэальныя аб'екты або канструкты (вызначаючы эпістэмалагічна). Калі ўстанаўліваць іх статус паводле логіка-гнасеалагічнай класіфікацыі аб'ектаў пазнання, прапануемай Я. К. Вайшвілам і М. Р. Дзегцяровым у пачатку главы 4 іх падручніка для ВНУ "Логика" [мы характарызуем яе як логіка-гнасеалагічную таму, што дзяленне аб'ектаў пазнання як прадметаў мыслення на эмпірычныя і тэарэтычныя праводзіцца ў ёй у адпаведнасці з крытэрыем крыніцы ўзнікнення такіх прадметаў, як пачуццёва-ўспрымаемых (варыянт — назіраемых) або неўспрымаемых. Класіфікацыю належала б лічыць эпістэмалагічнай, калі б крытэрыем яе быў узяты ўзровень метадаў даследавання. Але эпістэмалагічная класіфікацыя — гэта класіфікацыя навуковых ведаў, а не аб'ектаў пазнання], то атрымаем наступ-

---

[1] Гуревич А. Я. Теория формаций и реальность истории // Вопросы философии. 1990. № 11. С. 32.

нае: этнасы, нацыі, сацыяльныя класы і г. д. — тэарэтычныя аб'екты пазнання, а менавіта ідэальныя прадметы мыслення; рабы, мяшчане, кельты, хазары і г. д. — эмпірычныя аб'екты пазнання, такія прадметы мыслення, як рэчы (сукупнасці індывідаў). Разам з тым калі лічыць, што людзі як аб'ект пазнання — эмпірычны аб'ект, то рабы, мяшчане, кельты, хазары і г. д. належыць разглядаць ужо як тэарэтычны аб'ект пазнання, абстрактны прадмет мыслення, які ўзнікае пры інтэнцыяльным ужыванні імёнаў. Лібералы, камуністы і г. д. таксама абстрактныя прадметы мыслення, але ўзнікаючыя інакш — як вынік ізаляванага абстрагавання.

Але калі паспрабаваць устанавіць анталагічны статус гэтых і іншых пазнавальных зместаў грамадазнаўчых дысцыплін, то атрымліваюцца іншыя вынікі. Пры такім устанаўленні мы зыходзім з палажэння, што рэальныя дзеянні ажыццяўляюць канкрэтныя соцыумы, і тыя, якія адносяцца да дзяржаўных устаноў, і тыя, якія да іх не адносяцца. Працэдура ўстанаўлення анталагічнага статуса пазнавальных зместаў уключае працэдуру ўстанаўлення рэферэнта іх выкладання яго вынікаў на мове анталагічных паняццяў. Эпістэмалагічна тлумачачы сцвярджэнне пра тое, што канкрэтныя этнасы, пэўныя сацыяльныя класы ажыццяўляюць рэальныя дзеянні, удзельнічаюць у падзеях — ідэалізацыі рэчаіснага становішча спраў, ідэалізаваныя тэарэтычныя і канцэптуальныя схемы. Калі адмаўляць вызначэнню канкрэтных этнасаў, пэўных сацыяльных класаў і інш. як суб'ектаў грамадскай дзейнасці, то належыць сцвярджаць, што такія пазнавальныя зместы трэба логіка-гнасеалагічна класіфікаваць як абстрактна-ідэалізаваныя прадметы мыслення.

Звычайна логікі тлумачаць, што прадметы ў мысленні заўсёды маюць абстрактны характар, аднак гэта "не азначае, як часта ўяўляецца, што самі мыслімыя ў іх прадметы заўсёды ёсць абстракцыі і што менавіта гэтыя абстракцыі, а не канкрэтныя прадметы рэчаіснасці з'яўляюцца аб'ектам вывучэння навукі"[2]. Але ў навуковым пазнанні, асабліва на паспелай стадыі развіцця навуковых дысцыплін, шырока распаўсюджаны тэарэтычныя аб'екты (гл.: Степин В. С. Теоретическое знание. М., 2000), г. зн. пазнавальныя зместы, у якіх мысляцца не канкрэтныя прадметы. Належыць усведамляць, што паняцце прадмета шматслойнае, у рамках логікі яно неэксплікавана і таму дае магчымасць, калі не для спекуляцый, то для непаслядоўнасцяў у выказваннях, у якіх ўжываюцца тэрміны, якімі яно абазначаецца.

---

[2] Войшвилло Е. К., Дегтярев М. Р. Логика. С. 181.

Устанаўленне анталагічнага статуса пазнавальных зместаў (паняццяў, імёнаў) адпавядае прапаноўваемаму намі гнасеалагічнаму падзелу іх на рэпрэзентанты і канструкты. Паняцці, якія абазначаюцца тэрмінамі "рэпрэзентант", "канструкт", магчыма па-рознаму трактаваць у межах розных навуковых дысцыплін: рэпрэзентант у гнасеалогіі — як пазнавальны змест, які адпавядае пачуццёвым вобразам, аб'ект якога цалкам або часткова дадзены (або быў дадзены) у наглядным уяўленні, канструкт — як змест, якому не адпавядае такі вобраз; у логіцы рэпрэзентант — як змест, для якога даецца астэнсіўнае вызначэнне (хаця некаторыя логікі лічаць, што "астэнсіўнае вызначэнне з'яўляецца пазалагічным"[3]), канструкт — як змест, для якога даецца вербальнае вызначэнне; у эпістэмалогіі рэпрэзентант — як змест, які з'яўляецца апісаннем з'яў, фіксацыяй момантаў і аспектаў эмпірычнага даследавання, канструкт — як змест, які не з'яўляецца такім апісаннем.

Тэрмін "паняцце" шматзначны. Выдзелім асноўныя значэнні, у якіх ён ужываецца ў пэўных навуковых дысцыплінах: у псіхалогіі — у значэнні формы мысліцельных актаў псіхікі; у логіцы — у значэнні выніку абагульнення прадметаў некаторага класа, у лагічнай семантыцы — у значэнні сэнсу агульных імёнаў; у гнасеалогіі — у значэнні любога пазнавальнага зместу, крыніцай якога служыць не мысленне, а пачуццёвасць; у эпістэмалогіі — любога ідэальнага аб'екта. У мэтах аптымізацыі апісання працэсу пазнання лічым мэтазгодным увесці ў гнасеалогію дадаткова і тэрмін "пазнавальны змест" замест выкарыстоўваемага ў ёй шматзначнага тэрміна "паняцце". Яго ўвядзенне мэтазгодна для адрознення розных сэнсаў, у якіх ужываецца тэрмін "паняцце". Паняцце пазнавальнага зместу блізка да логіка-гнасеалагічнага паняцця аб'екта пазнання як прадмета мыслення, але больш шырокае па аб'ёму; пазнавальныя зместы трактуюць элемент лагічнай структуры пазнання. З аднаго боку, пазнавальныя зместы, у мэтах метатэарэтычнага апісання, дапушчальна трактаваць як элементарныя веды, з другога боку, яны аптымальна вызначаемы як базавыя элементы, з якіх складаюцца веды, але не пэўныя веды.

Толькі ў гнасеалагічным сэнсе тэрміна "паняцце" дапушчальна прыняць вызначэнні шэрагам даследчыкаў, у прыватнасці Р. Радзікам, канкрэтных народнасцей, нацыянальнасцей не як этнонімаў, а як паняццяў. Калі зыходзіць пры такім вызначэнні з лагічнага сэнсу тэрміна "паняцце", то тады "беларусы", "палякі" і інш. — паняцці класі-

[3] Курбатов В. И. Логика. С. 138.

фікацыйнага характару, якія выкарыстоўваюцца для апісання этнічных з'яў, накшталт паняццяў пэўнага віду, роду, класа, сямейства, ствараемых ў біялогіі. Прыведзены прыклад падкрэслівае палажэнне, паводле якога адзін і той жа тэрмін (у дадзеным выпадку — тэрмін "паняцце") у межах адной і той жа галіны даследаванняў мае розную інтэрпрэтацыю (у дадзеным выпадку — эпістэмалагічную, лагічную).

Пазнавальныя зместы, якія адпавядаюць паняццю этнасу, такія, як канкрэтныя суперэтнасы (напрыклад, славяне, кельты), — эфектыўны сродак тлумачэння розных этнічных з'яў. Але з гэтага не вынікае, што рэферэнты іх трэба анталагічна характарызаваць як рэальныя ўтварэнні. Для тых, хто не прымае палажэння, што славяне, кельты як канструкты археалогіі, лінгвістыкі, этналогіі, таксама як і, напрыклад, паняцці сацыялістычнай рэвалюцыі, феадалізму, — абстрактныя аб'екты, якім не адпавядае рэчаіснасць, нагадаем, што найбольш эфектыўныя сродкі ў даследаваннях прыродазнаўчых дысцыплін —лічбы і іншыя матэматычныя структуры, яны — вынікі ізаляванага абстрагавання, вызначаючы логіка-гнасеалагічна — тэарэтычныя аб'екты пазнання як абстрактныя прадметы мыслення.

М. А. Сакалова бліскуча зрабіла гістарыяграфічную выснову, што "...айчынныя гісторыкі часам гіпастазуюць лінгвістычныя, археалагічныя і этнаграфічныя класіфікацыйныя катэгорыі"[4]. Мы пададзім становішча некалькі інакш — даследчыкі (не толькі айчынныя) экстрапалююць паняцці лінгвістыкі, археалогіі і этналогіі на гістарычны матэрыял, не маючы выразнай тэарэтычнай мадэлі этнасу, зыходзячы з розных канцэптуальных мадэляў. А гіпастазуюць яны паняцці з прычыны філасофскай неадукаванасці. У якасці прыкладу гіпастазавання прывядзём сцвярджэнне В. К. Бандарчыка: "І балты, і угра-фіны існуюць сёння побач са славянамі. І нікуды яны не зніклі"[5]. Тым самым айчынны этнограф разумее пад суперэтнасамі пэўнае аб'ектыўна рэальнае ўтварэнне, а між тым падобныя пазнавальныя зместы — канструкты, з дапамогай якіх апісваюцца і тлумачацца даследуемыя з'явы ў межах пэўнай дысцыпліны. Як біялагізацыю грамадскага ўтварэння мы разглядаем сцвярджэнні, падобныя наступнаму:"Этнічныя

---

[4] Сакалова Марыяна. Пра разуменне... С. 169.

[5] Беларусы: У 8 т. Т. 3. Гісторыя этналагічнага вывучэння / Рэд. кал.: В. К. Бандарчык і інш. Мн., 1999. С. 306.

супольнасці рэагуюць на змены знешніх умоў перш за ўсё выпрацоўкай новых культурных элементаў"[6].

Э. В. Бендэнфердэ не прыбягае да прыёму гіпастазавання, але для яго цяжка ўразумець розніцу паміж рэальнымі і ідэальнымі грамадскімі ўтварэннямі: "Тое, што нацыя — гэта «ўяўленае адзінства», якое абапіраецца на распаўсюджаныя ўяўленні, не пярэчыць яе рэальнасці і рэальнай сіле ўзаемадзеяння"[7]. Паняцце грамадскай рэальнай рэчаіснасці аптымальна ствараць, выдзяляючы галоўнай адзнакай яго наяўнасць сацыя(та)льна абумоўленай дзейнасці. А інстытуалізаваныя ўтварэнні індывідаў, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі і прадстаўнікі якіх усведамляюць сваё адзінства, зыходзіць з выкарыстання адной (або некалькіх) мовы, якая іх ідэйна аб'ядноўвае і г. д., падыходзячы анталагічна строга, памылкова вызначаць як рэальныя. Тут трэба заўважыць, што невыразныя анталагічныя ўяўленні грамадазнаўцаў абумоўлены тым, што філосафы не прапанавалі ім эксплікаваных анталагічных паняццяў.

Вызначаючы метадолаганавукова, навуковае пазнанне мае мэтай стварэнне ідэальных аб'ектаў, тэарэтычных схем і мадэляў, з дапамогай якіх тлумачацца і прадказваюцца пэўныя з'явы. Устанаўленне адпаведнасці іх (гнасеалагічна — пазнавальных зместаў) рэчаіснасці — задача ўжо анталагічнага даследавання. Сёння распаўсюджаны логіка-семантычны падыход да такога ўстанаўлення.

У рамках лагічнай семантыкі выпрацоўваецца паняційны апарат тлумачэння адносін моўных выразаў да пазамоўных аб'ектаў (прычым у ёй высвятляюцца адносіны імёнаў і паняццяў як імёнаў пэўнага віду да універсуму разважання), але не выкарыстоўваюцца і не абгрунтоўваюцца паняцці рэальнасці і рэчаіснасці. Паколькі імёны абазначаюць прадметы або сукупнасці падобных прадметаў з універсуму разважання, г. зн. прадметы мыслення, то логіка-семантычная працэдура ўстанаўлення рэферэнта імёнаў (як імёны магчыма разглядаць ўсялякія вербальна ўвасабляемыя пазнавальныя зместы) не носіць характару анталагічнага вызначэння, не дазваляе ўстанаўліваць анталагічны статус эквівалентных імёнам пазнавальных зместаў. Рэфэрэнты — заўсёды мысленныя прадметы, працэдура іх устанаўлення ў рамках семантыкі заключаецца перш за ўсё ў лагічным выдзяленні класаў прадме-

---

[6] Микулич Т. Н. Этнические общности как феномен социально организованного человечества // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы навук. канф. (Мінск, 6—7 снежня 2001 г.). Мн., 2001. С. 306.
[7] Радзік Р. Ад этнічнага згуртавання… С. 131.

таў. Пры логіка-семантычным падыходзе да рэферэнтаў імёнаў і паняццяў як сэнсаў апісальных імёнаў не адрозніваюцца рэпрэзентанты і канструкты, г. зн. пазнавальныя зместы, якім адпавядаюць рэчаісныя ўтварэнні, і зместы, якія канструіруюцца ў даследчых мэтах. Рэферэнты імёнаў — пазамоўныя аб'екты, якія вызначаюцца як рэчаісныя прадметы або іх уласцівасці і адносіны. У пэўных імёнаў адсутнічаюць рэферэнты, калі імёнам не адпавядаюць такія аб'екты, што не маюць рэферэнта. Пры анталагічным падыходзе да рэферэнтаў паняццяў, і шырэй — пазнавальных зместаў, у выніку анталагічнага аналізу канкрэтнасці іх атрымліваецца анталагічная характарыстыка іх як рэчаісных або ідэальных утварэнняў.

Пры анталагічным падыходзе да вырашэння пытання пра адпаведнасць пазнавальных зместаў рэальным утварэнням, на наш погляд, аптымальна зыходзіць з палажэнняў пра канкрэтнасць як крытэрый аднясення ўтварэнняў да рэчаіснасці, пра наяўнасць дзеяння як крытэрый аднясення да рэальнасці; з выдзялення відавых паняццяў у адносінах да паняцця рэчаіснасці як паняццяў рэальнай і ідэальнай формы рэчаіснасці.

Калі пры гэтым да рэальнай грамадскай рэчаіснасці (менавіта грамадскай, а не матэрыяльнай) адносіць канкрэтныя соцыумы (г. зн. утварэнні індывідаў, якія класіфікуемы як аб'яднанні і адзінствы і характарызуемы адпаведна як арганізаваныя, каардынаваныя, і адзінствы, акрамя гэтага, цесна звязаныя і мэтанакіраваныя), іх узаемадзеянні, падзеі (праявы, вынікі ўзаемадзеянняў розных соцыумаў), працэсы (паслядоўнасці падзей), а да ідэальнай грамадскай рэчаіснасці адносіць пэўныя грамадскія свядомасці (напрыклад, пэўную этнапалітычную свядомасць), сацыяльныя адносіны, то тады погляды прымордыялістаў ("...усе прымордыялісцкія канцэпцыі трактуюць этнічныя супольнасці як рэальна існуючыя групы людзей ... этнічныя групы разглядаюцца як тыя, якія базіруюцца на культурным адзінстве, і, значыць, як анталагічна рэальныя") і канструктывістаў (для якіх этнічнае пачуццё — інтэлектуальны канструкт, этнас — супольнасць людзей з пэўнай этнічнасцю, а "этнічнасць — гэта працэс сацыяльнага канструіравання ўяўляемых супольнасцяў..."[8]) на анталагічны статус этнасаў аказваюцца памылковымі.

З пункту гледжання гнасеалогіі маецца розніца не толькі паміж рэчаіснасцю і прадметнасцю, паміж канкрэтнымі з'явамі як зместам прадметнасці і ведамі пра іх, але і паміж паняццямі рэчаіснасці і гра-

---

[8] Садохин А. П., Грушевицкая Т. Г. Этнология... С. 96, 99—100.

мадскай рэчаіснасці, таму спекулятыўным будзе, разважаючы пра грамадскую рэчаіснасць, сцвярджаць пра рэальныя дзеянні этнасаў, сацыяльных класаў і іншых утварэнняў. Паняцце рэчаіснасці ахоплівае зместам не толькі матэрыяльныя і духоўныя ўтварэнні і ўзаемадзеянні, але і грамадскія. Да грамадскіх утварэнняў адносіцца тая рэчаіснасць, што прыўносіцца да матэрыяльных і духоўных утварэнняў звыш іх у сферы грамадства.

Грамадская (не індывідуальная, але ўласцівая псіхіцы асобных індывідаў) свядомасць, у прыватнасці этнічная, палітычная, і грамадскія, у першую чаргу сацыяльныя (міжіндывідуальныя), адносіны выражаюцца праз знакі, прычым не толькі моўныя. "Знак — гэта пачуццёва ўспрымаемы аб'ект, які ўмоўна прадстаўляе абазначаемы ім прадмет"[9], г. зн. што знак характарызуемы і як сродак выражэння грамадскіх адносін і свядомасці; матэрыяльнае ўтварэнне функцыяніруе як носьбіт пэўных значэнняў, а значэнні знакаў — гэта ўтварэнні ідэальныя. Такія грамадскія ўтварэнні, як пэўныя юрыдычныя законы і прававыя нормы, ажыццяўляюцца ў рэчаіснасці як пэўныя грамадскія адносіны і выражаюцца праз знакі, якія надзелены значэннямі, адпаведнымі такому ажыццяўленню.

У этналогіі выдзяляемы такія пазнавальныя зместы, як мікра-, суб-, макра-, суперэтнасы. Канкрэтныя этнасы праяўляюцца ў грамадскай рэчаіснасці як пэўная этнічнасць, а выражаюцца праз этнонімы (а таксама і палітонімы). Пры анталагічным падыходзе да ўстанаўлення рэферэнтаў рэферэнты падобных пазнавальных зместаў характарызуюцца з дапамогай паняццяў рэальных і ідэальных грамадскіх утварэнняў. Такая характарыстыка — першапачатковая апраксімацыя; прымальна ажыццяўляць і далейшую дыферэнцыяцыю паняцця грамадскай рэчаіснасці, напрыклад на патэнцыяльную — актуальную. Тады прымаемыя заканадаўчымі органамі пэўныя нарматыўныя акты дзяржаўнага характару трэба трактаваць як патэнцыяльную грамадскую рэчаіснасць, а іх розныя ажыццяўленні ў падзеях — як актуальную.

У рамках семантыкі выкарыстоўваецца, разам з лагічнымі, і пэўны анталагічны пункт гледжання пры ўстанаўленні рэферэнтаў імёнаў, які зыходзіць з пэўнай базіснай тэарэтычнай схемы лагіцысцкай арыентацыі. У лагіцысцкай традыцыі выдзяляемы тры базісныя семантычныя схемы: двухузроўневая схема Б. Расела (моўныя знакі — рэферэнты, дэнататы), трохузроўневая схема Г. Фрэге (знакі — сэнсы — рэферэнты), трохузроўневая лагіцысцкая (знакі — рэферэн-

---

[9] Бартон В. И. Логика. Мн., 2001. С. 25.

ты, дэнататы — метафізічная рэальнасць)[10]. У схемах, якія прапаноўвалі Б. Расел і Г. Фрэге, анталагічны статус прадметаў выносіцца за межы семантычнага аналізу. Трохузроўневая лагіцысцкая схема (і іншыя семантычныя схемы, паводле якіх прадугледжваецца ўстанаўленне анталагічнага статуса прадметаў) узгадняецца з базіснай бінарнай анталагічна-гнасеалагічнай схемай: аб'ектыўная рэчаіснасць (матэрыя) — суб'ектыўная рэчаіснасць (свядомасць). Такую схему абгрунтоўваў у свой час яшчэ Р. Дэкарт, сёння яна безнадзейна ўстарэла. У такой схеме змешаны анталагічныя і гнасеалагічныя паняцці. Такая схема неаднаразова пераадольвалася ў гісторыі філасофіі (Л. Вітгенштэйн абгрунтоўваў схему: факты — падзеі — мова). Тым не менш у найноўшых (паслядэкартавых) анталагічных пабудовах паняцце рэчаіснасці не дыферэнцыравана аптымальна, у іх разам з матэрыяльным тыпам рэчаіснасці не выдзяляемы і грамадскі тып яе (разам з тым у навуковай літаратуры шырока распаўсюджаны тэрміны "фізічная, гістарычная, сацыяльная і т. п. рэальнасць", якія абазначаюць спекулятыўныя, псеўдаанталагічныя паняцці).

Пры выкарыстанні семантычнага пункту гледжання на рэферэнт імёнаў і паняццяў нівеліруецца розніца паміж канструктамі і рэпрэзентантамі. Рэдукцыя паняццяў і іншых пазнавальных зместаў да імёнаў канцэптуальна нівеліруе і элімінуе адрозненне моўнай формы пазнавальных зместаў ад аб'ектаў пазнання як прадметаў мыслення. Семантычнае ўстанаўленне рэферэнта мае ў сваёй аснове перш за ўсё лагічны падыход да яго ўстанаўлення. Возьмем імя (эпістэмалагічна — тэрмін) "маса", утворанае і выкарыстоўваемае ў рамках фізікі. Логікасемантычна характарызуючы, "маса" — абстрактнае імя. Рэферэнт яго і паняцця інертнай масы сістэмы як сэнса апісальнага імя "мера інертнасці цел" — гэта клас прадметаў, якія маюць масу, у тым ліку і масу спакою; змест гэтага імя — пэўная ўласцівасць. Імя "беларус", характарызуючы логіка-семантычна, — канкрэтнае імя. Рэферэнт яго і паняцця беларуса, сэнса апісальнага імя "прадстаўнік сукупнасці індывідаў, якія называюць сябе беларусамі, усведамляе агульнасць свайго паходжання..." і г. д. — і клас падобных выдзяляемых па пэўных адзнаках індывідаў; і асобны прадстаўнік этнічнай або этнапалітычнай супольнасці, характарызуемы як дэсігнат такога імя. Рэферэнт імя "беларусы" складае адзін прадмет — пэўную сукупнасць індывідаў, разам з тым гэтае імя можа ўказваць на розныя пазамоўныя аб'екты —

---

[10] Кюнг Г. Мир как ноэма и мир как референт // Аналитическая философия. Тексты и развитие. М., 1998.

насельніцтва Рэспублікі Беларусь, частку прадстаўнікоў дзяржавы з такой назвай, пэўную нацыю, жыхароў або этнічную групу, якая існавала ва ўсходнім рэгіёне зямель Беларусі ў XVII—XIX стст., і нават этнас, які фарміраваўся пачынаючы з XIII ст., а саманазву атрымаў напрыканцы XIX ст. [такое ўказванне (дэнатацыя) залежыць і ад разгалінавання этналагічнай тэарэтычнай схемы]. Між тым характарызуючы гнасеалагічна, маса як мера інертнасці цел — такі пазнавальны змест, які з'яўляецца канструктам, але ўжываецца для вывучэння і характарыстыкі з'яў у прадметнай галіне фізікі.

Канструктамі з'яўляюцца не толькі паняцці, але і такія пазнавальныя зместы, як канкрэтныя суперэтнасы (напрыклад, славяне, германцы), эпістэмалагічна — ідэальныя аб'екты археалогіі, этналогіі, лінгвістыкі. Такія пазнавальныя зместы, як канкрэтныя этнасы (напрыклад, беларусы, амерыканцы), не канструкты, але з гэтага не вынікае, што ім адпавядаюць менавіта рэальныя грамадскія ўтварэнні. "Амерыканцы" — гэта агульнапрынятая назва жыхароў краіны з назвай "ЗША" і пэўнай сукупнасці індывідаў, якая ў рамках этналогіі і палітапогіі тыпалагізуема як нацыя. Амерыканская нацыя як пазнавальны змест — ідэальны аб'ект, выдзяляемы па шэрагу адзнак; мы ўстанаўліваем яго рэферэнтам, ставім яму ў адпаведнасць наяўную ў рэчаіснасці сукупнасць індывідаў, але такая сукупнасць, у адрозненне, напрыклад, ад такой сукупнасці індывідаў, як вайсковы кантынгент, які прымаў ўдзел ў вайне супраць Ірака вясною — летам 2003 г., не ажыццяўляе рэальныя дзеянні. Такому пазнавальнаму зместу (і іншым падобным прадметам), як амерыканская нацыя, адпавядае пэўная супольнасць індывідаў, якая праяўляецца ў рэчаіснасці як пэўная этнічнасць, г. зн., трактуючы анталагічна, яму адпавядае ідэальная рэчаіснасць. У рамках штодзённага пазнання мы не сумняваемся ў рэальнасці рэферэнтаў пазнавальных зместаў, накшталт такога зместу, як амерыканцы, аднак штодзённае пазнанне не мае сваёй састаўной часткай крытычны аналіз тэрмінаў, паняццяў, моўных выразаў і г. д.

Такім чынам, мы лічым семантычную трактоўку рэферэнтаў як рэферэнтаў імёнаў анталагічна непрыдатнай працэдурай. Паводле такой трактоўкі рэферэнты імёнаў "беларусы", "ліцвіны", "амерыканцы" і г. д. трактуюцца як класы (мноствы) рэальных або пачуццёва ўспрымаемых, назіраемых прадметаў. Між тым калі ставіцца да рэферэнтаў адпаведных пазнавальных зместаў як да з'явы грамадскай, а не матэрыяльнай, то іх належыць характарызаваць анталагічна як ідэальную рэчаіснасць, вызначаць патэнцыяльнымі, а не актуальнымі ўтва-

рэннямі. Рэферэнты канкрэтных імёнаў, паняццяў канкрэтных індывідаў — рэальныя матэрыяльна-духоўныя ўтварэнні. Паводле семантычнай трактоўкі рэферэнт імёнаў "славяне", "германцы" і г. д. таксама клас пэўных рэальных прадметаў, а між тым ён або канкрэтная супольнасць, якая праяўляе сабе не ў дзеянні, а ў пэўнай грамадскай свядомасці, парасткі фарміравання якой акрэсліваюцца не раней XIX ст., або, увогуле, толькі, вызначаючы эпістэмалагічна, ідэальны аб'ект ці канструкт, які патрэбны ў межах археалогіі, этналогіі, лінгвістыкі, карысны ў іх межах для апісання даследуемых з'яў і атрымання ведаў пра іх.

Патлумачым розніцу паміж логіка-семантычнай і анталагічнай трактоўкай рэферэнта паняццяў яшчэ некалькі інакш. Паняццям, напрыклад, масы цела, этнічнасці як сукупнасці адметных рыс этнасу, заканамернасці як сукупнасці законаў — ведаў пра ўстойлівыя сувязі з'яў, а таксама іх моўным абазначэнням не адпавядае пэўная рэальная рэчаіснасць у адрозненне ад такіх пазнавальных зместаў і іх абазначэнняў, як, напрыклад, Сонца, рэцэптарны слухавы аналізатар, вада.

Аптымальным крытэрыем аднясення да рэчаісных утварэнняў рэферэнтаў пазнавальных зместаў лічым іх канкрэтнасць [анталагічна фармулюецца, пачынаючы яшчэ з Арыстоцеля (з пэўнай карэкціроўкай яго палажэнняў), што рэчаіснымі вызначаемы выключна канкрэтныя ўтварэнні]. Пункт гледжання на канкрэтнасць аб'ектаў пазнання залежыць ад узятых крытэрыяў аднясення да яго. Логікі не могуць выпрацаваць аптымальны крытэрый канкрэтнасці паняццяў. Некаторыя з іх разумеюць пад элементамі канкрэтных паняццяў некаторыя канкрэтныя прадметы, але не іх характарыстыкі; другія — разумеюць пад канкрэтнымі паняццямі "...паняцці, элементы аб'ёма якіх — канкрэтныя аб'екты. Гэта такія паняцці, якія складаюць сэнс выразаў "чалавек", "сацыялістычная рэвалюцыя"[11]. Пры анталагічным падыходзе да вырашэння праблемы канкрэтнасці паняццяў, які мы абгрунтоўваем, лічыцца, што тым пазнавальным зместам, якія вызначаемы як рэпрэзентанты, адпавядаюць канкрэтныя ўтварэнні. Крытэрыем размежавання рэальнай і ідэальнай грамадскай рэчаіснасці бяром непасрэднасць узаемадзеяння індывідаў, непасрэдны ўдзел індывідаў у падзеях.

Крытэрыем размежавання канкрэтных і абстрактных імёнаў у логіцы часам бяруць прыроду абазначаемых прадметаў. Лагічна вызначаемыя як канкрэтныя — імёны, якія абазначаюць паасобныя прадметы або іх класы; як абстрактныя — імёны, якія абазначаюць улас-

[11] Войшвилло Е. К., Дегтярев М. Г. Логика. С. 206.

цівасці або адносіны, якія абстрагіраваны ад аб'ектаў[12]. Як бачна, для адных логікаў "канкрэтнае" — характарыстыка і рэферэнта (аб'екта, імя, паняцця) і яго моўнага абазначэння (імя) або мысліцельнага ўзнаўлення (паняцця); для іншых логікаў — гэта характарыстыка імёнаў, але не рэферэнтаў. На наш погляд, вызначэнне (лагічная характарыстыка) паняццяў як канкрэтных і абстрактных непрымальнае, паколькі паняцце як абагульненне прадметаў пэўнага класа ўжо ёсць абстракцыя.

Калі несупярэчліва выдзяляць канкрэтныя паняцці як від паняццяў і калі рэферэнт іх, напрыклад паняцця сацыялістычнай рэвалюцыі ці сэнсу выразу "сацыялістычная рэвалюцыя", — канкрэтны аб'ект, то гэта павінна азначаць, падыходзячы строга анталагічна, што маецца рэчаіснае ўтварэнне, якому адпавядае такое паняцце або імя. Аднак у рэчаіснасці не маецца такога ўтварэння. У ёй маюцца індывіды, пэўную сукупнасць якіх мы пазначаем пэўнай назвай, напрыклад этнонімам "беларусы"; канкрэтныя грамадскія падзеі, пэўную паслядоўнасць якіх мы абазначаем, напрыклад, выразам "Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі". Абагульняючы такія сукупнасці, выдзяляючы характэрныя рысы іх, мы ствараем паняцце, якое абазначаем тэрмінам "сацыялістычная рэвалюцыя". Гнасеалагічна характарызуючы, сацыялістычная рэвалюцыя як пэўны пазнавальны змест — канструкт, г. зн. што пры анталагічным падыходзе да рэферэнта паняцце сацыялістычнай рэвалюцыі характарызуема як канструкт, абстрактны змест; імя "чалавек" пры такім падыходзе не канкрэтнае, а абстрактнае, дакладней — відавое імя. Пэўная сацыялістычная рэвалюцыя, тая, якая абазначаецца выразам "Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі" — збіральнае імя, дэсігнат якога — паслядоўнасць рэальных падзей. Пэўны чалавек, напрыклад той, які зваўся "М. В. Доўнар-Запольскі" і быў расійска-савецкім гісторыкам, — канкрэтнае імя, але не збіральнае, паколькі мы мыслім яго як адзін прадмет (асобу). Пры такім падыходзе канкрэтае племя (напрыклад, паляне), канкрэтная нацыя (напрыклад, амерыканцы) і г. д. — імя збіральнае, паколькі дэсігнат яго — сукупнасць рэальных індывідаў.

У пабудовах семантыкі ігнаруецца адрозненне паміж паняццямі імёнаў і паняццяў, апошняе рэдуцыруецца да першага. Паняцці разглядаюцца як імёны, ужываемыя ў генеральнай супазіцыі, а рэферэнты імёнаў — як прадметы, якія існуюць у форме матэрыяльных утварэнняў, або іх уласцівасці і адносіны. У адпаведнасці з такім падыходам

[12] Бартон В. И. Логика… С. 47.

імёны “чалавек”, “электарат” і г. д. маюць рэферэнтам такія прадметы. З пункту гледжання анталогіі такім пазнавальным зместам, у адрозненне ад такіх, напрыклад, зместаў, як Зямля (і іншыя канкрэтныя касмічныя целы), беларусы (і іншыя канкрэтныя этнасы), не адпавядаюць рэчаісныя ўтварэнні, а толькі пэўныя паняцці, з дапамогай якіх пазнаюцца з'явы, г. зн. што пры ўстанаўленні рэферэнтаў пазнавальных зместаў мы зыходзім не з тэарэтычных схем семантыкі, у аснову якіх кладзецца паняцце імені, а з тэарэтычных схем анталогіі, у аснову якіх кладуцца паняцці рэчаісных і ідэальных утварэнняў.

Безумоўна, беларусы, палешукі (і нават славяне, калі мець на ўвазе не лігвістычна-археалагічны канструкт, а сукупнасць індывідаў, якія ўсведамляюць сябе славянамі) і г. д. — пазнавальныя зместы, якім адпавядае пэўная рэчаіснасць. Але для іх апісання і тлумачэння выкарыстоўваюцца канструкты — паняцці этнічнасці, культурных рыс і г. д. У рэчаіснасці маюцца супольнасці — пэўныя сукупнасці індывідаў, прадстаўнікі іх маюць этнічнасць, этналагічна — этнічную свядомасць і этнічную самасвядомасць (іншы раз толькі этнічную свядомасць), што дазваляе этналагічна выдзяляць гэтую сукупнасць як супольнасць этнічную, а анталагічна як рэчаіснае ўтварэнне. Такім чынам, канкрэтныя этнасы — гэта не “ўяўляемыя згуртаванні” (выраз Б. Андэрсана), але і не рэальныя грамадскія ўтварэнні, як лічыцца пры зыходжанні з адпаведна пазітывісцкіх і гістарыясофскіх установак.

Этнасы не з'яўляюцца вытворцамі вынікаў грамадскай дзейнасці, паколькі не выступаюць у якасці суб'ектаў яе, хаця і выдзяляемы па адзнаках, якія адпавядаюць такім вынікам. Вынікі грамадскай дзейнасці індывідаў ці дзейнасці соцыумаў — гэта так званыя соцыёкультурныя ўтварэнні, вызначаючы анталагічна — матэрыяльна-грамадскія, і духоўна-грамадскія ўтварэнні. Выдзяляючы этнас не толькі па адзнаках этнічнасці [тэрмін “этнічнасць” ужываем не ў этналагічным значэнні, а ў сацыяльна-філасофскім. Пад этнічнасцю разумеем грамадскую, а не індывідуальную свядомасць паходжання культурнай еднасці, а таксама, мабыць, і міжэтнічныя адносіны (або сувязі). Тое, што ў этналогіі звычайна абазначаюць тэрмінам “этнічнасць”, мы абазначаем тэрмінам “этнічныя рысы”], а і па адзнаках тэрыторыі, культурных рыс, мы тым самым звязваем грамадскія ўтварэнні ў тэарэтычных схемах з утварэннямі не выключна грамадскімі.

Вызначэнне пэўных грамадскіх утварэнняў як рэальных, матэрыяльных і г. д. у межах навуковага пазнання, г. зн. на падставе строгіх метадаў даследавання, магчыма толькі ў межах анталогіі. І. Кант

у кнізе “Крытыка чыстага розуму”, паставіўшы мэтай зняць супрацьпастаўленне катэгорый розуму і рэчы (характэрнае для мысліцеляў новага часу), у інтэрпрэтацыі Г. Г. Шпета, “падмяніў анталогію гнасеалогіяй”[13], чым аказаў “мядзведжую паслугу” развіццю філасофіі. Прадстаўнікі розных філасофскіх кірункаў, у тым ліку, і лагіцысцкай філасофіі, услед за ім, адвяргаючы мэтафізіку, разам з тым пазбаўляліся ад паняційнага апарату анталогіі. Невыпрацоўка імі аптымальнай базіснай анталагічнай і гнасеалагічнай схем, у прыватнасці неразлічэнне імі трансцэндэнтальных абъектаў пазнання з прадметамі пазнання, прыводзіць да недакладнага ўстанаўлення адпаведнасці пазнавальных зместаў утварэнням рэчаіснасці.

---

[13] Шпет Г. Г. Введение. История как проблема логики: В 3 т. Т. 2 // Антология феноменологической философии в России. М., 2000. С. 57; Макаров И. В. Проект “герменевтической” логики Г. Шпета. Генезис и основные проблемы // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Сер. 3. 2002. № 2.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Коратка падсумуем асноўныя вынікі праведзенага даследавання.

Узровень гісторыказнаўчых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь застаецця пакуль недастаткова высокім. Гэтаму ў пэўнай ступені садзейнічае тое, што выкарыстоўваемая сёння гісторыказнаўчая і навуказнаўчая тэрміналогія ў значнай ступені шматзначная, а паняційны апарат неўдасканалены. Першае генезісна абумоўлена тым, што яна стваралася ў часы, калі не мелася выразнага разумення адрознення тэрмінаў ад паняццяў, другое — яго неадкарэліраванасцю. Для апісання працэсу навуковага пазнання і разгляду яго розных аспектаў працягваюць карыстацца паняццямі, змест якіх часам перасякаецца.

Неабходнасць увядзення ў рамках гісторыказнаўства і навуказнаўства ўдасканаленай (перш за ўсё адкарэліраванай) тэрміналогіі дыктуецца недастатковай пераканаўчасцю гісторыказнаўчага і навуказнаўчага выкладання, а іншы раз — тэрміналагічнай блытанінай пры такім выкладанні (так, тэрмін "апісанне" ўжываецца ў навуказнаўчых даследаваннях не строга ў значэнні пэўнай функцыі тэорыі, але і ў значэнні метаду даследавання, апавядання). Пры аналізе навуказнаўчых тэкстаў трэба звяртаць на гэта пільную ўвагу, а для пазбягання супярэчлівасцяў належыць уводзіць новыя навуказнаўчыя тэрміны, якія будуць разгружаць шматзначныя тэрміны.

Прапануецца для мэт несупярэчлівага навуказнаўчага выкладання выдзяляць у сістэме гістарычных дысцыплін навуковую дысцыпліну пад найменнем "гісторыка". Да яе прымальна адносіць тыя галіны канкрэтна-гістарычных даследаванняў (у якіх выкладаецца гісторыя падзей, развіццё канкрэтных падзей і непрацяглых па часе працэсаў), што не аформіліся ў якасці навуковых дысцыплін. Лічым прымальным аддзяляць ад гісторыкі сумежныя гістарычныя дысцыпліны [у якіх праводзяцца даследаванні, пераважна датычныя тыпаў гістарычных з'яў (эканамічных, этнічных і г. д.)]. Апошнія ўключаюцца ў сістэму гістарычных дысцыплін, нягледзячы на тое, што ў іх межах пераважаюць іншыя тыпы даследавання, чым традыцыйнае гістарычнае даследаванне (прытрымліваючыся тыпалогіі такіх даследаванняў П. Ласлета). Акрамя таго, канкрэтна-гістарычныя і сумежна-гістарычныя даследаванні маюць адрозненне ў лагічнай структуры даследавання, якая заключаецца ў тым, што ў першых разглядаюцца пераважна падзеі, у другіх — пераважна тыпы падзей.

Лагічная структура гістарычных ведаў прынцыпова адрозніваецца ад лагічнай структуры ведаў у прыродазнаўчых і большасці грамадазнаўчых дысцыплін. Асноўны вынік даследавання апошніх — тэорыі, у склад якіх уваходзяць тэарэтычныя мадэлі і схемы, законы, гіпотэзы, тэарэтычныя тэрміны, а таксама факты і велічыні. Асноўны вынік канкрэтна-гістарычных даследаванняў — канцэпцыі, у склад якіх уваходзяць канцэптуальныя палажэнні (схемы), тэарэтычныя і эмпірычныя тэрміны, пункты гледжання, а таксама факты і рэканструкцыі. У гісторыцы, як і ў рамках любой іншай навуковай дысцыпліны, будуюцца, вызначаючы эпістэмалагічна, ідэальныя аб'екты, але не выключна эмпірычныя ідэальныя аб'екты (нягледзячы на тое, што вывучаемыя ў яе межах аб'екты, вызначаючы лагічна, канкрэтныя), паколькі такія пазнавальныя зместы, як, напрыклад, беларуская культура XX ст. або беларускі этнас у XV ст., з'яўляюцца ідэалізацыямі.

У межах гісторыкі не будуецца такая сістэма ведаў, як тэорыя (незалежна ад таго, ці мець на ўвазе тэорыю ў шырокім сэнсе тэрміна "тэорыя", калі ім абазначаюцца дзве разнавіднасці тэорыі — субстанцыянальныя (змястоўныя) і аперацыянальныя (інструментальныя) (агульнапрынятае адрозніванне іх у сучаснай філасофіі навукі праводзіць Г. Ленк[1]), або ў вузкім сэнсе — толькі субстанцыянальныя тэорыі), паколькі тэарэтычныя пабудовы ў гістарычным даследаванні не ўключаюць законы, не выконваюць функцыю прадказання, не з'яўляюцца інструментам практычнай дзейнасці. Сістэму ведаў, якая ў ёй будуецца, аптымальна абазначаць тэрмінам «канцэпцыя». Гістарычныя канцэпцыі з'яўляюцца сродкам упарадкавання гістарычных фактаў.

Гісторыкі ўстанаўліваюць дэтэрмінанты падзей, прычынныя сувязі паміж з'явамі, але вынікі такога ўстанаўлення нельга характарызаваць як закон, паколькі закон — вынік устанаўлення сувязяў паміж з'явамі, датычных класаў прадметаў. Гісторыкі карыстаюцца законамі, якія ўстанаўліваюцца ў гістарыясофіі і грамадазнаўчых дысцыплінах для тлумачэння даследуемых з'яў, аднак ў канкрэтна-гістарычных даследаваннях яны пазбягаюць такога тыпу тлумачэння.

Слова "гістарыяграфія" ў якасці наймення ўжываецца для абазначэння навуковай дысцыпліны, у межах якой ажыццяўляецца вывучэнне канкрэтна-гістарычных прац і ўжываемых у іх метадаў даследавання. У якасці тэрміна яно ўжываецца ў іншых значэннях. Амаль ва ўсіх

---

[1] Ленк Г. К философии науки и эпистемологии, теоретико-деятельностным и технически ориентированным // Вопросы философии. 2003. № 8. С. 86—87.

такіх выпадках яго прымальна замяніць іншымі тэрмінамі і выразамі: "гістарыялогія", "гістарычныя працы", "гістарычны (гістарыялагічны) кірунак" і г. д. Выразам "гістарыяграфія пэўнай тэмы (праблемы)" аптымальна абазначаць прадметна-змястоўны разгляд гісторыкамі пэўнай тэмы (праблемы) (такі разгляд ажыццяўляецца ў рамках гістарычнага, а не гістарыяграфічнага даследавання, але яго вынікі ўлічваюцца пры правядзенні апошняга; такі разгляд мае іншыя мэты, чым мэты, якія ставяцца ў гістарыяграфіі, але па характару даследчай дзейнасці ён аднолькавы з гістарыяграфічным вывучэннем; такі разгляд, безумоўна, крытычны, таму выразам «гістарыяграфічная крытыка» аптымальней абазначаць сукупнасць суб'ектаў такой крытыкі, а не іншае).

Таму мы лічым, што тэрмінам "гістарыяграфія" аптымальна абазначаць выключна спецыяльную гістарычную дысцыпліну, у межах якой вывучаюцца агульны ход развіцця гістарычных дысцыплін, развіццё гісторыкі, пэўных перыядаў гісторыі ў пэўных краінах, гістарычных кірункаў і "школ", агульных і прыватных раздзелаў гісторыкі і нават дзейнасць гісторыкаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё гісторыкі.

Мэтазгодна адрозніваць філасофскі і навуказнаўчы падыходы да вызначэння аб'екта і прадмета пэўнай навуковай дысцыпліны. Пры першым пад аб'ектам пэўнай дысцыпліны разумеецца пэўны фрагмент рэальнасці, а пад прадметам яе — пэўныя аспекты апошняй; пры другім пад прадметам пэўнай дысцыпліны разумеецца абагульненая фармулёўка тэматыкі і праблематыкі, распрацоўваемых у кагнітыўных межах яе (сукупнасць такой тэматыкі і праблематыкі мы абазначаем праз тэрмін "прадметнае поле навуковай дысцыпліны", абагульненне іх — праз тэрмін "прадметныя рамкі навуковай дысцыпліны"); пад аб'ектам дысцыпліны — пэўны пазнавальны змест, які дазваляе адрозніваць такі аб'ект ад аб'ектаў іншых навуковых дысцыплін.

Для мэт навуказнаўчага (і гісторыказнаўчага) даследавання прымальны розныя тыпалогіі ведаў, метадаў і ўзроўняў даследавання. Выбар і ўжыванне пэўнай тыпалогіі абумоўлены ў значнай ступені тымі задачамі, якія стаяць перад навуказнаўцамі.

У межах метадалогіі гісторыі (ды і іншых падобных навуказнаўчых дысцыплін) распрацоўваецца эпістэмалагічная тэматыка і таму больш дакладным было б сказаць пра "метадолага-эпістэмалогію гісторыі". Закранаецца ў яе (і іх) межах гнасеалагічная, анталагічная праблематыка, сацыялагічная, гістарычная тэматыка, аднак

гэта не дае падстаў для выдзялення гнасеалогіі, анталогіі, сацыялогіі, гісторыі гісторыі. Аптымальным, на наш погляд, з улікам невыкаранімага перакрыжоўвання эпістэмалагічнай і метадалагічнай тэматык галіны даследаванняў пад найменнем "метадалогія гісторыі", надаць ёй найменне "гісторыказнаўства".

Належыць адрозніваць паняцце аб'екта пазнання (і даследавання), у якое ўкладаецца змест аб'екта, на які накіравана пазнанне суб'екта і паняцце ўтварэння рэчаіснасці, якія дадзены ў практычных дзеяннях і пачуццёва ўспрымаюцца як з'явы, мысленна адлюстроўваюцца і разглядаюцца пэўным чынам у якасці прадмета пазнання, ад паняцця аб'екта пэўнай навуковай дысцыпліны, у якое ўкладаецца змест пэўнага абстрактнага аб'екта пазнання (прадмета мыслення), з дапамогай якога карэкціруецца адрозненне прадметных межаў навуковых дысцыплін. Прадметамі пазнання ў працэсе пазнання выступаюць розныя пазнавальныя зместы. Прадмет навуковага пазнання — розныя навуковыя паняцці, эмпірычныя і тэарэтычныя мадэлі, схемы; прадмет канкрэтнага даследавання — пэўныя тэмы, праблемы, аспекты дзейнасці.

Сёння, на наш погляд, мэтазгодным і наспелым з'яўляецца выдзяленне сістэмы навуказнаўчых дысцыплін, у якую далучаемы ўсе тыя галіны даследаванняў, якія звязаны з распрацоўкай кагнітыўных, метадалагічных, грамадска-інстытуцыянальных і іншых праблем навукі і навуковага пазнання. Такі пункт погляду знаходзіць падтрымку ў значных маштабах і разгалінаванасці даследаванняў, што звязаны з рознымі аспектамі функцыяніравання навукі, лагічнай структурай і асаблівасцямі развіцця розных галін навуковага пазнання. У склад навуказнаўчых дысцыплін прапануем уключаць навуказнаўства (з раздзеламі гісторыказнаўства, фізіказнаўства і г. д.), навукаметрыю, сацыялогію навукі, псіхалогію навукі, гісторыю навукі (з раздзеламі лейбніцазнаўства, доўнаразнаўства і мноства іншых галін даследавання), эпістэмалогію, метадалогію навуковага пазнання і іншыя дысцыпліны.

Пры выкладанні і аргументацыі вынікаў канкрэтна-гістарычнага даследавання належыць дакладна выкарыстоўваць паняційны апарат тэорый і канцэпцый грамадазнаўчых дысцыплін; у адваротным выпадку выкладанне не будзе строгім. Тэарэтычная тэрміналогія грамадазнаўчых дысцыплін задавальняе сёння патрэбы правядзення даследаванняў. Але карэляцыйны аналіз яе паказвае на неаптымальнасць з пункту гледжання філасофіі шэрагу прынятых і сталых значэнняў розных тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтых дысцыплінах. Пры правядзенні навуказнаўчых даследаванняў належыць уліч-

ваць тое, што тэрміны "паняцце", "тэорыя", "закон" і інш. абазначаюць не пэўныя паняцці ўвогуле, а розныя паняцці (прытрымліваючыся у дадзеным выпадку лагічнай трактоўкі паняцця).

Намі эксплікуецца сацыяльна-філасофскае паняцце, якое абазначаецца тэрмінам "дзяржава", з адрозненнем ад яго паняццяў, змест якіх перадаецца праз тэрміны "краіна", "дзяржаўныя межы", "органы ўлады і кіравання", "нацыя" (як абазначэнне паліталагічнага паняцця) і г. д. Дзяржава — пэўны соцыум (таксанамічна — аб'яднанне індывідаў), які арганізаваны як сістэма палітычных, ваенных, медыцынскіх, выхаваўчых і іншых устаноў, якой надаецца пэўная назва, а прадстаўнікі якіх падпарадкоўваюцца прынятым у гэтай сістэме заканадаўству і юрыдычным нормам. Дапушчальна трактаваць дзяржаву і як сукупнасць жыхароў пэўнай тэрыторыі, якія, карыстаючыся агульным палітонімам, складаюць спецыфічную сацыятальную структуру, якая арганізаваная шляхам задзейнічання іх у сістэме палітычных, гаспадарчых, фінансава-крэдытных і іншых устаноў, у якіх дзейнічаюць агульныя заканадаўчыя і прававыя нормы.

Прапануецца дэмаркіраваць паняційны апарат сацыялогіі і сацыяльнай філасофіі, пакідаючы ў першым паняцці сацыяльнай групы, сацыяльнага інстытута, сацыяльных арганізацый, адносіць да другога паняцці сфер грамадскай дзейнасці (з выдзяленнем яе розных тыпаў і відаў), соцыуму (г. зн. арганізаванай сукупнасці індывідаў, якая ажыццяўляе грамадскую дзейнасць), этнасу (г. зн. этнічнай супольнасці, якая не з'яўляецца суб'ектам грамадскай дзейнасці), "соцыосу" (г. зн. сацыятальнай супольнасці, якая не з'яўляецца суб'ектам грамадскай дзейнасці), а таксама зыходзіць у рамках сацыяльнай філасофіі пры анаталагічным падыходзе да яе праблематыкі з базіснай канцэптуальнай схемы, у аснову якой пакладзены катэгорыі супольнасці, аб'яднання і адзінства, паводле якой грамадскія ўтварэнні індывідаў класіфікуюцца ў залежнасці ад ступені іх арганізаванасці. Ствараючы паняцці этнічнай і сацыяльнай грамадскай супольнасці як паняцці сацыяльнай філасофіі (абазначаючы іх тэрмінамі "этнасы" і "соцыосы"), мы гістарыясофскі інтэрпрэтуем іх як субстраты сусветнай гісторыі.

Суб'ектамі грамадскай дзейнасці адначасова выступаюць розныя соцыумы — дзяржавы, эканамічныя кланы, палітычныя партыі, канфесійныя рухі і г. д. Суб'ектам сусветнай гісторыі (сусветна-гістарычнага працэсу) мы прапануем вызначаць найбольш значныя (уплывовыя) соцыумы. У розныя перыяды гісторыі імі выступаюць розныя канкрэтныя соцыумы (напрыклад, германскія плямёны,

Ватыкан, КПСС і інш.). Калі разглядаць у цэлым, суб'ектам сусветнай гісторыі аптымальна вызначаць да ўзнікнення дзяржаўнай формы арганізацыі грамадства плямёны (якія этналагічна характарызуюцца як этнасы), пасля яе ўзнікнення — дзяржавы. Плямёны (якім адпавядае першапачатковая асноўная форма арганізацыі грамадства — радавы лад) вызначаюцца этналагічна як этнасы (або этнічныя субстраты), а сацыяльна-філасофскі — як соцыумы, якія маюць этнічную свядомасць. Пасля стварэння і распаўсюджвання іншай асноўнай формы арганізацыі грамадства — дзяржаўнасці становіцца магчымым падзяляць грамадскія ўтварэнні на соцыумы і этнасы.

Прапануецца падзяляць у межах гнасеалогіі паняцці (і шырэй — пазнавальныя зместы) на рэпрэзентанты і канструкты. Рэферэнты тых пазнавальных зместаў, якія вызначаем як канструкты (г. зн. у якіх не адбіты канкрэтныя з'явы, прадметы), — ідэальныя, не рэчаісныя ўтварэнні. Аптымальная дэфініцыя пазнавальных зместаў, якія вызначаемы намі як канструкты, залежыць ад узаемакарэляцыі іх з іншымі пазнавальнымі зместамі, а таксама ад таго, у межах якой навуковай дысцыпліны яна даецца.

Этнасы — асноўны аб'ект этнічнай гісторыі і этналогіі. Агульным (неэмпірычным) аб'ектам пэўнай навуковай дысцыпліны канстытуіруецца пэўнае паняцце, якому адпавядае тэарэтычная (канцэптуальная) мадэль. Таму сцвярджэнне пра тое, што аб'ект пэўнай дысцыпліны — гэта рэальны аб'ект, з'яўляецца праявай наіўнага рэалізму. Гнасеалагічна вызначаючы, нацыі, этнасы, грамадскія класы і іншыя падобныя пазнавальныя зместы тэорый і канцэпцый грамадазнаўчых дысцыплін — канструкты, эпістэмалагічна — яны ідэальныя аб'екты, логіка-гнасеалагічна — абстрактна-ідэалізаваныя прадметы мыслення. У рэчаіснасці няма такіх утварэнняў, як сацыяльна-эканамічныя цэласнасці, аб'яднаныя агульнымі культурнымі рысамі і г. д.; у рэчаіснасці ёсць індывіды, якія складаюць пэўныя сістэмы палітычных органаў улады і кіравання, пэўныя супольнасці, якія ўсведамляюць сваю прыналежнасць да пэўнай краіны. У этналогіі, паліталогіі і іншых грамадазнаўчых дысцыплінах ствараюцца ідэалізаваныя мадэлі такой рэчаіснасці, зручныя для патрэб навуковага пазнання яе.

Сёння ў рамках этналогіі пры апісанні этнічных з'яў карыстаюцца як паняццем этнічнай супольнасці, так і паняццем этнасу, прычым дэфініцыі, якія ім даюцца, падобныя; на наш погляд, гэта рабіць немэтазгодна. Для пабудовы тэорыі этнасу і абагульнення фактаў неаднаслойнай этнічнай свядомасці прапануецца выдзяляць разам з

этнічнымі і этнапалітычныя супольнасці. У адпаведнасці з такім выдзяленнем этнічную гісторыю Беларусі (як і іншых краін) трэба распрацоўваць як гісторыю ўзнікнення і развіцця розных пераемных этнічных і этнапалітычных супольнасцяў, а не адзінага этнасу.

У межах этналогіі, якая распрацоўвалася ў савецкі час, выкарыстоўвалася паняцце нацыі, выдзяляемае па адзнаках агульнасці тэрыторыі і ўмоў эканамічнага жыцця, а галоўнай адзнакай паняцця этнасу бралася пэўная самаідэнтыфікацыя — па агульнасці культурных рыс, а таксама па паходжанні. Улічваючы, што пры гэтым нацыя абгрунтоўвалася як гістарычны тып этнасу, нельга не адзначыць супярэчлівасці такой пабудовы тэорыі этнасу.

Канкрэтны этнас (беларусы, немцы) з пункту гледжання этналогіі — гістарычна склаўшаяся сукупнасць індывідаў, якая выдзяляема па комплексе адзнак; з пункту гледжання семантыкі — імя, якое мае рэферэнт; з пункту гледжання эпістэмалогіі — ідэальны аб'ект, пазначаемы эмпірычным тэрмінам: з пункту гледжання гнасеалогіі — рэпрэзентант, пазнавальны змест, якому адпавядае рэчаіснасць; логіка-гнасеалогіі — рэальны аб'ект мыслення, у адрозненне ад этнасаў, нацый і іншых падобных паняццяў, вызначаемых як ідэальныя аб'екты мыслення. У межах этналогіі дыскусіруецца праблема анталагічнага статуса этнасаў, аднак яе аптымальнаму вырашэнню перашкаджае недасканаласць паняційнага апарату анталогіі.

Этнас як пазнавальны змест — агульны тэрмін, а таксама і паняцце, запазычваемае ў мадэрнізаваным выглядзе з гістарыясофіі і выкарыстоўваемае для тлумачэння этнічных працэсаў. Канкрэтныя этнасы, вызначаючы анталагічна, — утварэнні, якія адносяцца не да матэрыяльнай або духоўнай рэчаіснасці, а выключна да грамадскай рэчаіснасці. Індывіды, з якіх складаецца пэўны этнас, аптымальна анталагічна трактаваць як цэласныя матэрыяльна-духоўныя ўтварэнні, больш спрошчана — як адзінствы цела і душы. Жыццядзейнічаючыя як супольнасці сукупнасці індывідаў — гэта ўжо ўтварэнні не матэрыяльнай, а грамадскай рэчаіснасці. Яны, у прыватнасці, канкрэтныя этнасы, удакладняючы анталагічна, — гэта ідэальнае (а не рэальнае) грамадскае ўтварэнне, паколькі яно праяўляецца не ў дзейнасці, а ў этнічнасці (пэўнай грамадскай свядомасці) і ў міжэтнічных адносінах.

Паколькі мы вызначылі ў межах сацыяльнай філасофіі і анталогіі канкрэтныя этнасы як ідэальную грамадскую рэчаіснасць, то з пункту гледжання ведаў гэтых галін даследаванняў мы лічым спекулятыўнымі (а часцяком выкарыстоўваемымі ў палітычных і ідэалагічных мэтах)

разважанні пра этнасы як пра рэчаісныя ўтварэнні. У сувязі з выкладзеным вышэй нельга не нагадаць пасажы з твора О. Шпенглера "Канец Еўропы": народ (г. зн. эквівалент этнасу. — *Ю. Н.*) — гэта рамантычнае ўяўленне пра сілу, якая выступае творцам сусветнай гісторыі, яго неабходна разбурыць, паколькі пасля надыходу ледніковага перыяду на Зямлі жывуць людзі, а не народы (гл. п. 7 главы 2 т. 2).

Звяртаем увагу на анталагічную непрыдатнасць семантычнага падыходу да ўстанаўлення рэферэнтаў імёнаў. Пры ім, напрыклад, атрымліваюць наступны вынік: апісальнае, агульнае, канкрэтнае, безадноснае імя "сацыялістычная рэвалюцыя" мае рэферэнт, г. зн., як сёння патлумачваецца логікамі, клас прадметаў, якія існуюць у форме матэрыяльнага ўтварэння. Пры анталагічным падыходзе да рэферэнтаў пазнавальных зместаў (пры якім вызначаюцца адносіны апошніх да рэчаісных утварэнняў, а не адносіны імёнаў да прадметаў, як пры логіка-семантычным падыходзе), якога прапануем прытрымлівацца мы, рэферэнт зместу, абазначаемага тэрмінам (а семантычна — імем) "сацыялістычная рэвалюцыя", вызначаемы як ідэальнае ўтварэнне (і апісальнае, абстрактнае імя), у адрозненне ад рэферэнта зместу, абазначаемага праз выраз "Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Расіі" (які вызначаем як зборнае імя), што вызначаецца як паслядоўнасць рэчаісных грамадскіх падзей (і апісальнае, зборнае, канкрэтнае імя). Семантычная трактоўка рэферэнтаў як пазамоўных аб'ектаў імёнаў непрыдатная для пераносу яе на паняцці і іншыя пазнавальныя зместы, паколькі моўныя знакі — толькі выражэнні апошніх.

Прапануецца працэдура ўстанаўлення анталагічнага статуса пазнавальных зместаў, паняццяў і імёнаў. Умовай і падставай для ўстанаўлення анталагічнага статуса паняццяў грамадазнаўчых дысцыплін і адпавядаючых ім тэарэтычных тэрмінаў з'яўляецца не лагічны аналіз аб'ектаў пазнання як прадметаў мыслення і характарыстыкі іх як абстрактных, канкрэтных, зборных і г. д., а таксанамічны аналіз рэферэнтаў тэрмінаў як супольнасцяў, аб'яднанняў, адзінстваў у залежнасці ад ступені арганізаванасці ўтварэнняў.

Устанаўленне анталагічнага статуса пазнавальных зместаў, выкарыстоўваемых у этналогіі, не ўплывае на тэарэтычныя схемы этналогіі (накшталт таго, як, напрыклад, у кібернетыцы ўстанаўленне анталагічнага статуса паняцця адноснай інфармацыі (матэрыяльная або нематэрыяльная рэчаіснасць) не ўплывае на змест тэорыі інфармацыі). Распаўсюджаная трактоўка этнасу як сукупнасці індывідаў, якая складаецца на пэўнай тэрыторыі, прадстаўнікі якой ўсведамля-

юць агульнасць свайго паходжання, сваё адрозненне ад іншых этнасаў, карыстаюцца пэўным этнонімам, як правіла, маюць аднолькавую мову, звычаі, абрады і іншыя элементы духоўнай культуры, агульныя рысы псіхалагічнага складу, захоўваецца ў якасці мадэлі з'яў, нягледзячы на тое, ці вызначаецца рэферэнт паняцця этнасу як актуальнае або як патэнцыяльнае грамадскае ўтварэнне.

Недакладна ўстанаўліваць рэферэнты пазнавальных зместаў (семантычна — імёнаў), з дапамогай якіх даследуюцца з'явы грамадскай рэчаіснасці зыходзячы са стандартнай бінарнай анталагічнай схемы (аб'екыўная рэчаіснасць — суб'ектыўная рэчаіснасць), як гэта робіцца і сёння. Анталагічны аналіз пазнавальных зместаў, якім адпавядаюць канкрэтныя грамадскія ўтварэнні, паказвае пэўную непрацаздольнасць такой схемы.

# SUMMARY

The book argues that it is not possible to discover laws in a historical study as such. Laws reflect knowledge about some general interconnection within groups of homogeneous processes or phenomena. This type of knowledge can hardly be obtained as a result of historical studies.

The subject of historical science is further developed by the authors. The subject is subdivided into fields, i. e. a unity of subject and the issue under study, as well as the framework, the boundaries defining the subject areas of each discipline.

The book sustains that a new science, i.e. science-study (a multidisciplinary concept) should be singled out as well as the fields it should comply, including the methodology of history.

The critical review of a multifaceted use of the term "historiography" allows the authors to suggest that the term should be used solely as a name for a discipline studying the development of historical studies. The term "historics" could be used instead of "historical science" for methodology of history, and the term "history" to define the fields of study dedicated to the history of society.

The procedure of establishing the ontological status of ethnos is discussed (the term "ethnos" is taken as a general one). The referent of each ethnos is understood as an ideal rather than an objective social construct. This understanding is based on the premises that it is concrete social groups-clans, military units, etc. — rather than a whole ethnos that are responsible for certain actions and events.

# ЗМЕСТ

Уводзіны ........................................................................................................ 3
Глава 1. Некаторыя тэарэтычныя праблемы метадалогіі гісторыі ...... 7
1. Гістарычныя заканамернасці .................................................................. 7
2. Аб'ект і прадмет гістарычнага пазнання і даследавання ......... 14
3. Гісторыказнаўчая тэрміналогія................................................................ 23
4. Гістарычныя факты і канцэпцыі ........................................................... 29
5. Тыпалогіі ведаў, метадаў і ўзроўняў даследавання.................. 40
6. Гістарычнае апісанне і тлумачэнне ................................................... 51
Глава 2. Некаторыя тэарэтычныя праблемы гістарыяграфіі ............ 60
7. Міні-нарыс ужывання тэрміна "гістарыяграфія" ў савецкі і постсавецкі час ........................................................................................ 60
8. Гістарыяграфія як навуковая дысцыпліна..................................... 65
Глава 3. Некаторыя тэарэтычныя праблемы навуказнаўства............ 70
9. Метадолаганавуковая тэрміналогія .................................................. 70
10. Удакладненне прадметных межаў метадалогіі навукі, эпістэмалогіі і метадалогіі гісторыі ........................................... 77
Глава 4. Некаторыя тэарэтычныя і філасофскія праблемы этналогіі ......................................................................................................... 85
11. Этналогія як навуковая дысцыпліна.............................................. 85
12. Тэрміналогія этнагістарычнага выкладання ............................... 94
13. Аналіз базісных паняццяў этналогіі і грамадазнаўства........ 103
14. Этнічныя і этнапалітычныя супольнасці ................................. 119
15. Анталагічны статус этнасаў.......................................................... 138
Заключэнне........................................................................................... 151
Summary ............................................................................................... 160

Навуковае выданне

**Несцяровіч** Юрый Уладзіміравіч

**Тэарэтычныя праблемы метадалогіі гісторыі, гістарыяграфіі, навуказнаўства і этналогіі**

Рэдактар *А. І. Валахановіч*
Карэктар *З. Я. Губашына*
Камп'ютэрны набор *Ю. У. Несцяровіча*
Камп'ютэрная вёрстка *П.А. Рэзванава*

ISBN 985-6099-99-4

Падпісана да друку 13.01.2004. Фармат 60Ç84 1/16. Гарнітура Times.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 9,2. Ул.-выд. арк. 7,4. Тыраж 100 экз. Заказ № 81.

Беларускі навукова-даследчы інстытут дакументазнаўства і архіўнай справы (БелНДІДАС). Ліцэнзія ЛВ № 69 ад 12.11.2002.
Надрукавана на НВС БелНДІДАС. 220002, г. Мінск, вул. Крапоткіна, 55.